Установа адукацыі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

Факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці

Кафедра культуралогіі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай

А.І. Смолік
“___”__________2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

І.М. Варановіч
“___” ______________2019 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭОРЫІ І ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ

для магістрантаў па спецыяльнасці 1-21 80 13 Культуралогія

Складальнікі:

Смолік А.І., загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар культуралогіі, прафесар;

Сакалоўская М. М. старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, кандыдат культуралогіі

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Савету ўніверсітэта 16 красавіка 2019 г.
пратакол № 8

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнікі:

Смолік А.І., загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар культуралогіі, прафесар;

Сакалоўская М. М., старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, кандыдат культуралогіі

Рэцэнзенты:

М.А. Ладуцька, загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт;

В.М. Сакалова, начальнік аддзела рэдакцыйна-выдавецкай і паліграфічнай работы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, кандыдат культуралогіі.

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай культуралогіі*
*(пратакол ад 27.03.2019 № 10);*

*Саветам факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці*
*(пратакол ад 25.03.2019 № 8)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………………….4

2. ТЕАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ………………………………………..........7
2.1 Канспект лекцый……………………………………………………..7
2.2 Слоўнік паняццяў і катэгорый культуры……………………...121

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………..130
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў…………………………………..130
3.2 Рэкамендуемыя тэмы магістарскіх работ……………………......132

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ……………………………….........145
4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіх заняткаў……………………145
4.2 Пытанні да экзамену……………………………………………………152

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ……………………………………………...155
5.1 Вучэбная праграма…………………………………………………155

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па культуралогіі з'яўляецца інавацыйным рэсурсам, стымулючым працэс грамадска-палітычнай сацыялізацыі магістрантаў, фарміруе творчае, спрыяльнае для дыялога і калектыўнага пошуку ісціны адукацыйнае асяроддзе, узбагачае каштоўнасны змест вывучаемых магістрантамі культуралагічных ведаў і навыкаў даследчыка духоўнай і матэрыяльнай культуры. Ён уключае не толькі лекцыйны матэрыял, але і неабходныя магістранту сістэмныя па характару і структуры метадычныя распрацоўкі. Прафесійна распрацаваны комплекс уяўляе сабой інтэрактыўны механізм грамадскай сацыялізацыі асобы спецыяліста сацыякультурнай сферы, якасную дыягностыку ведаў, уменняў і навыкаў.

Практыка выкарыстання ВМК па культуралогіі дазваляе разглядаць яго як сапраўдную інавацыйную вучэбную літаратуру, якая забяспечвае мэтанакіраванае фарміраванне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста сферы культуры. Іманентны патэнцыял комплекса выяўляецца ў рацыянальным спалучэнні і ўзаемадзеянні ў вучэбна-выхаваўчым працэсе традыцыйных і інавацыйных метадаў, якія забяспечваюць мабільныя і ўстойлівыя "зваротныя сувязі" паміж выкладчыкам і магістрантамі. Па сваёй структуры і зместу ВМК з'яўляецца альтэрнатывай методыкам, якія выкарыстоўваліся ў вышэйшых навучальных установах на першай ступені культуралагічнай адукацыі. Комплекс уяўляе сабой сістэмны, універсальны арганізацыйна-метадычны інструмент, які адпавядае акадэмічным крытэрыям: фундаментальнасці, інфарматыўнасці, сацыякультурнай накіраванасці. Яго метадычны і інфармацыйна-аналітычны патэнцыял садзейнічае раскрыццю і ўзбагачэнню творчых магчымасцей магістрантаў, рэалізацыі функцый культуралогіі як інэгратыўнай сацыяльна-гуманітарнай дысцыпліны.

Канцэптуальна-базовы сегмент ВМК па культуралогіі гэта – змест адрасаваных аўдыторыі магістрантаў тэкстаў лекцый, якія адпавядаюць патрабаванням міждысцыплінарнай інтэграцыі і сучаснай інфармацыйнай парадыгмы грамадскай думкі. Глыбокі інтарэс і давер да культуралогіі выклікаюць лекцыі, якія не дубліруюць змест сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, выкладаемых на першай ступені.

У навукова-метадычны кампанент ВМК па курсу "Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры" акрамя тэкстаў лекцый уваходзяць іншыя ўзаемазвязаныя элементы: вучэбная праграма, планы семінарскіх заняткаў, тэсты розных узроўняў складанасці, трэнінгі па шэрагу раздзелаў, пералік тэарэтычных і практычных праблем для рэфератаў, найбольш значныя фрагменты арыгінальных тэкстаў заснавальнікаў навукі аб культуры, слоўнік культуралагічных дэфініцый, кантрольныя пытанні да заліка і экзамена, метадычныя парады магістрантам і выкладчыкам, наглядна-графічныя матэрыялы, спіс літаратуры і г.д.

Такім чынам, ВМК па культуралогіі якасна адрозніваецца сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архітэктонікай (структурай, стылем тлумачэння тэорыі і сацыякультурнай практыкі, навукова-метадычным забеспячэннем) ад традыцыйнай вучэбнай літаратуры.

Выкарыстанне дадзенага ВМК прадугледжвае творчы падыход да структурыравання лекцыйнага матэрыяла, выбару праблем для дыскусій, актуальнай тэматыкі студэнтскіх даследаванняў, увядзенне ў лекцыі і семінарскія заняткі наглядна-графічнага, відыё-і-гука раду, інфармацыйна-аналітычных фрагментаў, інтэрпрэтацый, афарызмаў, тэрміналагічнага слоўніка.

Навукова-педагагічная і грамадзянская пазіцыя выкладчыка культуралагічных дысцыплін выяўляецца ў здольнасці ўлічваць змены ў інфармацыйнай плыні сучаснага грамадства, міжкультурнай камунікацыі. Выклікі глабалізацыі патрабуюць асаблівых адносін да нацыянальных культурных каштоўнасцей, ідэалогіі беларускай дзяржавы. Арганічнасць узаемасувязі тэорыі культуры і сацыякультурнай практыкі абумоўлівае неабходнасці ў грунтоўнай эмпірычнай аргументацыі характара і вынікаў мадэрнізацыі беларускага грамадства.

На наш погляд, прапануемы вучэбна-метадычны комплекс істотна адрозніваецца ад традыцыйнай вучэбнай літаратуры (падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, курсаў лекцый айчынных і замежных аўтараў) якаснымі параметрамі: адпаведнасцю структуры і зместу патрабаванням дзяржаўнага адукацыйнага стандарта; навізной прапануемых метадаў навучання; дэмакратычным каштоўнасна-светаглядным патэнцыялам; наяўнасцю сукупнасці метадычных матэрыялаў, якія неабходны студэнтам: аўтарскага тэксту лекцый ў лаканічнай і даступнай форме; інфармацыйна-аналітычных дыягнастычных распрацовак; інфарматыўнасцю, непарыўна звязанай з праблематыкай культурнага жыцця беларускага грамадства; накіраванасцю на выкарыстанне ў вучэбным працэсе сучасных інфамацыйна-камунікатыўных тэхналогій.

Безумоўнай перавагай ВМК па культуралогіі з’яўляецца яго інавацыйны рэсурс, які абумоўлены гарманічным узаемадзеяннем яго элементаў: навукова-метадычным, ідэйна-выхаваўчым, арганізацыйна-метадычным. Комплекс уключае у сябе поўны і гарманічны вучэбна-метадычны набор матэрыялаў, якія неабходны студэнтам для паспяховага засваення тэорыі і гісторыі культуры. Яны скрупулёзна распрацоўваліся аўтарамі, апрабіраваліся ў вучэбным працэсе, на навукова-метадычных канферэнцыях, верыфіцыраваліся, рэцэнзаваліся на прадмет надання асобным з іх грыфа Мінадукацыі

Канцэптуальна-базовы сегмент ВМК па культуралогіі гэта – змест адрасаваных студэнтскай аўдыторыі тэкстаў лекцый, якія адпавядаюць патрабаванням міждысцыплінарнай інтэграцыі і сучаснай інфармацыйнай парадыгмы грамадскай думкі. Тэксты ўяўляюць сабой інфармацыю тэарэтычна-практычнага характару ў выглядзе сукупнасці звестак аб новых артэфактах, з’явах і працэсах у матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама адпаведныя прыклады і парады выкарыстання атрыманых тэарэтычных ведаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у сацыякультурнай практыцы. Дыдактычнае прызначэнне лекцыйнага матэрыяла заключаецца ў тым, каб увесці студэнтаў у фундаментальную культуралогію, азнаёміць з з яе асноўнымі прынцыпамі, катэгорыямі, заканамернасцямі, паказаць яе метадалогію і логіку, значэнне тэорыі для сацыякультурнай практыкі. Глыбокі інтарэс і давер да культуралогіі выклікаюць лекцыі, якія не дубліруюць змест іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, пазбаўлены маніпуляцый з інфармацыяй, якая размешчана ў глабальнай і айчыннай інфармацыйнай прасторы. Выклікаюць водгук у студэнтаў праўдзівыя факты аб сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі, блізкім і далёкім замежжы, праблемы, «нязручныя», дыскусійныя, непасрэдна звязаныя з сацыякультурнай дынамікай.

У навукова-метадычны кампанент ВМК па культуралогіі акрамя тэкстаў лекцый уваходзяць іншыя ўзаемазвязаныя элементы: вучэбная праграма, планы семінарскіх заняткаў, тэсты розных узроўняў складанасці, трэнінгі па шэрагу раздзелаў праграмы, пералік тэарэтычных і практычных праблем для рэфератаў, курсавых і дыпломных работ, найбольш значныя фрагменты арыгінальных тэкстаў заснавальнікаў навукі аб культуры, слоўнік культуралагічных дэфініцый, кантрольныя пытанні да заліка і экзамена, метадычныя парады студэнтам і выкладчыкам, нагляднa-графічныя матэрыялы, спіс літаратуры і г.д.

Такім чынам, ВМК па “Фундаментальных праблемах тэорыі і гісторыі культуры” якасна адрозніваецца сваёй архітэктонікай (структурай, стылем тлумачэння тэорыі і сацыякультурнай практыкі, навукова-метадычным забеспячэннем) ад традыцыйнай вучэбнай літаратуры.

Выкарыстанне дадзенага ВМК прадугледжвае творчы падыход да структурыравання лекцыйнага матэрыяла, выбару праблем для дыскусій, актуальнай тэматыкі магістарскіх даследаванняў, увядзенне ў лекцыі і семінарскія заняткі нагляднa-графічнага, відыё-і-гука раду, інфармацыйна-аналітычных фрагментаў, інтэрпрэтацый, афарызмаў, тэрміналагічнага слоўніка.

Пры яго складанні ўлічваліся змены ў інфармацыйнай плыні сучаснага грамадства, міжкультурнай камунікацыі, выклікі глабалізацыі, узаемасувязь тэорыі культуры і сацыякультурнай практыкі.

На наш погляд, прапануемы вучэбна-метадычны комплекс адпавядае структуры, зместу і патрабаванням дзяржаўнага адукацыйнага стандарта; сучасным метадам навучання, дэмакратычным каштоўнасна-светаглядным патэнцыялам, метадычным матэрыялам, якія неабходны магістрантам.

Комплекс уключае у сябе поўны і гарманічны вучэбна-метадычны набор матэрыялаў, якія неабходны магістрантам для паспяховага засваення тэорыі культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Канспект лекцый

**Тэма. Дысцыплінарны статус культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Культуралогія як эксплiцытная форма ведаў аб феноменах культуры.
2. Неабходнасць універсальнага падыходу да культуры.
3. Дыверсіфікацыя навук аб культуры.

*Мэта лекцыі:* паказаць вытокі культуралагічных эксплiцытных ведаў, актуальнасць вывучэння і даследавання культурных з'яўпрацэса,месца фундаментальнай культуралогіі ўсітсэме гуманітарных навук.

**1. Культуралогія як эксплiцытная форма ведаў аб феноменах культуры.**

Культуралогія з'яўляецца гуманітарной дысцыплінай, якая вывучае разнастайнасць культур, іх унікальнасць, непадабенства і адзінства культурна-гістарычнага працэса. Яна анлізуе тыпы культурнай творчасці, структуру і функцыі культур, заканамернасці сацыядынамікі і іх праяўленні ў культуры чалавечага быцця. Яна разам з філасофіяй выступае ў якасці аснавання гуманітарных навук. Культуралагічныя веды і ўяўленні дапамагаюць сёння пераадолець так званую глабалізацыю, садзейнічаюць фарміраванню ўяўленняў аб шматполюснай цывілізацыі і многіх самакаштоўнасных культурах.

Уплыў на працэс фарміравання імпліцытных культуралагічных ведаў аказала антычная філасофія як вышэйшае дасягненне старажытных грэкаў і рымлян. Іх філасофія асэнсоўвала не толькі культурны вопыт Грэцыі і Рыма, але і досвед усяго тагачаснага свету, абмежаванага сяродземнаморскім рэгіёнам, і мела на той час высокую ступень усеагульнасці. У антычны перыяд ужо адбываецца паступовае зніжэнне ролі міфа, крызіс міфалагічнага светасузірання. Міфалагічныя сюжэты ў пэўнай ступені набываюць сімвалічную, умоўную, паэтычную форму. У суб'ектаў антычнай культуры назіраецца ўзмацненне этычнага аспекта светаразумення. Аналіз літаратуры, якая была вядома ў ранні перыяд гісторыі еўрапейскай цывілізацыі сведчыць, што продкам еўрапейцаў дастаткова шырока былі вядомы перакладзеныя і нават арыгінальныя творы грэчаскіх аўтараў. Вытрымкі шэрагу антычных літаратараў нярэдка групіраваліся ў разнастайныя зборнікі. Таму ёсць усе падставы меркаваць, што ўжо ў пачатку першага тысячагоддзя пісьменныя людзі Еўропы былі знаёмы з некаторымі імпліцытнымі культуралагічнымі ведамі антычных філосафаў і гісторыкаў. Антычныя аўтары выказалі мноства цікавых думак наконт прыроды гісторыка-культурнага прагрэсу і рэгрэсу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактараў, якія абумоўліваюць паходжанне і разнастайнасць культур, аб карысці міжкультурных камунікацый і інш. Суб'екты еўрапейскай культуры паступова далучыліся да багацця антычнай і візантыйскай літаратуры і культуры і самі пачалі займацца творчасцю ў розных галінах духоўнай культуры. Так, даволі рана узнікае і афармляецца ерапейская летапісная традыцыя.

Уплыў на светапогляд еўрапейскіх мысляроў сярэдніх выкоў аказала візантыйская культура, якая была спадкаемцам антычнай культуры. Яе архітэктура, жывапіс, філасофія, тэалогія, навука выступалі ў якасці недасягальнага ўзору (прынамсі да XII–XIII стст.) для народаў як мусульманскага, так і хрысціянскага свету. У перыяд існавання Візантыйскай імперыі культура перажывала сапраўдны росквіт.

Паколькі Візантыйская імперыя знаходзілася на перакрыжаванні Захаду і Усходу, то яе культура ўяўляла своеасаблівы сінтэз грэка-рымскай і ўсходняй культур, прычым дамінавалі ў ёй відавочныя антычныя традыцыі, рысы. Асобныя элементы візантыйскай культуры нагадвалі антычную (найперш рымскую) культуру, напрыклад, адміністрацыйная сістэма, ваенная магутнасць, моцная армія, хрысціянская рэлігія, рымскае права, дзяржаўная лацінская мова (пазней яе замяніла грэчаская мова), іпадромы. У эпоху Сярэднявечча візантыйская цывілізацыя і культура займалі (разам з кітайскай) вядучае месца ў сусветным цывілізацыйна-культурным працэсе.

Да крыніцы фарміравання культуралагічнай думкі, на наш погляд, варта аднесці народныя міфапаэтычныя ўяўленнінародаў Еўропы, прадстаўленыя вуснай народна-паэтычнай творчасцю. У вуснай паэтычнай творчасці, музыцы, танцы, тэатры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве адлюстроўваецца працоўная дзейнасць, грамадскі і бытавы ўклад жыцця, культы і вераванні, рэлігійныя і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці этнаса. Як ранняя форма ідэйнай свядомасці навогул, фальклор меў для іх вялізарнае значэнне. Фальклор, як сінтэзаваная шматаспектная сфера ў культурнай самарэалізацыі і камунікацыі этнаса уплывае на розныя аспекты онта-і філагенэза, уздейнічае на культурную кампетэнцыю суб'ектаў этнічнай культуры. Менавіта ў ім выяўляецца мадэль светабачання чалавека, фарміруецца этнічная самасвядомасць этнафора. На прыроду пераносіліся сутнасныя сілы чалавека, якія надзяляліся атрыбутам бязмежнай магутнасці.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў міфе адбываўся працэс надзялення навакольнага асяроддзе якасцямі чалавека. Міфалогія развівала ў суб'ектаў старажытнай культуры ўяўленні і тым самым садзейнічала іх духоўнаму развіццю. У розных жанрах фальклору заключаліся зачаткі культуралагічных ведаў.

Сучасныя культуралагічныя даследаванні дазваляюць крытычна ўспрымаць уласную культуру і ўласцівы ёй тып чалавека, зразумець іх гістарычныя і культурныя межы. Цікавасць да культуралогіі абумоўлена таксама зменай сацыянальных стымулаў на культурныя. Сацыяльныя змены ўсё больш атрымліваюць культурную матывацыю.

Павышаны інтарэс да фундаментальных культуралагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванняў выклiканы глабальнымi праблемамi крызiса нашай тэхнагеннай цывiлiзацыi i прадчуваннем парасткаў будучай цывiлiзацыi. У XXI ст. назiраецца iмклiвае нарастанне прыкладных культуралагiчных даследаванняў, якiя падтрымлiваюцца iх метадалагiчнай i тэарэтычнай рэфлексiяй.

Культура сучаснай цывiлiзацыi ўяўляе сабой складанае, шматузроўневае супярэчлiвае ўтварэнне, якое ўплывае на ўладкаванне грамадства на велiзарнай геакультурнай прасторы. Культура з'яўляецца духоўным кампанентам дзейнасцi чалавека, якая забяспечвае розныя сферы жыццядзейнасцi грамадства, iнтарызацыi, пад'ёму агульнай культуры будучых спецыялiстаў. У культуры знаходзiць праяўленне дыферэнцыраванасцi i сiстэмнасцi грамадскага жыцця, якiя падтрымлiваюць адзiнства грамадства, пераемнасць i яго развiццё. У сувязi з гэтым асаблiвае значэнне набывае сiстэматычнае i планамернае вывучэнне магiстрантамi вышэйшых навучальных устаноў фундаментальных праблем тэорыi i гiсторыi культуры – адной з базавых дысцыплiн на другой ступенi вышэйшай культуралагiчнай адукацыi. Ва ўмовах глабалiзацыi вывучэнне сусветнай культуры – пры веданнi сваёй, нацыянальнай – набывае асаблiвае значэнне. Веданне тэорыi i гiсторыi культуры дазваляе далучыцца да духоўнага вопыту старэйшых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасцi для ўсебаковага развiцця асобы i фармiравання агульначалавечых iдэалаў. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалiзаваць толькi сiстэматызаваным, лагiчна пабудаваным вучэбным працэсам. Самастойна авалодаць скарбамi сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогii, немагчыма. Акрамя таго, сёння нi адна з'ява, што мае дачыненне да гуманiтарнай сферы, не можа быць разгледжана без культуралагiчнага кантэксту: без яго любы дыскурс ужо будзе няпоўным.

Такiм чынам, нягледзячы на тое, што культуралогiя адносна маладая навуковая i вучэбная дысцыплiна (першыя даследаваннi культуры адносяцца да другой паловы XIX ст.), тым не менш у ёй назапасiўся значны аб'ём ведаў аб культуры як разнастайнасцi i самабытнасцi. Сведчаннем таму з'яўляецца вялiзарная колькасць манаграфiчнай лiтаратуры па разнастайных праблемах фундаментальнай i прыкладной культуралогii, кандыдацкiх i доктарскiх дысертацый, навуковых артыкулаў i дакладаў у спецыялiзаваных часопiсах i зборнiках матэрыялаў канферэнцый, сiмпозiўмаў i форумаў па актуальных пытаннях сацыкультурнага развiцця грамадства.

## 2. Неабходнасць унiверсальнага падыходу да культуры.

У складаных канфiгурацыях канцэпцый культуры значнае месца займаюць тэорыi, з дапамогай якiх культуролагi спрабуюць вызначыць сутнасць i змест сацыяльна-культурных працэсаў. Да iх у першую чаргу варта аднесцi тыпалогiю культур i канцэпцыю культурна-гiстарычных тыпаў. Важнейшыя iдэi дадзеных канцэпцый прадстаўленыя ў вучэннях такiх мыслiцелей, як М.А.Бердзяеў, А.Вебер, М.Я.Данiлеўскi, Л.П.Карсавiн, М.I.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крукоўскі, П.М. Сарокін, В.С. Сцёпін, А.Тойнбі, С. Ханцінгтон, О.Шпенглер і інш. Яны па-рознаму трактуюць сутнасць і змест цывілізацыі і культуры.

Іх тэарэтыка-метадалагічныя падыходы сведчыць аб тым, што культуры і цывілізацыі ўяўляюць сабой вельмі складаныя амбівалентныя феномены сацыяльнага жыцця, ад узаемадзеяння якіх залежаць лёсы ўсяго чалавецтва. У значнай ступені ў сучасную эпоху актуалізуецца праблема самазахавання і паступальнага развіцця агульнанацыянальных цывілізацый і культур.

У сувязі з гэтым тэарэтычны аналіз розных дыскурсіўных практык па праблемах узаемаадносін культуры і цывілізацыі з'яўляецца вельмі важным для будучых даследчыкаў культурных працэсаў.

У сучаснай культуралогіі адбываецца актыўны працэс адаптацыі метадаў прыродазнаўчых навук да даследавання працэсаў і з'яў культуры. Плённа беларускімі і замежнымі культуролагамі выкарыстоўваецца сінергітычны, дыфузіянісцкі падыходы, уведзенныя ў свой час фізікамі. Сёння пры выяўленні дэтэрмінацыі культуратворчасці асобы культуролагі абапіраюцца на тэорыю інтэрферэнцыі.

У фізіцы інэрферэнцыя разглядаецца як узаемнае ўзмацненне ці паслабленне хваль пры налажэнні. У культуралогіі пад інтэрферэнцыяй разумеецца налажэнне, судакрананне розных культурных плыняў як у сферы высокай культуры, так і ў паўсядзённым жыцці. Культурная інтэрферэнцыя асабліва закранае мову, якая з'яўляецца ядром культуры. Пры культурных кантактах адбываецца адхіленне ад нормы і сістэмы іншай мовы пад уплывам роднай. Да праяў культурнай інтэрферэнцыі культуролагі адносяць, напрыклад, білінгвізм і полілінгвізм, спалучэнне язычніцтва і хрысціянства, полістылістычнасць у мастацтве і г.д. У працэсе кантактаў паміж прадстаўнікамі розных культур творца засвойвае культуру і мову іншых супольнасцей, але ў той жа час не страчвае поўнасцю сваю культуру, гістарычную памяць і нацыянальную самасвядомасць. Засваенне норм, каштоўнасцей і традыцый іншай культуры, безумоўна, узбагачае асобу і спрыяе яе плённай творчасці ў навуковай і мастацкай дзейнасці. Культурная інтэрферэнцыя ўяўляе сабою працэс засваенне неабходных для жыцця нормаў і каштоўнасцей чужой культуры, якія напластоўваюцца на традыцыі і звычаі роднай культуры і наадварот.

У працэсе дыялогу культуры набываюць новыя рысы, засвойваюць некаторыя іншаэтнічныя традыцыі, а часам і адвяргаюць іх, аказваюць узаемаўплыў адна на адну. Так, у ХУІІІ ст. беларускі філосаф Аскерка Сцяпан, глыбока авалодаўшы духоўнай культурай нямецкага народа, у 1760 г. напісаў трактат "План, які з'яўляецца нормай". У гэтым даследаванні ён выклаў план перабудовы нямецкага грамадства, усталявання такога сацыяльнага ладу, які б садзейнічаў уздыму жыццёвага ўзроўню, культуры і асветы народа. Праца была высока ацэнена грамадскасцю Еўропы. Нашаму суайчынніку нават была прапанавана пасада саветніка юстыцыі караля Фрыдрыха ІІ. Вялізарны ўнёсак у развіццё культуру чылійскага народу зрабіў Ігнат Дамейка. Мікалай Судзілоўскі прыўнёс шэраг інавацый у культуру паўднёва-азіяцкіх краін (Гаваі, Кітай, Японія). Дзякуючы культурна-асветніцкай дзейнасці Іосіфа Гашкевіча, японцы засвоілі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэраг духоўных артэфактаў усходнеславянскай культуры.

У той жа час і беларуская культура пазітыўна ўплывала на рэсацыялізацыю суб’ектаў культуры іншых народаў. Характэрна ў дадзеным кантэксце інтэрферэнцыя Аляксандра Семянтоўскага (1821-1893 гг.), культуратворчая дзейнасць якога адбывалася ў перыяд, калі ўплыў рускай культуры на беларускую перавышаў “крытычную мяжу”, што ўяўляла пагрозу для культуры беларускага этнасу, паколькі ён прыводзіў да збяднення і нават знікнення асобных нацыянальных традыцый, абрадаў, звычаяў, артэфактаў і інш. Семянтоўскі быў накіраваны ў Беларусь з мэтай русіфікацыі мясцовага насельніцтва і прызначаны сакратаром Губернскага статыстычнага камітэта і адначасова неафіыйнай часткі “Витебских губернских ведомастей”, пазней – рэдактарам “Памятной книжки Витебской губернии». Пад час працяглага знаёмства з культурай беларусаў ён пераканаўся ў бесперспектыўнасці русіфікатарскай культурнай палітыкі і імкнуўся маючамі ў яго сродкамі паказаць адметнасці, багацце беларускай культуры, яе самабытнасць, спецыфічныя асаблівасці мовы беларусаў. Ён прыхільна ставіўся да беларускага народа, падкрэсліваў цяжкае яго матэрыяльнае становішча, не вінаваціў у гэтым прыродныя ўмовы пражывання і фізічную прыроду насельніцтва. Працу сакратара губернскага статыстычнага камітэта А.Семянтоўскі спалучаў з актыўнай археалагічнай, этнаграфічнай і фальклярыстычнай навуковай дзейнасцю. А.Семянтоўскі інтэсіўна займаўся даследаваннем побыту і культуры беларусаў. Вынікам навуковых пошукаў краязнаўцы былі арыгінальныя працы “Сінельна-набойная вытворчасць у г. Віцебску” і “Пра кірмашы Віцебскай губерні” Але асноўнай яго навуковай працай, на наш погляд, з’яўляецца “Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні”. У ей кожнай народнасці Віцебшчыны Семянтоўскі прысвяціў асобны раздзел. Навуковец дэталёва апісаў жыллё беларусаў і яго інтэр’ер, гаспадарчыя будынкі, ежу, вопратку, прылады працы. Паказваючы гаротнае становішча беларуса, этнограф, аднак не вінаваціць народ у яго цяжкім лёсе. Наадварот, ён адзначаў, што беларус працавіты, духоўна багаты: *“Нельга сказаць, каб беларус быў пазбаўлены дароў духоўных, каб зямля, якую ён неяк апрацоўвае дапатопнай сахой ды смыкам з суччa, не магла адзесяцярыцай адплаціць яму за сапраўды цяжкую працу, каб тапаграфічныя ўмовы вобласці беларусаў і фізічная прырода іх саміх стварала неадольныя перашкоды”*.Ён рэзка крытыкаваў погляды Ф. Эркерта, які акаталічаных беларусаў, латышоў, эстонцаў і іншых этнасаў, якія пражывалі на Віцебшчыне, залічваў у палякі. Семянтоўскі навукова аргументавана падышоў да вызначэння этнічнага складу насельніцтва, пражываючага на сучасных беларускіх землях. На канкрэтных статыстычных даных і прыкладах ён паказаў, што галоўнымі акалічнасцямі прыналежнасці да нацыі трэба лічыць родную мову, мінулы гістарычны лёс і сучасны лад жыцця, а таксама нацыянальную свядомасць народа і яго культуру. Краязнавец сцвярджаў, што ў паўсядзённай культуры беларусаў-католікаў і беларусаў-праваслаўных не толькі няма адрозняннаў, але бытавая культура шляхты недалёка адыйшла ад культуры сялян-беларусаў.

Семянтоўскаму належыць праца “Беларускія старажытнасці”, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэталёва апісана вялікая колькасць старажытных помнікаў Беларусі, большасць з якіх сёння знікла назаўсёды. Побач з апісаннем земляных валоў, насыпаў, курганоў, замкаў і археалагічных знаходкаў этнограф прыводзіць вялікую колькасць аўтэнтычных народных паданняў

Упершыню этнографам зроблена класіфікацыя 53 адзінак мер і вагі, якія бытавлі ў XIX ст. на тэрыторыі Віцебскай губерні. У працы “Аб мерах і вазе, якія выкарыстоўваюцца цяпер і ўжываліся ў старыя гады ў Віцебскай губерні” ён паказаў, што вывучэнне адзінак народнай метралогіі неабходна для ўсебаковай характарыстыкі культуры штодзённасці беларусаў.

Цікавую канцэпцыю развіцця культуры прапанаваў амерыканскі культуролаг Уільям Огбарн. Ён грунтоўна вывучаў уздзеянне змен у галіне тэхналогіі на культуру і прыйшоў да высновы, што духоўная культура (у тэорыі Огбарна яна называецца адаптыўная) звычайна змяняецца марудней, чым матэрыяльнае. У сваёй тэорыі сацыяльнага зрушэння ён вылучае два аспекты – матэрыяльны і нематэрыяльны. Матэрыяльная культура ўключае будынкі, збудаванні, жыллё, сродкі камунікацыі, транспарт, вынаходніцтвы, інавацыйныя тэхналогіі і інш. Да кампанентаў нематэрыялнай (адаптыўнай) культуры навуковец адносіць сацыяльныя інстытуты (сям’ю, царкву, навучальны ўстановы, сістэму каштоўнасцей); абрады, норавы, вераванні, нормы, ўяўленні; палітычныя інстытуты (урад, грамадскія арганізацыі, лобі, палітычныя партыі). Галоўная ідэя У.Огбарна: культурнае спазненне адбываецца тады, калі змены ў матэрыяльным жыцці грамадства апярэджваюць трансфармацыю нематэрыяльнай культуры (абрады, рытуалы,філасофскія сістэмы, законы і формы кіравання). Як лічыць Огбарн, гэта прыводзіць да пастаяннай неадпаведнасці паміж развіццём матэрыяльнай і адаптыўнай культуры, і ў выніку ўзнікае мноства нявырашаных сацыяльна-культурных праблем. Для апісання такой сітуацыі навуковец уводзіць паняцце “культурны лаг”.

Сапраўды ў XX ст. еўрапейская цывілізацыя дасягнула ўнушальных поспехаў у развіцці матэрыяльнай сферы. Паводле тэорыі хваль у развіцці чалавечай цывілізацыі, “першая хваля” – аграрная рэвалюцыя, адбывалася 10 тыс. гадоў назад. За гэты перыяд адбыўся пераход ад качавога лада жыцця да аседлага, ад жывёлаводства да земляробства. “Другая хваля” – індустрыяльная рэвалюцыя – пераўтварыла чалавечае грамадства ў індустрыяльнае. Гэта эпоха ахоплівае ўсяго толькі 300 гадоў (у 33 разы хутчэй). І “трэцяя хваля” – новая тэхналагічная, ці камп’ютарная рэвалюцыя – самая хуткая па тэмпах. Па меркаванню Э.Тофлера, за 25-30 гадоў яна карэнным чынам створыць новую цывілізацыю, знішчыўшы індустрыяльны свет. Японскі навуковец Е.Масудэ спрабуе выявіць прыкметы інфармацыйнага грамадства: а) масавая вытворчасць новай інфармацыі, што дазволіць замяніць чалавека на разумныя машыны (кікборг); б) ажыццяўленне дынамічнага кантролю за вытворчасцю, распаўсюджаннем, спажываннем неабходнай інфармацыі; в) стварэнне комплекснай нарматыўнай інфармацыі; г) фарміраванне сетак кагнітыўнай інфармацыі (уключэнне кожнага чалавека ў пазнавальныя працэсы і практычную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць). Як бачна, Е.Масудэ не адводіць месца працэсу фарміравання духоўных якасцей чалавека. Швейцарскі філосаф Г.Эйхельберг параўновае 50-тысячную гісторыю чалавецтва з бегам на 60-кіламетровую дыстанцыю, пры гэтым умоўна прыраўновае 10 тыс. гадоў да 1 км. Большая частка гэтай дыстанцыі апынецца за межамі цывілізацыі. Толькі на 58 км. з'явяцца першыя прылады працы і пячорныя малюнкі. На 60-м кіламетры ўзнікае земляробства, за 200 метраў да фініша сфарміруецца рымская цывілізацыя. Апошнія 10 метраў будуць адзначаны з'яўленнем керасінавай лямпы і толькі на самым фінішы еўрапейцы пачнуць выкарыстоўваць электрычную энергію, навучацца кіраваць тэрмаядзернымі працэсамі, асвойваць космас і г.д. Адным словам, у XX ст. еўрапецы стварылі тэхнагенна-спажывецкую цывілізацыю, дзе эканоміка адыгрвае выключную ролю. Укараненне ў быццё прынцыпа першынства эканомікі над іншымі сферамі сацыяльнага жыцця спарадзіла прымітыўны тып чалавека – Homo echanomicus, для якогоа прыбытак і грошы сталі меркай, матывацыяй жыццёвых арыентацый і ўчынкаў. У еўрапейскай індустрыяльнай цывілізацыі амаль усё, у тым ліку чалавечае цела, дух і душу, разглядаюць праз прызму камерцыйнага інтарэса, запамятаўшы, што эканоміка толькі частка грамадскага жыцця.

Беларусь як частка еўрапейскай супольнасці адчувае на сабе імклівыя змены ў матэрыяльнай сферы. Так, дастаткова прасачыць за зменамі, якія адбываюцца ў мікраэлектроніцы. Вядома, што першая інтэгральная сістэма на крэмніі была пабудавана ў 1959 г. амерыканскімі інжэнерамі Д. Кілбі і Р. Нойсам .Недасканалыя 50 гадоў назад сёння высокапрадуктыўныя мікрачыпы хутка ператварыліся ў важны інструмент ў многіх галінах навукі і вытворчасці. На мікрачыпах сёння працуюць камп'ютары і аўтамабілі, медыцынскія прыборы, мабільныя ўстройствы і нават цацкі. Удасканаленне тэхналогій мікраэлектронікі адбывалася сямімільнымі крокамі. Так, калі ў 2000 г. колькасць транзістараў ў адной інэгральнай схеме дасягала 43 млн., то ў 2004 г. яно склала 4,3 млрд. Хуткасць каналаў перадачы інфармацыі ад 10 гігабіт у секунду ў 2000г. прыблізна за 12 гадоў вырасла ў тысячу разоў – да 10 000 гігабіт. Інтэрнэт стаў паўнавартаснай структурнай часткай беларускай медыясістэмы, яго ўплыў імкліва ўзмацняецца. Так, у 2010 г. у Беларусі інтэрнэтам карысталася амаль палова жыхароў краіны – каля 4 млн., што ў 2,5 разы болей, чым у 2005 г. Як бачна, змены ў матэрыяльных кампанентах культуры адбываюцца імкліва. У мінулыя стагоддзі грамадства мела больш часу для прыстасавання да навацый і праверкі розных спосабаў ажыццяўлення гэтых мер.

Хуткі тэмп кардынальных змен у матэрыяльным жыцці грамадства не дазваляе духоўнай культуры так хутка змяніць карціну свету, сістэму нарматыўна-каштоўнасных адносін, формы кіравання грамадствам. Менавіта таму зваротным бокам пераможнага шэсця цывілізацыі становіцца духоўная дэградацыя чалавека. Культурны лаг дакладна характарызуе сацыякультурную сітуацыю ў сучасным беларускім грамадстве. Разрыў паміж імклівымі зменамі ў матэрыяльнай культуры ўскладніўся разбурэннем савецкага тыпу культуры. На этапе крызіса савецкай культуры зместам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнай дэструкцыі з'яўляліся: разбурэнне склаўшыхся сацыяльна-культурных інстытутаў, змены каштоўнасна-сэнсавага ядра монастылістычнай савецкай культуры, зніжэнне узроўня сістэмна-іерархічнай структурыраванасці, сладанасці і поліфункцыянальнасці культурнага комплекса беларускага грамадства, змена сістэмы патрэбнасцей, мэт, матывацый, дамініраванне адмоўна накіраваных экзістэнцыяльных станаў асобы. Дэградацыя падсістэмы каштоўнасных арыентацый, традыцйнай маралі выклікала да жыцця масіфікацыю разнастайных форм дэструкцыі сацыяльнага і асобаснага характара: аномію, агрэсію, бунт, канфармізм, рытрытызм, рытуалізм, эскапізм і інш. Адбываўся пераход ад традыцыйнай культуры беларусаў (у цэнтры якой каштоўнасці любові, дабра, справядлівасці, узаемадапамогі, спагады і інш.) да цывілізацыі (заснаванай на каштоўнасцях аўтаноміі, спажывання і геданізма). Наступствы гэтага перахода выражаюцца ў прыярытэце рацыянальных рэгулятараў (розум, закон) над маральнымі (сумленне, маральная адказнасць), што вызваляе ад усялякай адказнасці як вытворцаў, так і іх спажыўцоў. У выніку у беларускім грамадстве назіраецца ўзрастанне сацыяльна-негатыўных дэвіяцый (амаральныя ўчынкі, п'янства, наркаманія, суіцыд, злачынствы і інш.). Па дадзеных крымінальнай статыстыкі, у рэспубліцы ў 2008 г. у параўнанні з 1990 г. зарэгістраваная агульнае злачынства павялічылася ў 2,3 разфы ( у 1990 – 75 699, а ў 2008 – 158 506 злачынстваў). Сярод краін СНД Беларусь па ўзроўню зарэгістраванага злачынства займае 2-е месца пасля Расіі. Штогод рост злачынства павялічваецца на 8 %. Да крымінальнай адказнасці прыцягнута 73 тыс. чал. Наша краіна наблізілася да сусветнага крытычнага ўзроўню злачынства. Акрамя злачынства, актуальнай сацыяльнай праблемай з'яўляецца алкагалізацыя насельніцтва. За апошніх 18 гадоў узровень спажывання алкаголю павялічыўся з 5,7 літра да 12, 4 – на душу насельніцтва (рэальны ўзровень 16 літраў). 83 % навучэнцаў і студэнтаў з'яўляюцца актыўнымі спажыўцамі алкаголю. Гэта перавышае ў 2 разы еўрапейскі узровень. Сусветная арганізацыя аховы здароў'я вызначыла, што пасля 8 літраў наступае крытычны ўзровень, калі пачынаецца эканамічная, культурная і дэмаграфічная дэгралацыя грамадства. Дастаткова шырокае распаўсюджанне набыло спажыванне наркотыкаў. Іх спажыўцамі з'яўляюцца маладыя людзі ва ўзросце 16-24 гады (74%). Сярод наркаманаў: навучэнцы ПТУ – 22%, тэхнікумаў і каледжаў – 17%, школьнікі – 15 %, студэнты – 8 %, беспрацоўныя – 6 %.

Такім чынам, чалавек XXI ст. фарміруецца масавай, а не адаптыўнай культурай, якая аперыруе прымітыўнымі, прамалінейнымі і нярэдка агрэсіўнымі знакамі і сімваламі, якія праз апеляцыю да форм архетыпічных станаў пераўтвараюць свет чалавека і яго самога. У выніку фарміруецца новы ідэал чалавека, які ідзе па жыцці аўтаномна, з аглядкай толькі на асабістыя інтарэсы, каб з дапамогай спажывання дасягнуць адзіна значных геданістычных мэт. Гэта яўна выражаны тып носьбіта масавай свядомасці, абмежаваны, прагматычны, самаўлюблёны, зямны, пачуццёвы, зарыентаваны цывілізацыяй на спажывецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прычын адставання духоўнай культуры ад матэрыяльнай шмат. Па-першае, ў беларускім грамадстве маюцца кансерватыўныя сацыяльныя групы, якія імкнуцца абараніць свае ідэі і каштоўнасці ад уздзеяння матэрыяльнай культуры (розныя рэлігійныя канфесіі, палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі). Па-другое, беларускае грамадства складаецца з сацыяльных груп, якія маюць гдыбока розныя інтарэсы. Па-трэцяе, наяўнасць культурнага лага тлумачыцца прывачкамі і інерцыяй, якія ўласцівы чалавеку.

## 3. Дыверсіфікацыя навук аб культуры.

Культура чалавецтва гістарычна ўяўляе сабой сукупнасць культур тэрытэрыяльных супольнасцяў. У выніку сіметрычнага дыялогу паміж імі ўзнікла вялікая культурная разнастайнасць, якая ахапіла розныя рэгіёны нашай планеты. У працэсе сацыякультурнага развіцця народамі свету былі створаны самабытныя гістарычныя тыпы культур, якія з'явіліся падмуркам сучаснай сусветнай культуры. Сацыякультурны свет паўстае перад намі не як нешта аднароднае, а як багатая разнастайнасць, мноства, шматварыянтнасць самабытных унікальных культурных адзінак. Яны часам існуюць не сутыкаючыся, маюць сваю прастору і свой час. Так, шэраг культуролагаў (М. Данілеўскі, А. Тойнбі, Э. Трольч, О. Шпенглер) лічылі, што няма адзінай культурнай гісторыі чалавецтва; гісторыя, па іх меркаванні, уяўляе сабой змену культур, кожная з іх жыве сваім уласным самадастатковым і адасобленым ад іншых культур жыццём. Яны былі пераканаы, што адналінейнасці працэсу культурнага і гістарычнага жыцця няма, лініі развіцця культуры разыходзяцца. Кожная культура жыве прыкладна адну тысячу гадоў, а іх англійскі калега А.Тойнбі сцвярджаў, што існаванне культур не мае выразных часавых меж. Аднак у разнастайнасці сацыякультурнага свету, па меркаванні Вальтэра, Ш.-Л.Мантэск'ё, Г.Э.Лесінга, І.Канта, І.Гердэра, У.Салаўёва, К.Ясперса зыходзяць з ідэі аб універсальнасці сусветнай гісторыі. можна прасачыць адзіную лінію развіцця чалавецтва, якая вядзе да стварэння агульначалавечай культуры. Яе эталоны пранікаюць ва ўсё складанаарганізаванае мноства этнічных, нацыянальных, мікра- і макрарэгіянальных культурных утварэнняў. Інакш кажучы, скразныя формы культурна- і сацыяльна-гістарычнага развіцця розных народаў пастаянна напаўняюцца духоўным і матэрыяльным зместам сусветнай культуры, якая сама знаходзіцца ў працэсе вечнага станаўлення і вяртання. У аснове такой інтэрпрэтацыі сусветнага культурнага працэсу пакладзена ідэя аб універсальнасці сусветнай гісторыі прызнанне, таго, што культура ёсць змест чалавечага жыцця і чалавек усюды і заўсёды думае аб тым, як уладкаваць сваё жыццё і жыццё іншых людзей найлепшым чынам.

Разыходжанні па пытанні аб адзінстве сусветнай культуры, аб агульначалавечай культуры звязаны з розным разуменнем агульнага ў сусветнай культуры і розным тлумачэннем адзінства. Справа ў тым, што ў межах аднаго мноства можна вылучыць некаторую агульнасць усіх непаўторных элементаў, асобных культурных адзінак і абазначыць гэту



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнасць як адметную асаблівасць множства культур у адрозненне ад іншага множства.


Літаратура

Иконникова, С.Н. История культурологических теорий: учебное пособие / С.Н.Иконникова. – Санкт-Петербург: Питер, 2005. – 473 с.: фот.

История культурологии / С.С.Наретина и др.; под ред. А.П.Огурцова. – М.: Гардарики, 2006. – 384.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Розин, В.М. Введение в культурологию: учеб. для высш. шк. / В.М. Розин.— М.: Форум: Инфа-М, 1997. – 219 с.

Смолік, А.І. Культурологія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Смолік, А. І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэбна-метадычны комплекс / А.І. Смолік, Л.К. Кухто, С.Л. Шпарло; Мін-во культуры Рэспублікі Беларусь; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. –Мінск : БДУКМ, 2017. – 343 с.


**Тэма. Сфера культуры як аб’ект вывучэння і даследавання (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Культура як аб’ект вывучэння розных гуманітарных дысцыплін.
2. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання.
3. Аксеалагічны і семіятычны сэнс культуры.

*Мэта лекцыі*: раскрыць заканамернасці і механізмы функцыянавання і развіцця культуры як сістэмы.

**1. Культура як аб’ект вывучэння розных гуманітарных дысцыплін.**

З часоў фарміравання класічнай навукі ў ХУІІ – ХУІІІ стст. вучоных галоўным чынам цікавіла пазнанне таямніц прыроды, а затым у ХІХ – ХХ стст. – даследаванне сацыяльна-эканамічных сістэм і чалавека як грамадска-палітычнай істоты. У нашы дні працягваецца актыўнае вывучэнне прыроды і грамадства. Тлумачыцца гэта, на наш погляд, тым што з’явіўшыся вельмі рана, культура даволі позна стала спасцігацца чалавечым розумам, яе доўга атаясамлівалі з соцыумам.

Сёння стораны чалавечым розумам і рукамі грандыёзны свет культуры стаў надзвычай складаным і супярэчлівым, увайшоў у крызісны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“турбулентны” стан, і яго развіццё цяжка прадсказаць і праектаваць без сістэматызацыі і абнаўлення прадыходаў да аналіза назапашанага культурнага доследу. У сучасным пазабіялагічным арганізме культуры існуе разлад, дысбаланс паміж развіццём яе розных сфер: тэхніка-біялагічнай і маральнай, матэрыяльна-эканамічнай і прававой, масава-камунікатыўнай і адукацыйнай, палітычнай і маральна-каштоўнаснай, мастацкай і ідэалагічнай і г.д. Таму праблема чалавека і яго культуры зараз усё больш змяшчаецца ў цэнтр сучаснай навуковай думкі. Менавіта гэтым тлумачыцца з’яўленне культуралогіі ў якасці самастойнай навуковай дысцыпліны, закліканай сістэмна і цэласна вывучаць свет культуры, навукі, якая здольна стаць адным з сапраўдных інструментаў у барацьбе за пабудову больш гарманічнага і вартага чалавечага існавання. Л.Уайт, які навуку аб культуры, назваў культуралогіяй, меркаваў, што адкрыццё культуры калі-небудзь стане ў гісторыіі ў адзін рад з геліяцэнтрычнай тэорыяй Каперніка ці адкрыццём клетачнай асновы ўсіх форм жыцця [9].

Працы, прысвечаныя вывучэнню культуры як асобай формы арганізацыі жыцця чалавека, з’явіліся ў шэрагу еўрапейскіх краін прыкладна ў 50-я гады XIX ст. У гэты перыяд пачынае фарміравацца самастойная навука, якая даследуе гістарычнае развіццё культуры і ажыццяўляе параўнальны аналіз розных яе тыпаў, вывучае заканамернасці функцыянавання і структурнай арганізацыі, узаемадзеяння з прыроднымі ўмовамі. У канцы XIX ст. ужо былі заснаваны кафедры ва універсітэтах і нават створаны цэлыя інстытуты, галоўнай задачай якіх было вывучэнне культур у гістарычным і структурна-функцыянальным аспектах. Для сістэматызацыі, абагульнення канкрэтна-эмпірычных даных выкарыстоўваліся розныя метады, прыёмы, ствараліся культуралагічныя канцэпцыі, якія ўпарадкоўвалі разрозненыя звесткі ў адзіную, цэласную карціну. Да пачатку XX ст. сфарміраваліся розныя кірункі ў вывучэнні культур: эвалюцыяніcцкі, дыфузіяніcцкі, біялагічны, псіхалагічны, функцыянальны, герменеўтычны і інш.

Складанасці вывучэння культуры выклікаюць разуменне структуры і іерархічныя ўзроўневыя падзелы культуры. Усталяваным у навуцы можна лічыць падзел культуры на матэрыяльную і духоўную. Як правіла, у якасці крытэрыю разглядаецца канчатковы прадукт, атрыманы ў выніку чалавечай дзейнасці па аналогіі з відамі вытворчасці (напрыклад, у працахУ.Я.Давідовіча, Ю.А.Жданава, Э.У.Сакалова і інш.). Так, да матэрыяльнай культуры адносяць рэчы, прылады, веды, якія з’яўляюцца прадуктамі матэрыяльнай вытворчасці або абслугоўваюць матэрыяльнае жыццё грамадства. А да духоўнай культуры належаць прадукты духоўнай вытворчасці, змест формаў грамадскай свядомасці, эстэтычныя каштоўнасці, выяўленыя сродкамі мастацтва.

Разгляд праблемы культуры, перш за ўсё духоўнай, часта звязваецца з праблемай развіцця і ўдасканалення патрэбнасцей асобы. Гэтая псіхалагічная ўласцівасць настолькі звязана з узроўнем развіцця грамадства, што ўся гісторыя чалавецтва фактычна пацвярджае: аб’ём так званых першых жыццёвых патрэбнасцей і спосаб іх задавальнення практычна залежаць ад стану культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства і яе праламлення на ўзроўні канкрэтнага індывіда. Філосаф Э.В.Ільянкоў сцвярджае, што “чалавечую асобу можна з поўным правам раз-глядаць як адзінкавае ўвасабленне культуры, гэта значыць усеагульнага ў чала-веку”.

Культуры адводзіцца важная роля аднаго з дэтэрмінантаў спосабу жыцця чалавека, надання высакароднасці яго патрэбнасцям. Многія даследчыкі падкрэсліваюць дыялектычную сувязь паміж актуальным станам духоўнай куль-туры і спосабам жыцця людзей, паміж каштоўнасным аспектам культурнай дэтэрмінацыі, з аднаго боку, і выніковасцю працэсу пранікнення духоўных каш-тоўнасцей у індывідуальнае быццё - з другога. Праявай духоўнай культуры ў структуры спосабу жыцця выступае культура патрэбнасцей і спажывання. Так, прызнаючы важнасць разгляду праблемы культуры патрэбнасцей і спажыван-ня, філосаф М.В.Іванчук мяркуе, што “культура спажывання - такая ж не ад'емная частка духоўнай культуры, як і культура маральная, эстэтычная", што яна “з’яўляецца мерай і спосабам рэалізацыі сутнасных сіл чалавека... накіравана на ўсебаковае развіццё асобы...”.

Аднак зводзіць выхаванне чалавека толькі да фарміравання арганічнай сістэмы патрэбнасцей не зусім правільна. Гаворка павінна ісці аб адпаведнасці патрэбнасцей канкрэтнага чалавека сукупнасці духоўных каштоўнасцей гра-мадства, аб “акультурванні" патрэбнасцей, таму што пра далучэнне асобы да багаццяў культуры мы можам меркаваць па яе патрэбнасцях. Яны выяўляюцца як матывы дзейнасці і ўчынкаў: культура спажывання - гэта праекцыя за межы ўнутранагасветучалавека.

У сувязі з гэтым актуалізуюцца праблемы кіравання асобай сваімі жаданнямі, патрэбнасцямі, уменнямі надаваць ім сацыяльна прымальную форму, бо імкненне да неадкладнага задавальнення патрэбнасцей, якое аб’ектыўнае на-ват на самым высокім узроўні развіцця вытворчасці, не можа быць адразу рэалізавана і прывядзе да адмоўных эмоцый, незадаволенасці, песімізму, зніжэння жыццёвага тонусу, можа нанесці непапраўны ўрон развіццю асобы.

Патрабавальнае стаўленне да сваіх патрэбнасцей, уменне вызначыць сту-пенькнадзённасід,спалучэннеіндывідуальныхзапатрабаванняўзграмадскімі, выбар сродкаў іх рэалізацыі характарызуюць унутраныя якасці чалавека, глыбіню яго выхаванасці, таму што структура патрэбнасцей, іх сацыяльная скіраванасць вызначаюцца аб'ёмам і якасцю засвоеных чалавекам культурных каштоўнасцей.

Працэс фарміравання культуры чалавека з'яўляецца бясконцым працэсам станаўлення, самавыяўлення, індывідуалізацыі асобы. Чым вышэй духоўнае развіццё асобы, тым болын актыўным з'яўляецца яе стаўленне да культурнага асяроддзя. Паводле перакананне акадэміка Д .С. Ліхачова, культурнае асярод-дзе неабходна чалавеку для яго духоўнага і маральнага жыцця, для яго “духоў-най аседласці", маральнай самадысцыпліны і сацыяльнай актыўнасці.

## 2. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання.

Падзел культуры на матэрыяльную і духоўную, безумоўна, адносны і мае абмежаванае значэнне ў гнасеалагічным аспекце. Пры разглядзе гэтага чля-нення ў анталагічным рэчышчы заўсёды аказваецца, што матэрыяльнае ўва-сабляе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэальную мэту, значыць, мае духоўны аспект, а ўсе духоўныя каштоўнасці, у сваю чаргу, прадстаўлены ў той або іншай матэрыяльнай аба-лонцы, але яны служаць пэўнай асновай, крытэрыем вызначэння структуры культуры. Аднак некаторыя вучоныя наогул адмаўляюць наяўнасць матэры-яльнай культуры, разглядаючы яе як нейкае прадметнае ўвасабленне ідэальнага ўяўлення аб навакольным асяроддзі, або лічаць, што размежаванне матэрыяль-най і духоўнай культур знаходзіцца ў сферы ўсведамлення чалавекам таго, якую патрэбнасць задавальняе дадзены прадмет або від дзейнасці.

Вычляненне відаў культуры - працэс складаны, заўсёды можна знайсці элементы, якія не ўвайшлі ў прапанаваную схему і маюць амбівалентную пры-роду. Духоўная культура ёсць праява ідэальнага, радавога, сутнаснага пачатку чалавека, які на універсальнай аснове здольны ўзвышаць любую дзейнасць, забяспечваць яе высокія вынікі. Матэрыяльныя аб'екты самі па сабе не з'яўля-юцца ўвасабленнем культуры. Яны разглядаюцца як такія ў тым выпадку, калі становяцца ідэальным узорам чалавечай працы і накіраваны на ўдасканаленне асобы. Духоўная культура чалавека, укладзеная ў матэрыяльныя аб'екты, вяр-таецца да яго ў выглядзе болын гуманістычна афармленага прадметнага ася-роддзя, якое ўзвышае чалавека. Чалавек таму і ёсць мера ўсіх рэчаў, што рэчы, у сваю чаргу, служаць мерай яго ўласнай чалавечнасці.

Залежнасць прадукцыйнасці і якасці працы ад узроўню духоўнай культуры пераканаўча даказана вядомым сацыёлагам, мастацтвазнаўцам, педагогам Ю.У .Фохт-Бабушкіным. Праведзеныя ім даследаванні сярод рабочых многіх гарадоў Расіі паказалі непасрэдны ўплыў цікавасці да мастацтва на выніki і х працы: у наведвальнікаў тэатра, кіно, музеяў, канцэртаў прадукцыйнасць пра-цы на 7-10% вышэй за сярэднюю па горадзе. Павелічэнне сярэдняй наведвальнасці тэатра ў 0,68 раза ў год вядзе да перавыканання плана на 10%.

Чалавек з неразвітым густам, нізкім узроўнем духоўнай культуры, неразвітым успрыманнем эстэтычных катэгорый абыякавы да выконваемай работы, да яе якасці, вынікаў і эстэтычнага афармлення, і, што самае галоўнае, працэс работы не прыносіць яму радасці, задавальнення, разумення ўласнай значнасці, асобаснага самаадчування.

Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца азначэнне духоўнай культуры як сукупнасці духоўных каштоўнасцей, якія характарызуюць узровень і арганізацыю духоўнага жыцця грамадства, ступень развіцця грамадскай свядомасці, сацыяльных ведаў, адукацыі і выхавання людзей. Ядро духоўнай культуры складае грамадская свядомасць: палітыка, права, мараль, мастацтва, рэлігія, філасофія. Сюды ж адносяць эмпірычныя і навуковыя веды, характар і сістэму адукацыі і выхавання, культуру мовы і зносін люзей.

Значыць, духоўная культура ўключае агульны ўзровень інтэлектуальнага і маральнага развіцця людзей, сукупнасць ведаў і навыкаў, поглядаў, пазіцый і

звычаяў, узровень эстэтычнагаі эмацыянальнагаразвіцця, разнастайнасць гус-таў і пачуццяў.

Такім чынам, духоўная культура - сукупнасць духоўных каштоўнасцей, якія характарызуюць узровень і арганізацыю духоўнага жыцця грамадства, а ў дачыненні да асобы – сукупнасць якасцей, якія характарызуюць асобу або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадзеную сацыяльную групу з пункту гледжання меры асваення духоўнай культурыграмадства.

Традыцыйна прынята ў адпаведнасці з азначэннем духоўнай культуры вылучаць галоўныя прыметы, крытэрыі ўзроўню яе развіцця ў канкрэтнай асобы. Як правіла, гэта:

- дасведчанасць у сферы агульнай або духоўнай культуры, яна характарызуецца аб'ёмам і якасцю культурнай інфармацыі;
- выбіральнасць у сферы агульнай або духоўнай культуры, якая характарызуецца зместам, скіраванасцю культурнай інфармацыі ў гэтай галіне;
- ступень актыўнага стаўлення да агульнай або духоўнай культуры, якая характарызуецца актыўным прымяненнем культурных навыкаў, удзелам у распаўсюджванні культурнай інфармацыі;
- ступень вызначальнага ўплыву агульнай або духоўнай культуры на сацыялізацыю асобы, яе сацыяльныя паводзіны і самасвядомасць, на яе светапогляд.

Гэтыя прыметы фармальныя, агульныя, аднак яны могуць служыць для правядзення сацыялагічных і педагагічных даследаванняў у якасці асноўных крытэрыяў узроўню развіцця духоўнай культуры асобы.

У філасофскай літаратуры ў паняцце культуры ўключаюцца як сама дзейнасць чалавека, так і яе тэхналагічная аснова, гэта значыць сукупнасць сродкаў і механізмаў, дзякуючы якім яна матывуецца і ажыццяўляецца, а таксама агуль-ны ўзровень валодання культурнымі каштоўнасцямі. Важна і тое, што вучоныя разглядаюць культуру як цэласную з'яву, цэнтральным звяном якой выступае чалавек як суб'ект культурнага развіцця.

Паняцце "культура" ў самым шырокім сэнсе выражае якасную характарыстыку таго, наколькі канкрэтныя людзі здолелі ўзвысіцца над сваёй натуральнай біялагічнай прыродай, развіўшы сваю другую, сацыяльную прыроду. Таму куль-турай з'яўляецца толькі тое з выробленага чалавекам, што накіравана на самаразвіццё і самаўдасканаленне чалавека. Адпаведна культура спецыяліста - гэта яго здольнасць да развіцця і ўдасканалення сваіх творчых магчымасцей у вырашэнні нестандартных задач, у ажыццяўленні сваіх прафесійных функцый. Культура-гэтатаксамаісвядомая,мэтанакіраваная,творчаяактыўнасць індывідаў і супольнасці: імкненне падтрымаць традыцыі, палепшыць і ўпарад-каваць жыццё, ажыццявіць якія-небудзь змены, супрацьстаяць разбуральным, антыгуманным тэндэнцыям і інш.

Варта адзначыць, што для сучаснага перыяду характэрны інтэгральны, сацыяльны феномен, які В.С.Біблер называе "соцыумам культуры". Культура ўсё больш рухаецца ў эпіцэнтр сучаснага быцця, дзе адначасова суіснуюць каштоўнасці ўсходняй і заходняй культур, антычныя, сярэдневяковыя, адраджэнцкія, асветніцкія і інш. Культурныя спектры маюць сэнс у дачыненні адзін да аднаго ў дыялогу нашай рэальнай сённяшняй свядомасці. Гэта праб-лема не толькі мыслення, але і сапраўднага быцця кожнага сучаснага чалавека. Чалавек бліжэйшай будучыні будзе пастаўлены перад неабходнасцю выбару свайго соцыуму культуры, у якім ён і стане ажыццяўляць сваё духоўнае сама-вызначэнне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3. Аксеалагічны і семіятычны сэнс культуры**.

Ва ўмовах пераходнага перыяду, фарміравання новага глабальнага мыслен-ня чалавека XXI ст. выспявае новая культуралагічная парадыгма, за аснову якой бяруцца ўяўленні аб гуманістычным тыпе асобы, мадэль чалавека, які не толькі спажывае культурныя каштоўнасці, але стварае і развівае іх па прычыне прафесійнай і асобаснай патрэбнасці, асобы як самакаштоўнасці, самагоднасці чалавека - не толькі мэты, але і сродку грамадскага развіцця.

Найбольш зручнай мадэллю культуры для структуравання зместу культуралагічных ведаў з'яўляецца канцэпцыя, распрацаваная вядомым беларускім філосафам і культуролагам М.І.Крукоўскім. У яго іерархічнай тыпалагізацыі культура разглядаецца ў двух разрэзах: уздоўж вертыкалі іерархічных узроўняў (сінхранія) і па гарызанталі, уздоўж лініі яе гістарычнага развіцця ў часе (дыяхранія). Такі погляд, узыходзячы да гегелеўскай традыцыі рухомасііды ялектыка-сугшрэчлівагаадзінстваагульнагаіпрыватнага,сутнасці і з'явы, ідэальнага і матэрыяльнага, зместу і формы, скіраваны ў будучыню, у перспектыву развіцця чалавецтва і выкарыстання сучасных агульнанавуковых падыходаў.

У адпаведнасці са сказаным культура - гэта сістэмная сукупнасць духоў-ных і матэрыяльных каштоўнасцей, якая ўяўляе сабой іерархічную структуру, дзе асноўнымі ўзроўнямі з'яўляюцца духоўная, мастацкая і матэрыяльная куль-туры, яны, у сваю чаргу, маюць уласныя, болын дробныя мікраструктуры. І так аж да асобных прадметаў і фактаў культуры, кожны з якіх уяўляе індывідуальную мікраструктуру як шкалу мікраўзроўняў паміж полюсамі сутнасці і з'явы, зместу і формы.

Але культура - гэта не толькі мноства асобных фактаў і з'яў духоўнага, мастацкагаабоматэрыяльнагахарактару,аідаволівысокаарганізаванаясістэма са сваёй уласнай структурай, з больш ці менш стабільным наборам элементаў, якія знаходзяцца ва ўзаемасувязі і ўзаемадзеянні. Таму важна вывучаць не толькі яе асобныя элементы (напрыклад, жанр музыкі, выкананне), але і бачыць усю сістэму ў цэлым - "не толькі дрэвы, але і лес" (М.І.Крукоўскі).

Звернем увагу на стройнасць і лагічнасць сістэмы вертыкальных, сінхранічных узроўняў культуры. Вылучэнне мастацкай культуры як самастой нага віду нароўні з духоўнай нязвыкла для еўрапейскай філасофіі, таму што янабольшасцювучонькласіфікуеццаякчасткадухоўнай.Аднаккаліўлічыць, што да духоўнай культуры адносяць прадукты і працэс інтэлектуальнай дзейнасці (навука, філасофія, рэлігія, права і інш.), то мастацтва як вынік эма-цыянальнага асваення і ўспрымання карціны свету, разнастайнага і рознатыпо-вага, з развітой уласнай тыпалогіяй структурна можа быць разгледжана па-за або ў рамках духоўнай культуры. Гэта асабліва плённа і зручна ў навукова-педагагічным плане, бо дае магчымасць даволі поўна ўявіць і апісаць цэльную структуругэтагафеномена.

На наступным узроўні мастацкая культура распадаецца на сістэму асобных відаў мастацтва: выяўленчае, музыка, мастацкая літаратура, архітэктура, ды-зайн і інш. У сваю чаргу, кожны з відаў мае ўласную структуру ўжо на ўзроўні жанраў як падвідаў канкрэтнага мастацтва: графіка, жывапіс, скульптура - у выяўленчым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтве; паэзія, проза, драма - у мастацкай літаратуры; сімфонія, опера, песня - у музыцы і гэтак далей. Затым кожны падвід, у сваю чаргу, распадаецца на яшчэ болын дробныя падструктуры: так, графіка падзя-ляецца на станковую, кніжную, газетна-часопісную, прыкладную і інш.; жывапіс - на алейны, тэмперны, васковы і гэтак далей - аж да канкрэтных твораў, якія маюць сваю мікраструктуру, пэўны стыль, вобразы, мову і інш.

Надзвычай цяжка іерархізаваць сінтэтычныя віды мастацтва, такія як кіно, тэатр, харэаграфія, дзе ўжо на трэцім узроўні, жанравым, адбываецца вельмі цеснае перапляценне з іншымі мастацтвамі, напрыклад кіно - з музыкай, выяўленчым мастацтвам, літаратурай, дызайнам, харэаграфіяй і інш.

Мастацкая культура непарыўна звязана з двума іншымі відамі культуры, грунтуючыся на матэрыяльнай культуры (спажывецкія тавары, прадметы быту, машыны, матэрыялы і інш.), мастацкая культура вяртаецца ў матэрыяльны свет у выглядзе ўзвышаных прадметаў і з'яў, якія служаць чалавеку ў яго паступальным руху да духоўнай культуры (навука, рэлігія, філасофія, права, мараль і інш.). Мастацтва, як мост, злучае паміж сабой два пласты, утвараючы трэці, даволі самастойны ўзровень, названы мастацкай культурай.

У другой сістэме, уласна культурнай, пазбаўленай біялагічнай абумоўленасці, культура выступае як складаная сістэма сімвалаў і нормаў, якія пастаянна змяняюцца, удасканальваюцца людзьмі.

У сучасным культуралагічным дыскурсе культуру разумеюць як нешта адметнае ад прыроды, тое, што перадаецца па традыцыі сродкамі мовы і сімвалаў, практычнага вывучэння і непасрэднай пераймальнасці, а не біялагічнага наследавання. Мовай культуры звычайна называюць тыя сродкі, веды, сімвалы, тэксты, формы, якія дазваляюць людзям арыентавацца ў прасторы культуры і ўступаць адзін з адным у камунікатыўныя сувязі.

Мовакультуры-гэтауніверсальнаяформаасэнсаваннярэальнасці,уякую арганізуюцца ўсе ўзніклыя або існуючыя ўяўленні, успрыманні, паняцці, воб-разы і іншыя падобныя сэнсавыя канструкцыі (носьбіты сэнсу). Такім чынам, усё гэта - сродак разумення паміж людзьмі і народамі.

Праблема разумення даволі актуалізуецца ў апошнія гады. Лакальныя канфлікты, этнічныя войны, рэлігійная і расавая нецярпімасць працягваюцца, нягледзячы на рост адукацыі, тэхнічных ведаў, новых інфармацыйных тэхналогій. Абвастрэнне геапалітычнай і грамадска-палітычнай сітуацыі, супярэчнасці, якія пранізваюць чалавецтва, "распадзенне сувязі часоў" (Х.Г.Гадамер), па сутнасці, вядуць да змены тыпаў культуры, парушэння звыклых паняційных сувязей паміж нацыямі і народамі, рэгіёнамі і пакаленнямі. Праб-лема мовы культуры - гэта праблема разумення, эфектыўнасці культурнага дыялога як па вертыкалі, гэта значыць дыялога паміж культурамі розных эпох, так і па гарызанталі, гэта значыць дыялога розных культур, існуючых аднача-сова,паміжсабой.

Мова, з'яўляючыся "праблемай сэнсу культуры", сінтэзуе сацыяльныя, культурна-гістарычныя, псіхалагічныя, эстэтычныя аспекты жыцця чалавека. Але для таго, каб падзея культуры стала яе з'явай, яна павінна быць пераведзена ў тэкст. Значыць, мова ўяўляе ядро сістэмы культуры, менавіта пры дапамозе яе чалавецтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засвойвае каштоўнасці, ацэнкі, уяўленні, усё тое, што вызначае карціну свету. Такім чынам, мова культуры - гэта спосаб захоўвання і перада-чы культуры ад пакалення да пакалення.

Асобае значэнне валодання мовай культуры ў тым, што яно дазваляе чала-веку ўключыцца ў культурны кантэкст, усвядоміць сваё месца ў ім, зарыента-вацца ў складаных і дынамічных сацыякультурных працэсах. І чым вышэй уз-ровень валодання мовай культуры, чым болын шырокі і разнастайны дыяпазон ведаў, уяўленняў аб культуры, тым вышэй здольнасць чалавека да ўспрымання

і гармоніі з навакольным светам, таму што мовы - гэта іерогліфы, у якія чалавек умяшчае свет і сваё ўяўленне. Праз разнастайнасць моў для нас адкрываюцца багацце свету і разнастайнасць таго, што мы спазнаём у ім, і чалавечае быццё робіцца для нас шырэйшым, паколькі мовы ў выразных і дзейсных ры-сах даюць нам розныя спосабы мыслення і ўспрымання.

Мова ўвасабляе асновы культуры: яе прадукт і структурныя элементы, умо-вы развіцця. І натуральныя (французская, беларуская і інш.), і штучныя (мова навукі, умоўныя сігналы, знакі, сімвалы), і другасныя (камунікатыўныя струк-туры - міф, рэлігія, мастацтва) мовы - спецыфічны знакавы спосаб фіксацыі, захавання, перапрацоўкі і трансляцыі культурнай інфармацыі.

Літаратура

Исламгалиева, С. Культуралогия: курс лекцый / М. Исламгалиева, К. Хамин, Г. Бабаян. – М. : Экзамен, 2009. – 192 с. 20.

Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013.— 352 с.

Риккерт, Г. Науки о природе, науки о культуре / Г.Риккерт // Культурология, XX век: антология / гл. ред . и сост. С.Я.Левит. – М.: Юристъ, 1995.— С. 69-103. – (Лики культуры).

Фейблман, Дж. Концепция науки о культуре / Дж. Фейблман // Антология исследования культуры. – СПб.: Университетская книга, 1997. – Т.1. Интерпретация культуры. – С.

Уайт, Л. Понятие культуры // Антология исследования культуры. — СПб.: Университетская книга, 1997. – Т.1. Интерпретация культуры. – С. 141-156.

Шендрик, А.И. Теория культуры: учеб. пособие для вузов / А.И.Шендрик. – М.:ЮНИТИДАНА; Единство, 2002. – 519 с.

**Тэма. Метады культуралагічных даследаванняў (4 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Метад як сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення з’яў і працэсаў культуры.
2. Класіфікацыя навуковых метадаў.
3. Метады тэарэтычнага і эмпірычнага даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта лекцыі*: абазначыць спецыяльныя метады фундаментальнай культуралогіі і агульналагічныя метады даследавання артэфактаў культуры.

**1. Метад як сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення з'яў і працэсаў культуры.**

Пад метадам у гуманітарным дыскурсе (ад грэч. *methodos* – шлях даследавання) разумеецца сукупнасць аналітычных прыёмаў, аперацый і працэдур, якія выкарыстоўваюцца пры даследаванні культуры.

Кожная навука толькі тады адпавядае статусу навуковасці, калі яна ўяўляе сабой правільна пабудаваную тэорыю і абапіраецца на пэўную сістэму эмпірычных ведаў аб прадмеце, які яна даследуе. Нават у якасці эмпірычных ведаў культуралогія з'яўляецца навукай абагульняючай. Яна грунтуецца на тых факталагічных і спецыяльных дадзеных, якія здабываюць прыватныя навукі, ужо арганізаваныя ў выглядзе тэорый. Напрыклад: тэорыя мовы, тэорыя гаспадаркі, тэорыя мастацтва, тэорыя этнагенезу, сацыялагічная і экалагічная тэорыя і г.д. Іншымі словамі, культуралогія апрацоўвае выніковую інфармацыйную базу прыватных тэорый іншых навук. Тым самым яна карыстаецца эмпірыкі-індывідуальнымі метадамі, забяспечваючы сабе шырокую і дастаткова поўную эмпірычную аснову.

Маючы справу з суадносінамі розных навуковых тэорый, параўноўваючы, крытыкуючы, не прымаючы або прымаючы іх, пераходзячы не толькі ад факта да абагульнення, але і ад агульнага становішча да факта, культуралогія мае справу з дэдуктыўным метадам. У цэлым яе адносяць да навук, якія называюць гіпатэтыка-дэдуктыўнымі, дзякуючы спалучэнню эмпірычна абгрунтаваных гіпотэз з пэўнымі высновамі, атрыманымі тэарэтычным шляхам на аснове лагічных высноў. Падкрэслім, што культуралогія з'яўляецца навукай аналітычнай, таму што яна звязаная з прадуманым выбарам фактаў у сацыякультурнай рэальнасці, выяўленнем іх сапраўднасці, а таксама з тлумачэннем іх сэнсу. Напрыклад, каб навукова прааналізаваць феномен культуры моладзі, трэба выявіць факталогію яго існавання, параўнаць розныя тэарэтычныя аспекты вывучэння моладзевай культуры, упарадкаваць веды на гэты феномен і растлумачыць спецыфіку спосабу быцця гэтай сацыяльнай групы ў культуры горада ў адзінстве мэт, зместу і сэнсаў яе існавання, тэхналогіі яе канкрэтнай дзейнасці, а таксама таго культурнага выніку, які моладзь укладвае ў развіццё сучасных сацыяльных практык горада. Менавіта ў выніку строгай аналітычнай працы магчымыя працэдуры праверкі навуковых палажэнняў, суадносіны іх з фактамі, г.зн. верыфікацыя (ад лац. veritas) – праверка праўдзівасці. Для развіцця культуралогіі вялікае значэнне мела адрозненне метадаў навук натуральных (навукі аб прыродзе) і гуманітарных (навукі аб культуры), прадпрынятае Г. Рыкертам і В. Віндэльбандам. Гэтае распазнаванне прывяло пасля да расколу культуры на натуральную і гуманітарную. Гаворка ішла аб адзінстве ідэаграфічнае метаду (ад грэч. idios – асаблівы, своеасаблівы), мэтай якога з'яўляецца выяўленне ўнікальных рыс аб'екта, і номатэтычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(ад грэч. nomo-teteo – усталяванне законаў), задачай якога з'яўляецца выяўленне агульнага, якое мае форму закона. З гэтага часу вывучэнне культуры стала звязвацца з каштоўнасным падыходам. Іншымі словамі, важна вывучаць не толькі прадметы, існае, але і тое, што для людзей мае каштоўнасць і сэнс.

## 2. Класіфікацыя навуковых метадаў.

Вырашэнне кожнай даследчыцкай задачы патрабуе выбару адпаведных метадалагічных і метадычных прыёмаў. У працэсе культуралагічнага аналізу прадмета даследавання метады выкарыстаныя выбарачна, з улікам іх здольнасці вырашаць канкрэтныя аналітычныя праблемы, ужытая шматузроўневая сістэма метадалагічных ведаў. Культуралагічнае даследаванне можа быць выканана на аснове сістэмнай метадалогіі, якая прадугледжвае комплексны аналіз гісторыка-культурнага перыяда і сацыядынамікі духоўнай і матэрыяльнай культуры ў яго межах.

У падмурак даследавання ў першую чаргу павінен быць пакладзены падыход да культуры як сістэмы, якая мае своеасаблівую структурную пабудову і ўласныя законы функцыянавання. *Сістэмны падыход* аб’ядноўвае структурна-элементны аналіз з гістарычным. Ён таксама патрабуе вылучэння і аналізу сістэмаўтваральных фактараў. Менавіта таму ў даследаванні разгляд духоўна-змястоўнай сутнасці, выяўленай на матэрыяле літаратурных твораў і творах жывапісу, напоўнены высвятленнем сацыяльных, палітычных, гістарычных і філасофскіх фактараў. *Элементы структурна-функцыянальнага падыходу*, пастулююць, што кожная культура – гэта цэласнасць, і для захавання культурай яе цэласнасці кожны яе элемент з'яўляецца неабходным і строга функцыянальным. У якасці такой цэласнасці ў даследаванні можа выступаць сацыякультурная парадыгма.

У якасці базавага ў даследваннях культуры нярэдка выкарыстоўваецца *аксіялагічны падыход*, выкарыстаны падчас выяўлення адметнасцей пераасэнсавання такога элемента структурнай характарыстыкі духоўнай культуры, як ідэалы, каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі, якія складаюць аксіялагічны комплекс суіснуючых сацыякультурных парадыгмаў. Каштоўнасны падыход з’яўляецца адным з ключавых метадалагічных падыходаў, які дазваляе выявіць унікальнасць нацыянальнай культуры, канфігурацыю ў ёй універсальнага і ўнікальнага. Выкарыстоўваючы аксіялагічны падыход у даследаванні магчыма выявіць у тэкстах культуры тыя ідэі і каштоўнасці, на якіх базавалася тагачасная для суб’ектаў культуры рэчаіснасць. Аксіялагічны падыход з'яўляецца зыходным метадалагічным прынцыпам, на аснове якога набываюць значэнне і ўсе астатнія, напаўняючыся ўласна культуралагічным зместам. Згодна з каштоўнасным падыходам, культура ёсць не што іншае, як сукупнасць каштоўнасцяў, як складаная іерархія сэнсаў, значных для канкрэтнага грамадскага арганізма (асабліва этнічнай супольнасці на этапе нацыястанаўлення – У. Ж.).

Для больш глыбокага асэнсавання феномену каштоўнасцей неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звяртацца да канцэпцыі “цэнтральнай зоны культуры”, якая сцвярджае, што цэнтрам любога грамадства, т. зв. “цэнтральнай зонай” выступаюць каштоўнасці і вераванні дадзенага грамадства, дамінуючымі сярод якіх выступаюць этнічныя каштоўнасці. У асяродку каштоўнасных прыярытэтаў народаў можна ўлічваць дынаміку этнакультурных працэсаў і самасвядовасці этнафораў. Каштоўнасны падыход дае пераканаўчае ўяўленне пра міжкультурныя адрозненні.

Паколькі аксіялогія культуры выходзіць за межы разумення культуры як сістэмы матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, а зыходзіць са спасылкі пра складанае ўзаемадзеянне асобы, груп, сістэм культуры і прыроды, якія ўвасабляюцца ў каштоўнасцях. У адпаведнасці з гэтым, аксіялагічная метадалогія неаддзельная ад семіятычнага і дыялогавага падыходу ў разуменні культуры.

Таму цалкам апраўдана, што адным з вызначальных метадаў, якія выкарыстоўваюцца на этапе выяўлення адметнасці інтэрпрэтацыі сімвалаў у артэфактах культуры, з’яўляецца *семіятычны падыход* да культуры, паколькі любы культурны феномен выступае ў якасці тэксту як цэласнай функцыянальнай структуры, адкрытай для мноства сэнсаў, якія існуюць у сістэме сацыяльных камунікацый. Сацыякультурная парадыгма, якая складае аснову даследавання, выступае ў якасці адметнай мовы або тэксту эпохі, паколькі валодае здольнасцю знакавага замацавання сацыякультурных уяўленняў у словах, вобразах, рэчах. У якасці такога знакавага замацавання сэнсаў, напрыклад, з’яўляюцца творы мастацтва (літаратурныя творы і творы жывапісу), якія змяшчаюць закадзіраваную інфармацыю, звязаную не толькі са сферай калектыўнага бессвядомага этнічнай супольнасці, але і з тагачасным сацыякультурным кантэкстам пэўнага перыяда.

Не апошняе месца ў культуралагічным даследаванні адводзіцца выкарыстанню *герменеўтычнага падыхода*. Дадзены падыход заключаецца ў спасціжэнні сэнсу складаных, нярэдка шматзначных тэкстаў, зафіксаваных не толькі ў пісьмовай знакавай форме, але ў прынцыпе любой з’явы культуры, любога артэфакта. У якасці асновы герменеўтычнага падыходу ў культуралогіі выступае спроба асобаснага “пранікнення” ў тэкст як фрагмент духоўнага цэлага праз пранікненне даследчыка ва ўнутраны свет мастака і выяўленне яго творчай думкі. Выкарыстанне герменеўтычнага падыходу дазваляе зразумець, як ствараліся артэфакты суб’ектамі культуратворчасці, дае магчымасць спасцігаць каштоўнасці і сэнсы тэкстаў як інфармацыйных носьбітаў культуры.

Стан метадалогіі сучаснай культуралогіі дазваляе выявіць філасофскія карэляты, сфармуляваць новыя метадалагічныя прынцыпы. Адным з накірункаў пошукаў з’яўляецца спроба апісання гісторыка-культурнага перыяда пры дапамозе катэгорыі сацыякультурнай парадыгмы. Асаблівая ўвага ў даследаванні культуры надзяляецца сацыякультурнай парадыгме развіцця грамадства як асноўнаму метадалагічнаму сродку ў даследаванні гістарычнага перыяду ў цэласнасці і дынаміцы. Выяўленне адметнасцей пераасэнсавання аб’ектаў духоўнай культуры суб’ектамі творчасці не можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбыцца па-за межамі сацыякультурнай дынамікі (як знешняй, так і ўнутранай), паколькі ў межах кожнай канкрэтнай сацыякультурнай парадыгмы культурная спадчына суб’ектаў культуры якраз выступае ў якасці сродку трансляцыі культурна-значнай інфармацыі, якая рэалізуецца ў працэсах азначвання (замацавання гэтай інфармацыі ў тэкстах) і разумення (асэнсавання і рэканструкцыі гэтай інфармацыі праз тэкст). Таму менавіта дзякуючы акрэсліванню парадыгмаў сацыякультурнага развіцця грамадства ў межах пэўнага гістарычнага перыяду тэксты культуры выступаюць у якасці элементаў агульнай культурнай прасторы, што знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі з іншымі “адначасовымі” яе кампанентамі і падсістэмамі. Дадзеная акалічнасць дазваляе раскрыць паняцце поліпарадыгмальнасці не толькі як агульнавядомага метадалагічнага прынцыпа ў межах даследавання, але і як адметнасці сацыядынамікі духоўнай культуры.

Акрамя таго, асаблівую значнасць для даследавання культуры набывае *структурна-функцыянальны падыход.* Элементы структурна-функцыянальнага падыходу пастулююць, што кожная культура – гэта цэласнасць, і для захавання культурай яе цэласнасці кожны яе элемент з'яўляецца неабходным і строга функцыянальным. У якасці такой цэласнасці ў даследаванні выступае сацыякультурная парадыгма (сінтэз сацыякультурных парадыгмау, выражены у поліпарадыгмальнасці), якая складаецца з суб’ектнага, аксіялагічнага, сімвалічнага і светапогляданага элементаў, а таксама комплекса ідэалаў. Варта адзначыць, што дадзеныя комплексныя элементы абумоўліваюць адзін аднаго.

## 3 Метады тэарэтычнага і эмпірычнага даследавання.

У культуралогіі ўжываюцца і асаблівыя метады даследавання, якія крысталізаваліся ў рамках дысцыплін, якія складаюць культуралагічны падмурак гэтай навукі. Гаворка ідзе пра такія метады, як кампаратыўны, або параўнальны – гэта параўнанне якіх-небудзь структур па вызначаным прыкметам.

Калі ж культуролаг ставіць задачу прадставіць абагульнены характар розных сацыякультурных арганізмаў, тады ён выяўляе цэлы комплекс прыкмет і працуе на базе тыпалагічнага метаду. Параўнальны метад можа разгортвацца ў двух даследчых плоскасцях пры вывучэнні культур – сінхронным і дыяхронным. Калі, напрыклад, вывучаюцца адначасова існуючыя культуры, скажам сярэднявечнай Францыі і Індыі, тады выкарыстоўваецца сінхранічны метад, а калі развіццё гэтых культур разглядаецца ад Сярэднявечча да сучаснасці, то выкарыстоўваецца дыяхранічны метад. Пры гэтым важна, каб навуковыя працэдуры параўнання грунтаваліся на добра прадуманых тыпалагічных прыкметах.

Разам з названымі метадамі культуралогія выкарыстоўвае біяграфічны, або персаналагічны, метад, калі асоба канкрэтнага чалавека і яго дзейнасць разглядаюцца ў кантэксце пэўнага тыпу сацыякультурнага быцця і непаўторнасці праяў яе індывідуальнасці. У апошні час усё больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разглядаецца метад мадэлявання сацыякультурнай рэальнасці. У яго ўжыванні існуе пэўная цяжкасць – нязводнасць складанаструктураванага арганізма да дакладных матэматычных формул. Аднак ужыванне гэтага метаду і прыняцце рашэнняў на аснове выяўлення матэматычна пэўных заканамернасцяў уяўляецца многім навукоўцам перспектыўным.

Ёсць яшчэ адна цяжкая праблема ў вывучэнні чалавечай культуры. Сутнасць яе ўпершыню выклаў нямецкі сацыёлаг і гісторык М. Вэбер у сваёй вядомай канцэпцыі "навук аб духу". Ён вылучыў два метады вывучэння і спасціжэння культуры – гэта "метад тлумачэння" і "метад разумення". У першым выпадку прамень пазнання накіраваны на выяўленне рацыянальным спосабам законаў, якія існуюць паміж з'явамі і працэсамі. У другім выпадку гаворка ідзе пра тое, што, напрыклад, напал рэвалюцыйных запалаў або пачуццё вялікай любові і наогул душэўнае жыццё немагчыма растлумачыць шляхам выяўлення "аб'ектыўных законаў". Тут спасціжэнне духоўна-псіхалагічных, эмацыйна-пачуццёвых з'яў магчыма на аснове "разумення" – ужывання, заглыблення, інтуіцыі, эмпатыі, суперажывання, любавання, спагады і г.д. У сувязі з абгрунтаваннем метаду разумення як спецыфічнага метаду гуманітарных і сацыяльных навук, М. Вэбер пісаў, што "вывучаючы сацыяльныя адукацыі (у адрозненне ад "арганізмаў"), мы здольныя выйсці за межы простага станаўлення функцыянальных сувязей і правілаў ("законаў") і даць тое, што зусім недаступна ўсім "прыродазнаўчым навукам"... Мы разумеем паводзіны асобных індывідаў, якія ўдзельнічаюць у падзеях, тады як паводзіны клетак мы "зразумець" не можам, а можам толькі спасцігнуць яго функцыянальна, а затым усталяваць правілы дадзенага працэсу". Відавочна, што многія бакі дзейнасці "жывых людзей" з іх складанымі псіхалагічнымі, душэўнымі з'явамі мы можам зразумець, схопліваючы іх сэнсы. Так што ў культуралагічных даследаваннях неабходны навуковы метад "тлумачэння" і, па прынцыпу дадатковасці, магчыма выкарыстанне "метаду разумення".

Акрамя пазначаных метадаў вывучэння феномена культуры выкарыстоўваюцца розныя прыватныя метады: кампанентны, марфалагічны, статыстычны, тэксталагічны і інш. Выбар тых ці іншых метадаў вывучэння культуры ў значнай меры вызначаецца асаблівасцямі канкрэтнага прадмета даследавання, а таксама яго мэтамі і задачамі.

На этапе выяўлення асаблівасцей пераасэнсавання структурных элементаў рэалістычнай сацыякультурнай парадыгмы (каштоўнасцей, сімвалаў і ідэалаў) магчыма выкарыстоўваць *гнасеалагічны метад*, заснаваны на разглядзе твора як адлюстравання рэчаіснасці. Пры ажыццяўленні дадзенага падыходу ўстанаўліваецца прадмет мастацкага адлюстравання (гістарычная эпоха, супярэчнасці грамадскага жыцця), што найбольшае уласціва для светапогляднага комплексу рэалістычнай сацыякультурнай парадыгмы.

Асноўным метадам, з дапамогай якога ажыццяўлялася ўзнаўленне сацыякультурнай сітуацыі пэўнага перыяду, з'яўляецца метад *гісторыка-культурнай рэканструкцыі*. Метадалагічная значнасць рэканструкцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага тэкста заключаецца ў магчымасці фарміравання цэласнага, маштабнага, вызваленага ад празмернай эмпірыка-апісальнай дэталізацыі погляда на беларускую культуру XIX ст., мадэлявання яе як структурна-функцыянальнай дынамічнай сістэмы, рэканструявання працэсаў па іх выніках.

З дапамогай метада *кампаратыўнага аналізу* мы выявілі адметнасць сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. у беларускай сацыякультурнай сітуацыі з параўнанні з агульнаеўрапейскай, выявілі нацыянальную адметнасць поліпарадыгмальнасці.

На этапе выяўлення парадыгмальнага зместу гісторыка-культурнага перыяда XIX ст. мы выкарыстоўвалі *генетычны метад*, які спрыяў даследаванню прычын і асноўнай мэты творчасці суб’ектаў культуры ў межах сумежных культурых парадыгмаў XIX ст., высвятленню тэндэнцый развіцця сацыякультурных працэсаў у тагачаснай Беларусі, пэўным чынам рэстаўраваў лагічную сувязь мінулага, сучаснага і будучыні ў светапоглядзе суб’ектаў культуры, што ўвасобілася ў аксіялагічным і сімвалічным напаўненні іх твораў.

Агульнанавуковы узровень даследавання прадстаўлены выкарыстаннем метада апісання, сістэматызацыі, метада аналогіі і абагульнення.

У межах аксіялагічнага падыходу намі быў выкарыстаны метад *катэгарыяльнага аналізу*, які дазваляе разгледзець катэгарыяльнае поле аксіясферы культуры з мэтай канкрэтызацыі ўзаемаадносін паняццяў “ідэал”, “каштоўнасць”.

У заключэнні агляду методыкі даследавання адзначым, што ўсе метады, выкарыстаныя даследаванні, знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі: яны дапаўняюць адзін аднаго, што спрыяе забеспячэнню аб’ектыўнасці і праўдзівасці даследчыцкага працэсу.

Літаратура


Иконникова, С.Н. История культурологических теорий: учебное пособие / С.Н.Иконникова. – Санкт-Петербург: Питер, 2005. – 473 с.: фот.

История культурологи / С.С.Наретина и др.; под ред. А.П.Огурцова. – М.: Гардарики, 2006. – 384.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013.— 352 с.

Смолік, А. І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэбна-метадычны комплекс / А.І. Смолік, Л.К. Кухто, С.Л. Шпарло; Мін-во культуры Рэспублікі Беларусь; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. –Мінск : БДУКМ, 2017. – 343 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма. Кірункі навуковых даследаванняў у галіне культуры (4 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Сістэматызацыя культурных з’яў па сутнасных прметах.
2. Праблема дзейнасці і адаптыўна-тэхналагічныя функцыі культуры.
3. Сацыялізацыя і інкультурацыя асобы.

*Мэта лекцыі:* паказаць разнастайнасць навуковых накірункаў даследавання феноменаў культуры ў замежнай і айчыннай культуралогіі.

**1. Сістэматызацыя культурных з’яў па сутнасных прметах**.

Прадметнай галіной культуралогіі з’яўляецца тэарэтычнае пазнанне феномена культуры, распрацоўка катэгарыяльнага апарату і метадаў даследавання. У сваю чаргу этымалогія дэфініцыі “культура” узыходзіць да часоў антычнасці. Слова cultura (лац.) тады адлюстроўвала меру ўдзелу чалавека ў асваенні прыроды. Да ХУІІ ст. такое разуменне культуры ўжывалася для вызначэння ўплыву чалавека на акаляючае асяроддзе, для выяўлення тых вынікаў, якіх дасягнуў чалавек у авалоданні яе сіламі.

Мысляры эпохі Асветніцтва тэрміну “культура” надаюць каштоўнасную афарбоўку. Культуролагі прытрымліваюцца думкі, што тэрмін “культура” у якасці самастойнага паняцця было ўпершыню ўжыта нямкцкім правзнаўцам, С.Пуфендорфам у ХУІІ ст. Ён лічыў культурай стан грамадства, супрацьлеглы натуральнаму (цывілізацыя). Культура, на яго думку, – усё тое, што існуе дзякуючы чалавеку і яго дзейнасці. Ж.-Ж.Русо разглядаў культуру як самастойную з’яву сацыяльнага жыцця, якая заслугоўвае і патрабуе навуковага даследавання. Так, Русо трактаваў культуру як нешта, што аддаляе чалавека ад натуральнай прыроды. Культура, на думку асветніка, -- асабліва ў форме навукі – вораг прыроды і ўсяго таго, што ёсць у чалавеку натуральнага, духоўнага, маральна прыгожага.

Найбольш глыбока ідэя культуры была распрацавана нямецкім асветнікам І.Г.Гердэрам (1744-1803). “Радавое жыццё” чалавецтва, па меркаванні Гердэра, заключаецца ў тым, што кожны асобны індывід мноствам нітак звязаны з іншымі людзьмі, залежыць ад іх. У сваёй працы “Идеи к философии истории человечества” [с 230 ] філосаф адзначае, што гэта сувязь выразна праяўляецца ў адукацыі і выхаванні. Названы працэс , які ўяўляе сабой як бы другое нараджэнне чалавека, і ёсць культура, лічыць І.Гердэр.Дзякуючы культуры, сцвярджае мысліцель, чалавек не выключацца з прыроды, а стварае яе вышэйшае і заключнае звяно. І.Гердер, які трактаваў культуру як ступень удасканалення чалавека і перш за ўсё ступень развіцця навук і асветы. У яго канцэпцыі па сутнасці культура разглядаецца як змест, характарыстыка сацыяльнага прагрэсу.

У канцэпцыях ХІХ ст. культура ўжо разглядаецца ў асноўным як духоўная сфера грамадскага жыцця, як каштоўнасны аспект духоўнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаючай чалавека. Напрыклад, І.Г.Фіхте звязваў культуру з духоўнымі характарыстыкамі: для яго культура – гэта незалежнасць і свабода духа. Вельмі шырокае разуменне культуры ў Э.Б.Тайлара. Ён разглядаў культуру як складанае цэлае, якое ўключае веды, вераванні, мастацтва, мараль, законы, звычаі, здольнасці і прывычкі, засвоенныя чалавекам як членам грамадства. К.Маркс пашырыў межы культуры. Ён уключыў у яе не толькі духоўныя, але і матэрыяльныя ўтварэнні, абгрунтаваў сувязь культуры з усімі сферамі сацыяльнага жыцця.

У ХХ ст. грамадская думка цалкам вызвалілася ад абмежаванага, вузкага разумення культуры, якое мела рамантычнае, суб'ектыўнае адценне. Рэфлексія перамясцілася ў сферу пазнання ўсяго свету створанай чалавекам "другой прыроды", выкарыстоўваючы ў гэтым пазнанні агульнапрынятыя ў навуцы метады. О.Шпеглер ужо уяўляў культуру як пэўную дынамічную сістэму. Асабліва важна, што ў сваёй працы "Заняпад Еўропы", ён культурную сутнасць сістэмы бачыў ва ўнутраным ладзе душы таго альбо іншага народа [ ]. Такім чынам, Шпенглер ствараў сваю канцэпцыю ў межах псіхалагічнай трактоўкі сутнасці культуры. З.Фрэйд, К.-Г.Юнг таксама лічылі, што ў рамках псіхалагічнай антрапалогіі адбываецца ўключэнне асобы ў культуру. А.Р.Рэдкліф-Браун і Б.Маліноўскі вылучылі ў прыродзе культуры яе дзейнасную сутнасць. Яны цалкам звязвалі культуру, яе функцыянаванне з задавальненнем дзейнасных патрэбнасцей. У гэты перыяд адбываецца асэнсаванне таго, што культура – такі змест грамадскага жыцця, які забяспечвае цэласнасць і жыццядзейнасць грамадства. М.Херсковіц выступае з тэорыяй культурнага рэлятывізму, у рамках якой фарміруецца ўяўленне аб тым, што ў аснове культуры знаходзіцца сістэма каштоўнасцей, якія вызначаюць адносіны "чалавек-свет".

Узбагачэнне тэорыі і гісторыі культуры ў ХХ ст. звязана з ідэямі герменэўтыкі, семіётыкі,структуралізма, фенаменалогіі, якія адначасова з'яўляюцца і навуковымі кірункамі, і метадалогіяй даследавання з'яў і працэсаў культуры. Дасягненні ў галіне фундаментальнай культуралогіі звязаны з такімі імёнамі замежнай думкі, як Р.Барт, М.Бахцін, Р.Бергсан, Р.Бенядзікт, М. Бярдзяеў, Г. Гадамер, Ж.Дэлёз, Ж.Дэрыда, А. Крёбер, Ю.Крысцева, М.Мід, Ю.Лотман, Д.Матсумота, Дж.Пірс, П.Сарокін, Ж.Сартр, П.Рыкёр, М.Фука, М.Хайдэгер, М.Шэлер, У.Эко, К.Юнг і інш. Такім чынам, сучасны культуралагічны дыскурс уяўляе сабой шырокі спектар аналіза культуры, прадстаўлены шматлікімі тэорыямі і канцэпцыямі. Больш таго, сёння культуролагі абапіраюцца і на ўласна культуралагічныя метады аналіза, якія выкарыстоўвюецца не толькі ў спецыялізаваных даследаваннях культуры, але і ў іншых галінах ведаў. Нельга не заўважыць у другой палове ХХ ст. значнай актывізацыі даследчай і навукова-метадычнай працы ў галіне культуралогіі ў Беларусі. Працы Я.М.Бабосава, Я.Д.Грыгаровіч, П.Р.Ігнатовіча, Ч.С.Кірвеля, М.І.Крукоўскага, М.А.Мажэйка, А.С. Майхровіча, А.І. Мальдзіса, І.В.Марозава, У.Ф.Мартынава, В.У.Пазнякова, У.П.Скараходава, А.І.Смоліка, Э.А.Усоўскай, Ю.В.Чарняўскай, І.М.Шумскай, І.Я.Шыршова, В.Р.Языковіча, Я.С.Яскевіч і іншых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раскрываюць тэарэтычныя асновы, сутнасць і марфалогію культуры. Абапіраючыся на тэарэтычную спадчыну айчынных мысляроў мінулых стагоддзяў сучасныя беларускія культуролагі даследуюць спецыфіку фарміравання нацыянальнай культуры, яе функцыянаванне ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў, якія адбываюцца ў XXI ст. У рамках беларускай культуралагічнай школы створана шэраг прац па гісторыі станаўлення і развіцця культурфіласофскай думкі на землях Беларусі. Сярод іх вылучаюцца манаграфіі У.М.Конана. Развіццё філасофскіх поглядаў у Беларусі ў эпоху Асветніцтва даследваў Э.К.Дарашэвіч. У прыватнасці яму належыць праца “Анёл Доўгірд – мысліцель эпохі Асветніцтва.” Пошуку беларускімі асветнікамі сэнсу быцця і чалавека прысвяціў сваё даследаванне А.С.Майхровіч. Пэўную каштоўнасць для культуролагаў мае праца “Культура Беларусі XI-XIX стст.” А.І.Смоліка, у якой шмат увагі надаецца поглядам мысляроў мінулых эпох на сутнасць і змест культуры. На жаль, айчыннымі культуролагамі да сённяшняга часу не створана комплексная праца, у якой з пазіцый сучасных дасягненняў у галіне культуралогіі быў бы прааналізаваны працэс станаўлення і развіцця імпліцытных і экспліцытных культуралагічных ведаў у Беларусі. У дадзенай манаграфіі робіцца першая спроба сістэмна прадставіць працэс фарміравання айчыннай гісторыі культуралогіі.

**2. Праблема дзейнасці і адаптыўна-тэхналагічныя функцыі культуры.**

Сучасны этап грамадскага развіцця характарызуецца дынамічнасцю і пераўтварэннем культурных кампанентаў штодзённай жыццядзейнасці людзей. Пры гэтым істотна змяняецца сутнасць сацыяльнай дзейнасці. Яна вызваляец-ца ад ідэалагізацыі, адміністравання, павярхоўна-павучальнага асветніцтва і набывае гуманістычны, агульначалавечы змест. У дзейнасці актуалізуюцца індывідуальныя асаблівасці чалавека, нацыянальная самабытнасць, аўтарскі пачатак.

Дынаміка функцыянальнага прызначэння культуры абумовіла пашырэнне традыцыйна прынятых формаў і спосабаў ажыццяўлення культурнай дзейнасці, змяніла змест гэтай дзейнасці: яна арыентуецца на рэалізацыю не толькі па-трэб адпачынку, але і агульнасацыяльных запатрабаванняў і інтарэсаў розных групнасельніцтва.

Культуролагіразглядаюцьпрынцыпдзейнасціякуласначалавечы,анепры-родны. Ён нараджаецца разнастайнымі формамі сацыяльнага жыцця і прадук-таў культуры. Універсальнасць гэтай катэгорыі дазваляе ўключаць у яе мэта-згодную вытворчую дзейнасць, накіраваную як на змяненне навакольнага ася-роддзя, так і на кампаненты паводзін, якія робяць магчымай вытворчасць або выступаюць як формы, адцягненыя ад вытворчасці. Культуролагамі і сацыёлагамі вылучаюцца самыя разнастайныя віды дзейнасці, кожны з якіх можа быць ахарактарызаваны з улікам мэты, бюджэту часу, сацыяльнай накіраванасці і інш. На сацыяльныя і культурныя аспекты дзейнасці звяртаюць увагу А.М.Лявонцьеў, Э.Г.Юдзін, В.М.Лаўрыненка,М.А.Нартаў, Б.А.Шабана-ва, Г.С. Лукашова. Яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падкрэсліваюць, што нельга разглядаць культуру толькі як пазавытворчую дзейнасць, гэта значыць зводзіць яе да таго, чым чалавек займаеццапасляпрацы.

Разам з тым нельга распыляць культуру па ўсіх напрамках дзейнасці чалавека. Так, расійскі культуролаг М.С.Каган, даючы сістэмнае апісанне культу-ры, уключае ў яе ўсю чалавечую дзейнасць і ўсё, што ўзнікае ў ёй, - прадукты, сацыяльныя якасці чалавека і інш. Пры такім поглядзе спецыфіка культуры губляецца, і да ліку культурных феноменаў, па сутнасці, адносіцца ўсё, што ёсць у грамадстве. А гэта вядзе да таго, што мяжа паміж паняццямі “культура" і “грамадства" размываецца, розніца паміж імі становіцца хісткай. Культуролагі К.М.Харужанка, Б.С.Ерасаў налічваюць больш за сто відаў дзейнасці.

Прыкладнаякультуралогіязаймаеодааналізамагульнай структуры дзейнасці і вызначэннем месца ў ёй культурных фактараў. У сваёй сукупнасці грамадства неабходна разглядаць як усёабдымную суперсістэму, якая складаецца з узаемазвязаных, але ўсё ж самастойных сістэм (або сфер) дзейнасці: эканоміка-гаспадарчай, сацыяльнай, духоўнай і палітычнай. Кожная з іх, таксама як і грамадства ў цэлым, мае свае характарыстыкі і механізмы, структуры, функцыі, інстытутыііінш.

Эканоміка-гаспадарчая сістэма, напрыклад, забяспечвае матэрыяльную жыццядзейнасць грамадства, сацыяльная - структуру адносін паміж рознымі групамі і слаямі. Палітычная сістэма ўяўляе механізм рэалізацыі ўлады, волі і інтарэсаў састаўных элементаў грамадства і яго сукупнасці. Духоўная сістэма ўзнаўляе нарматыўна-каштоўнасныя, інфармацыйныя і камунікатыўныя кампаненты сацыяльнай рэгуляцыі.

Распрацоўка тэарэтычных поглядаў на культуру ў сучасных умовах ідзе па двух асноўных кірунках. Прадстаўнікі аднаго з іх, адаптацыянізму, разглядаюць культуру як спецыфічны спосаб узаемадзеяння чалавека з навакольным асяроддзем. Цэнтральнае месца тут у тлумачэнні культурных з'яў адводзіцца паняццю дзейнасці. У рэчышчы гэтага кірунку развіваецца функцыянальная канцэпцыя культуры, дзе культура разглядаецца як сістэма спосабаў задавальнення патрэбнасцей.Прыхільнікідругогакірункуразумеюцькультуруякгаліну ідэальнага, што ўключае духоўную творчасць чалавека. У выніку зместам культуры, яе вызначальным і ўтваральным пачаткам яны лічаць толькі пэўную абмежаваную сферу духоўнай творчасці, галоўным чынам навуку і мастацтва. Менавіта тут ствараюцца сімвалы, ідэі, каштоўнасці, у святле якіх людзі ўспрымаюць і разумеюць рэчаіснасць і будуюць сваё жыццё.

Найбольш грунтоўна дзейнасць прааналізавана прадстаўнікамі інфармацыйна-семіятычнагападыходу да культуры. Э.Касірэр, Ю.М.Лотман, Х.Г.Гадамер,А.Моль і іншыя прытрымліваюцца, што ў культуры ўвасабляюцца сродкі, спосабы і вынікі чалавечай дзейнасці. Імі паказана адрозненне ўласна чалавечай, разумнай дзейнасці ад біялагічных паводзін жывёлы. Чалавечая дзейнасць характарызуецца свядомай пастаноў-кай мэты. Менавіта ў каштоўнаснай і асэнсаванай сферах культуры фіксуюцца мэты, перспектывы і праекты чалавечай дзейнасці. Функцыя мэтамеркавання ўласцівая як культуры, так і палітычнай сістэме. Характар мэтамеркавання за-лежыць ад узроўню культуры. Вылучаюць узроўні высокі, спецыялізаваны і звычайны. Культура высокага ўзроўню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уключае агульназначныя шкаштоўнасці, далучэнне да якіх патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі і падтрыманне якіх забяспечваецца асобнымі сацыяльнымі інстытутамі. Праз высокую культуру гэтага ўзроў ню фарміруецца духоўны свет асобы, соцыуму, нацыі, цывілізацыі, гэтая куль-тура дапамагае людзям надаваць сэнс не толькі словам і рэчам, але і сваім паводзінам. Мы маем на ўвазе як асобныя ўчынкі, так і жыццё ў цэлым.

Розніца паміж спецыялізаваным і звычайным узроўнямі культуры ў знач-най ступені выяўляецца пры разглядзе таго значэння, якое надаецца на кож-ным узроўні прынцыпу рацыянальнасці і яго суадносінам з каштоўнасцямі і мэтавымі арыентацыямі. Паняцце рацыянальнасці ўведзена ў культуралогію М. Вэберам і выкарыстоўваецца для абазначэння не гнасеалагічнага падзелу разумнага і стыхійнага, а накіраванасці чалавечых дзеянняў як працэсу пасля-доўнага ўладкавання і падтрымання пераемнасці ў дасягненні тых ці і ншых каштоўнасцей і мэт. Рацыяналізацыя прадугледжвае высвятленне суадносін *мэта -план абомэта -сродак,* каб сканцэнтраваць намаганні на дасягненні пастаўленай мэты пры разумным выкарыстанні магчымых сродкаў на аснове ўнутранага ўзгаднення этапаў, уліку магчымых вынікаў, вызначэння парадку выбару канчатковых і прамежкавых мэт. Таму ў дзейнасці пастаянна адбыва-ецца перамяшчэнне ўвагі ад мэты да сродкаў. 3 цягам часу ва ўсёй сферы дзейнасці стварэнне і ўдасканаленне яе сродкаў становяцца асобнай самастой-най мэтай, і работа, накіраваная на гэтую мэту, адасабляецца ў самастойную галінудзейнасці.

Такім чынам, духоўная дзейнасць, без якой немагчымае існаванне культу-ры, узнікае як сродак, што садзейнічае ўдасканаленню практычнай дзейнасці па вытворчасці матэрыяльных даброт. Але з развіццём грамадства яна ператва-раецца ў самастойную галіну дзейнасці, што параджае такія сферы культуры, якмастацтва,рэлігія,навука.

Абагульненне назапашанага ў культуралогіі тэарэтычнага і практычнага матэрыялу дазваляе разглядаць дзейнасць як мэтанакіраваную, структураваную, рацыянальна асэнсаваную актыўнасць суб’екта, у працэсе якой адбыва-ецца развіццё чалавека і грамадства.

Для асэнсавання сутнасці культурнай дзейнасці пэўную каштоўнасць уяў-ляе агульная тэорыя дзейнасці, заснавальнікам якой быў Т.Парсанс, адзін з га-лоўных прадстаўнікоў структурна-функцыянальнага аналізу ў сацыялогіі. Па-водле Т.Парсанса, духоўныя і матэрыяльныя здабыткі людзей з’яўляюцца вынікам грамадска абумоўленых дзеянняў на ўзроўні дзвюх сістэм: сацыяль-най і ўласна культурнай. У рамках гэтай тэорыі ў структуры дзейнасці вылучаюцца дзеяч і сітуацыя. У аснове сацыяльнай сістэмы знаходзяцца сумесныя дзеянні людзей, якія абумоўлены мэтамі і х біялагічнага самазахавання ва ўмовах пэўнага грамадскага асяроддзя. Тут адносіны паміж дзеячам і сітуацыяй уключаюць: а) адаптацыйную арыентацыю, якая патрабуе вылучэння з навакольнага асяроддзя асобных аб’ектаў, іх абазначэння па якасцях, месцы і інш.; б) мэтамеркаванне як імкненне да дасягнення значымых патрэбнасцей; в) ацэначную арыентацыю, якая мае на мэце ўстанаўленне становучага ці адмоўнага значэння аб’ектаў з пункту гледжання чалавечых патрэбнасцей; г) узаемадзеянне сацыяльных суб’ектаў, зняцце напружанасці паміж рознымі групамі, падтрыманне дыферэнцыяцыі і стабільнасці

грамадства.

У другой сістэме, уласна культурнай, пазбаўленай біялагічнай абумоўленасці, культура выступае як складаная сістэма сімвалаў і нормаў, якія пастаянна змяняюцца, удасканальваюцца людзьмі.

Культура забяспечвае адаптацыю чалавека да навакольнага асяроддзя. Слова «адаптацыя» азначае прыстасаванне. Кожны від жывых істот адаптуецца да асяродку свайго існавання. Але адаптацыя чалавека праходзіць інакш. У прыродзе жывыя арганізмы прыстасоўваюцца да асяроддзя, г.зн. змяняюцца ў ад-паведнасці з дадзенымі ўмовамі свайго існавання. Чалавек жа прыстасоўвае асяроддзе да сябе, змяняе яго ў адпаведнасці са сваімі патрэбамі. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва людзям даводзілася ад нечага абараняцца: ад холаду і спёкі, дажджу і снегу, ветру і пылу, ад мноства небяспечных ворагаў. Развіццё культуры дало людзям абарону, якой не надзяліла іх прырода: магчымасць ствараць і выкарыстоўваць адзенне, жыллё, зброю, лекі, разнастайныя прадукты харчавання. Біялагічная незавершанасць, непрыстасаванасцьродучалавечага да вызначанай экалагічнай нішы абярнулася здольнасцю засвойваць любыя прыродныя ўмовы не за кошт змен біялагічных відавых прымет, а пшяхам фар-міравання«абароннага слою» штучных умоў існавання.Чалавек застаецца тым жа самым у розных прыродных умовах, але ўзнікае разнастайнасць яго «абаронных слаёў» - формаў культуры. Асаблівасці культуры абумоўлены прыроднымі ўмовамі жыцця этнасу.

Многія культурныя традыцыі маюць пад сабой рацыянальную абумоўленасць, звязаную з якім-небудзь карысным прыстасавальніцкім эфектам.

Развіццё культуры з цягам часу ўсё больш забяспечвае людзям бяспеку і камфорт: узрастае эфектыўнасць працы, вынаходзіцца масса рэчаў, сродкаў, з дапамогай якіх можна палегчыць і палепшыць жыццё і інш. Перамагаюцца хваробы, якія абвяргалі людзей на пакуты і смерць: чума, воспа, халера, сухо-ты і інш. Усё гэта вядзе да павелічэння працягласці жыцця і росту насельніцтва Зямлі. Аднакразамзтымкультурнаяэвалюцыянараджае новыяпагрозы для чалавецтва. Чым вышэй становіцца абароненасць людзей ад прыроднай небяс пекі, тым ясней выяўляецца, што галоўным ворагам чалавека з'яўляецца... ён сам. Войны, рэлігійныя разлады, зверствы і гвалт, злачынствы над нявіннымі ахвярамі - гэта абаротны бок культурнага прагрэсу.

Памяншаючы залежнасць ад сіл прыроды, людзі трапляюць у залежнасць ад сіл культуры. Таму будучыня чалавецтва цалкам вызначаецца тым, як і ў якім кірунку будзе яно развіваць сваю культуру.

Чалавеку ў працэсе жыццядзейнасці даводзіцца прыстасоўвацца не толькі да змен навакольнага асяроддзя. Ён вымушаны праходзіць праз сацыяльную адаптацыю, г.зн. узаемадзейнічаць з сацыяльным асяроддзем. Сацыяльная адап-тацыя характарызуецца прыстасаваннем да новых умоў жыцця, выпрацоўкай і актуалізацыяй такіх якасцей, што забяспечваюць выжыванне, зменай фактараў асяроддзя для найболын поўнага авалодання імі, пераглядам уласных да-маганняў і самаацэнак рэальных умоў і суб'ектыўных магчымасцей, пераадо-леннем існуючых стэрэатыпаў, звычак, інерцыі мыслення.

Адаптацыя цесна звязана з асваеннем і прыняццем (інтэрыярызацыяй) індывідам нормаў і каштоўнасцей таго грамадства, да якога ён належыць, у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыялізацыі.

Чалавек здольны не толькі прыстасоўвацца, але і актыўна ўздзейнічаць на новыя ўмовы і абставіны, кантраляваць і рэгуляваць іх з дапамогай культуры. З гэтай мэтай чалавеку патрэбна прыстасавацца да патрабаванняў канкрэтнай культуры, усяго грамадства. Адным з найбольш важных момантаў адаптацыі з'яўляецца ўзгадненне ўласных поглядаў, стэрэатыпаў паводзін з рэальнымі магчымасцямі навакольнага фізічнага і культурнага асяроддзя. Адаптацыя па сваім змесце падобная да сацыялізацыі, аднак калі апошняя працягваецца прак-тычна ўсё жыццё, то адаптацыя можа мець лакальны маштаб і адбывацца ў кароткіятэрміны.

### 3. Сацыялізацыя і інкультурацыя асобы.

Уваходжанне чалавека ў культуру не заканчваецца з дасягненнем ім паўна-лецця. Фарміраванне сацыяльных якасцей, уласцівасцей, каштоўнасцей, ведаў і ўменняў, засваенне нормаў, правіл, узораў, установак, паводзін, дзякуючы якім чалавек становіцца дзеяздольным удзельнікам сацыяльных сувязей, інстытутаў і супольнасцей, працягваецца ў далейшы перыяд. *Сацыялізацыя* - бесперапынны працэс. Яна прадугледжвае як авалоданне навыкамі, уменнямі, ве-дамі, звязанымі з прыроднымі аб'ектамі, так і фарміраванне каштоўнасцей, ідэ-алаў, нормаў і прынцыпаў сацыяльных паводзін. Разгорнутую сацыялагічную тэорыю, якая апісвае працэсы агульнапрынятых нормаў інтэграцыі індывіда ў сацыяльную сістэму, распрацаваў амерыканскі сацыёлаг Т.Парсанс. Па сцвяр-джэнні вучонага, інстытуты сацыялізацыі, уключаючы сям'ю, школу і іншыя, выконваюць функцыю ўзнаўлення сацыяльнай структуры.

Тэрмін "сацыялізацыя" з'явіўся ў 30-я гг. XIX ст.; у 1956 г. ён быўупершы-ню ўнесеныўрэестр Амерыканскайсацыялагічнай асацыяцыі, а ў 60-70-я гг. міну-лага стагоддзя прыняты на ўзбраенне вучонымі і практыкамі нашай краіны.

*Сацыялізацыя (ад лац. sociaiis - грамадскі) - гэта працэс і вынік уклю-чэння чалавекаў пэўны соцыум, асваенне іўзнаўленне ім сацыяльнага вопыту, прыняцце патрабаванняў, нормаў і прынцыпаў грамадскіх адносін, фарміра-ванне ірэалізацыя дэтэрмінаваных грамадствам грамадзянскіх, маральных, прафесійных, грамадскіх, сямейных і іншых сацыяльна значных функцый.*

Сацыялізацыя ўяўляе сабой складаны, шматгранны працэс уключэння ча-лавека ў сацыяльную практыку, набыцця ім сацыяльных якасцей, рыс, засваен-ня культурнага вопыту і рэалізацыі ўласнай сутнасці праз выкананне пэўнай ролі ў практычнай дзейнасці. Толькі ў розных відах дзейнасці: эканамічнай, грамадска-палітычнай, культурнай, педагагічнай і іншых, - выконваючы пэў-ную сацыяльную ролю, чалавек фарміруецца як творца матэрыяльных і духоў-ных каштоўнасцей, актыўны суб'ект сацыяльных адносін - пазнавальных, практычных, камунікатыўных і інш. Яго сацыяльная актыўнасць пры гэтым разглядаецца як сацыяльная якасць, а яе рэалізацыя ў сацыяльнай практыцы - як функцыя. Без уключанасці чалавека ў той ці іншы від дзейнасці сумесна з другімі людзьмі працэс сацыялізацыі, фарміравання асобы немагчымы.

У ходзе сацыялізацыі культура сродкамі выхавання і адукацыі перадаецца ад пакалення да пакалення, а таксама шляхам сацыяльнага ўзаемадзеяння інды-віда з яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акружэннем (перш за ўсё “малымі групамі”, у практыку жыццядзей-насціякіхёнуключаны).

Сацыялізацыя праяўляе свае асаблівасці ў кожнай культуры, у кожную гіста-рычную эпоху. Змяняюцца спосабы, прыёмы і формы сацыялізацыі, абнаўля-юцца і набываюць новыя фарбы ўзаемаадносіны тых, хто ўдзельнічае ў гру-пах, але захоўваюцца асновы культурнай спадчыны ў працэсе агульнакультур-нага і псіхалагічнага развіцця, у ходзе сацыяльнага станаўлення маладога па-калення ва ўсіх грамадствах.

Для раскрыцця і разумення сутнасці сацыялізацыі і механізмаў яе ажыц-цяўлення прынцыповае значэнне мае прынятая грамадствам мадэль асваення культурнай спадчыны. У філасофіі эпохі Асветніцтва традыцыйнай мадэллю служыла локаўскае ўяўленне пра чалавека, як пра “чысты ліст”, які, быццам мяккі воск, адлюстроўвае ўздзеянне асяроддзя. Другая мадэль узнікла ў рам-ках біхевіярысцкай псіхалогіі, згодна з якой чалавек актыўна імкнецца да зада-вальнення сваіх прыродных біялагічных запатрабаванняў. Пры ўзаемадзеянні з грамадскім асяроддзем ён аднабакова рэагуе на яго і змяняецца такім чынам, каб дасягнуць максімальнага задавальнення. Біхевіярыстамі сацыялізацыя ра-зумеецца як прыстасаванне, адаптацыя індывідуальнага арганізма да асярод-дзя. Трэцяя мадэль акцэнтуе значэнне прыродных механізмаў паводзін. Ася-роддзе служыць пры гэтым толькі стымулам дзейнасці.

Аналіз спецыфікі сацыялізацыі, прынятыў розных грмадствах і краінах, сведчыць аб тым, што розныя мадэлі індывідуальнага развіцця адрозніваюцца адна ад адной па той ролі, якую яны прыпісваюць знешнім і ўнутраным умо-вам, прыроджаным праграмам ці набытаму вопыту, біялагічным імкненням і культурным мэтам, творчай дзейнасці і адаптацыі ў асяроддзі.

Так, у канцы XIX - пачатку XX ст. даследаванні сацыялізацыі канцэнтра-валіся вакол спрэчкі аб ролі спадчыннасці ў фарміраванні паводзін. Макдаў-гал, Гезеля, Піяжэ адстойвалі тэзіс аб дамінуючай ролі спадчыннасці; Болдуін і Мід сцвярджалі, што ўздзеянне на фарміраванне паводзін аказвае асяроддзе. Найболын моцны штуршок развіццю даследаванняў сацыялізацыі і дзяцінства далі тэорыі Фрэйда аб вызначальнай ролі сям’і.

Працэс сацыялізацыі праходзіць фазы, якія яшчэ называюць стадыямі жыц-цёвагацыклачалавека: дзяцінства, юнацтва, сталасць, старасць.

Выхаванне - састаўная частка сацыялізацыі, яна ўяўляе сабой мэтанакіра-ваную перадачу этычных нормаў і правіл паводзін старэйшым пакаленнем ма-лодшаму. Сутнасць выхавання - маральнае ўдасканаленне чалавека.

Важнейшым інстытутам сацыялізацыі з’яўляецца школа. Школа дае дзе-цям сістэматычную адукацыю, рыхтуе да працоўнага жыцця і ўдзелу ў палі-тычных працэсах. Мэта адукацыі - даць маладому пакаленню сістэматычныя веды ў асноўных сферах чалавечай дзейнасці: фізіцы, матэматыцы, літарату-ры, мове, гісторыі і інш. Сацыялізуючая функцыя школы выяўляецца яшчэ і ў тым, што дзеці вучацца сацыяльным нормам і ролям, якія ім давядзецца вы-конваць у жыцці. Акрамя школы, да інстытутаў сацыялізацыі адносяцца ўсе ўстановы, якія ўплываюць на працэс станаўлення асобы (сярэднія спецыяль-ныя навучальныя установы, ВНУ, установы павышэння кваліфікацыі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак сацыялізацыю нельга зводзіць толькі да адукацыі і выхавання. Сацыялізацыя асобы здзяйсняецца пад уплывам сукупнасці ўмоў як сацыяльна кантралюемых і накіравана арганізуемых, так і стыхійных, узніклых спантан-на. Яна атрыбут ладу жыцця і можа разглядацца як умова і як вынік. Абавязко-вымі ўмовамі сацыялізацыі з’яўляюцца культурная самаактуалізацыя асобы, яе актыўная работа над сваім сацыяльным удасканаленнем. Якімі б спрыяль нымі ні былі ўмовы сацыялізацыі, яе вынікі ў значнай ступені залежаць ад актыўнасцісамойасобы.

Такім чынам, сацыялізацыя - працэс увядзення чалавека ў сістэму сацыяльнага функцыянавання грамадства: у падзел працы і функцый, у нормы палітычнай лаяльнасці існуючаму парадку і сацыяльнай адэкватнасці як члена соцыуму, у сістэму падзелу і выканання разнастайных сацыяльных роляў, у коды і мовы сацыяльнай камунікацыі; гэта працэс засваення ведаў, уменняў і навыкаў якой-небудзь спецыяльнасці і інш. У канчатковым выніку грамадства зацікаўлена ў тым, каб індывід ператварыўся ў сацыяльна канкурэнтаздоль-ную і мабільную асобу, якая праяўляе неабходную ініцыятыву і дасягае поспе-ху на грамадскім рынку падзелу працы, займае пэўную сацыяльную нішу, мае больш ці менш здавальняючыя яе сацыяльныя прэтэнзіі і амбіцыі, якія не супярэчаць інтарэсам грамадства. Канечны працэс сацыялізацыі - асоба.

ными ні былі ўмовы сацыялізацыі, яе вынікі ў значнай ступені залежаць ад актыўнасцісамойасобы.

Такім чынам, сацыялізацыя - працэс увядзення чалавека ў сістэму сацыяльнага функцыянавання грамадства: у падзел працы і функцый, у нормы палітычнай лаяльнасці існуючаму парадку і сацыяльнай адэкватнасці як члена соцыуму, у сістэму падзелу і выканання разнастайных сацыяльных роляў, у коды і мовы сацыяльнай камунікацыі; гэта працэс засваення ведаў, уменняў і навыкаў якой-небудзь спецыяльнасці і інш. У канчатковым выніку грамадства зацікаўлена ў тым, каб індывід ператварыўся ў сацыяльна канкурэнтаздоль-ную і мабільную асобу, якая праяўляе неабходную ініцыятыву і дасягае поспе-ху на грамадскім рынку падзелу працы, займае пэўную сацыяльную нішу, мае болын ці менш здавальняючыя яе сацыяльныя прэтэнзіі і амбіцыі, якія не су-пярэчаць інтарэсам грамадства. Канечны працэс сацыялізацыі - асоба.

Фарміраванне асобы адбываецца ў працэсе ўзаемаабмену паміж чалавекам і культурай, пры якіх, з аднаго боку, культура вызначае асноўныя рысы чалаве-ка, а з другога боку - чалавек сам уплывае на культуру. Працэс і вынік засва-ення традыцый, звычаяў і каштоўнасцей роднай культуры, вывучэнне і перада-ча культуры ад аднаго пакалення да другога прынята называць інкультурацы-яй. Тэрмін “інкультурацыя” ўведзены амерыканскім антраполагам М.Херсков-іцам у кнізе “Чалавек і яго праца. Навука культурнай антрапалогіі” (1948). Па-няцце “інкультурацыя” да сённяшняга часу застаецца дыскусійным у культура-логіі. Так, М.МІд пад інкультурацыяй разумее рэальны працэс навучання, які адбываецца ў спецыфічнай культуры. Д .Матсумота лічыць сацыялізацыяй пра-цэсы і механізмы, з дапамогай якіх людзі пазнаюць сацыяльныя і культурныя нормы, а інкультурацыяй - прадукты працэсу сацыялізацыі. Нягледзячы на некаторыяразыходжанні, болынасць даследчыкаўпрыходзяць давысновы, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыялізацыя болын універсальная, а інкультурацыя - культурна-спецыфіч-ная. І, безумоўна, працэсы інкультурацыі і сацыялізацыі непарыўна звязаны адзін з адным. У працэсе інкультурацыі чалавек засвойвае традыцыйныя фор-мы мыслення і дзеянняў, характэрныя для той культуры, да якой ён належыць. У адрозненне ад сацыялізацыі канечным вынікам інкультурацыі з’яўляецца інтэлігент. Паняцце “інкультурацыя” прымяняецца як да засваення культурных нормаў дзецьмі, так і дарослымі. Працэс інкультурацыі можа працягвацца не толькі некалькі гадоў, але і ўсё жыцце чалавека.

Інкультурацыя азначае навучанне чалавека традыцыям і нормам паводзін у канкрэтнай культуры. Так, адаптацыя да сацыяльнага парадку жыцця ў чужой краіне адбываецца хутчэй, чым інкультурацыя - засваенне чужых традыцый, звычаяў, ладу жыцця. Вынікам інкультурацыі з’яўляецца эмацыянальнае і па-водзінскае падабенства чалавека з іншымі членамі дадзенай культуры і яго ад розненне ад прадстаўнікоў іншых культур. Па сваім характары працэс інкультурацыі болын складаны, чым працэс сацыялізацыі. Справа ў тым, што засва-еннесацыяльныхзаконаўжыццяадбываеццазначнахутчэй,чымзасваеннекуль-турных нормаў, каштоўнасцей, традыцый і звычаяў.

На індывідуальным узроўні працэс інкультурацыі выяўляецца ў паўсядзён-ных зносінах са сваякамі, сябрамі, знаёмымі ці незнаёмымі прадстаўнікамі адной культуры, у якіх свядома ці несвядома чалавек вучыцца таму, як неаб-ходна весці сябе ў разнастайных жыццёвых сітуацыях, як ацэньваць падзеі, сустракаць гасцей, рэагаваць на тыя ці іншыя знакі ўвагі і сігналы.

*Спосабы перадачы культурнай інфармацыі.* Чалавеку на працягу жыцця даводзіцца засвойваць мноства сацыяльных роляў, кожная з якіх утрымлівае культурныя нормы, правілы, стэрэатыпы паводзін. Паслядоўная змена цыклаў развіцця культуры ў межах аднаго народа ці краіны павінна адбывацца такім чынам, каб ад пакалення да пакалення перадаваліся базісныя элементы культу-ры, а відазмяняліся толькі другасныя. У адваротным выпадку адбываецца раз-рыў культурнага ланцуга. Часцей гэта бывае ў тых выпадках, калі радыкальна і нечакана мяняецца вобраз жыцця носьбітаў культуры (культуртрэгераў), якія выступаюць у ролі настаўнікаў і вучняў. Дзякуючы культурнай трансмісіі кож-нае наступнае пакаленне атрымлівае магчымасць пачынаць з таго, на чым спы-нілася папярэдняе. Маладое пакаленне дадае новыя веды да ўжо назапашаных.

Працэс перадачы культурнай інфармацыі ажыццяўляецца трыма спосабамі:

- вертыкальная трансмісія, у ходзе якой сацыякультурная інфармацыя перадаецца ад бацькоў да дзяцей;
- гарызантальная трансмісія, пры якой засваенне культурнага вопыту адбываецца пры зносінах з аднагодкамі;
- непрамая трансмісія, пры якой індывід навучаецца ад сваякоў, суседзяў, настаўнікаў.

У працэсе інкультурацыі ўдзельнічае вялікая колькасць людзей, сацыяльных груп, грамадскіх інстытутаў, яны называюцца *інстытутамі інкультурацыі.* У залежнасці ад функцый, якія яны выконваюць, іх падзяляюць нанекалькігруп:

- апекуны - здзяйсняюць догляд за дзіцем, задавальняюць яго фізічныя і эмацыянальныя патрэбы;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

• аўтарытэты - перадаюць культурныя нормы на ўласным прыкладзе;

• дысцыплінатары-размяркоўваюць пакаранні;

• выхавальнікі - навучаюць дзіця ў інстытутах інкультурацыі;

• кампаньёны - займаюць роўнае становішча з дзіцем, удзельнічаюць у сумеснай з ім дзейнасці.

Гэтыя функцыі ажыццяўляюцца наступнымі агентамі інкультурацыі:

• сям'ёй - у любой культуры яна з'яўляецца асноўнай ячэйкай, у якой адбываецца інкультурацыя;

• групай людзей аднагоўзросту менавіта пры кантакце з аднагодкамі дзеці спасцігаюць, што такое раўнапраўныя зносіны і падпарадкаванне;

• школай - яна дае не толькі адукацыю, але і знаёміць дзіця з правіламі школьнага жыцця, роляй настаўніка;

• СМІ - газеты, часопісы, перыядычныя выданні, радыё, тэлебачанне ўсё больш уплываюць на інкультурацыю, яны знаёмяць індывіда з вялікім аб'ёмам інфармацыі, на якую арыентуецца чалавек у сваім жыцці спасцігаюць, што такое раўнапраўныя зносіны і падпарадкаванне;

• школай - яна дае не толькі адукацыю, але і знаёміць дзіця з правіламі школьнага жыцця, роляй настаўніка;

• СМІ - газеты, часопісы, перыядычныя выданні, радыё, тэлебачанне ўсё больш уплываюць на інкультурацыю, яны знаёмяць індывіда з вялікім аб'ёмам інфармацыі, на якую арыентуецца чалавек у сваім жыцці.

## Літаратура

Бабосов, Е. М. Структурные модели адаптации индивидов в трансформирующемся обществе / Е.М.Бабосов // Социология. — Мн.: Изд-во БГУ, 1999.— №4.— С.18—28.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. / Крукоўскі, М.І. Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Можейко, М.А. Порядок дискурса / М.А. Можейко // Новейший философский словарь: 2-е изд., переработ. и дополн. – Мінск: Интерпрессервис; Книжный дом, 2001. – С. 771 – 774.

Смолік, А.І. Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А.І.Смолік; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 275 с.

Смолік, А.І. Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі: вучэб.-метад. дапам. /А.І.Смолік, Л.К.Кухто; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 236 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма. Трансфармацыя культуралагічных ведаў (2 гадзіны)

*План лекцыі:*

1. Міфалагічныя ўяўленні аб культуры.
2. Тыпы і функцыі міфаў.
3. Паглыбленне разумення культуры ў антычнасці

*Мэта лекцыі:* паказаць эвалюцыю ўспрымання этымалогіі канцэпту “культура”, яго сутнасці і зместу на ранніх этапах культурагенэзу.

### 1. Міфалагічныя ўяўленні аб культуры.

У сучаснай культуралогіі міф не разглядаецца як нешта мінулае, уласцівае толькі архаічнай культуры. Ён, адзначаюць даследчыкі, з’яўляецца гістарычна першай формай культуры. Большасцю культуролагаў міф вызначаецца як спосаб чалавечага быцця і све-таадчування, цалкам заснаваны на пародненасці ча-лавека са светам. Чалавек успрымае псіхалагічныя сэнсы ў якасці першасных якасцей рэчаў, разглядае і ўспрымае з’явы прыроды як жывыя істоты. З пункту гледжання Э.Фрома, міф ёсць не што іншае, як пра-екцыя душы чалавека ў знешняе асяроддзе.

Такім чынам, *міф - гэта абагульненае адлюстраванне рэчаіснасці ў выглядзе пачуццёвых уяў-ленняў ці, дакладней, у фантастычным выглядзе тых або іншых адухоўленых істот.* Міфы існуюць у форме архаічных паданняў пра жыццё багоў і ге-рояў, розныхдухаў. Раздзяляюцца на касмалагічныя (апісанне стварэння свету, людзей), антрапаганічныя (пра паходжанне людзей), каляндарныя (пра памерлых і ўваскрэслых багоў, герояў), эсхаталагічныя (ап-ісанне будучай пагібелі Сусвету). У іх падаюцца пад-зеі далёкага ці блізкага мінулага. Міфалагічныя сюжэты звычайна будуюцца на супрацьпастаўленні апазіцыйныхзначэнняў.

Антычная культура на працягу ўсяго часу свайго існавання заставалася ў абдымках ***міфалогіі***. Больш за тое, яна ўвабрала і перапрацавала племянныя міфы, зліла іх у адзіную рэлігійна-міфалагічную сістэму. Ужо ў VIII – VII ст. да н.э. у паэмах Гамера “Іліяда” і “Адысея” і Гесіода “Тэагонія” гэта сістэма набывае той від, у якім яна становіцца асновай усяго антычнага светапогляду.

Міфы злучалі старажытных грэкаў і рымлян з культурай продкаў. Адносіны да іх былі прасякнуты асаблівай верай. Так, грэкі захоўвалі прадметы, помнікі, гістарычныя месцы, звязаныя з міфамі і якія даказвалі верагоднасць. Міфы аб’ядноўвалі ў сабе прадукты народнай творчасці і фантазію, стваралі цэласную карціну свету, у якім усё мела сваё значэнне, месца і тлумачэнне. У адпаведнасці з міфічнымі ўяўленнямі грэкаў Зеўс лічыўся бацькам багоў і людзей; у яго гонар было пабудавана мноства храмаў. Культ Зеўса быў распаўсюджаны практычна ва ўсіх грэчаскіх гарадах-дзяржавах. Яго вернай жонкай і адначасова сястрой была багіня Гера – уладарка Алімпа, царыца багоў. Яна з’яўлялася ахоўніцай шлюбу, благаслаўляла ўсіх маці на нараджэнне дзіцяці.

Пасяйдон, брат Зеўса, быў уладаром мора, які жыў у раскошным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падводным палацы, ездзіў на залатой калясніцы з белымі конямі. Лічылася, што Пасяйдон па сваёй волі можа выклікаць землятрусы. Другі родны брат Зеўса – Аід – з'яўляўся ўладаром падземнага царства памерлых. Яму належалі шматлікія падземныя багацці – найперш каштоўныя камяні і металы. У адрозненне ад іншых багоў ён не жыў на Алімпе, а праводзіў увесь час у царстве ценяў чалавечых душ.

Гесція была багіняй хатняга ачага, ахоўніцай агню. У кожным грэчаскім горадзе і сям'і стаялі спецыяльныя алтары ў яе гонар. Пяшчотная і чыстая, яна заўсёды стаяла ў баку ад спрэчак іншых багоў.

Дэметра была багіняй урадлівасці і земляробства. Яе называлі "маці хлеба", "абаронца ўраджаю". Сімваламі Дэметры былі ячменны або пшанічны колас.

Гефест быў богам агню і кавальскай справы. У сваёй кузні пад гарой ён зрабіў залаты трон і шчыт для сваіх бацькоў Зеўса і Геры. Быў найлепшым майстрам кавальскай справы; найбольш шанаваўся ў асяродку грэчаскіх рамеснікаў.

Афрадыта – багіня кахання і прыгажосці. Яна з'яўлялася сімвалам вечнай вясны і паўнакроўнага жыцця. Яна нарадзілася ў марской пене і прыплыла на бераг у ракавіне. Афрадыта была жонкай Гефеста, але кахала Арэса. Сімваламі багіні кахання былі ружы, вераб'і, дэльфіны, баран і галубы.

Артэміда – багіня палявання і месяца, дачка Зеўса. Яе сімваламі з'яўляліся кіпарысавае дрэва, лань і сабака. Багіня выяўлялася ў вобразе маладой цнатлівай жанчыны з лукам, сярэбранымі стрэламі ў акружэнні розных жывёл. Гэтая багіня палявала звычайна ў калясніцы з ланямі; лічылася таксама ахоўніцай усіх дзікіх жывёл. Артэміда ўмела лячыць, благаслаўляла людзей на шчаслівы шлюб і на дзетанараджэнне.

Апалон – сын Зеўса; бог святла, сонца і праўды, а таксама заступнік паэзіі, музыкі, навукі і ўсіх мастацтваў. Меў дар прадказанняў; яго звычайна ўяўлялі з лірай у руках і ў акружэнні дзевяці муз – багінь розных сфер творчага жыцця. Сімвалам Апалона з'яўлялася дрэва лаўра.

Гермес – сын Зеўса. Ён лічыўся вестуном багоў, ахоўнікам падарожнікаў, купцоў, рамеснікаў і злодзеяў, заступнікам гандлю, праваднікоM душ памерлых людзей. Меў крылатыя сандалі, што дазваляла яму хутка пераносіцца з аднаго месца ў другое. Паводле падання, ён упершыню вынайшаў ліру, стварыў матэматыку, азбуку, астраномію, бокс.

Дыёніс – бог вінаградарства і вінаробства. Ён упершыню навучыў людзей вырабляць віно; увасабляў разнастайныя оргіястычныя станы (ап'яненне, транс, рэлігійны экстаз). У яго гонар нярэдка наладжваліся святы – найперш так званыя "Дыянісіі", падчас якіх выконваліся танцы, музыка, ужывалася шмат віна, мелі месца неўпарадкаваныя інтымныя адносіны.

Афіна – дачка Зеўса, багіня мудрасці і справядлівай вайны, ахоўніца грэчаскіх гарадоў. Як і Артэміда, багіня Афіна была ўсё жыццё цнатлівай. Найбольш вядомы храм гэтай багіні – афінскі Парфянон. Яна стварыла флейту, навучыла людзей рабіць калясніцы і караблі, дала людзям законы,

усяляк дапамагала грэчаскім героям. Яе сімваламі былі сава і аліўкавае дрэва.

У Старажытнай Грэцыі яе насельнікі ганаравалі і іншых багоў, такіх як Арэс, Аід, шматлікіх багінь паэзіі, мастацтва і навук, якіх называлі музамі.

Аднак, росквіт міфалогіі ў антычную эпоху суправаджаўся барацьбой супраць архаічных традыцый міфалагічнага пазнання, якое стрымлівала свабоду думкі, рост ведаў, развіццё працоўнай дзейнасці. Імкненне вырашыць г.ту ўнутраную супярэчнасць антычнай культуры складала рухаючую сілу яе развіцця. Міф быў падмуркам антычнай цывілізацыі, які вызначаў лад жыцця, паводзіны чалавека, прыкладное мастацтва, літаратуру філасофію.

## 2. Тыпы і функцыі міфаў.

Міфы існуюць у форме архаічных паданняў пра жыццё багоў і ге-рояў, розныхдухаў. Раздзяляюцца на касмалагічныя (апісанне стварэння свету, людзей), антрапаганічныя (пра паходжанне людзей), каляндарныя (пра памерлых і ўваскрэслых багоў, герояў), эсхаталагічныя (ап-ісанне будучай пагібелі Сусвету). У іх падаюцца пад-зеі далёкага ці блізкага мінулага. Міфалагічныя сюжэты звычайна будуюцца на супрацьпастаўленні апазіцыйныхзначэнняў.

Важнейшай функцыяй, якую выконвае міф, з’яў-ляецца тлумачальная. Яна ажыццяўляецца праз міфалагічны сюжэт і праз увядзенне ў міф культурнага героя, які здабывае ці ўпершыню стварае для людзей прадметы культуры, навучае іх рамяству, уводзіць рытуалы і святы (Праметэй, Гефест, Гільгамеш і інш.).

Росквіт міфалогіі адносіцца да эпохі абшчынна-радавога ладу.Угэты час узнікаюць усебуйны яміфалагічныя цыклы, якія пазней былі замацаваны ў літаратурных помніках.

*Міфалогія ўяўляе сукупнасць міфаў - паданняў пра аб’екты жывой і нежывой прыроды, чалавека і грамадства, якія ўзніклі ў свядомасці людзей у першабытным грамадстве і несвядома мастацкім спосабам адлюстроўвалі іх уяўленні пра навакольны свету выглядзе багоў, герояў, дэманічных істот.*

Для міфалогіі характэрна наіўнае адухаўленне навакольнай прыроды, яе аб’ектаў і стыхій, якое адбываецца на аснове знешніх прымет або выкліканых імі эмацыя-нальных пачуццяў. У міфах чалавек імкнуўся растлума-чыць і ўпарадкаваць навакольны свет.

Міфалогія, звязаная з гаспадарчай дзейнасцю чалавека, дапамагала замацоўваць і перадаваць праз пакаленні практычныя навыкі (здабыванне агню, выраб ганчарнага і іншага посуду, выплаўка металаў). У міфалогіі народаў, звязаных генетычна, напрыклад індаеўрапейскіх, шмат агульных сюжэтаў, сістэм і канцэпцый свету, падобных па функцыях і іншых характарыстыках міфалагічных воб-разаў (старажытнагрэчаскі бог Зеўс, рымскі Юпітэр, славянскі Пярун, балцкі Пяркунас і інш.).

Духоўнай асновай першабытнай культуры становіцца *міфалагічная свядомасць*. Сутнасць міфалагічнага светапогляду заснавана на прыпадабненні навакольнай рэальнасці чалавеку, перанясенні ўнутраных якасцей індывіда на знешні свет. Міфалогія звязана з вераваннямі ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

адухатварэнне ўсёй прыроды. Аб’екты прыроды ўяўляюцца яму адушаўлёнымі істотамі, якія таксама, як і ён, маюць волю, жаданні, думкі, пачуцці. У міфах спалучаюцца рэальнасць і выдумка. Затое яны тлумачаць усё: у іх усё робіцца зразумелым, нягледзячы на дробязь рэальных ведаў. Славесная сімволіка міфаў уліваецца ў рытуалы і надае ім сэнс (у тым ліку і тайны сэнс магічных рытуалаў, даступны толькі чараўнікам і магам). Міфы ахутваюць усе формы жыццядзейнасці людзей і выступаюць як асноўныя “тэксты” першабытнай культуры. Іх вусная трансляцыя забяспечвае ўсталяванне адзінства поглядаў усіх членаў племя на навакольны свет. Вера ў “свае” міфы замацоўвае племя і разам з тым аддзяляе яго членаў ад “чужакоў”, што вераць у іншыя міфы.

У міфах замацоўваліся і асвятляліся практычныя звесткі і навыкі гаспадарчай дзейнасці. Дзякуючы іх перадачы з пакалення ў пакаленне, сабраны на працягу многіх гадоў вялікі вопыт захоўваецца ў сацыяльнай памяці і стварае першасны ўзровень ведаў і спосабаў мыслення, ад якіх пачынаецца шлях, які вядзе да развіцця філасофіі і навукі.

Такім чынам, першабытная міфалогія ўключае ў сябе зачаткі асноўных сфер духоўнай культуры, якія выдзяляюцца ў ёй на далейшых ступенях развіцця чалавечага грамадства, – рэлігіі, мастацтва, філасофіі, навукі.

### 3. Паглыбленне разумення культуры ў антычнасці.

Старажытнагрэчаская цывілізацыя была першай з усіх вядомых высокаразвітых цывілізацый на еўрапейскім кантыненце. Храналагічна і гістарычна названыя цывілізацыі суадносяцца з IX ст. да н.э. і V ст. н.э. Гэтаму параўнальна невялікаму адрэзку гістарычнага часу і адпавядае антычная культура.

*Антычная культура – гэта цэласнае ўтварэнне, якое ахоплівае ўсе яе гістарычныя формы быцця – палітыку і права, міфалогію і рэлігію, філасофію і мастацтва Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.*

У антычным грамадстве ўпершыню сфарміраваліся адносіны да чалавека як да “меры ўсяго існага”, вышэйшай сапраўднай каштоўнасці. Галоўнымі ідэаламі і каштоўнасцямі антычнай цывілізацыі і культуры былі патрыятызм, вернасць грамадзянскаму абавязку, ушанаванне багоў, павага да продкаў. У антычнай культуры знайшлі падрабязную распрацоўку такія актуальныя і вядомыя сёння паняцці і тэрміны, як грамадзянская свабода і раўнапраўе, грамадзянскі доўг, гарманічнае развіццё асобы. Практычна да сённяшніх дзён у асноўных рысах дайшла старажытнагрэчаская сістэма адукацыі і выхавання. У антычную эпоху былі створаны практычна ўсе асноўныя жанры літаратуры Сярэдневякоўя, Новага і Навейшага часу: ідылія, трагедыя, камедыя, ода, элегія, сатыра, эпіграма, байка і інш. Антычная міфалогія і літаратура на працягу многіх стагоддзяў з’яўляюцца невычэрпнай крыніцай натхнення паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў. Філасофія аказала надзвычай моцны ўплыў на далейшае развіццё сусветнай філасофскай думкі. На працягу многіх стагоддзяў антычнае мастацтва было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзорам для пераймання.

"Грэка-рымская культура, – адзначаў А.Тойнбі, – разлілася ў свой час па Старому Свету нічуць не менш шырока, чым наша заходняя ў цяперашні час. Уздзеянне грэчаскай культуры на свет у перыяд з IV ст. да н.э. і пазней было такім жа рэзкім, як і ўздзеянне сучаснай заходняй культуры з XV ст. да нашых дзён."

Адной з асаблівасцей антычнай культуты з'яўляецца *полісная аснова.* Антычная культура ўзнікла і развівалася на аснове гарадскога, ці поліснага, сацыяльнага і духоўнага жыцця. Старажытная Грэцыя практычна ніколі не была адзінай дзяржавай, а складалася з асобных гарадоў-дзяржаў (полісаў), якія ўзніклі ў архаічны перыяд (VIII–VII стст. да н.э.). Усе свабодныя жыхары горада-дзяржавы і яго наваколля лічыліся грамадзянамі, мелі зямельную ўласнасць, палітычныя правы і прымалі актыўны ўдзел у жыццядзейнасці поліса. На працягу трох стагоддзяў адбываўся паступовы пераход антычнага грамадства ад вёскі да горада, ад родавых і патрыярхальных адносін да адносін класічнага рабства. Рабаўладанне было найбольш распаўсюджаным у эканамічна развітых полісах (Афіны, Карынф і інш.). Вышэйшага ўзроўню свайго развіцця полісы дасягнулі ў класічны перыяд – у V–IV стст. да н.э. Паступова ў полісах узмацнялася барацьба паміж рознымі сацыяльнымі катэгорыямі насельніцтва: арыстакратамі, алігархамі і "дэмасам". У выніку гэтай барацьбы ў розныя часы ўзнікалі, змяняліся разнастайныя формы дзяржаўнага праўлення: манархія, алігархія, арыстакратыя, тыранія, дэмакратыя.

Антычнасць пабудавана на матэрыяльна-пачуццёвым і адушаўлёна-разумным *касмалагізме*. Космас выступае абсалютам культуры. Касмагонія старажытных грэкаў і рымлян дастаткова складаная і ў агульных рысах можа быць зведзена да наступных палажэнняў.

Спачатку існаваў вечны і бясконцы Хаос – першапачатак усяго існага ў свеце. Пазней з гэтага Хаосу ўзніклі багі, якія сатварылі людзей і іх навакольнае асяроддзе. Космас ва ўяўленні грэкаў і рымлян гэта не толькі свет, але і парадак, сусветнае цэлае, якое супрацьстаіць Хаосу з прычыны ўпарадкаванасці і прыгажосці.

Антычная культура шмат у чым мела *пераймальны характар*, гэта значыць многае пераняла ў культуры суседніх народаў. Так, грэкі многае пераанялі ў егіпцян, вавіланян, аднак змаглі давесці гэтыя навацыі да класічных формаў і вышэйшай дасканаласці. Рымляне стаарылі свой уласны пантэон багоў у значнай ступені на аснове грэчаскага. Яны нярэдка капіравалі найлепшыя творы грэчаскага выяўленчага мастацтва. Моцным быў уплыў грэчаскай культуры на развіццё рымскай літаратуры, філасофіі, навукі.

Сярод іншых адметных рыс антычнай культуры неабходна выдзяліць *антрапацэнтрызм.* Космас пастаянна суадносіўся з чалавекам, прыродныя аб'екты – з чалавечым целам. Антрапацэнтрычнасць гэтай культуры прадугледжвала культ цела чалавека; ідэалізуючы багоў, грэкі надзялялі іх чалавечымі якасцямі, вышэйшай цялеснай прыгажосцю. У іх скалаліся

ўяўленні пра тое, што багі дзейнічалі амаль як звычайныя людзі, жылі сярод людзей, мелі розныя чалавечыя слабасці, адмоўныя рысы. Для старажытных грэкаў і рымлян асоба – гэта добра арганізаванае і жывое цела.

Антычная культура фарміравалася на аснове *пантэізму*. Антычныя багі ўяўляліся як ідэі, законы, якія ўвасабляліся ў космасе. У старажытнасці законы прыроды называліся багамі. Яны – гэта і ёсць сама прырода, ёсць боскі космас як абсалют, які можна ўбачыць, пачуць, адчуць на дотык. Таму ўсе недахопы, перавагі, якія ёсць у чалавеку і прыродзе, усе яны ёсць і ў божаствах. Пантэон агульнагрэчаскіх багоў сфарміраваўся, верагодна, у архаічны перыяд. Звычайна іх называлі Алімпійскімі багамі, бо яны пастаянна пражывалі на вяршыні самай высокай у Грэцыі гары Алімп. Гэтыя божаствы складалі адзіную вялікую іерархічную сям'ю. Да ліку галоўных адносіліся 12 багоў-алімпійцаў. Вярхоўным богам быў бог грому і маланкі Зеўс.

Антычная культура мела відавочную *дэмакратычнасць*. У старажытным грэчаскім і рымскім грамадствах існавала практыка вырашэння найбольш важных праблем на агульных народных сходах, у якіх мелі права ўдзельнічаць усе паўнапраўныя свабодныя грамадзяне. Гэтага права былі пазбаўлены рабы, жанчыны, іншаземцы.

Літаратура


*Культурология*: теория и история культуры: учеб. пособие / И. Е. Ширшов [и др.]; под общ. ред. И.Е.Ширшова. – Мн.: БГЭУ, 2004. – 543 с.

*Ненадавец, А. М.* Нарысы беларускай міфалогіі  А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 535 с.

*Першиц, А. И.* История первобытного общества: учебник для ист. фак. вузов / А.И.Першиц [ и др.]. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Высш. шк., 1982. – 223 с.

*Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура / предисл. и примеч. А.П.Першина; пер с англ. – М.: Политиздат, 1989. – 572 с.

*Фрэзер, Д. Д.* Золотая ветвь: исследование магии и религии / Д. Д. Фрезер; пер. с англ. М. К. Рыклина. – 2-е изд. – М.: Политиздат, 1983. – 703 с.


**Тэма. Уяўленні аб сутнасці культуры ў Сярэднявеччы і ў эпоху Адраджэння (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Манатэістычная канцэпцыя культуры.
2. Уяўленні аб культуры гуманістаў эпохі Адраджэння.
3. Паглыбленне поглядаў на культуру беларускіх мысліцеляў ХУ1 ст.

*Мэта лекцыі:* паказаць спецыфіку разумення пытанняў культуры ў працах мысліцеляў эпохі Сярэдневечча і Антычнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1. Монатэістычная канцэпцыя культуры.

Сярэднія вякі ахопліваюць перыяд ад V да XV ст. Асноўнымі прыметамі Сярэднявечча прынята лічыць існаванне сістэмы феадалізму як асаблівага тыпу грамадскага ладу. Культура еўрапейскага Сярэднявечча ўзнікла на руінах Рымскай імперыі. Аслабленне і распад цэнтральнай імперскай улады суправаджаліся смутамі, войнамі, разрухай. Тры сілы сутыкнуліся ў барацьбе, ад зыходу якой залежала яе будучыня. Першая – гэта традыцыі старэючай грэка-рымскай культуры. Яны засталіся ў нямногіх культурных цэнтрах, дзе яшчэ існавала жыццё ў антычных храмах, бібліятэках і майстэрнях. Зберагалі гэтыя традыцыі высокаадукаваныя людзі, але авалодаць новымі ідэямі, што маглі б заваяваць шырокае прызнанне на аснове элінізму, яны ўжо не маглі. Калі б гэтая сіла, тым не менш, змагла выстаяць і зноў усталявацца ў грамадстве, тады вектар далейшага культурнага жыцця Еўропы быў бы звернуты ў мінулае. Другой сілай быў дух варварства. Пераносчыкамі яго былі розныя народы, што жылі на тэрыторыі Рымскай імперыі і пранікалі ў яе. Варвары былі мужнымі і суровымі, ідэалы і каштоўнасці антычнага свету былі ім не зразумелымі. Духоўны свет варварскіх народаў быў вельмі бедны. Яны не маглі супрацьпастаўляцца больш развітым формам духоўнага жыцця, якія нёс Рым.

Хрысціянства было трэцяй і самай моцнай з усіх сіл, якія характарызавалі культурнае развіццё Еўропы. Ад іудаізму яно ўвабрала не толькі ідэю адзінабожжа (монатэізму) і ветхазапаветнага Свяшчэннага Пісання, але і элементы старажытных культаў, што адлюстроўваліся ў ім. Такім чынам, хрысціянства з’яўлялася свежай плынню, якая змагла ўдыхнуць новае жыццё ў культуру Еўропы.

У сярэдневяковым гісторыка-культурным працэсе акрамя дзяржавы вельмі важную ролю адыгрывалі рэлігія і царква, якія значна паўплывалі на характэрныя культуры Сярэдніх вякоў.

*Ментальныя асновы і характэрныя рысы культуры Сярэднявечча.* Культурная рыса – гэта аналітычная адзінка культуралогіі, якая абазначае ўстойлівую сукупнасць падзяляемых уяўленняў, дзеянняў, поглядаў, традыцыйных для дадзенай культуры; непадзельная адзінка ў выглядзе паводзінскага ўзору ці матэрыяльнага прадукту. Абазначае тое ж самае, што і элемент культуры, гэта значыць базісныя цаглінкі культурнай статыкі.

*Рэлігійны характар*. У духоўнай культуры Сярэднявечча галоўная роля належыць хрысціянскай рэлігіі. Яна з’яўлялася дамінантай духоўнага жыцця сярэдневяковага грамадства, выконвала функцыі аднаго з найважнейшых інстытутаў культуры. У гэтых умовах прыроду маральнага ідэала хрысціянскай ідэалогіі можна ўявіць як адзінства веры, надзеі і любові. У гэтай трыядзе вера выступае як асаблівы стан духу, як святая прастата, што вядзе да Бога. Надзея ўвасабляла ідэю выратавання ад граху з дапамогай Бога праз замагільную адплату, шлях да якой – пакорлівасць, прытрымліванне прыкладаў асвечаных царквою паводзін. Любоў разумеецца як любоў да Бога, як сувязь, імкненне чалавека да Бога. Дзеячы царквы імкнуліся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскія адносіны тлумачыць па прыкладзе адносін чалавека і Бога. Падпарадкаванне, пакорлівасць становяцца галоўнымі каштоўнасцямі грамадскага жыцця, якія прапаведуе хрысціянскае духавенства. Яно ідэйна апраўдвае саслоўную арганізацыю жыцця грамадства, яго іерархічнасць, калі кожны чалавек ведае сваё месца ў свеце і жыве ў строгай адпаведнасці з гэтым парадкам размяшчэння сацыяльных груп. Рэлігійнасць як галоўная асаблівасць духоўнага жыцця Сярэднявечча абумовіла ролю царквы як найважнейшай арганізацыі культуры. Хрысціянства выступае як новая светапоглядная аснова свядомасці чалавека, выяўленне запыту на святое, чыстае жыццё, якое ўзнікае ў таго чалавека, што стомлены грубасцю позняй рымскай Антычнасці. Язычніцкія рэлігіі не былі падрыхтаваны да гэтага, але і вялікія масы людзей таксама не былі здольнымі стаць аскетамі, практычна цалкам адмовіцца ад радасцей зямнога жыцця. Хрысціянства было свайго роду залатой сярэдзінай, кампрамісам духу і плоці, бо пры ўсёй сваёй духоўнасці Хрыстос уваскрасае як цялесная істота, якая мае плоць і кроў, да якой можна дакрануцца. Акрамя таго, адзін Бог лепш зразумелы для чалавека, які мае аднаго гаспадара. Таму асноўнай асаблівасцю культуры Сярэдніх вякоў з’яўляецца яе відавочны тэацэнтрызм – такі светапогляд, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзіцца Бог.

*Сімвалізм.* Сімвал адносіцца да універсальнай катэгорыі культуры, якая раскрываецца праз супастаўленне прадметнага вобраза і глыбіннага сэнсу. Сярэдневяковы чалавек імкнецца да таго, каб знаходзіцца па іншы бок формы, да чыстага Боскага быцця. Для яго сімвалічным быў увесь навакольны свет. Сонца – сімвал самога Бога; зоркі – сімвалы анёлаў і прапаведнікаў; камень – сімвал Хрыста і цвёрдай веры; пясок – сімвал слабасці і няўстойлівасці; золата – ісціны; дрэва – сімвал душы.

Сімвалічнае мысленне ў Сярэднявеччы было спосабам пераадолення бездані паміж матэрыяльным і духоўным светам, паміж натуральным і звышнатуральным. Пры дапамозе шматлікіх пераходаў матэрыяльны свет звязваўся з духоўным, і гэта стварала псіхалагічную аснову для маністычнага разумення.

Сімвалізмам было прасякнута сярэдневяковае мастацтва. Сімвалічны характар меў шырока распаўсюджаны ў Сярэднія вякі літаратурны жанр – прытча. У музыцы – строгая аднагалоснасць – сімвал яднання пачуццяў.

Жывапіс, скульптура, архітэктура, літаратура ў Сярэднія вякі мелі характар настаўніцтва, напаміну. У тэатральным мастацтве – павучальны жанр маралітэ – дыдактычнай п’есы з алегарычнымі персанажамі.

Задачай філасофіі было раскрыццё сімвалічнага значэння Пісання. Дарэчы, уся духоўная культура Сярэднявечча заснавана на рознабаковых каментарыях Бібліі, прац тэолагаў. Такое каменціраванне ажыццяўлялася на трох узроўнях. Першы заключаўся ў выяўленні як бы зашыфраванага сэнсу дакладных слоў Бібліі, іх тлумачэнні вернікам. Другі ўзровень расшыфроўваў ідэі, закладзеныя ў Бібліі. На трэцім, вышэйшым узроўні дазвалялася развіццё гэтых ідэй асабістымі роздумамі, якія вынікалі з глыбокага разумення першакрыніцы аўтарам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дыдактычнасць*. Дзеячамі сярэднявечнай культуры былі перш за ўсё прапаведнікі, выкладчыкі багаслоўя. Галоўнае ў іх дзейнасці – не проста зразумець вялікасць боскай задумы, але і перадаць гэта іншым людзям. Найважнейшай асаблівасцю сярэднявечнай культуры з'яўлялася арыентацыя не на прычынна-выніковыя сувязі паміж рэчамі, а іерархічныя, калі ідзе пошук нябесных узораў зямных рэчаў. Пазнанне выступае як выяўленне сувязі паміж рэччу і ідэяй, якая за ёй стаіць, а не паміж самімі рэчамі. Логіка і містыка не супярэчылі адна адной, бо першая служыла містычнаму ўспрыманню тайны боскай, што хавалася ў рэчах.

*Дагматычнасць.* Адукацыя гэтай эпохі прытрымлівалася гнасеалагічнай пазіцыі, якая заключалася ў выключэнні якіх-небудзь сумненняў з абсалютнай праўдзівасці існуючых ведаў. Хрысціянскія дагматы вызначалі некаторыя моманты сярэднявечнай ідэалогіі. Так, грамадства разумелася з IX ст. як непадзельнае адзінства трох сацыяльных слаёў: царкоўнікаў, воінаў і працоўных. Таму значнага распаўсюджання набыла ідэя ўзаемнага служэння ўсіх саслоўяў на карысць цэлага.

Сярэднявечная навука выступала як асэнсаванне аўтарытэтных дадзеных Бібліі. Паводле меркаванняў царкоўных ідэолагаў, грэшным з'яўляюцца ўсякія веды, калі яны не маюць сваёй мэтай пазнанне Бога. У ідэале сярэднявечны розум павінен быць скіраваны на разуменне Боскай задумы адносна свету, яго прадметаў. У такой навуцы адкрыцці быццам бы не дапускаліся, таму што ісціна ў прынцыпе была дадзена Богам у Бібліі, тлумачылася ў працах айцоў царвы. Таму сярэднявечная навука падзялялася на ніжэйшую, заснаваную на пазнавальных магчымасцях чалавека, і вышэйшую – захавальніцу Боскага адкрыцця. Галоўным метадам пазнання ў гэтых абставінах з'яўляецца спасціжэнне сэнсу Боскіх сімвалаў. Свет у Сярэднявеччы разглядаўся як кніга, напісаная Богам, якую патрэбна ўспрыняць.

*Кананічнасць*. Адметнай асаблівасцю сярэднявечнай культуры з'яўлялася яе кананічнасць. Прафесары, дзеячы мастацтва, прапаведнікі ў сваёй дзейнасці абапіраліся на аўтарытэтныя працы айцоў царквы, іх некрытычныя ўспрыманні, на цвёрда вызначаныя прынцыпы, што сталі агульнапрынятымі нормамі духоўнага жыцця чалавека і грамадства, правілы рэлігійнай дзейнасці.

У эпоху, калі большасці было не даступным чытанне Бібліі (яе пераклад з лацінскай мовы з'явіўся толькі ў XYI ст.), галоўнай мовай хрысціянства былі выяўленчыя віды мастацтва, якія ў ілюстрацыйнай, вобразнай форме давалі ўяўленні пра прыгажосць боскага: жывапіс разглядаўся як нямая споведзь. Галоўным жанрам быў іканапіс. Іконы выступалі сродкам эмацыянальнай сувязі з Богам, даступным непісьменным масам. Але іконы з выявамі Бога, святых былі глыбока сімвалічныя, каб прытупіць іх пачуццёвы, цялесны вобраз. Выявы павінны былі ўспрымацца як увасабленне Боскага, не будзіць зямных перажыванняў, паказваць сусветны смутак Бога аб сваіх грэшных і пакутлівых дзецях. Галоўным у выяве з'яўляюцца вочы (люстэрка душы), фігуры, часта адарваныя ад зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастакі грэбуюць фонам, з жывапісу на доўгія гады знікае пейзаж (хрысціянства не надае ўвагі прыродзе, у Бібліі яна ўзгадваецца вельмі рэдка).

*Алегорыя.* Алегорыя з'яўлялася адным з прынцыпаў мастацкага асэнсавання рэчаіснасці і спосабам афармлення зместу ў мастацтве, калі дадзеная ім выява атрымлівала іншасэнсавае значэнне.

Алегарычны вобраз меў два сэнсавыя слаі – паверхневы і глыбінны. Змест, заключаны ў знешнім слоі, не супадаў з яго глыбінным сэнсам, але з'яўляўся спосабам яго знаходжання. Сродкамі стварэння алегорыі ў мастацтве былі ўвасабленне і метафара. Па сваёй функцыі алегорыя набліжалася да сімвала. Але ў адрозненне ад апошняга яе сэнсавае значэнне больш аднабаковае і раскрывалася шляхам выкарыстання відавочных і ўтоеных намёкаў.

Карнавальны, смехавы характар народнай культуры – важная асаблівасць культуры Сярэднявечча, якая больш яскрава выявілася ў выявілася ў гарадах. Карнавал з'яўляўся асаблівым спосабам існавання і мыслення, які адрозніваўся ад сур'ёзнай афіцыйнай царкоўнай і свецкай культуры. Карнавал нёс з сабой ідэю асаблівай свабоды, магчымасці выйсці на якісьці момант са звыклага жорстка іерархізаванага парадку рэчаў у асобую прастору, дзе магчымы ўсякія ператварэнні, дзе апошні можа стаць першым (бабовым каралём ці царом дурняў), дзе можна пражыць сацыяльныя ролі, якія недаступныя ў звычайным жыцці.

Другая рыса карнавальнай культуры – нястрыманая весялосць, смех, перамога жыцця. Карнавалы дазвалялі культурна дазволеным чынам выліць энергію прыроднага пачатку чалавека, якая стрымлівалася ідэаламі хрысціянскай набожнасці. Карані карнавалу ўзыходзяць да земляробчых культаў з іх абрадамі смерці і ўваскрэсення, да міфалогіі. Жыватворныя сілы прыроды рэпрадукаваліся ў форме разгулу, абжорства, усеагульнай радасці. Смех, лаянка, брыдкаслоўе былі магічнымі сродкамі, якія забяспечвалі перамогу жыцця. Нават царкоўныя храмавыя святы суправаджаліся кірмашамі і пляцовачнымі забавамі. Блазаны і дурні былі незаменнай часткай свецкага жыцця, яны заўсёды парадзіравалі сур'ёзныя дзеянні афіцыйнай культуры.

*Ананімнасць.* Паняцце аўтарства ў Сярэднявеччы спецыфічнае. Спевакі – "песняказальнікі" ранняга Сярэднявечча: скапы ў англасаксаў, барды ва уэльсцаў, філіды ў ірландцаў, скальды ў нарвежцаў, менестрэлі сталага Сярэднявечча – ганарыліся сваім мастацтвам апавядальніка, спевака, але не аўтара. Апісанні працэсу стварэння імі паэтычных твораў дазваляюць меркаваць пра калектыўнасць творчасці, калі матывы, якія сталі традыцыйнымі, скампаноўваліся па-новаму. У выніку з'явіліся творы, якія адносіліся да так званага неўсвядомленага аўтарства. Невядомыя імёны большасці песняказальнікаў.

*Інталерантнасць.* З наступленнем позняга Сярэднявечча перамагае думка аб тым, што чалавек здольны заключыць дагавор з д'яблам. Узнікаюць уяўленні пра зносіны з нечысцю, шабашы, дзе адбываецца чорная меса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абвінавачванні ў вядзьмарствах набліжаюцца да абвінавачванняў у ерасі, да якой царква была нецярпімай у эпоху Сярэднявечча. Вядзьмарскія працэсы становяцца дастаткова распаўсюджанымі і звычайнымі з’явамі. У практыку царквы ўваходзяць адмоўныя, нецярпімыя адносіны да асобнага індывіда ці групы людзей, да пэўных відаў культуры, да некаторых стваральнікаў культурных каштоўнасцей. Інталерантнасць праяўлялася таксама ў адмоўным стаўленні да дзейнасці тых або іншых дзяржаўных устаноў, асветніцкіх, грамадскіх арганізацый. Культурная інталерантнасць сведчыла пра абмежаванасць культурнага кругагляду царкоўных і свецкіх асоб, іх агрэсіўныя, часам нават асацыяльныя схільнасці, думкі і паводзіны. Наватарства лічылася праяўленнем гордасці, адступленне ад даўніны разглядалася як адступленне ад ісціны. Адсюль ананімнасць твораў, абмежаванне свабоды творчасці рамкамі рэлігійнага светапогляду, які склаўся на той час.

Для барацьбы з разнастайнымі ерасямі была створана інквізіцыя (ад лац. inqusitio – розыск, вышук), якая з XIII ст. дзейнічала як царкоўны суд, спецыяльны трыбунал каталіцкай царквы. Інквізіцыя змагалася не толькі супраць ерэтыкоў, але і супраць розных праяў вальнадумства, знахарства, вядзьмарства, чарадзейства. У Сярэдневякоўі ўзнікла новая форма барацьбы хрысціян з “нехрысціянскім светам”, так званыя крыжовыя паходы. Яны пачаліся пры рымскім папе Урбане II (1088–1099 гг.), які ў 1095 г. на Клермонскім саборы ўпершыню заклікаў прысутных “да вызвалення Гроба Гасподняга ад няверных”. Удзельнікі гэтых паходаў – крыжакі – імкнуліся любымі сродкамі вызваліць “святую зямлю” Палесціны ад уладарства турак-мусульман. Крыжакоў лічылі своеасаблівымі “рыцарамі Хрыстовымі”.

*Традыцыяналізм*. Адносіны свецкай і духоўнай улад да навукі і тэхнікі былі пераважна непрыхільнымі, бо лічылася, што ўсё духоўнае жыццё чалавека павінна будавацца на старадаўніх традыцыях, нязменных рэлігійных нормах і каштоўнасцях. У грамадстве, заснаваным на павазе да традыцый мінулага, усё новае, нязвыклае ўспрымалася насцярожана і нярэдка выклікала страх, паколькі разглядалася як нешта бязбожніцкае, грахоўнае, нават д’ябальскае.

У аснове сярэднявечнай культуры было ўзаемадзеянне двух пачаткаў: культуры “варварскіх” народаў Заходняй Еўропы (германскі пачатак) і культурных традыцый Заходняй Рымскай імперыі – права, навукі і мастацтва, хрысціянства (раманскі пачатак). Узаемадзеянне гэтых пачаткаў моцна паўплывала на станаўленне заходнееўрапейскай сярэднявечнай культуры. “Чым больш старажытнае, тым больш сапраўднае” – гэты прынцып быў у сувязі новага і старога ў духоўным жыцці. Так сярэдневяковая літаратура развівалася пад уплывам традыцый вуснай народнай творчасці, рэлігійных нормаў і каштоўнасцей хрысціянства, а таксама антычнай культуры і літаратуры. Традыцыяналізм стрымліваў развіццё навукі і тэхнікі. Менавіта таму на працягу амаль тысячагоддзя эпохі Сярэдневякоўя было зроблена адносна мала навуковых адкрыццяў і тэхнічных нованўвядзенняў.

*Рэфлексіўнасць*. Спрадвеку лічылася, што Бог – гэта ўратаванне. Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хрысціяніна выратаванне існавала пад знакам веры і надзеі. У яго верыць і на яго спадзяецца нават чалавек не самага праведнага жыцця. Надзея чалавека – гэта надзея на Бога, калі яго няма, то святкуе перамогу чалавечае рабства.

Хрысціяніну ёсць у каго верыць, на каго спадзявацца і каго любіць. Сярэдневяковая еўрапейская філасофія арыентавалася на абгрунтаванне і тлумачэнне рэлігійных ісцін, на "школьнае" авалодванне ўжо назапашаным, а не на пошук новых ведаў, стварэнне новых тэорый і канцэпцый.

Для абгрунтавання гэтых рэлігійных ісцін схаласты спасылаліся не толькі на біблейскія тэксты, але і на творы знакамітых мысліцеляў Антычнасці, найперш Арыстоцеля, які ў Сярэдневякоўі лічыўся найбольш буйным аўтарытэтам у галіне філасофіі і тэалогіі. У цэлым філасофію Сярэдневякоўя нярэдка разглядалі як своеасаблівую "служанку багаслоўя". Найбольш вядомымі прадстаўнікамі сярэдневяковай хрысціянскай філасофіі і тэалогіі былі Аўрэлій Аўгусцін, св. Фама Аквінскі, Роджэр Бэкан, Уільям Окам, Іаан Скот Эрыўгена і інш.

Аснова сярэднявечнага багаслоўя таксама была антычнай. Пры ўзнікненні багаслоўе абапіралася перш за ўсё на антычны неаплатанізм. Царкоўная арганізацыя ранняга Сярэднявечча яшчэ доўгі час працягвала будавацца па прынцыпе антычных полісаў: адносна незалежныя метраполіі, а затым патрыярхіі стваралі адзіны саюз.

*Тэацэнтрызм.* Адзінства сярэдневяковага свету ўвасаблялася Богам, ён вызначаў лёс рэчаў, а не іх адносіны з іншымі прадметамі свету. У самім свеце не знаходзілі аб'яднальнага пачатку, і Бог выступаў свайго роду яго інтэгратарам.

У сярэднявечнай навуцы не было ўяўленняў пра самазаконнасць свету, не было глебы для ідэй аб законах прыроды. Чыста матэрыяльныя, не натхнёныя Богам сувязі не валодалі аўтарытэтам ісціны.

Бог стаяў за рэчамі прыроды як майстар за створнай ім рэччу. Адсюль кніжнае вывучэнне свету, каменціраванне прац знакамітых тэолагаў, антычных мудрацоў праходзіла ў адрыве ад жыцця.

Такім чынам, Сярэднявечча ўвабрала традыцыі і звычаі некалькіх культурных платформаў, сярод якіх выдзяляюцца антычная субкультура, хрысціянства, германска-варварская субкультура, рыцарская субкультура, бюргерская субкультура, сялянская нізавая субкультура.

## 2. Уяўленні аб культуры гуманістаў эпохі Адраджэння.

Асноўным зместам Адраджэння было станаўленне новай, "зямной" па сваёй сутнасці карціны свету, кардынальна адрознай ад сярэднявечнай. Новая карціна свету знайшла ўвасабленне ў *гуманізме*, вядучай ідэйнай плыні эпохі, і натурфіласофіі, выявілася ў мастацтве і навуцы. Будаўнічым матэрыялам для новай культуры паслужыла Антычнасць, да якой звярнуліся праз эпоху Сярэднявечча і якая "адраджалася" да новага жыцця. Зарадзіўшыся ў Італіі ў канцы XV ст., у выніку сінтэзу італьянскай і мясцовых нацыянальных традыцый нараджаецца новая культура – культура Адраджэння. Новая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэнесансная культура суіснавала з культурай позняга Сярэднявечча, што асабліва характэрна для краін, якія знаходзіліся на поўнач ад Італіі і Альп. Гэты перыяд у гісторыі еўрапейскай культуры адметны пераносам культурных інтарэсаў са сферы вышэйшага (нябеснага) Сусвету, з краю сакральнага да матэрыяльнага праяўлення жыцця, стварэння культуры антрапацэнтрызму (ад грэч. anthropos – чалавек). Эпоха Адраджэння характарызуецца ўсплескам мастацкай дзейнасці, у першую чаргу пластычнага мастацтва (жывапіс, скульптура), з'яўленнем нацыянальных моў на аснове царкоўнай латыні і мясцовых народных гаворак, станаўленнем нацыянальных дзяржаў на аснове феадальных уладанняў, эканамічным развіццём, а на яго аснове развіццём гарадоў і звязанай з імі цывілізацыі, духоўнай секулярызацыяй і ростам індывідуалістычных тэндэнцый у грамадскім жыцці.

Працэс "праходжання" Адраджэння быў нераўнамерны ў розных еўрапейскіх краінах. Існуюць тры тыпы рэнесансных культур.

***Італьянскае Адраджэнне.*** Для яго характэрны паслядоўнасць працэсу духоўнага разняволення з-пад улады царквы (як эканамічна, так і палітычна; менавіта гэты працэс атрымаў назву секулярызацыі), мастацкі ўздым, з'яўленне новых жанраў у мастацтве (ды і ўласна мастацтва ў нашым разуменні гэтага слова). Італія лічыцца радзімай культуры Адраджэння. Менавіта тут гэтая культура ўпершыню заявіла аб сабе фактам з'яўлення кнігі вершаў Дантэ Аліг'еры "Новае жыццё" ("Vita nuova"), першага ў Еўропе літаратурнага твора на нацыянальнай мове.

Другім тыпам рэнесанснай культуры лічыцца *Паўночнае Адраджэнне* (краіны, размешчаныя на поўначы ад Італіі: Нідэрланды, Нямеччына, Францыя). Яно характарызуецца больш сціснутым і інтэнсіўным пераносам рэнесанснай праблематыкі са знешніх праяў на рашэнне ўнутраных пытанняў веры, дзяржаўнасці. Паўночнае Адраджэнне пачынаецца ў сярэдзіне XIV ст. і доўжыцца да канца XVIII ст.

Трэці тып рэнесансных культур уяўляюць культуры, што прайшлі толькі ***частковае Адраджэнне***, "пражыўшы" яго ў кароткія перыяды (за 40–70 гадоў) і не ў "чыстым" выглядзе нават у параўнанні з Паўночным Адраджэннем. Да такога тыпу рэнесансных культур адносяць культуры Англіі, Партугаліі, шэрага славянскіх краін (Чэхіі, Польшчы, Украіны).

Важнейшымі рысамі рэнесанснай культуры з'яўляюцца: развіццё індывідуалізму, у выніку чаго "героем эпохі" паўстае моцная гераічная асоба. Усё гэта надало Адраджэнню характар перавароту ў жыццёвым укладзе і феадальна-каталіцкім успрыманні свету. Сваёй духоўнай прарадыгмай гуманісты лічылі культуру Антычнасці. Але гуманісты бачылі чалавека як "вянец Боскага тварэння", уладара прыроды, якая дадзена яму для асабістай творчасці. Такія ідэі сцвярджаў у сваім трактаце "Аб вартасці чалавека" гуманіст Піко дэ Ла Мірандола.

Адной з найбольш яскравых прымет італьянскага Адраджэння стала новае разуменне мастацтва і навукі, якія перасталі лічыцца нявартымі павагі высакароднага чалавека. Таму ў раздробленай на мноства карлікавых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаў Італіі былі такімі знакамітымі дзеячы мастацтваў – жывапісцы Мазачча, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла Буанароці, Рафаэль Санці, скульптары Данатэла і інш.

Мастацтва эпохі Адраджэння характарызуецца больш жыццярадасным пачаткам, постаці набываюць адносны аб'ём. У скульптуры пераадольваецца гатычная бясплотнасць постацяў. Выразна разрыў са сярэднявечнымі традыцыямі выявіўся ў канцы у фрэсках *Джота ды Бандоне,* які абазначыў у жывапісе пачуццё трохмернай прасторы, пісаў постаці больш аб'ёмнымі, вялікую ўвагу надаваў жыццёвай пераканальнасці і ўнутранай сіле вобразаў, рэлігійныя сюжэты напаўняў простым жыццёвым зместам. Ён – пачынальнік рэалізму ў італьянскім жывапісе.

З дапамогай жывапісу мастакі асвойваюць свет і чалавека, як яны бачыліся воку, ужываючы новы мастацкі метад, перадавалі трохмерную прастору пры дапамозе перспектывы (лінейнай, паветранай, каляровай). Цікавасць да асобы, яе індывідуальных рыс перапляталіся ў іх мастацтве з ідэалізацыяй чалавека, пошукам "дасканалай прыгажосці". Сюжэты святой гісторыі не сышлі з мастацтва, але з гэтага часу іх малюнак быў непарыўна звязаны з задачай засваення свету і ўвасаблення зямнога ідэалу. Архітэктура губляе гатычнае імкненне да неба, набывае "класічную" раўнавагу і прапарцыянальнасць. Так, *Мазачча,* як і *Джота,* выкарыстоўваў у сваёй творчасці прынцыпы лінейнай перспектывы.

У XV ст. нараджаюцца і развіваюцца скульптура (Л.Гіберці, Данатэла, Я. дэла Кверча, Л. дэла Робіа, Верок'ё і інш.; Данатэла ўпершыню стварыў круглую статую, якая самастойна стаяла і не была звязана з архітэктурай) і архітэктура (Ф.Брунелескі, Л.Б.Альберці і інш.). Створаныя мастакамі вобразы ўвасаблялі чалавечую вартасць, сілу, прыгажосць. Жывапіс характарызаваўся небывалай пластычнасцю.

Літаратура з'яўляецца адным з важнейшых дасягненняў культуры Рэнесанса. Менавіта ў ёй, як і ў выяўленчым мастацтве, выявіліся з найбольшай сілай новыя ўяўленні аб чалавеку і свеце. Асаблівасцю літаратуры Рэнесанса, як і ўсёй культуры, былі найглыбейшы інтарэс да асобы і яе перажыванняў, праблемы асобы і грамадства, праслаўленне прыгажосці чалавека, абвостранага ўспрымання паэзіі зямнога свету. Была створана новая сістэма літаратурных жанраў. Некаторыя з іх, вядомыя з часоў Антычнасці, былі адроджаны і пераасэнсаваны з гуманістычных пазіцый, іншыя створаныя наноў. Замест сярэдневяковых жанраў Рэнесанс адрадзіў трагедыю і камедыю. Дастаткова шырокае распаўсюджанне ў літаратуры атрымлівае пастараль. На схіле Адраджэння зацвярджаецца "куцельскі раман". Сапраўдным дасягненнем Рэнесанса з'яўляецца жанр навелы, тыпалагічныя асновы якога былі закладзены *Бакачыо.* Паэзія эпохі Адраджэння таксама была звязана з узнікненнем і адраджэннем шэрага жанраў. Для яе характэрна дамінаванне лірычнай паэзіі. Літаратура Рэнесанса, як і ўся культура Адраджэння, абапіралася на антычныя дасягненні. Адсюль, напрыклад, з'яўленне "навуковай драмы" як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наследавання антычнай драматургіі, у той жа час яна творча развівала народныя традыцыі сярэднявеснай літаратуры.

Прынцыпы мастацтва Рэнесанса – у тым ліку і тэатра – закладваліся ў Італіі. Тут былі адроджаны камедыя, трагедыя, пастараль; створана опера; пабудаваны першыя тэатральныя будынкі; распрацаваны прынцыпы прафесійнага сцэнічнага і пляцоўнага тэатра, быў дадзены штуршок да тэарэтычнага асэнсавання драматургічных канонаў.

Развіццё рэнесанснага італьянскага тэатра ішло ў асноўным у двух напрамках: так званай "*вучонай камедыі" – la commedia erudite* (да гэтага ж напрамку можна аднесці і літаратурную трагедыю) і народнага тэатра імправізацыі – *камедыя дэль артэ*, якая аказала вялікі ўплыў на развіццё сусветнага тэатральнага мастацтва. Італьянская "вучоная камедыя", да стварэння якой звярталіся буйныя пісьменнікі і мысліцелі XV–XVI стст. (Лудавіка Арыоста, Мікала Макіявелі, Пьетра Арэнціна, Джардана Бруна), уяўляла сабой пераважна дагматычныя перапевы антычных сюжэтаў. Тыя ж тэндэнцыі характэрны і для італьянскай рэнесанснай трагедыі (Джан-Джорджа Трысіна, Джавані Ручэлан, Луіджы Аламанка, Тарквата Таса і інш.).

Самай яскравай старонкай італьянскага Адраджэння быў і застаецца імправізаваны вулічны тэатр масак – камедыя дэль артэ. Па сутнасці быў сфарміраваны першы ў гісторыі прафесійны тэатр.

Вяршыняй рэнесанснага тэатральнага мастацтва стала творчасць Шэкспіра, які дагэтуль застаецца самым рэпертуарным драматургам сусветнага тэатра. Менавіта ў шэкспіраўскім тэатры адлюстравалася галоўная асаблівасць тэатра Адраджэння: не столькі аднаўленне антычных матываў, сюжэтаў і схем, колькі выхад на новы філасофскі ўзровень. Тэатр Шэкспіра стаў універсальнай, пазагістарычнай мадэллю светастварэння, дзе засяродзіліся адвечныя праблемы ўзаемаадносін асобы і грамадства.

Вобраз прафесійнай музыкі, які быў сфарміраваны на працягу Сярэднявечча ў царкве, у эпоху Адраджэння дапаўняецца вобразам адукаванага арыстакрата, які стварае музыку для царквы і для свецкага грамадства. З'явілася разуменне самастойнай значнасці музыкі, яе здольнасці "будавацца" па асобых законах і быць крыніцай задавальнення. Спецыфіка ўзаемадзеяння культавага і свецкага музычнага прафесіяналізму выявілася ў размежаванні музычна-паэтычнага мастацтва на "*новае мастацтва" (ars nova) і "старое мастацтва" (ars antiqua).* Тэарэтыкам ars nova стаў французскі музыка, паэт і філасоф *Філіп дэ Вітры*, аўтар трактата "Ars nova". Гэтая праца вызначыла новы "вектар" развіцця музыкі, якая адрознівалася ад усталяванай на той час культавай музыкі.

Музыка перастала быць "боскай навукай", яна стала выразнікам зямнога пачатку. Кампазітары, якія працавалі для царквы, запазычвалі з музыкі *ars nova* яе выразны стыль. У XIV ст. у Італіі з'явіўся шэраг яскравых музычных індывідуальнасцей, якія пісалі музыку па натхненні і стваралі ўласныя мелодыі для поліфанічных імшаў. З'явіліся свецкія жанры – мадрыгал, балада. Сярод выдатных музыкаў той эпохі – сляпы арганіст-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віртуоз *Франчэска Ландзіні*, аўтар знакамітых двух- і трохгалосых мадрыгалаў і лірычных балад.

У гэты час складваецца *Нідэрландская (франка-фламандская) поліфанічная школа,* у якой спалучаюцца французская, бургундская і англійская музычныя традыцыі. Тут нарадзілася новя прафесійная школа майстроў поліфаніі, якая распаўсюдзіла свой уплыў на Італію, Іспанію і калоніі Новага свету. У іх музыцы яскрава выявіўся духоўны пачатак, які звязаны з узнёслымі ідэямі каталіцкай веры, яны змаглі апладніць гэтую традыцыю новымі імпульсамі эпохі *ars nova*, надаўшы царкоўнай музыцы незвычайную сілу мастацкай прыгажосці і дасканаласці. Матэматычна рацыянальнае майстэрства поліфанічнай тэхнікі выявілася ў гучанні шматгалосых хароў, якія спявалі без суправаджэння (a capella). Гэтая поліфанія выявіла такую аднапланавасць гучання ў хоры, якую можна дасягнуць толькі на аргане. Раўнавага чатырох або пяці галасоў стварала непарыўную плынь музыкі, дзе адзін голас напластоўваецца на іншы. Гэта была вяршыня харавой лінеарнай поліфаніі.

Інструментальная музыка пачынае вылучацца ў самастойную традыцыю і хутка распаўсюджвацца ў быце, салонах, пры дварах і ў царкве. *Жанр мадрыгала*, які з'явіўся ў XIV ст., найбольш яскрава выявіў новы свецкі вектар развіцця музычнай культуры.

Важнейшай умовай маштабнасці і рэвалюцыйнасці дасягненняў навукі Адраджэння быў гуманістычны светапогляд, у якім дзейнасць па асваенні свету разумелася як складаючая зямнога прызначэння чалавека. Да гэтага трэба дадаць адраджэнне антычнай навукі. Немалую ролю ў развіцці навукі адыгралі патрэбы мараплавання, ужыванне артылерыі, стварэнне гідразбудаванняў і да т.п. Распаўсюджанне навуковых ведаў, абмен імі між навукоўцамі былі б немагчымымі без вынаходства друкарства каля 1445 г.

Першыя дасягненні ў галіне матэматыкі і астраноміі адносяцца да сярэдзіны XV ст. і шмат у чым звязаны з імёнамі *Г.Пеярбаха (Пурбах) і І.Мюлера (Рэгіямантан). Мюлерам* былі створаны новыя, больш дасканалыя астранамічныя табліцы – "эфемерыды", якімі карысталіся ў сваіх падарожжах Калумб, Васка да Гама і іншыя мараплаўцы. Істотны ўклад у развіццё алгебры, геаметрыі на мяжы стагоддзяў зрабіў італьянскі матэматык *Л.Пачолі*. У **XVI** ст. італьянцы *Н.Тарталя і Дж.Кардана* адкрылі новыя спосабы рашэння ўраўненняў трэцяй і чацвёртай ступеней.

Важнейшай навуковай падзеяй XVI ст. стала капернікаўская рэвалюцыя ў астраноміі. Польскі астраном *Мікалай Капернік* у трактаце "Аб абарачэнні нябесных сфер" (1543) адхіліў пануючую геацэнтрычную пталамееўска-арыстоцелеўскую карціну свету і не толькі пастуліраваў вярчэнне нябесных цел вакол Сонца, а Зямлі вакол сваёй восі, але і ўпершыню падрабязна паказаў як, зыходзячы з такой сістэмы, можна растлумачыць усе дадзеныя астранамічных назіранняў. У **XVI** ст. новая сістэма свету ў цэлым не атрымала падтрымкі ў навуковым згуртаванні. Пераканальныя доказы сапраўднасці тэорыі Каперніка прывёў толькі *Галілей*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абапіраючыся на дослед, некаторыя навукоўцы XVI ст. (сярод іх Леанарда, Б.Варкі) выказвалі сумненне адносна законаў арыстоцелеўскай механікі, непадзельна пануючай да таго часу, але свайго рашэння праблем не прапанавалі (пазней гэта зробіць Галілей). *Леанарда да Вінчы* стаў заснавальнікам гідраўлікі. Яго тэарэтычныя вышуканні былі звязаны з пабудовай ім гідразбудаванняў, правядзеннем меліярацыйных работ, будаўніцтвам каналаў, удасканаленнем шлюзаў.

Крытычнае стаўленне да аўтарытэтаў і апора на вопыт ярка выявіліся ў медыцыне і анатоміі. Фламандзец *А.Везалій* у сваёй знакамітай працы “Аб будове чалавечага цела” (1543) падрабязна апісаў цела чалавека, абапіраючыся пры гэтым на шматлікія назіранні пры анатаміраванні трупаў, падвергнуў крытыцы Галена і іншых аўтарытэтаў. У пачатку **XVI** ст. нараўне з алхіміяй узнікае ятрахімія–урачэбная хімія, якая распрацоўвала новыя лячэбныя прэпараты.

У XVI ст. атрымалі развіццё мінералогія, батаніка, заалогія (Георг Бауэр Агрыкола, К.Геснер, Чэзальпіна Рандзелэ, Бялона), якія ў эпоху Адраджэння былі на стадыі збірання фактаў. Вялікую ролю ў развіцці гэтых навук адыгрывалі справаздачы даследчыкаў новых краін, якія ўтрымлівалі апісанні флоры і фауны.

Навука эпохі Адраджэння слаба закранула прадукцыйныя сілы, якія развіваліся па шляху паступовага ўдасканальвання традыцыі. У той жа час поспехі астраноміі, геаграфіі, картаграфіі сталі важнейшай перадумовай вялікіх геаграфічных адкрыццяў, якія прывялі да карэнных змен у сусветным гандлі, да каланіяльнай экспансіі і рэвалюцыі цэн у Еўропе. Дасягненні навукі эпохі Адраджэння сталі неабходнай умовай для генезісу класічнай навукі Новага часу.

### 3. Паглыбленне поглядаў на культуру беларускіх мысліцеляў XVI ст.

XVI – першая палова XVII ст. увайшлі ў гісторыю Беларусі як час найвялікшага культурнага ўздыму. Развіццё беларускага мастацтва ў гэты час было хуткім і бурлівым. У эпоху Адраджэння наглядалася актыўнае засваенне традыцыйнай рэнесанснай культуры, якая ўзбагачалася нацыянальнымі рысамі. Вялікую ролю адыграла багатая спадчына старажытнабеларускіх княстваў. Пашырэнне ўзаемасувязей з заходнееўрапейскімі краінамі, у першую чаргу ў рэлігійных справах, спрыяла распаўсюджанню ра манскага і гатычнага стыляў, а з канца XVI ст. – і барочнага.

На развіццё беларускага мастацтва аказаў ўплыў рэфармісцкі рух (XVI ст.), галоўным чынам у распаўсюджанні светапоглядных канцэпцый (С.Будны, У.Цяпінскі, А.Волан). У процівагу каталіцкай царкве былі адчынены пратэстанцкія вучэльні, а ў 1590-я гг. узніклі праваслаўныя брацтвы ў Магілёве, Вільні, Менску, Брэсце, Гародні. Брацтвы – нацыянальна-рэлігійныя арганізацыі праваслаўнага насельніцтва гарадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яны адчынялі вучэльні, тыпаграфіі, шпіталі; вялі дзейнасць, накіраваную на захаванне культурнай спадчыны ў рамках патрабаванняў праваслаўнай царквы. Высокі ўзровень пачатковай адукацыі на тэрыторыі Беларусі даваў магчымасць беларускай моладзі паступаць ва універсітэты Германіі, Аўстрыі, Італіі, Францыі. Многія славутыя беларусы ў гэты час набывалі вядомасць у свеце.

Культурнае жыццё ў Беларусі XIV–XVI стст. было азнаменавана гуманістычнай дзейнасцю асветнікаў *Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Яна Вісліцкага, Лаўрэнція Зізанія, Андрэя Рымшы.* У гэта час былі створаны “Летапіс Аўраамкі” (2-я палова XV ст.), “Хроніка Быхаўца” (XVI ст.), “Хроніка ВКЛ, Рускага і Жамойцкага” (1520-я гг.), зборнікі законаў (“Судзебнік Казіміра IV”, 1468; “Статуты ВКЛ” – 1529, 1566, 1588 гг.).

Значнай з’явай культурнага жыцця Беларусі пачатку XVI ст. стала дзейнасць беларускага друкара, ураджэнца Полацка Францыска Скарыны**.** Першую сваю кнігу “Біблію” ён надрукаваў у Празе 6 жніўня 1517 г. У 1520 г. Скарына заснаваў друкарню ў Вільні і выдаў “Малую падарожную кніжку”, “Апостал”. Яны былі адрасаваны перш за ўсё свецкаму чытачу. Здабытак Скарыны налічвае 25 выданняў, і ўсе яны адзначаны высокай тэхнікай выканання. Прадаўжальнікамі справы *Ф.Скарыны* сталі Сымон Будны і Васіль Цяпінскі**.**

*Эпоха Адраджэння на Беларусі* – гэта эпоха станаўлення і развіцця *беларускай мовы, нацыянальнай пісьменнасці і літаратуры.* Літаратурным шэдэўрам стала паэма Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”, выдадзеная у 1523 г. У паэме апяваюцца веліч народа і хараство прыроды Беларусі.

Акрамя гэтай паэмы ў рымскі перыяд ім напісана яшчэ 11 вершаў. У 1524 г.ім створана паэма “Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы”, а праз год – паэма “Жыццё і подзвігі Гіяцынта”. У творчай спадчыне асветніка ўвасоблены яго грамадска-палітычныя і эстэтычныя погляды. М.Гусоўскі належыў да творцаў, якія стаялі ля вытокаў рэнесансавага рэалізму.

У гэты ж час (1516 г.) *Ян Вісліцкі* стварае гістарычную паэму “Пруская вайна”. У першай частцы твора паэт сцісла выклаў старажытную гісторыю Польшчы. Другую частку прысвяціў Грунвальдскай бітве, якую падааў у панегірычна-дыдактычным плане з пазіцый дзяржаўнага патрыятызму ў традыцыях еўрапейскай героіка-эпічнай паэзіі. Творца ўславіў гераічнае мінулае, ратную мужнасць воінаў, сцвердзіў ідэю гістарычнай еднасці і неабходнасці ваенна-палітычнага саюзу славянскіх народаў перад іншаземнай пагрозай, падаў вобразы Вітаўта і Ягайлы.

На лацінскай і польскай мовах пісаў мастацкія творы М. Стрыйкоўскі, прсвечаныя гісторыі ВКЛ і Польшчы. Добра вядома ў ХУІ ст. была патрыятычная празаічна-вершаваня хроніка “Пра пачатак, паходжанне, мужнасць, рыцарскія і грамадзянскія справы слаўнага народа літоўскага, жамойцкага і рускага”.

Гераічная эпічнасць – галоўная рыса беларускай літаратуры XVI ст.

У цэнтры грамадска-рэлігійнага руху ў Беларусі знаходзіўся пісьмнік-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палеміст эпохі Адраджэння Мілецій Сматрыцкі, які напісаў шэраг прац з антаезуіцкай накіраванасцю. Найбольш вядомыя яго творы – “Антыграф, або Адказ на з’едлівы трактат” і “Трэнанс, альбо лямант усходняй царквы”.

Абагульненнем яго творчай дзейнасці з’явілася “Грамматики славенския правильное синтагма», выдадзеная ў 1619 г. У ёй Сматрыцкі адстойваў і сцвярджаў правы беларусаў на захаванне сваёй мовы як асновы культуры, абараняў мову і айчынную самабытную культуру ад нападкаў каталіцкіх палемістаў. На працягу двух стагоддзяў “Граматыка” *М. Сматрыцкага* служыла падручнікам усяму ўсходнеславянскаму свету.

Характар і шляхі развіцця беларускага *дойлідства*

У XIV–XVI стст. адбываецца імклівае развіццё дойлідства і выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура). Для яго характэрны шэраг узаемазвязаных кірункаў і стыляў – готыка, рэнесанс, маньерызм. Суіснаванню гэтых стыляў садзейнічалі змены ў жыцці дзяржавы. Уздзеянне аказалі візантыйская і стараруская культура.

Побач з манументальным жывапісам развіваецца і станковы жывапіс. Асаблівай з’явай быў сармацкі партрэт Чалавека ў сармацкім партрэце паказвалі па вызначанай схеме – у парадная вопратцы, у акружэнні розных прадметаў, што не толькі характарызавала мадэль, яе унутраны свет, але і прыналежнасць да таго або іншага саслоўя.

Да відаў выяўленчага мастацтва, характэрных для беларускага Адраджэння, адносяцца таксама графіка і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (мастацкая кафля, ткацтва, апрацоўка металу, дрэва, шкла).

Мастацтва пластыкі XIV–XVI стст. адрознівалася багаццем, разнастайнасцю і высокім узроўнем выканання. Дробная пластыка ў асноўным адлюстроўвала народны побыт (абразкі, крыжыкі, медальёны), выявы Хрыста, Божай Маці, архангелаў. Традыцыі еўрапейскага мастацтва праследжваюцца ва ўбранстве храмаў (алтарная разьба, мемарыяльная пластыка, медальёны. Выявы адрозніваюцца выцягнутымі прапорцыямі і падрабязнай мадэліроўкай формы, эвалюцыяй пластыкі, тонкім адзінствам формы і зместу, рэалістычнасцю.

У XVI ст. – фарміруецца беларуская скульптурная школа – водгулле традыцый мінулага (парушэнне прапорцый, схематызм) і рысы Рэнесанса (прасторавасць, мадэліроўка формы). У мемарыяльнай скульптуры дзейнічае культ продкаў, сарматычны светапогляд (помнікі ў касцёлах, капліцах). Вядомыя імёны скульптараў *Бернарда Занобія, Джавані Цыні, Яна Марыя Моска* і інш. У медальённай справе вылучаюцца пячаткі, медалі, гемы майстроў *Яна Марыя Моска, Дамініка Венетуса, Яна Якаба Караглія, Стэфана ван Голанда.*

Літаратура

*Вахнина, А.П.* Средневековая культура западной цивилизации V–XV вв.: учеб. пособие / А.П.Вахнина; Министерство образования Республики Беларусь, учреждение образования “Белорусский государственный педагогический университет им. М.Танка”. – 2-е изд. – Мінск: БГПУ, 2005. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

93 с.

*Дюби, Жорж*. Средние века: от Гут Капета до Жанны д'Арк (987 – 1460) / Жорж Дюби; пер. с фр. Г.А.Абрамова, В.А.Павлова. – М.: Междунар. отношения, 2000. – 414 с.

*История* Средних веков. Европа / А.Н.Бадак [и др.] – Мінск.: Харвест, 2007. – 285 с.

*Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М.: Мысль, 1982. – 623 с.

*Смолік, А.І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А.І.Смолік; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 275 с.

*Падокшын, С.А.* Беларуская думка ў кантэксце гісторыі культуры/ С.А.Падокшын [навук. рэд. А.С.Майхровіч]; Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 315 с.

*Соколова, М.В*. Мировая культура и искусство: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений/ М.В.Соколова – М.: Академия, 2004. – 368 с.

*Хейзинга, Йохан*. Осень Средневековья: исслед. форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV вв. во Франции и Нидерландах / Йохан Хейзинга; сост. и пер. с [нидерл.] Д.С.Сильвестров. – М.: Айрис-Пресс, 2002. – 537 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма. Культуралагічныя веды ў Новы час (2 гадзіны)

*План лекцыі:*

1. Асаблівасці культуралагічных ідэй у тэорыях заходнееўрапейскіх мысліцеляў.
2. Рацыяналістычны падыход да культурнага працэсу ў беларускіх асветнікаў.

*Мэта лекцыі:* прааналізаваць асаблівасці асноўных культуралагічных ідэй прадстаўнікоў заходнееўрапейскай і айчыннай гуманітарыстыкі Новага часу.

### 1. Асаблівасці культуралагічных ідэй у тэорыях заходнееўрапейскіх мысліцеляў.

XVII–XVIII стст. – гэта гістарычная эпоха, на працягу якой культура заходнееўрапейскіх краін набыла тую развітую форму, што вылучыла Еўропу з астатняга свету, а еўрапейскую культуру ў асобы тып культуры. Рэфармацыя была зародкам культуры новага тыпу. Яна праклала дарогу да пераасэнсавання дагматаў хрысціянства. Духоўная атмасфера ў грамадстве пачала мяняцца. У барацьбе з царквой былі закладзены асновы навуковага прыродазнаўства. Знакамітыя мысліцелі Новага часу Ф. Бэкан, Т. Гобс, Р. Дэкарт, Б. Спіноза, Г. Лейбніц і іншыя вызвалілі філасофію ад схаластыкі і павярнулі яе тварам да навукі. Сярод іх былі і беларускія мысліцелі : С.

Полацкі, А. Вішаваты, К. Вырвіч, Б. Дабшэвіч, Я. Даманеўскі і інш. Яны адстойвалі павагу да навукі, да адукацыі і выхавання, выказваліся за падзел сфер навукі, філасофіі і рэлігіі. Асновай філасофскага пазнання для іх стала не сляпая вера, а розум, які абапіраўся на логіку і факты. Так, Б. Дабшэвіч у якасці фундаментальных прынцыпаў пазнання вылучаў прынцып сумнення і прынцып дастатковай падставы. Хаця хрысціянская рэлігія засталася важнейшым фактарам духоўнага жыцця грамадства, але яе манапольнаму панаванню над усёй культурай прыйшоў канец. Еўрапейская культура стала свецкай.

З Новага часу бярэ пачатак і другая асаблівасць еўрапейскай культуры – яе шматнацыянальнасць, шматмоўнасць. Сярэдневяковая латынь саступіла месца нацыянальным мовам, што, з аднаго боку, узбагаціла еўрапейскую культуру традыцыямі і вопытам народнай творчасці, а з другога – зрабіла дасягненні культуры больш даступнымі для народаў Еўропы. Пачаўся падзел нацыянальных культур, што паслужыла базай развіцця агульнаеўрапейскай культуры, адзінай у сваёй разнастайнасці. У краінах Еўропы фарміруюцца арыгінальныя мастацкія школы і літаратурныя плыні, у якіх па-рознаму знаходзяць выражэнне галоўныя мастацкія стылі таго часу – барока, класіцызм, ракако і сентыменталізм.

Кантакт і ўзаемадзеянне культур – гэта адна з важнейшых умоў культурнага прагрэсу, які вывеў Еўропу ў Новы час на лідзіруючае месца ў свеце.

У XVIII ст. важную ролю ў культуры эпохі Асветніцтва пачала адыгрываць філасофія. І гэта зразумела, бо сама ідэалогія Асветніцтва была распрацавана менавіта філосафамі-асветнікамі Ж. Ж. Русо, Вальтэрам, Д. Дзідро, Ш. Мантэск’ё і інш. Надзвычай хутка пачала развівацца навука, якая разам з філасофіяй лічылася найлепшым увасабленнем магчымасцей чалавечага розуму.

У эпоху Асветніцтва мастацтва стала (у параўнанні з папярэднім перыядам) менш глыбокім і ўзвышаным і ў той жа час, наадварот, больш лёгкім, вытанчаным, павярхоўным. У мастацкай культуры ўзмацнілася своеасаблівая цяга да геданізму, пачуццёвага задавальнення. Мастацтва XVIII ст. стала больш заангажыраваным, бо пачало ўсё актыўней умешвацца ў працэсы грамадска-палітычнага жыцця. Сярод усіх відаў мастацкай культуры на першыя месцы выйшлі музыка і тэатр, якія нават адцяснілі на другі план выяўленчае мастацтва.

У XIX ст. еўрапейская культура Новага часу ўступае ў перыяд спеласці. У большасці краін Еўропы ўсталёўваецца капіталістычная сістэма гаспадарання з уласцівымі ёй формамі эканамічных і палітычных адносін. Буйная машынная вытворчасць патрабуе вялікай колькасці кваліфікаваных інжынераў і рабочых. Таму развіваецца сетка школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. Агульнаадукацыйны і культурны ўзровень мас хутка павышаецца. Пісьменнасць становіцца агульнай культурнай нормай. Паскараюцца тэмпы тэхнічнага прагрэсу.

Навука XIX ст. выступае як класічная сістэма ведаў, асноўныя ідэі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпы якой лічацца канчаткова ўсталяваўшыміся ісцінамі. Падмуркам гэтай сітэмы з'яўляюцца матэматыка і механіка. Вялікіх поспехаў дасягае прыродазнаўства. У біялогіі ўзнікаюць клетачная тэорыя, тэорыя эвалюцыі. З'яўляецца эксперыментальная псіхалогія. Публікуюцца працы па агульнай гісторыі, мастацтвазнаўстве, гісторыі філасофіі, культуры.

У мастацкай культуры адным з галоўных кірункаў становіцца рэалізм. Поспехам карыстаецца жанр рамана, які дазваляе шырока і шматаспектна адлюстраваць рэчаіснасць. У выяўленчым мастацтве рэлігійная тэматыка адыходзіць на другі план. Атрымліваюць распаўсюджванне рамантыка-гераічныя палотны, партрэты і пейзажны жывапіс, сцэны з народнага жыцця, бытавы жанр, сатырычная графіка, гістарычны сюжэт.

Аднак ужо ў сярэдзіне XIX ст. адчуваюцца прыметы крызісу еўрапейскай культуры. Філасофскія працы Шапенгаўэра, К'еркегора, Доўгірда, Лавіцкага, Яжоўскага і іншых мысліцеляў прасякнуты духам ірацыяналізму і песімістычным настроем думак. Фарміруецца так званая буржуазная культура, якая ў мастацтве бачыць сферу карыснага ўкладання і разглядае мастацкія творы толькі як прадметы раскошы і прэстыжнага спажывання.

Расчараванне ў ідэалах, страта веры ў вечныя жыццёвыя каштоўнасці, адыход ад агульназначымых сацыяльных, маральных, эстэтычных арыенціраў усё больш адчуваецца ў еўрапейскай культуры апошняй трэці XIX ст. Атрымлівае росквіт салонны жывапіс, узнікае прымітывізм, выходзіць на сцэну імпрэсіянізм. Ва ўсіх формах мастацкай творчасці набывае папулярнасць сімвалізм, які напаўняе творы таемным містычным сэнсам. З 1880-х гг. у моду ўваходзіць тэрмін “дэкадэнс”. Яго прыхільнікі разважаюць аб заняпадзе культуры, нораваў, дэградацыі мастацтва, бяссілі чалавека перад змрочнымі ракавымі сіламі, якія кіруюць лёсам.

Філосафы-асветнікі распрацавалі даволі стройную канцэпцыю мінулага, сучаснага і будучага чалавецтва. Аснову дадзенай канцэпцыі склалі паняцці “натуральнага стану”, “натуральнага права”, “грамадскага дагавору”, “прыроды чалавека”, розуму, прагрэсу. Паводле гэтай канцэпцыі, эвалюцыя чалавецтва пачалася з “натуральнага стану”, заснаванага на “натуральным праве”, якое, у сваю чаргу, адпавядала “прыродзе чалавека”. Асветнікі разглядалі “прыроду чалавека" ў якасці своеасаблівай сукупнасці такіх псіхалагічных якасцей і маральна-духоўных каштоўнасцей, як свабода, роўнасць, братэрства, любоў, міласэрнасць, справядлівасць, што ўласцівы толькі чалавеку і выдзяляюць яго з жывёльнага свету. Названыя якасці з’яўляюцца натуральнымі, бо яны нараджаюцца разам з чалавекам і адначасова выступаюць яго неад’емнымі, натуральнымі правамі. Без іх і без права на іх чалавек перастае быць сапраўдным чалавекам.

Перыяд “натуральнага стану”, які ахопліваў час існавання першабытнага грамадства, асветнікі называлі “залатым векам”, бо тады, на іх думку, меў месца найвышэйшы росквіт свабоды, роўнасці, братэрства, справядлівасці і інш. Аднак гэтыя прынцыпы не былі поўнасцю гарантаваныя, нярэдка яны парушаліся з-за недахопу любові і з-за



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзмацнення суперніцтва паміж людзьмі. Неабходнасць урэгулявання такой сітуацыі прывяла да ўзнікнення дзяржавы, а разам з ёй – улады, права і законаў. Прычым усё гэта ўзнікла не па волі Бога, а ў выніку “грамадскага дагавору” – свядомага пагаднення паміж людзьмі. Менавіта дзяржава павінна была гарантаваць захаванне прынцыпаў і нормаў “натуральнага права”. Праўда, дзяржава найчасцей дрэнна спраўлялася з такімі абавязкамі і таму ў грамадстве паступова ўзмацняліся розныя несправядлівасці, несвабода, няроўнасць. Асветнікі лічылі, што феадальны лад несумяшчальны з прынцыпамі розуму і “натуральнага права”, а таму яго павінен замяніць больш справядлівы і гуманны дзяржаўны лад. Яны прапаноўвалі праграму пабудовы такога новага грамадства ў “светлай будучыні”, калі зноў расквітнеюць свабода, роўнасць, справядлівасць, братэрства паміж людзьмі. На шляху да такой “светлай будучыні” асветнікі бачылі дзве галоўныя перашкоды – дэспатызм (найперш у форме абсалютнай манархіі) і абскурантызм (крайне негатыўнае стаўленне да асветніцтва і навукі).

На думку асветнікаў, да ліку асноўных сродкаў пабудовы новага грамадства адносіліся адукацыя і выхаванне, а галоўнай прычынай чалавечых няшчасцяў было невуцтва. Таму надзвычай важная роля надавалася навучанню, выхаванню людзей, іх асветніцтву, а таксама кіраўніку дзяржавы – “гасудару-філосафу”, “мудрацу на троне”. Асветнікі распрацавалі таксама канцэпцыю правоў чалавека. Яе асноўныя ідэі знайшлі адлюстраванне ў знакамітай “Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна” (1789), якая была прынята ў пачатку Вялікай французскай рэвалюцыі. У дадзенай дэкларацыі неад’емнымі правамі чалавека былі абвешчаны свабода асобы, слова, сумлення, зафіксавана роўнасць усіх людзей перад законам і права чалавека на барацьбу супраць прыгнечання.

На працягу XVIII ст. у розных краінах свету даволі шырока распаўсюдзіліся ідэі скептыцызму і атэізму. Пачаўся навуковы аналіз Біблії, што стварыла тэарэтычны фундамент для крытыкі рэлігіі. Вялікая французская рэвалюцыя канца XVIII ст. прывяла не толькі да звяржэння абсалютызму, але і да канфіскацыі царкоўных, манастырскіх зямель, адмены царкоўнай дзесяціны. У выніку рэвалюцыі святары атрымалі статус дзяржаўных чыноўнікаў і павінны былі прыносіць клятву на вернасць рэвалюцыйнай уладзе. Спецыяльныя дэкрэты Канвента (1793) увогуле скасавалі ў Францыі каталіцкую царкву як самастойны інстытут. Рэвалюцыянерамі-атэістамі была нават зроблена няўдалая спроба ўвесці новую спецыфічную рэлігію – “Культ Розуму”. Прыхільнікі дэізму – вучэння, паводле якога Бог прызнаецца Сусветным Розумам, які калісьці стварыў усё існае, а пазней ніколі не ўмешваўся ў развіццё свету і чалавецтва, паспрабавалі стварыць “Культ Вярхоўнай Істоты”. Аднак абедзве гэтыя спробы скончыліся беспаспяхова.

XVIII ст. нярэдка называюць “стагоддзем філасофіі”, бо ў тагачасны перыяд менавіта яна займала адно з вядучых месцаў у духоўным жыцці грамадства. Сфарміраваўся своеасаблівы тып філосафа-асветніка, у якім адначасова сумяшчаліся асобныя рысы як філосафа, так і звычайнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніка, а нярэдка і пісьменніка, грамадскага дзеяча. Да ліку найбольш знакамітых і папулярных філосафаў-асветнікаў адносяцца Вальтэр, Ж.-Ж.Русо, Д.Дзідро, Ш.Мантэск'ё і інш.

### 2. Рацыяналістычны падыход да культурнага працэсу ў беларускіх асветнікаў.

Ідэі Асветніцтва і Французскай рэвалюцыі (свабода, роўнасць, культ розуму) па-ранейшаму натхнялі дэмакратычныя колы беларускага грамадства. Асэнсаванне і перадоленне разрыву паміж ідэаламі і рэчаіснасцю становіцца стрыжнем сацыяльна-культурнага развіцця грамадства XIX ст. Глыбокая супярэчнасць ідэала і рэчаіснасці выклікала надзвычай крытычныя адносіны да тагачаснага сацыяльна-палітычнага ладу ў значнай часткі вучоных, дзеячоў культуры. У сваёй творчасці яны адстойвалі гуманістычныя прынцыпы, імкнуліся змяніць духоўную атмасферу грамадства, аказваючы тым самым рэальнае ўздзеянне на пазітыўнае развіццё еўрапейскай культуры.

Ажыўленню грамадскай думкі ў Беларусі садзейнічала распаўсюджванне матэрыялістычных ідэй. Беларускія мысліцелі А. Доўгірд, К. Каліноўскі, М. Лавіцкі, Ф. Савіч, Ю. Яжоўскі і інш. выступалі з крытыкай канцэпцыі аб незалежнасці свядомасці ад матэрыі і духу ад цела. У сваіх працах яны адстойвалі ідэалы свабоды, крытыкавалі антыгуманны і амаральны характар прыгонніцтва, патрабавалі скасаваць ганебнае права аднаго чалавека панаваць над другімі.

Рост нацыянальнай свядомасці народа, актывізацыя барацьбы за вызваленне і выхад на арэну гістарычнай творчасці садзейнічаў развіццю беларускай нацыянальнай культуры. У літаратуру, выяўленчае мастацтва, навуку прыйшла бліскучая плеяда творцаў, якія стаялі на пазіцыях рамантызму, у якім спалучаліся рысы дваранскага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму. Прадстаўнікі беларускага рамантызму арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа.

Філасофская думка Беларусі ў XIX ст. таксама складвалася пад уплывам разнастайных эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурных і ідэйных фактараў, якія ўзніклі ў заходнееўрапейскіх краінах. Станоўчы ўплыў на фарміраванне свядомасці беларускай інтэлігенцыі аказваў вызваленчы рух, які разгарнуўся ў 20—40-я гады. У гарадах нашай краіны было створана некалькі тайных таварыстваў, якія ставілі сваёй мэтай падрыхтоўку ўзброенага паўстання супраць расійскага царызму, выступалі з патрабаваннем сацыяльных і палітычных перамен. Філаматы спрабавалі весці асветніцкую работу сярод працоўных і ўкараненню ў іх свядомасць рэвалюцыйных ідэй.

Беларускія філосафы сцвярджалі гуманістычныя ідэі павагі да чалавека, выхавання і адукацыі на аснове свабоды перакананняў, высокай грамадзянскасці і адказнасці. Так, А.Нарушэвіч адводзіў розуму галоўную ролю ў гістарычным працэсе, а прадметам навуковага даследавання лічыў не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі дзеянні кіраўнікоў і ваеначальнікаў, але і жыццё простага народа. Г.Каніскі прапагандаваў неабходнасць усталявання ў краіне парадку і законнасці, крытыкаваў духоўнае ўбоства тых, хто меў уладу. М.Матушэвіч у сваіх творах асуджаў самавольства пануючых класаў, абараняў чалавечую годнасць простых людзей. Фізіякраты (Г.Млоцкі, М.Страйноўскі, І.Храптовіч і інш.) разглядалі грамадства як натуральны арганізм, што складае частку прыроды; лічылі, што адыход чалавека ад разумных законаў прыроды непазбежна выкліча няшчасці, бедствы і беспарадкі. П.Бжастоўскі, М.Карповіч, І.Яленскі развівалі тэндэнцыі прыродазнаўчага матэрыялізму, радыкальныя сацыяльна-утапічныя ідэі. Для пашырэння ідэй Асветніцтва ў Беларусі шмат зрабіла Камісія народнай адукацыі Рэчы Паспалітай, якая па сутнасці была першым у Еўропе міністэрствам асветы, а таксама выкладчыкі Віленскага універсітэта, народных вучылішчаў. Прагрэсіўныя асветніцкія тэндэнцыі адлюстраваны ў літаратуры і мастацтве, кнігавыдавецкай, культурна-асветнай і навукова-педагагічнай дзейнасці.

Літаратура


*Бэрк, П.* Народная культура Еўропы ранняга Новага часу / Пітэр Бэрк; навук. рэд. А. Ліс.; пер. з англ. мовы І. Ганецкая. – Мінск.: Тэхналогія, 1999. – 380 с.

*Культурология*: учеб. пособие / З.А.Неверова, Т. А. Юрис, Е. П. Нарижная [и др.]; под науч. ред. А. С. Неверова. – Мінск.: Выш. шк., 2004. – 367 с.

*Лабутина, Т .Л.* Культура и власть в эпоху Просвещения / Т. Л. Лабутина; Ин-т всеобщ. истории РАН. – М.: Наука, 2005. – 458 с.

*Мальдзіс, А. І.* На скрыжавнні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова ХУІІ-ХУІІІ ст.) / А. І. Мальдзіс. – Мінск: , 1980. – с.

*Смолік, А. І.* Культура Беларусі XI-XIX стст. Навуковы даведнік / А. І. Смолік. – Мінск: Беларускі універсітэт культуры, 1998. – 182 с.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры : вучэбна-метадычны комплекс / А. І. Смолік, В. М. Сакалова, Л. К. Кухто; М-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. –352 с. : іл.


**Тэма. Трактоўка культуралагічных праблем у ХХ ст. (4 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Інтэрпрэтацыя сутнасці культуры ў творчай спадчыне заходееўрапейскіх культуролагаў.

2. Культуралагічныя погляды расійскіх культуролагаў па праблемах узаеаадносін культуры і цывілізацыі.

3. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта лекцыі:* акрэсліць важнейшыя праблемы сацыякультурнага развіцця сусветнай культуры XX ст.

## 1. Інтэрпрэтацыя сутнасці культуры ў творчай спадчыне заходнееўрапейскіх культуролагаў.

### Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе наступствы

Двадцатае стагоддзе ўвайшло ў гісторыю сусветнай цывілізацыі як эпоха найвялікшых сацыяльных пераўтварэнняў, што кардынальна паўплывалі на лёс многіх народаў. Навука стала яшчэ больш магутным фактарам развіцця постіндустрыяльнага грамадства. Стварэнне квантавай механікі, тэорыі рэлятыўнасці, кібернетыкі, ядзернай энергетыкі, геннай інжынерыі, камп'ютэрнай і лазернай тэхнікі, мноства іншых навукова-тэхнічных навін у корані змянілі навуковую карціну свету і яе ўвасабленне не толькі ў навуковых тэорыях, але і ў разнастайных тварэннях культуры.

Аптымістычнае светасузіранне, абумоўленае поспехамі навуковай думкі, увасобленай у сусветнай прамысловасці і тэхніцы, паслужыла асновай для ўзнікнення характэрнага для чалавека XX ст. адчування касмічнасці свайго быцця. Касмізм – унікальная, найцікавейшая з'ява сучаснай культуры. Значэнне яго пачынае ўсведамляцца толькі зараз, у трэцім тысячагоддзі. У працах вядомых касмістаў У.І.Вярнадскага, А.Л.Чыжэўскага, Тэйяра дэ Шардэна былі пастаўлены прынцыпова новыя праблемы касмічнай ролі чалавецтва, адзінства чалавека і космасу, маральна-этычнай адказнасці падчас касмічнай экспансіі чалавецтва.

Яшчэ адна акалічнасць адрознівае XX ст. ад папярэдніх. Буйныя адкрыцці мінулага рэдка былі звязаныя з развіццём тэхнікі. Яны існавалі аўтаномна, нават тады, калі апярэджвалі прагрэс тэхнікі. Тэхніка таксама развівалася незалежна ад навукі. Часам яны развіваліся паралельнымі курсамі, часам разыходзіліся, але практычна не залежалі адно ад аднаго. У XX ст., асабліва ў яго другой палове, яны немагчымыя адна без адной. Навука стала моцным фактарам развіцця тэхнікі, тэхніка стала навукаёмістай, і абедзве абумовілі далейшы прагрэс вытворчасці. З'яўляюцца атамная энергетыка, генная інжынерыя, пачынаецца засваенне касмічнай прасторы. Усё гэта прымушае не без падстаў называць XX ст. стагоддзем тэхнікі, якая пранікае ва ўсе сферы чалавечага існавання, закранае ўсе формы жыццядзейнасці чалавека.

Можа здацца, што бурнае развіццё тэхнікі ў XX ст. уяўляе сабой урачыстасць розуму і можа стаць асновай шчасця і ажыццяўлення шматвяковых летуценняў чалавецтва. На жаль, гэта далёка не так. Тэхнічны прагрэс, даруючы чалавеку матэрыяльныя выгоды, адымае ў яго чалавечы пачатак, ператвараючы яго спачатку ў прыдатак машыны, затым у абслугоўваючы элемент машыннай вытворчасці. Чалавецтва, якое марыла аб вызваленні ад знясільваючай працы, у чарговы раз выпрабавала расчараванне: яно стала рабом стандарту, якое адняло ў чалавека нават яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святая святых – непаўторнасць пачуццяў. Артэга-і-Гасэт у кнізе “Паўстанне масс” паказвае працэс абязлічвання мас, які адбываецца ў свеце вытворчасці, абсталяванай новай тэхнікай.

Ідэя панавання чалавека над прыродай паставіла грамадства ў ХХ ст. на мяжу экалагічнага крызісу. Перад сучаснай еўрапейскай культурай паўстаюць жыццёва важныя задачы: як захаваць і палепшыць якасць прыроднага асяроддзя пры нарастаючым навукова-тэхнічным уздзеянні на яго? Якімі павінны быць якасці чалавека ў новай экалагічнай сітуацыі? Як ліквідаваць адчужэнне чалавека ад прыроды? Яшчэ Э.Кант адзначаў: “Абавязкі, аднак, мы маем толькі ў дачыненні да людзей. Нежывое цалкам падпарадкаванае нашай самаўпраўнасці. І абавязкі ў дачыненні да жывёл з’яўляюцца такімі толькі ў той ступені, у якой яны трапляюць у кола нашых інтарэсаў”.

З незвычайнай вастрынёй паўстае ў ХХ ст. праблема чалавека: яго месца ў свеце і роля ва ўсіх працэсах, якія выступаюць дваяка: як вынік развіцця ўсёй мінулай культуры і як пачатак наступных эпох. Праз чалавека праходзіць дэмаркацыйная лінія, якая адлучае мінулае ад будучыні.

Сацыякультурнай сістэме постіндустрыяльнага грамадства ўласцівы шэраг негатыўных аспектаў. Перш за ўсё гэта маніпулятыўны характар гэтай сістэмы. Тэхналагічныя дасягненні "інфармацыйнага стагоддзя" прывялі да духоўнага абясцэньвання былой культуры, яе адыходу ад асноўных сфер грамадскага жыцця, да страты для духоўнага стану чалавека. Непрыманне негатыўных наступстваў постіндустрыяльнага грамадства спрыяе ўзнікненню разнастайных альтэрнатыўных формаў жыццеўладкавання: экалагічныя рухі; утапічныя камуны; арганізацыі, што ўзніклі на аснове розных усходніх містычных вучэнняў; авангардныя плыні, звязаныя з пакланеннем музычна-эстрадным тыпам масавай культуры і інш. Гэтыя і іншыя з’явы знаходзяць адлюстраванне ў працах буйнейшых заходнееўрапейскіх вучоных С.Бідні, Р.Карнейра, А.Кафанья, А.Кробера, К.Леві-Строса, Э.Ліча, Б.Маліноўскага, Д.Мёрдака, А.Радкліф-Браўна, Л.Уайта, Д.Фэйблмана інш.

Са сталым індустрыяльным грамадствам звязваюць і бурнае развіццё масавай культуры. У сучасным грамадстве пануюць масмедыя і масавая культура. Праз сродкі масавай інфармацыі масавая культура пранікае ў самыя шырокія слаі насельніцтва, самыя аддаленыя куткі як у рамках нацыянальных супольнасцей, так і ў глабальных маштабах.

Сучасная культуралогія дае мноства азначэнняў гэтай з’яве, бо масавая культура займае вялікую і ўсё больш значную культурную прастору ў свеце. На Захадзе яе называюць папулярнай культурай і індустрыяй забаў, спажывецкай і камерцыйнай культурай. Яе з'яўленне і функцыянаванне часта звязваюць з развіццём сродкаў масавай інфармацыі, з задачамі прапаганды пэўнай ідэалогіі, пэўных каштоўнасцей. Праблемам маскульта прысвечаны працы Артэга-і- Гасэта, А. Моля, Э. Морэн. Яны адзначаюць, што ўнутраным, істотным бокам масавай культуры з’яўляецца памкненне да пошласці – паніжэння ідэалу да ўзроўню асярэдненасці, звычайнасці, штодзённасці. Нездарма нават на радзіме масавай культуры яе называюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часта псеўдакультурай або контркультурай.

У пачатку XX ст. рамантызм, рэалізм, сімвалізм і іншыя кірункі і плыні мастацтва вычарпалі свой патэнцыял і вымушаны былі саступіць месца новым рухам, у якіх адлюстраваўся крызісны стан не толькі культуры, але і сучаснага грамадства ў цэлым. У межах *мадэрнізму* (ад англ.moderne – сучасны, найноўшы) ідуць эксперыментальныя пошукі ў мастацтве, падкрэслена незвычайных сродкаў і форм творчага самаўдасканалення. Прадстаўнікі мадэрнісцкай плыні імкнуліся да пераўтварэння і ўзвышэння сродкамі мастацтва паўсядзённага жыцця чалавека праз стварэнне эстэтычнага гарадскога асяроддзя і прадметаў побыту, якія ўплываюць эстэтычны густ. Творцы імкнуліся супрацьпаставіць безгустоўным прадуктам машыннай вытворчасці артэфакты высокага мастацтва. Мадэрну ўдалося здейсніць пераварот у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і навогул у побытавай сферы, надаўшы ёй эстэтычную прывабнасць.

У мадэрнізме ўзнікае мноства плыней, сярод якіх вылучаецца дадаізм, кубізм, *прымітывізм, сюрэалізм, фавізм,* футурызм, *экспрэсіянізм, прымітывізм. Іх* эстэтычную і светапоглядную пазіцыю паказалі К. Кёльвіц, Э. Кірхнер, Ф. Марк, Э. Мунк, Э. Нольдэ, М. Пехштэйн і інш.

**2. Культуралагічныя погляды культуролагаў па праблемах узаеамадносін культуры і цывілізацыі.**

У складаных канфігурацыях канцэпцый культуры значнае месца займаюць тэорыі, з дапамогай якіх культуролагі спрабуюць вызначыць сутнасць і змест сацыяльна-культурных працэсаў. Да іх у першую чаргу варта аднесці тыпалогію культур і канцэпцыю культурна-гістарычных тыпаў. Важнейшыя ідэі дадзеных канцэпцый прадстаўленыя ў вучэннях такіх мысліцелей, як М.А.Бердзяеў, М.Я.Данілеўскі, Л.П.Карсавін, П.М. Сарокін, В.С. Сцёпін, і інш. Яны па-рознаму трактуюць сутнасць і змест цывілізацыі і культуры.

Іх тэарэтыка-метадалагічныя падыходы сведчыць аб тым, што культуры і цывілізацыі ўяўляюць сабой вельмі складаныя амбівалентныя феномены сацыяльнага жыцця, ад узаемадзеяння якіх залежаць лёсы ўсяго чалавецтва. У значнай ступені ў сучасную эпоху актуалізуецца праблема самазахавання і паступальнага развіцця агульнанацыянальных цывілізацый і культур.

У сувязі з гэтым тэарэтычны аналіз розных дыскурсіўных практык па праблемах узаемаадносін культуры і цывілізацыі з'яўляецца вельмі важным для будучых даследчыкаў культурных працэсаў.

Сучасная цывілізацыя з яе ладам жыцця, сацыяльнымі і нацыянальнымі ўзрушэннямі выклікае ўзмацненне ўнутранай дысгармоніі чалавека, разбалансаванасці яго адносін з навакольным асяроддзем, спараджае выбухі стрэсавых сітуацый, дэструктыўнасці, бездухоўнасці, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Такі стан грамадства і асобы ў культуралогіі прынята лічыць крызісам культуры. Аб заняпадзе культуры задоўга да сённяшняга дня пісалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ф. Ніцшэ, О. Шпенгляр, М.Бярдзяяў і шэраг іншых мысляроў XIX-XX стст. Падчас крызіса культуры, адзначалі яны, змяншаецца яе творчы дух, ствaральны патэнцыял, а таксама здольнасць актыўна ўплываць на грамадскія з’явы і працэсы. У такі перыяд культура страчвае частку сваіх функцый, не можа задаволіць духоўныя запатрабаванні соцыума, прапанаваць грамадству найбольш апдпаведныя ідэалы і маральна-духоўныя каштоўнасці. Прадстаўнікі розных сацыяльна-гуманітарных навук імкнуцца выявіць прычыны крызіса, яго формы і наступствы. Значная колькасць культурологаў лічаць заканамерным крызіс культуры. Так, расійскі культуролаг М.Я.Данілеўскі мяркаваў, што культура як і пэўная расліна ў сваім развіцці праходзіць шэраг этапаў: зараджэнне, квітненне, пладанашэнне і разбурэнне . Так, і пэўныя тыпы культуры ўзнікаюць, развіваюцца і паступова прыходзяць у заняпад. Аналагічных поглядаў прытрымліваўся і нямецкі культуролаг О.Шпенглер, які разглядаў культуру як замкнёны арганізм. Паводле яго, культуры ў сваім развіцці праходзяць усе асноўныя стадыі жыццёвага цыклу – нараджэнне, росквіт, заняпад. Поўны цыкл існавання пэўнага тыпу культуры, лічыў ён, адбываецца прыблізна за адно тысячагоддзе. Пасяля гэтага гістарычны тып культуры выраджаецца ў сваю супрацлегласць – цывілізацыю дзе пануе тэхніцызм і сцыентызм, бяздушнасць, а на змену творчасці і развіцця прыходзіць бясплоддзе і аксцяненне; людзі паступова ператвараюцца ў бязлікія істоты. Х.Артэга-І-Гасэт назваў такога індывіда масавым чалавекам, у якога прымітыўнае мысленне, стандартныя паняцці і ўяўленні. Для масавага чалавека ствараецца і масавая культура, асноўнымі рысамі якой з’яўляюцца: прымітывізацыя чалавечых адносін; культ моцнай асобы, грошай, поспеху, асабістага ўзбагачэння; прапаганда канфармізму ў грамадскай свядомасці, жорсткасці, насілля, сексу; выкарыстанне разнастайных паўзабароненых і ўзбуджаючых тэм, вобразааў і мастацкіх сродкаў; штучная забаўляльнасць, натуралізм і г.д. Тыповымі героямі маскульта з’яўляюцца ўсякія супермэны (Джэймс Бонд, Тэрмінатар, Чалавек-Павук і інш.), разнастайныя секс-сівалы.

Цікавую канцэпцыю крызіса культуры прапанаваў амерыканскі культуролаг Уільям Огбарн. Ён грунтоўна вывучаў уздзеянне змен у галіне тэхналогіі на культуру і прыйшоў да высновы, што духоўная культура (у тэорыі Огбарна яна называецца адаптыўная) звычайна змяняецца марудней, чым матэрыяльнае. У сваёй тэорыі сацыяльнага зрушэння ён вылучае два аспекты – матэрыяльны і нематэрыяльны. Матэрыяльная культура ўключае будынкі, збудаванні, жыллё, сродкі камунікацыі, транспарт, вынаходніцтвы, інавацыйныя тэхналогіі і інш. Да кампанентаў нематэрыялнай (адаптыўнай) культуры навуковец адносіць сацыяльныя інстытуты (сям’ю, царкву, навучальны ўстановы, сістэму каштоўнасцей); абрады, норавы, вераванні, нормы, ўяўленні; палітычныя інстытуты (урад, грамадскія арганізацыі, лобі, палітычныя партыі). Галоўная ідэя У.Огбарна: культурнае спазненне адбываецца тады, калі змены ў матэрыяльным жыцці грамадства апярэджваюць трансфармацыю нематэрыяльнай культуры (абрады, рытуалы,філасофскія сістэмы, законы і формы кіравання). Як лічыць Огбарн,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта прыводзіць да пастаяннай неадпаведнасці паміж развіццём матэрыяльнай і адаптыўнай культуры, і ў выніку ўзнікае мноства нявырашаных сацыяльна-культурных праблем. Для апісання такой сітуацыі навуковец уводзіць паняцце “культурны лаг”.

Аўтар артыкула падзяляе асноўныя палажэнні тэорыі сацыяльнага зрушэння Сапраўды ў XX ст. еўрапейская цывілізацыя дасягнула ўнушальных поспехаў у развіцці матэрыяльнай сферы. Паводле тэорыі хваль у развіцці чалавечай цывілізацыі, “першая хваля” – аграрная рэвалюцыя, адбывалася 10 тыс. гадоў назад. За гэты перыяд адбыўся пераход ад качавога лада жыцця да аседлага, ад жывёлаводства да земляробства. “Другая хваля” – індустрыяльная рэвалюцыя – пераўтварыла чалавечае грамадства ў індустрыяльнае. Гэта эпоха ахоплівае ўсяго толькі 300 гадоў (у 33 разы хутчэй). І “трэцяя хваля” – новая тэхналагічная, ці камп’ютарная рэвалюцыя – самая хуткая па тэмпах. Па меркаванню Э.Тофлера, за 25-30 гадоў яна карэнным чынам створыць новую цывілізацыю, знішчыўшы індустрыяльны свет. Японскі навуковец Е.Масудэ спрабуе выявіць прыкметы інфармацыйнага грамадства: а) масавая вытворчасць новай інфармацыі, што дазволіць замяніць чалавека на разумныя машыны (кікборг); б) ажыццяўленне дынамічнага кантролю за вытворчасцю, распаўсюджаннем, спажываннем неабходнай інфармацыі; в) стварэнне комплекснай нарматыўнай інфармацыі; г) фарміраванне сетак кагнітыўнай інфармацыі (уключэнне кожнага чалавека ў пазнавальныя працэсы і практычную дзейнасць). Як бачна, Е.Масудэ не адводіць месца працэсу фарміравання духоўных якасцей чалавека. Швейцарскі філосаф Г.Эйхельберг параўновае 50-тысячную гісторыю чалавецтва з бегам на 60-кіламетровую дыстанцыю, пры гэтым умоўна прыраўновае 10 тыс. гадоў да 1 км. Большая частка гэтай дыстанцыі апынецца за межамі цывілізацыі. Толькі на 58 км. з’явяцца першыя прылады працы і пячорныя малюнкі. На 60-м кіламетры ўзнікае земляробства, за 200 метраў да фініша сфарміруецца рымская цывілізацыя. Апошнія 10 метраў будуць адзначаны з’яўленнем керасінавай лямпы і толькі на самым фінішы еўрапейцы пачнуць выкарыстоўваць электрычную энергію, навучацца кіраваць тэрмаядзернымі працэсамі, асвойваць космас і г.д. Адным словам, у XX ст. еўрапецы стварылі тэхнагенна-спажывецкую цывілізацыю, дзе эканоміка адыгрвае выключную ролю. Укараненне ў быццё прынцыпа першынства эканомікі над іншымі сферамі сацыяльнага жыцця спарадзіла прымітыўны тып чалавека – Homo echanomicus, для якогоа прыбытак і грошы сталі меркай, матывацыяй жыццёвых арыентацый і ўчынкаў. У еўрапейскай індустрыяльнай цывілізацыі амаль усё, у тым ліку чалавечае цела, дух і душу, разглядаюць праз прызму камерцыйнага інтарэса, запамятаўшы, што эканоміка толькі частка грамадскага жыцця.

Беларусь як частка еўрапейскай супольнасці адчувае на сабе імклівыя змены ў матэрыяльнай сферы. Так, дастаткова прасачыць за зменамі, якія адбываюцца ў мікраэлектроніцы. Вядома, што першая інтэгральная сістэма на крэмніі была пабудавана ў 1959 г. амерыканскімі інжэнерамі Д. Кілбі і Р. Нойсам .Недасканалыя 50 гадоў назад сёння высокапрадуктыўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мікрачыпы хутка ператварыліся ў важкны інструмент ў многіх галінах навукі і вытворчасці. На мікрачыпах сёння працуюць камп'ютары і аўтамабілі, медыцынскія прыборы, мабільныя ўстройствы і нават цацкі. Удасканаленне тэхналогій мікраэлектронікі адбывалася сямімільнымі крокамі. Так, калі ў 2000 г. колькасць транзістараў ў адной інэгральнай схеме дасягала 43 млн., то ў 2004 г. яно склала 4,3 млрд. Хуткасць каналаў передачы інфармацыі ад 10 гігабіт у секунду ў 2000г. прыблізна за 12 гадоў вырасла ў тысячу разоў – да 10 000 гігабіт (Міх-я с. 11). Інтэрнэт стаў паўнавартаснай структурнай часткай беларускай медыясістэмы, яго ўплыў імкліва ўзмацняецца. Так, у 2010 г. у Беларусі інтэрнэтам карысталася амаль палова жыхароў краіны – каля 4 млн., што ў 2,5 разы болей, чым у 2005 г. Як бачна, змены ў матэрыяльных кампанентах культуры адбываюцца імкліва. У мінулыя стагоддзі грамадства мела больш часу для прыстасавання да навацый і праверкі розных спосабаў ажыццяўлення гэтых мер. Хуткі тэмп кардынальных змен у матэрыяльным жыцці грамадства не дазваляе духоўнай культуры так хутка змяніць карціну свету, сістэму нарматыўна-каштоўнасных адносін, формы кіравання грамадствам.

Менавіта таму зваротным бокам пераможнага шэсця цывілізацыі становіцца духоўная дэградацыя чалавека. Культурны лаг дакладна характарызуе сацыякультурную сітуацыю ў сучасным беларускім грамадстве. Разрыў паміж імклівымі зменамі ў матэрыяльнай культуры ўскладніўся разбурэннем савецкага тыпу культуры. На этапе крызіса савецкай культуры зместам сацыякультурнай дэструкцыі з'яўляліся: разбурэнне склаўшыхся сацыяльна-культурных інстытутаў, змены каштоўнасна-сэнсавага ядра монастылістычнай савецкай культуры, зніжэнне узроўня сістэмна-іерархічнай структурыраванасці, сладанасці і поліфункцыянальнасці культурнага комплекса беларускага грамадства, змена сістэмы патрэбнасцей, мэт, матывацый, дамініраванне адмоўна накіраваных экзістэнцыяльных станаў асобы. Дэградацыя падсістэмы каштоўнасных арыентацый, традыцыйнай маралі выклікала да жыцця масіфікацыю разнастайных форм дэструкцыі сацыяльнага і асобаснага характара: аномію, агрэсію, бунт, канфармізм, рытрытызм, рытуалізм, эскапізм і інш. Адбываўся пераход ад традыцыйнай культуры беларусаў (у цэнтры якой каштоўнасці любові, дабра, справядлівасці, узаемадапамогі, спагады і інш.) да цывілізацыі (заснаванай на каштоўнасцях аўтаноміі, спажывання і геданізма). Наступствы гэтага перахода выражаюцца ў прыярытэце рацыянальных рэгулятараў (розум, закон) над маральнымі (сумленне, маральная адказнасць), што вызваляе ад усялякай адказнасці як вытворцаў, так і іх спажыўцоў. У выніку у беларускім грамадстве назіраецца ўзрастанне сацыяльна-негатыўных дэвіацый (амаральныя ўчынкі, п'янства, наркаманія, суіцыд, злачынствы і інш.). Па дадзеных крымінальнай статыстыкі, у рэспубліцы ў 2008 г. у параўнанні з 1990 г. зарэгістраваная агульнае злачынства павялічылася ў 2,3 разфы ( у 1990 – 75 699, а ў 2008 – 158 506 злачынстваў). Сярод краін СНД Беларусь па ўзроўню зарэгістраванага злачынства займае 2-е месца пасля Расіі. Штогод рост злачынства павялічваецца на 8 %. Да крымінальнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасці прыцягнута 73 тыс. чал. Наша краіна наблізілася да сусветнага крытычнага ўзроўню злачынства. Акрамя злачынства, актуальнай сацыяльнай праблемай з'яўляецца алкагалізацыя насельніцтва. За апошніх 18 гадоў узровень спажывання алкаголю павялічыўся з 5,7 літра да 12, 4 – на душу насельніцтва (рэальны ўзровень 16 літраў). 83 % навучэнцаў і студэнтаў з'яўляюцца актыўнымі спажыўцамі алкаголю. Гэта перавышае ў 2 разы еўрапейскі узровень. Сусветная арганізацыя аховы здароў'я вызначыла, што пасля 8 літраў наступае крытычны ўзровень, калі пачынаецца эканамічная, культурная і дэмаграфічная дэгралацыя грамадства.

Дастаткова шырокае распаўсюджанне набыло спажыванне наркотыкаў. Іх спажыўцамі з'яўляюцца маладыя людзі ва ўзросце 16-24 гады (74%). Сярод наркаманаў: навучэнцы ПТУ – 22%, тэхнікумаў і каледжаў – 17%, школьнікі – 15 %, студэнты – 8 %, беспрацоўныя – 6 %

Такім чынам, чалавек XXI ст. фарміруецца масавай, а не адаптыўнай культурай, якая аперыруе прымітыўнымі, прамалінейнымі і нярэдка агрэсіўнымі знакамі і сімваламі, якія праз апеляцыю да форм архетыпічных станаў пераўтвараюць свет чалавека і яго самога. У выніку фарміруецца новы ідэал чалавека, які ідзе па жыцці аўтаномна, з аглядкай толькі на асабістыя інтарэсы, каб з дапамогай спажывання дасягнуць адзіна значных геданістычных мэт. Гэта яўна выражаны тып носьбіта масавай свядомасці, абмежаваны, прагматычны, самаўлюблёны, зямны, пачуццёвы, зарыентаваны цывілізацыяй на спажывецтва.

Прычын адставання духоўнай культуры ад матэрыяльнай шмат. Па-першае, ў беларускім грамадстве маюцца кансерватыўныя сацыяльныя групы, якія імкнуцца абараніць свае ідэі і каштоўнасці ад уздзеяння матэрыяльнай культуры (розныя рэлігійныя канфесіі, палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі). Па-другое, беларускае грамадства складаецца з сацыяльных груп, якія маюць гдыбока розныя інтарэсы. Па-трэцяе, наяўнасць культурнага лага тлумачыцца прывачкамі і інерцыяй, якія ўласцівы чалавеку.

Літаратура

Массовая культура: учеб. Пособи / К. Акопян, А. В. Захаров, С. Я. Каргалицкая и др. – М.: 2004. – 217 с.

Огборн, У. Социальные изменения / У.Огборн. –. Manchester; New York, 1989. – 364 p. .

Ортега-и-Гассет, Х. Восстание масс: Сборник / Х. Ортега-и-Гассет; пер. с исп. – М.: ООО «Издательство АСТ», 2002. – 509 с.

Тоффлер, Э. Третья волна / Э.Тоффлер. – М.: АСТ, 2002. – 781 с.

Шпенглер, О. Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории. В 2 ч. – Ч.1.: Образ и действительность / Пер. с нем. Н. Ф. Гарелин / О. Шпенглер.— Минск.: Попурри, 1998.— 988 с.; Т. 2: Всемирно-исторические перспективы / Пер. с нем. И. И. Миханькова.— М.: Мысль, 1998.— 607 с.

Masuda, Y. The Information Society as Post-Industrial Society / Y. Masuda. – Washington, 1981. – 483 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

З сярэдзіны XX ст. у духоўным жыцці развітых краін, якія ўступілі ў постіндустрыяльную эпоху, выразна праяўляецца кірунак, што атрымаў назву *постмадэрнізм*. Індустрыялізацыя, урбанізацыя, сусветныя войны закладвалі перадумовы глабалізацыі сацыякультурнага працэсу, а таксама звязаных з гэтым праблем. Індустрыяльнае грамадства набірала сілу, падрыхтоўваючы глебу для постмадэрнізму. Постмадэрнізм афармляецца як агульны кірунак заходняй культуры ў 70-х–80-х гг. Да найбольш істотных тыпалагічных рыс культуры постмадэрнізму трэба аднесці тэхніцызм, рацыяналізм, сінтэз "высокай" і "масавай" культур, свецкі характар сацыяльнага жыцця, інтэгратыўнасць сацыякультурных працэсаў. Культуру постмадэрнізму нельга разглядаць як асабліва заходнюю з'яву, хоць пераважная роля Захаду тут відавочная. У постмадэрне знайшлі адлюстраванне таксама традыцыі Усходу, Лацінскай Амерыкі і Афрыкі.

Постмадэрн – гэта культура інфармацыйнага (постіндустрыяльнага) грамадства. Адметнымі рысамі такога грамадства з'яўляюцца пераважнае значэнне інфармацыі ў дачыненні да вытворчасці, рэсурсаў, капіталу; вялікая хуткасць, якая адбываецца ў грамадстве, змен; камп'ютэрная рэвалюцыя; перавага рацыянальнага спосабу засваення рэальнасці над пачуццёвым. Узнікненне цывілізацыі прывяло да падзелу навукі і мастацтва, гэта значыць да рацыянальна-лагічнага, сэнсавага і пачуццёва-вобразнага, эмацыйнага засваення рэальнасці. XX ст. у значнай ступені ўзмацніла гэты падзел.

Культура інфармацыйнага грамадства – гэта экранная культура, што прыйшла на змену пісьмовай. Гэта прынцыпова іншы спосаб фіксавання і перадачы інфармацыі, асаблівасць якога заключаецца галоўным чынам у хуткасці яе распаўсюджання. Дадзеная акалічнасць вядзе да паступовага сцірання граняў паміж цэнтрам сусветнай культуры і перыферыяй, а гэта, у сваю чаргу, спараджае універсалізацыю выявы жыцця і выявы думкі. З іншага боку, гэтыя змены вядуць да адраджэння этнічных культур перыферыі, а таксама да спроб пабудовы розных варыянтаў мастацкай карціны свету. Перыяд постмадэрнізму ў мастацкай культуры ўяўляе масу нявырашаных пытанняў, звязаных з праблемамі перыядызацыі, тыпалагізацыі, марфалогіі мастацтва.

Інфармацыйнае грамадства спараджае лепшы ад ранейшага спосаб засваення рэальнасці. Гэты факт выразна прасочваецца ў мастацкай культуры постмадэрнізму, у першую чаргу ў яе марфалогіі. Выяўленчае і пластычнае мастацтва, музыка і літаратура, як, зрэшты, і іншыя прасторавыя і часавыя віды мастацтва, саступаюць свае пазіцыі прасторава-часавым сінтэтычным відам. Найбольш ярка тыпалагічныя рысы постмадэрна выяўляюцца ў кіно, тэлебачанні, папулярнай або рок-музыцы, мастацтве камп'ютэрнай графікі. Тым не менш нельга не згадаць аб спецыфіцы такіх відаў мастацтва, як жывапіс, скульптура і архітэктура ў эпоху постмадэрна.

Мастацкая культура перыяду постмадэрнізму складаная і шматстайная ў сваіх праявах, якая ў 60 – пачатку 70-х гг. уключала ў сябе такія кірункі, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мінімальнае мастацтва, рэдзі-мэйд, хэпенінг, перформанс, лэнд-арт. Усе гэтыя кірункі аб'ядноўвае імкненне вылучыць сябе як антымастацтва. Сусветна вядомымі прадстаўнікамі постмадэрнізма з'яўляюцца Д. Барнс, Р. Бофіл, Т. Браун, П. Булез, Р. Вентуры, Ж.-Л. Годар, Ч. Джэнкс, М. Мерц, М. Паладзіна, П. Шыраішы, Р. Шапіно, У. Эка і інш. "Эстэтыка бунту" не прыцягвала мастакоў аж да канца 60-х гг., аднак і пасля гэтага жывапіс заставаўся пераважна элітарным відам мастацтва. У той жа час сам падыход да рэалізацыі творчых задум мастакоў гэтых кірункаў сведчыць аб іх прыналежнасці да постмадэрнізму. Для іх было характэрна пераважанне акта тварэння над самім вынікам. Іншаму кірунку, да якога адносяцца такія мастакі, як Э.Рэйнхардт, Фрэнк Стэла, Барнэт Ньютан, уласціва імкненне да спрашчэння формаў і колеравай гамы, што ўсё больш ператварала іх карціны ў аднастайную паверхню. У поп-арце назіраецца нейкае адраджэнне традыцый дадаізму: уключэнне ў карціну асобных прадметаў. Гэта было спробай разбурыць аднамерную плоскасную ўмоўнасць грубай рэальнасцю (заснавальнікі поп-арта – Джэспер Джонс і Роберт Раўшэнберг). Лучыо Фантана і Альберта Буры дайшлі да прамога арэчаўлення карціны і аднайменнага акта яе знішчэння. Апошняе заслугоўвае таго, каб быць згаданым хоць бы толькі таму, што для лёсу жывапісу постмадэрна носіць сімвалічны характар.

Падобныя тэндэнцыі назіраюцца і ў скульптуры. Цікавыя ў гэтым плане працы скульптараў Навума Габо і Жана Тэнглі. Так, Н. Габо стварыў незвычайна прыгожыя скульптуры, карыстаючыся даволі простымі геаметрычнымі элементамі. Працы Габо рассоўваюць прастору фону і нясуць адчуванне поўнасці часу і бясконцасці свету. Створаныя з мігатлівых, пераліўных нітак, складнікаў мякка дэфармаваных плоскасцей, гэтыя творы нагадваюць вытанчаныя выявы касмічных аб'ектаў. Супрацьлегласць гэтым вытанчаным канструкцыям уяўляюць працы Ж. Тэнглі, швейцарскага скульптара. У 1960 г. Тэнглі на вернісажы ў Нью-Йорку прадставіў сваё стварэнне – вялізны будынак, які складаецца з розных частак рухавіка аўтамабіля, слоікаў з-пад кока-колы, сапсаваных парасонікаў, цацак, яшчэ прыдатных да ўжывання, састарэлых мадэляў гаспадарчых тавараў. Усе гэтыя элементы, злучаныя неверагоднай выявай, на вачах здзіўленай публікі пачыналі бязладна рухацца. Не паспявалі гледачы наглядзецца на гэты дзіўны твор, як маэстра простым націскам кнопкі падаваў каманду, і машына пачынала эфектна знішчаць саму сябе.

Мастацтва постмадэрнізму ў Савецкім Саюзе звязана з імёнамі такіх мастакоў, як М.Шамякін, І.Якерсан, М.Гробман, Г.Худзякоў, У.Сітнікаў, выдатным кінарэжысёрам А. Таркоўскім. Кінематограф у цэлым можна разглядаць як своеасаблівы знак постмадэрна. Фільм "Люстэрка" А.Таркоўскага – найболей паказальны прыклад. У карціне практычна няма сюжэта. Відавочна, што задума навеяна ўспамінамі аб дзяцінстве аўтара фільма (доўгія бязлюдныя планы хат, краявіду, становішча). Тут толькі адзіная "дзеючая асоба" – вецер, рух паветра. Яго нельга перадаць у кіно гэтак жа, як колер або гук, але менавіта гэты "герой" звяртае нашу ўвагу. Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.Таркоўскага фільм "Люстэрка" – гэта не фільм аб дзяцінстве, а своеасаблівы сакральны акт вяртання ў дзяцінства, вяртанне ў адчуванне дзяцінства. Думка мастака праходзіць дзесьці за гранню слоў, відэа- або музычнага рада. Дыялогі гучаць неяк адхілена, далёка. Няўлоўна, як рух паветра, прасочваецца аўтарам светаадчуванне дзіцяці. Пошук згубленай некалі гармоніі прымушае "пракручваць" у галаве адны і тыя ж эпізоды, фразы, зрокавыя выявы дзяцінства, калі на кожнае пытанне можна было атрымаць вычарпальны адказ. У дадзеным выпадку А.Таркоўскі паўстае як "рэч у сабе", ён творча самадастатковы, ён – галоўны герой карціны.

Постмадэрнізм у эстэтычным плане выступае як засваенне вопыту мастацкага авангарда. У мастацтве постмадэрнізму сціраюцца грані паміж высокім мастацтвам і кітчам. Постмадэрнізму ўласціва адначасовая арыентацыя на масу і эліту. І калі ў кінематографе грань паміж элітарным і камерцыйным пралягае досыць выразна, то ў музыцы ўсе згаданыя прыметы спалучаюцца найбольш гарманічна. Гаворка ідзе аб так званай папулярнай, або рок-музыцы, з'яве, якая аказвае значны ўплыў на заходнюю культуру другой паловы XX ст. і па сваім значэнні далёка выходзіць за рамкі звычайнага музычнага жанру. Так, рок-музыка спалучае ўсе найбольш істотныя характарыстыкі постмадэрнісцкага мастацтва. Яе варта разглядаць як з'яву унікальную, спароджаную культурай постмадэрна. Яе гісторыя пачынаецца ў 50-х гг. з немудрагелістага рок-н-рола і рытм-н-блюза. У першую чаргу тут злучыліся розныя этнакультурныя традыцыі, галоўным чынам, еўрапейскія і афрыканскія, што не выключае і іншых. Рок-музыка нарадзілася і развівалася шмат у чым дзякуючы навукова-тэхнічнаму прагрэсу, эвалюцыі гукавытворчых і запісваючых прылад. Вялікае значэнне (асабліва ў 60 – пачатку 70-х гг. ) меў непасрэдны візуальны кантакт гледача і артыста. Манера выканання, паводзіны на сцэне і ў зале прыводзілі да нейкага энергаабмену паміж выканаўцамі і слухачамі, а сам канцэрт ператвараўся ў акт сумеснага тварэння, і ў гэтым плане працэс стварэння музычнага твора ўсякі раз набываў унікальны характар. Наколькі папулярныя былі такія мерапрыемствы, сведчыць той факт, што, напрыклад, на знакамітым фэсце ў Вудстоку ў 1969 г. сабраліся каля 500 тыс. гледачоў.

Рок-н-ролам называюць не толькі досыць вузкі музычны кірунак, які сфарміраваўся ў сярэдзіне 50-х гг. у ЗША, але галоўным чынам увесь спектр яго позніх трактовак, удасканаленняў і дадаткаў, па-першае, і вызначаную выяву жыцця, думкі, характар светаўспрымання і спосабы матывацыі, па-другое. У гэтым сэнсе рок-музыка найбольш выразна дэманструе сціранне граняў паміж сферамі духоўнай культуры і ўзроўнямі ўсвядомленасці.

І калі музыка ў 60-х гг. аб'ядноўвала асобныя групы моладзі па прымеце ўласна музычных прыхільнасцей, а таксама звязаных з гэтым жыццёвых арыенціраў, то зараз жыццёвыя арыенціры набываюць большае значэнне. Групы, якія найбольш выразна і таленавіта адлюстроўвалі ў сваёй творчасці згаданыя арыенціры, атрымалі назву "культавых". У розны час да такога роду калектываў адносіліся "Бітлз", "Ролінг стоўнз", "Секс пістолз", "Ю-2", "Нірвана" і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, постмадэрнізм заметна паўплываў на ідэалагічнае і рэлігійнае жыццё, літаратуру і мастацтва, на гуманітарныя веды. Постмадэрнісцкая ментальнасць складвалася як пераадоленне не толькі класічных, але і мадэрнісцка-авангардных установак і арыентацый, як адаптацыя духоўнай дзейнасці да ўмоў сталага дэмакратычнага грамадства, якое адрозніваецца плюралізмам у самых разнастайных сферах быцця.

Постмадэрнізм не адмаўляе ні мадэрнізм, ні іншыя культурныя парадыгмы, але знішчае тую статусную іерархію, вяршыню якую займалі творцы і эксперты, а масам прыходзілася знаходзіцца ў падножжы. Адкідваецца і розніца паміж цэнтрам і перыферыяй, паміж стваральнікамі культурных твораў і аўдыторыяй і нават паміж дасканалым, ці высокім, у мастацтве і выпадковым, ці паўсядзённым. У гэтай плыні не прызнаецца "дыктатура навізны і прагрэсу", адсутнічае клопат пра чысціню мастацкай з'явы, дапускаецца і нават заахвочваецца існаванне самых разнастайных элементаў.

Адметнай асаблівасцю постмадэрнізма з'яўляецца плюралізм. Мноства становіцца нормай жыцця, а адзіная сістэма ідэалаў выглядае ўсё больш утапічнай ідэяй. У мастацкай культуры прынцып плюралізму рэалізуецца аб'яднаннем у адным творы вобразаў, матываў і мастацкіх сродкаў розных гістарычных эпох, рэгіёнаў і субкультур, змешваннем розных стыляў і жанраў. Дзейнасць творцы разглядалася як спосаб удыхнуць жыццё ў старыя культурныя нормы, як своеасаблівы шлях дыялагічных зносін паміж разнастайнымі тыпамі культур. Постмадэрністы адмовіліся ад рацыяналістычнага падыходу, ад усякіх ацэнак, абмежаванняў, рэгламенту, упарадкаванасці, нормаў, каштоўнасных арыентацый. Сярод іншых характ арыстык асаблівасцей мастацкай культуры неабходна адзначыць геданізм, тэатралізацыю культуры, змешванне высокага і нізкага, элітарнага і масавага, арыентацыю на сучасныя тэхналогіі. Адначасова трэба сказаць, што для свядомасці прадстаўнікоў постмадэрнізма характэрны павярхоўнасць, адсутнасць цэласнасці і выразных каштоўнасных крытэрыяў творчасці, маральны рэлятывізм.

Літаратура

*Андреев, Л.Г.* Сюрреализм: история, теория, практика / Л.Г.Андреев. – М.: Гелеос, 2004. – 350 с.

*Арнольдов, А.И.* Цивилизация грядущего столетия: культурологические размышления / А.И.Арнольдов; Ин-т педагогики соц. работы РАО. – М.: Грааль, 1997. – 326 с.

*Власов, В.Г.* Стили в искусстве: архитектура, графика, декоративно-прикладное искусство, живопись, скульптура: словарь: в 3 т. / В.Г.Власов. – СПб.: Кольна, 1995–1997. – 3 т.

Данилевский, Н.Я. Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому / Н.Я.Данилевский. – СПб.: Издательство С.-Петербургского ун-та, Изд-во «Глаголь», 1995. – С. 396 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ильин, И.П.* Постмодернизм от истоков до конца столетия. Эволюция научного мифа / И.П.Ильин. – М.: Интрада, 1998. – 255 с.

*Лиотар, Жан Франсуа*. Состояние постмодернизма / Ж.Ф.Лиотар; пер. с фр. Н.А.Шматко. – М.: Ин-т эксперим. социологии; СПб.: Алетейя, 1998. – 159 с.

*Огборн, У*. Социальные изменения / У.Огборн. –. Manchester; New York, 1989. – 364 p. .

Ортега-и-Гассет, Х. Восстание масс: Сборник / Х. Ортега-и-Гассет; пер. с исп. – М.: ООО «Издательство АСТ», 2002. – 509 с.

*Тоффлер, Э*. Третья волна / Э.Тоффлер. – М.: АСТ, 2002. – 781 с.

*Шпенглер, О*. Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории. В 2 ч. – Ч.1.: Образ и действительность / Пер. с нем. Н. Ф. Гарелин / О. Шпенглер.— Минск.: Попурри, 1998.— 988 с.; Т. 2: Всемирно-исторические перспективы / Пер. с нем. И. И. Миханькова.— М.: Мысль, 1998.— 607 с.

*Masuda, Y*. The Information Society as Post-Industrial Society / Y. Masuda. – Washington, 1981. – 483 p.

## Тэма. Архетыпічная накіраванасць культуры і праблема фарміравання духоўнай прасторы (2 гадзіны)

*План лекцыі:*

1. Архетыпы як аснова быцця этнакультурнай супольнасці.
2. Этнакультурныя архетыпы – асноватворныя ўласцівасці супольнасці.

### 1. Архетыпы як аснова быцця этнакультурнай супольнасці.

Усеахопліваючымі сімваламі самасвядомасці асобы і адначасова культурнай субстанцыяй, якая спараджае імпульсы да яе станаўлення на падсвядомым узроўні, з'яўляюцца ўніверсальныя і этнанацыянальныя архетыпы. Яны характарызуюць асноватворныя ўласцівасці індывіда, уплываюць на асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурныя набыткі чалавека. Архетыпы застаюцца практычна нязменнымі па сваёй сутнасці, аднак у прасторава-часавай перспектыве праяўляюцца ў разнастайных формах: міфалагемах, вобразах, рэлігійных тэкстах, рытуалах, ідэалах і інш.

Кожны гістарычны перыяд культурнага развіцця любой этнасацыяльнай супольнасці заўсёды адзначаны пэўнай мадэллю, якая з'яўляецца і сацыякультурным сімвалам часу, і адлюстраваннем менталітэту гэтай супольнасці. Такімі ўсеахопліваючымі сімваламі этнанацыянальнай самасвядомасці і адначасова культурнай субстанцыяй, якая спараджае імпульсы да яе станаўлення на падсвядомым узроўні, з'яўляюцца этнанацыянальныя архетыпы, якія характарызуюць асноватворныя ўласцівасці супольнасці, уплываюць на асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурныя набыткі яе членаў У архетыпах адбываецца структурыраванне энергіі калектыўнага бессвядомага ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнакультурных формах.

Паводле меркавання К. – Г. Юнга, архетыпы ляжаць у аснове быцця любой этнакультурнай супольнасці. Розныя культуры могуць мець адпаведныя мадыфікацыі архетыпаў – этнакультурныя архетыпы, якія характарызуюць асноватворныя ўласцівасці супольнасці, уплываюць на асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурныя набыткі яе членаў.

Этнанацыянальныя архетыпы валодаюць моцным патэнцыялам на пачатковым этапе станаўлення беларускай нацыянальнай культуры XIX ст.. Этнанацыянальны архетып абумоўлівае культурную цэласнасць супольнасці, што наўпрост звязана з праявамі калектыўнага бессвядомага.

К.-Г. Юнг тэарэтычна распрацаваў феномен "калектыўнага бессвядомага" – крыніцы чалавечай агульнасці, што складаецца з архетыпаў – першасных вобразаў, універсальных мадэлей канцэнтрацыі вопыту, назапашанага калектыўна ўсімі папярэднімі пакаленнямі. Архетыпічная тэорыя была пашырана ў межах гуманітарыстыкі многімі паслядоўнікамі К.-Г. Юнга: Э. Нойманам, М. Л. фон Францам, Дж. Хендэрсанам, Дж. Хілманам. У айчыннай гуманітарнай навуцы разгляду архетыпаў прысвечаны працы У. Конана, Л. Кажухоўскай, А. Свечнікавай.

Архетып сам па сабе пусты і чыста фармальны, ён уласцівы як усяму чалавецтву як накоплены досвед, так і пэўнай сацыяльнай супольнасці і культуры, паколькі здольны напаўняцца розным канкрэтным зместам і несці каштоўнасную характарыстыку. Іх ўзмацненне і прысутнасць у масавай свядомасці з'яўляецца, з аднаго боку, умовай захавання самабытнасці і цэласнасці дадзенага грамадства, з другога – забяспечваюць дынаміку многіх працэсаў, паколькі архетып убірае ў сябе ўсё новыя і новыя адценні, сэнсы, узбагачаючыся каштоўнасна-сэнсавай нагрузкай, і прадукуе новыя значэнні.

Этнанацыянальныя архетыпы могуць інтэрпрэтавацца ў шматлікіх мастацкіх вобразах, сімвалах, сюжэтах. На змястоўную афарбоўку дадзенай інтэрпрэтацыі уплывае сацыякультурны кантэкст: канкрэтныя вобразы, або архетыпічныя вобразы, у якія праектуюцца архетыпы, заўсёды абумоўленыя эпохай (дамінантнай культурнай праграмай пэўнага часавага перыяду), якая, уласна кажучы, і спараджае іх.

Канкрэтныя вобразы і сімвалы, у якіх праектуюцца архетыпы, заўсёды суадносяцца з эпохай (дамінантнай культурнай праграмай пэўнага часавага перыяду), якая спараджае іх. Актуалізацыя архетыпа можа разглядацца ў рамках гістарычнага кантэксту. Кожны гістарычны перыяд культурнага развіцця любой этнасацыяльнай супольнасці заўсёды адзначаны пэўнай мадэллю, якая адначасова з'яўляецца і сацыякультурным сімвалам часу, і адлюстраваннем менталітэту гэтай супольнасці. Такімі ўсеахопліваючымі сімваламі этнанацыянальнай самасвядомасці і, адначасова, культурнай субстанцыяй, якая спараджае імпульсы да яе станаўлення на падсвядомым узроўні, з'яўляюцца архетыпы, якія вызначалі фарміраванне беларускага этнасу ў яго гісторыі, а таксама, набыўшы пэўную нацыянальную адметнасць, выступілі ў якасці вызначальнай рысы беларускай культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая пачынае фарміравацца акурат ў XIX ст.. Да таго ж архетыпы ўваходзяць у сімвалічны складнік дамінуючых сацыякультурных парадыгмаў таго часу, а значыць, у пэўным сэнсе акрэслівае адметнасць структурнага ўзроўню даследуемай намі поліпарадыгмальнасці як культурнай цэласнасці ў дынаміцы гістарычных змен.

У сімволіцы, выяўленай у мастацкай творчасці суб’ектаў розных сінтэзаваных сацыякультурных парадыгмаў сапраўды, немалаважную ролю адыгрывае калектыўная свядомасць, нешта закладзенае ў падсвядомасці народа на працягу стагоддзяў яго гістарычнага быцця, якое нясе ў сабе каштоўнасны сэнс і выступае ў якасці часткі ментальнага комплексу, вызначае вектары чалавечай дзейнасці, актыўнасці. Прызнанне аксіялагічнай прыроды архетыпа і сімвала дае магчымасць пазбегнуць вузка семіятычнага яго разумення, што дазваляе разгледзець ролю сімвала ў ментальным комплексе этнічнай супольнасці.

**2. Этнакультурныя архетыпы – асноватворныя ўласцівасці супольнасці.**

Асаблівае значэнне аксіялагічны падыход да сімвала набывае ў тым выпадку, калі гаворка ідзе аб этнічных, нацыянальных, нацыянальна-культурных каштоўнасцях. Сімвал, увасабляючы культурна-нацыянальныя архетыпы і каштоўнасці, прадстаўляючы іх чалавечай свядомасці ў пачуццёва-канкрэтнай форме, з'яўляецца злучэннем пазнавальнай дзейнасці (самапазнання культуры ці этнасу) і фарміравання эмацыйнага перажывання ўласнай этнічнай ці нацыянальнай ідэнтычнасці.

У архетыпах адбываецца структурыраванне біялагічнай энергетыкі калектыўнага бессвядомага ў этнакультурныя формы. Этнанацыянальны архетып абумоўлівае культурную цэласнасць нацыянальнай супольнасці. Архетыпы могуць інтэрпрэтавацца ў шматлікіх мастацкіх вобразах, сімвалах, сюжэтах. На змястоўную афарбоўку дадзенай інтэрпрэтацыі могуць уплываць як суб’ектыўны аўтарскі досвед, так і сацыякультурны кантэкст – гістарычныя ўмовы, сацыякультурныя змены. Такія змены могуць па-рознаму ўплываць на самасвядомасць этнаса і яго далейшы шлях развіцця, а таксама на станаўленне нацыянальанй культуры, паколькі менавіта ў перыяд яе выкрышталізоўвання (XIX ст.) этнанацыянальныя архетыпы і сімвалы накладваюць адбітак на нацыянальную самасвядомасць і замацоўваюцца ў культурны код. Для беларускай сацыякультурнай сітуацыі на этапе станаўлення нацыянальнай культуры на аснове этнічнай характэрна праяўленне архетыпаў на узроўні сацыяльнай свядомасці. Дадзеныя архетыпы ў некаторай ступені выступаюць у якасці вытокаў беларускай нацыянальнай культуры, адмыслова ўвасобленых у разглядаемых мастацкіх творах жывапісу і літаратуры. Да такіх архетыпаў можна аднесці архетып Маці-Радзімы, Зямлі, Героя, Мудрага Старца, Дзядоў, Анімы, Анімуса, Ценю, Дзіцяці (пачатак прабуджэння індывідуальнага, адметнага, нацыянальнага са стыхіі калектыўна-бессвядомага).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не апошнюю ролю ў межах семіятычнага структурнага элемента сацыякультурных парадыгмаў духоўнай культуры, а таксама, улічваючы адметансць перыяда, у фарміраванні беларускай нацыянальнай культуры адыгралі і сімвалы як сродкі ўвасаблення архетыпаў, большасць з якіх уяўляюць сабой базісныя элементы, уласцівыя нацыянальнай карціне свету беларусаў і рэінтэрпрэтаваныя ў мастацтве ў адпаведнасці з сацыякультурнай сітуацыяй, светапоглядам эпохі станаўлення нацыянальнай культуры: дрэва, гара, хата, астрог, свечка, вецер, агонь, крыж, могілкі, здань – дадзеныя сімвалы і іх семантычнае напаўненне непасрэдным чынам замацаваліся ў культурны код поліпарадыгмальнасці як адметнасці духоўнай культуры сваім аксіялагічнаафарбаваным зместам.

Рамантычная парадыгма сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства першай паловы XIX ст цесна знітавана ў сваёй аснове з вуснай народнай творчасцю як крыніцай сюжэтаў і маральнага зместу. Архетыпічная напоўненасць фальклору адбываецца дзякуючы т. зв. “міфалагізацыі” вуснай народнай творчасці, пранікненне ў яе ідэй, сюжэтаў і вобразаў з міфалогіі, якія надаюць фальклору прыкметы светаўспрымання. Ф. В. Шэлінг у свой час вызначаў ролю міфалагічнага пачатку ў творчасці: “Міфалогія – ёсць неабходная ўмова, першасны матэрыял для ўсякага мастацтва”. Праз дадзеную асаблівасць фальклор варта лічыць не проста народнай творчасцю, а народнай культурай, у якой акумуляваны традыцыі, звычаі, спосабы і формы светаўспрымання. Так фальклорны матэрыял, што мае ў сваёй аснове міфічны элемент, праз аўтарскае пераасэнсаванне суб’ектаў творчасці захоўвае і транслюе ў мастацкай сімвалічнай форме адлюстраваныя этнічныя архетыпы.

У межах творчасці суб’ектаў беларускай культуры XIX ст. можна выявіць шэраг архетыпаў, якія вызначаюць нацыянальны характар. У многіх тэкстах фігуруе этнакультурны архетып Маці-Зямлі (або яго сінанімічныя варыянты Радзімы-жанчыны, Радзімы-Маці). З гэтым архетыпам асацыююцца такія якасці, як матчын клопат і спачуванне; магічная ўлада жанчыны; мудрасць і духоўнае ўзвышэнне - усё, што адрозніваецца дабрынёй, клапатлівасцю або падтрымкай і спрыяе росту і ўрадлівасці. Архетып Маці-Зямлі мае аксіялагічнае пераасэнсаванне ў межах рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы, паколькі яна, як ужо было адзначана, базавалася пераважна на фальклорным матэрыяле. Зямля лічылася крыніцай існавання, галоўнай каштоўнасцю. На ўзроўні культуры каляндарна-земляробчага тыпу акцэнт быў перанесены з прагматычнай, матэрыяльнай каштоўнасці жыцця, якую забяспечвала зямля багатым ураджаем, на духоўную каштоўнасць. Уяўленні аб зямлі цесна звязаны з паняццямі роду, Радзімы, краіны. Пачалі складвацца новыя ўніверсаліі, семантыка якіх трымаецца на аснове роднасці, злучанасці, цеснай паяднанасці этнічнай супольнасці. Менавіта таму Я. Баршчэўскі неаднаразова падкрэслівае значэнне дабрасумленнай працы для шчасця і дабрабыту як простага селяніна, так і прадстаўнікоў вышэйшых саслоўяў. Варта падкрэсліць, што ў творы “Шляхціц Завальня…” яскрава прасочваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрадвечны звычай беларусаў ставіцца да зямлі як да жывой істоты, якая патрабуе адпаведных адносін да сябе. *“Зямля задаволіць усе патрэбы. На яе павінны звяртаць мы ўсю нашу ўвагу…”* – сказаў Завальні адзін з падарожных, апавядаючы пра свае гаспадарчыя клопаты простага селяніна па вясне. Для некаторых этнічных архетыпаў можа быць характэрна наяўнасць цеснай семантычнай злучанасці: так, напрыклад, выяўленне архетыпаў у мастацкай творчасці суб’ектаў розных сацыякультурных парадыгмаў часта падкрэслівае наяўнасць сувязі паміж архетыпам Зямлі і аксіялагемай жыцця, свабоды, зямнога раю, увасобленых у канататах нівы, руні, зерня, хлеба у якіх выразна прасочваюцца першапачатковыя ствараральныя сэнсы земляробчай працы.

**Тэма. Каштоўнасная сістэма культуры: тэарэтычнае і гістарычнае вымярэнне (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Вытокі каштоўнаснай свядомасці асобы і яе культуратворчай дзейнасці.
2. Узаемасувязь каштоўнасцей, норм, ідэалаў і мэт.

**1. Вытокі каштоўнаснай свядомасці асобы і яе культуратворчай дзейнасці.**

У сучасных умовах праблемы духоўнай культуры набываюць незвычайную актуальнасць, што непасрэдным чынам звязана з асаблівасцямі сучаснай культурнай сітуацыі, для якой у пэўнай ступені характэрны своеасаблівы адыход ад духоўнасці, што прадугледжвае пасіўную энтрапію духоўных патэнцый. Пад духоўнай культурай варта разумець сукупнасць феноменаў культуры, выражаных у ідэальнай форме. Да такіх феноменаў можна аднесці каштоўнасці, ідэі, ідэалы, сімвалы, правілы, узоры, эталоны, нормы, законы, звычаі, традыцыі. Духоўная культура ахоплівае сферу свядомасці, выступае так званым прадуктам духоўнай вытворчасці – стварэння, размеркавання і спажывання духоўных каштоўнасцей.

Аб’екты беларускай духоўнай культуры (сімвалы, каштоўнасці, ідэалы) знайшлі сваё адмысловае пераасэнсаванне ў мастацкай творчасці суб’ектаў нацыянальнай культуры, якая пачынае фарміравацца ў XIX ст., уяўляюць значную цікавасць для даследавання, паколькі менавіта яны ўваходзяць у аксіалагічны, сімвалічны комплекс, комплекс ідэалаў, вылучаных у межахструктуры сінтэзаваных сацыякультурных парадыгмаў (поліпарадыгмальнасці). Першым крокам у нацыянальным самавызначэнні грамадства з’яўляецца ўсведамленне народам сваіх адметных рысаў, што садзейнічае латэнтнай стадыі фарміравання нацыянальанй супольнасці.

Праз адметнасць інтэрпрэтацыі аб’ектаў духоўнай культуры ў мастацкім творы можна ахарактарызаваць не толькі творчую і інтэлектуальную асобу суб’екта культуры, яго светапогляд і тып мыслення,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але і сацыякультурную сітуацыю эпохі, адметнасцю якой у XIX ст. варта лічыць поліпарадыгмальнасць. У пісьмовай і вуснай культуры, у помніках духоўнасці, у гістарычных здзяйсненнях народа імпліцытна прысутнічае менавіта тая спецыфіка пазнання, пераўтварэння і духоўнага асваення рэчаіснасці, якая пачынае вызначаць нацыянальны каларыт, непаўторныя рысы асаблівасцей думкі і дзеянняў людзей, што знайшло сваё адлюстраванне ў мастацкай творчасці суб'ектаў культуры.

Каштоўнасці як з'ява, уласцівая суб'ектам культуры: супольнаму і індывідуальнаму, неразрыўна звязаны з катэгорыяй культуры. Менавіта каштоўнасці дэтэрмінуюць разуменне і інтэрпрэтацыю чалавекам як самога сябе і сваіх учынкаў, так і навакольнага свету. Ролю культуры ў жыцці чалавека як цэласнай сукупнасці прадметных і духоўных умоў, перадумоў, што ўздзейнічаюць на лад жыцця і светапогляд, немагчыма пераацаніць. Культура ўздзейнічае на чалавека, яго досвед, лад жыцця, тым самым праяўляючы свой сэнсаўтваральны патэнцыял. А каштоўнасці самі па сабе з'яўляюцца тым стрыжнем, вакол якога будуецца культура, яны вызначаюць стракатасць, шматстайнасць традыцый, нормаў, ідэалаў, сімвалаў. Менавіта ідэалы, каштоўнасныя арыентацыі і нормы выступаюць у якасці асноўных формаў бытавання каштоўнасцей у культуры.

Дзякуючы каштоўнасцям нацыянальная культура застаецца тоеснай сабе як у сінхронным плане (у сістэме паводзін і маральных поглядаў сучаснікаў), так і ў дыяхронным плане, які садзейнічае аб'яднанню прадстаўнікоў нацыі праз стагоддзі. Для больш глыбокага асэнсавання феномену каштоўнасцей варта звярнуцца да канцэпцыі цэнтральнай зоны культуры Э. Шылза. "Грамадства мае цэнтр. Ён уяўляе сабой цэнтральную зону" ў структуры грамадства. Цэнтр, ці цэнтральная зона, - гэта як бы ў звернутым выглядзе каштоўнасці і вераванні дадзенага грамадства. Менавіта "цэнтр" уладкоўвае сімвалы, каштоўнасці і вераванні. І цэнтрам ён з'яўляецца таму, што ён канечны, яго немагчыма рэдукаваць. Менавіта ён вызначае прыроду сакральнага ў кожным грамадстве. Такім чынам, цэнтральная зона – каштоўнасная сістэма культуры [189].

*Пад каштоўнасцямі разумеецца сукупнасць жыццёвых арыенціраў, ідэалаў, узораў, традыцый, найбольш адметных рысаў характару прадстаўнікоў таго ці іншага супольнага або індывідуальнага суб'екта культуры, якія лічацца найбольш значнымі для іх самазахавання і культурнага развіцця.* У каштоўнасны змест любой культуры уваходзяць каштоўнасныя адносіны – адносіны, якія маюць значнасць без утылітарнай рэдукцыі, якія звязваюць людзей з нагоды таго, што закранае іх асабістым, духоўным чынам. Каштоўнасці па сутнасці з'яўляюцца квінтэсэнцыяй нацыянальнай культуры, складаюць яе душу, ядро, злучаюць практычны і духоўны вопыт і адносіны чалавека да свету і да іншых людзей.

Каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі, якія ўяўляюць сабой адзін з базісных кампанентаў у светапоглядзе той ці іншай эпохі адрозніваюцца паміж сабой у залежнасці ад ступені значнасці, месца ў каштоўнаснай іерархіі таго часу, што адлюстравана праз асаблівасці інтэрпрэтацыі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчай спадчыне суб'ектаў культуры. Па сутнасці інтэрпрэтацыя выступае рэпрэзентатарам карціны свету суб'екта культуратворчасці, механізмам яго сацыякультурнай арыентацыі.

Культуралагічны дыскурс, звязаны з выяўленнем адметнасці інтэрпрэтацыі аксіялагічных складнікаў духоўнай культуры індывідуальнымі суб'ектамі мастацкай творчасці. паказаў, што выяўленыя каштоўнасці складаюць так званую "праграму жыццяўстойлівасці", вітальнай сілы і захавання супольнасці. Дадзеная праграма можа быць апісана ўмоўна дзвюма групамі аксіялагем, выразна выяўленых у мастацкіх творах і і класіфікаваных у адпаведнасці з тым, захаванне і ўстойлівасць якога аспекта жыццядзейнасці чалавека каштоўнасць забяспечвае:

1. *Каштоўнасці, якія забяспечваюць існаванне чалавека ў супольнасці, грамадстве, накіраваныя на пазнанне і пераўтварэнне рэчаіснасці* (біблейскія запаведзі, прынцыпы паводзін, зносін і дзейнасці ў адпаведнасці з хрысціянскай мараллю: любоў як галоўнае маральнае пачуццё ў адносінах да людзей, духоўна-маральныя мэты, матывы, устаноўкі (такія як сумленная праца, асвета, навучанне, сям'я, гасціннасць, гаспадарлівасць, ашчаднасць, мова).

2. *Рэфлексіўныя каштоўнасці, якія забяспечваюць самазахаванне, унутраную гармонію чалавека, накіраваныя на духоўнае асваенне рэчаіснасці і свайго месца ў ёй, а таксама каштоўнасныя арыентацыі, якія выступаюць у якасці агульных светапоглядных арыенціраў* (хрысціянскі маральны ідэал (Бог), розум, годнасць, сумленнасць, сціпласць, свабода волі, патрыятызм, імкненне да самаўдасканалення, набыцця ведаў, памяць пра продкаў, краса як эстэтычнае абагульненне прыгожага ў самасвядомасці, зямля і прырода як сакральныя сферы, якія забяспечваюць укаранёнасць, далучанасць да свайго месца, роднага кута. У сістэме народна-хрысціянскіх каштоўнасцей духоўна-маральнаму развіццю і пастаяннаму творчаму самаўдасканаленню адпавядае сэнс чалавечага існавання.

Непаўторную адметнасць той ці іншай эпохі складаюць формы і прыёмы мыслення, уласцівасці чалавечага духу, якія аднолькава выяўляюцца "ва ўсіх яе прадуктах". Менавіта дадзеная сувязь дае выдатную магчымасць для параўнання і выяўлення адметнасцей інтэрпрэтацыі каштоўнасцей у межах мастацкай творчасці.

Адметнасці інтэрпрэтацыі аксіялагічных складнікаў суб'ектамі мастацкай творчасці у некаторай ступені абумоўлены поглядамі на культуру як з'яву.

Варта падкрэсліць, што далучэнне да любой культуры адбываецца менавіта праз фальклор, які з'яўляецца адным са сродкаў выяўлення ўнутранага свету этнасаў і трансляцыі аксіялагем. У вуснай народный творчасці адлюстроўваюцца працоўны вопыт і гісторыя, эстэтычныя і маральныя ідэалы, мары і спадзяванні, захоўваюцца і трансліруюцца мадэлі ідэальнага жыцця беларусаў. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што фальклорны матэрыял дае выдатную магчымасць вылучыць аксіялагічныя дамінанты ў межах народнага светапогляду. Тэма месца фальклора ў сістэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры набывае ў творчасці суб’ектаў культуры шырокае сацыяльнае значэнне, суадносіцца з праблемай выхавання чалавека і фарміравання сістэмы каштоўнасцей. Беларускі фальклор выступае выдатным захавальнікам этнічных каштоўнасцей беларусаў, у аснове якіх знаходзяцца найперш каштоўнасці духоўныя.

Так, каштоўнасныя арыентацыі беларусаў базаваліся на спрадвечных хрысціянскіх маральных установках. Хрысціянская традыцыя лёгка ўспрымалася прадстаўнікамі этнасу з самага дзяцінства, сінтэзавалася з народнымі традыцыямі і гарманічна суіснавала ў межах карціны свету. У Богу бачылі перш за ўсё звышнатуральную сілу, абаронцу і караючую далонь, якая вызначае лёс, папярэджвае людзей пра сваю волю праз таямнічыя знакі. Нябесны патрон суправаджаў беларуса літаральна на кожным кроку. Паводле М. Крукоўскага, ідэя Бога мае універсальны характар, і ў ёй, як у вяршыні піраміды, канцэнтруюцца як законы прыроды, так і ўсе ідэалы і духоўныя каштоўнасці чалавецтва… [88, с. 17]. Духоўны боскі ідэал транслiруецца праз сістэму каштоўнасцей. Паняцце боскага, абсалютнага ў культуры асацыюецца найперш з галоўнай ідэяй хрысціянства – маральным удасканаленнем чалавека.

Цэнтральнай каштоўнасцю хрысціянства, яго вызначальным пастулатам з’яўляецца *любоў* ва ўсіх яе праявах: любоў да бліжняга, каханне да дзяўчыны, любоў да Радзімы. Менавіта любоў і літасць да бліжняга выступае аб’ядноўваючым фактарам, трывалым падмуркам чалавечага жыцця, каштоўнаснай першаасновай. У сваіх “Думках і заўвагах” А. Міцкевіч аднойчы зазначыў: *“Ведае сатана, што Бог вечны і сілай нязмерны, а толькі на тое забыўся, што Бог міласэрны*” [15, с. 61]. Я. Баршчэўскі ў зборніку “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” таксама неаднарозова прыгадвае народныя выразы адпаведнага зместу: “*Блізкім сваім дапамагаць – абавязак хрысціянскі”* [15, с.162], *“Лепей жыць з Богам”* [15, с.118]. Менавіта *міласэрнасць, спагадлівыя адносіны да бліжняга* былі асновай запавету, дадзенага бацькамі Завальні сыну, калі яны адпускалі юнака ў свет у пошуках сваёй долі:*Калі літасцівы Бог дасць табе добры лёс і ўладу над сваімі зямнымі скарбамі – не шкадуй бліжнім, памятаючы, што міласэрныя атрымаюць міласэрнасць і будуць спадчыннікамі царства нябеснага* [15, с. 177 – 178]. Любоў і цярпімасць фарміруюцца на аснове рэфлексіўных каштоўнасцей: усведамлення сваёй годнасці, сумленасці, свабоды волі, імкнення да самаўдасканалення і тым самым абумоўліваюць гарманічнае існаванне чалавека ў супольнасці.

Сукупнасць каштоўнасцяў як аб'ектыўна значных духоўных структур, задаюць сістэму адліку для пазнання і дзеяння. Маральная матывацыя ў многім вызначае паводзіны асобы ў яе стваральнай дзейнасці і ў паўсядзённым жыцці, з цягам часу яна сфарміравала асаблівыя адносіны да працы і гаспадарчай дзейнасці ў цэлым. Праца ў хрысцінскай традыцыі спрадвеку выступала адным з галоўных сродкаў выратавання душы. Працавітасць лічыцца адной з самых станоўчых і дамінуючых рыс характару беларуса. Успрыманне жыцця як працы ў беларускай народнай культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было звязана з тым, што такі лад жыцця быў дадзены Богам, які таксама ўспрымаўся беларусам як майстар і творца, адмысловы руплівы гаспадар над усім існым

Паводле А. Шапенгаўэра, адсутнасць усякай эгаістычнай матывацыі ёсць крытэр учынка маральнай каштоўнасці, што "спачуванне ёсць адзінай крыніцай такіх учынкаў, калі яны маюць маральную каштоўнасць, г.зн пазбаўленыя ўсякіх эгаістычных матываў" Дадзеныя інтэнцыі (людскасць, чалавечнасць, "жыць чалавекам") паступова сцвердзіліся ў працэсе самаўсведамлення нацыі, што знайшло адлюстраванне ў мастацкіх канцэптуальных схемах: "Наша мова такая ж людская…" (Ф. Багушэвіч), "Людзьмі звацца" (Я. Купала), "Без беларушчыны мы губляем частку чалавечнасці" (І. Абдзіраловіч).

У аксіялагеме Радзімы ўвасоблена таксама значная духоўная каштоўнасць – *памяць пра продкаў*, пра свае карані. У беларускай традыцыі продкі выступаюць носьбітамі духоўнага пачатку, прадстаўнікамі сакральнай сферы, найбольш набліжанымі да Бога, якім пашчасціла дасягнуць вечнага і нятленнага свету. Увогуле, варта адзначыць, што суб'ект культуры прадстае перад намі ў якасці адэпта не толькі той ці іншай сацыякультурнай парадыгмы, але і носьбіта пэўнага этнічнага светапогляду. Уздзеянне агульнага зместу псіхічнай дзейнасці, жыццёвага вопыту чалавека на ўспрыманне навакольнага асяроддзя, артэфактаў культуры ў філасофіі і псіхалогіі абазначаецца паняццем "аперцэпцыя". У сучаснай культуралогіі аперцэпцыя разумеецца як стрыжнёвая накіраванасць успрымання асобай з'яў і працэсаў культуры, абумоўленае генетычным кодам этнаса. Успрыманне сацыякультурнай рэчаіснасці і адчуванне яе адбываецца пад уплывам роднай (этнічнай) культуры і набора этнічных генатыпаў. Дадзеныя акалічнасці таксама ўплываюць на характар інтэрпрэтацыі аб'ектаў духоўнай культуры ў мастацкай творчасці. Таму продак як спрадвечная каштоўнасць этнічнай культуры выступае ў творчасці суб'ектаў тагачаснай беларускай культуры каардынатарам жыцця, на які прынята было раўняцца, арыентавацца як на ўзор: *Жыві ж, брат, здаровы ты з любаю жонкай / І дом свой за час найкароткі / Напоўні вясёлай дзіцячай гамонкай, / Працуй і рыбач так, як продак!* [184, с. 78]. Адсюль відавочна, што кожны суб'ект культуры з'яўляецца носьбітам пэўных этнічных каштоўнасцей, якія прама ці апасродкавана ўплываюць на аперцэпцыю свету і сябе ў свеце.

З аксіялагемай паважлівага стаўлення да мінулага цесна звязана катэгорыя *сям'і* як адной з аксіялагічных дамінант духоўнай культуры беларусаў. Аб'яўленая хрысціянствам у якасці дамінуючага ўзору, манагамная сям'я становіцца цэнтральным апірышчам ў жыцці чалавека.

Аксіялагема сям'і паўстае не толькі ў традыцыйнай трактоўцы саюзу мужа і жонкі, на якіх трымаецца грамадства. Паводле нормаў грамады і людскасці на землях Беларусі дзейнічалі патэрны і нормы маралі і эстэтыкі, а значыць духоўнае аблічча нацыі. Менавіта таму ў творы "Дажынкі" мы бачым літаральна сямейную ідылію шляхты і сялянства, не пазбаўленую аднак відавочных рысаў праўдападабенства ў адлюстраванні. Такім чынам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэрпрэтацыя спрадвечнай аксіялагемы “сям’і”, “абшчыны”, “грамады” пад уплывам грамадскіх ўмоў і асабістага светапогляду набыла сацыяльную афарбоўку ў мастацкай творчасці. Варта звярнуць увагу на той момант, што, нягледзячы на сацыяльнае расслаенне ў грамадстве, у большасці суб’ектаў беларускай культуры шляхта выступае ў якасці спагадлівых, сумленных гаспадароў, якім уласцівы высокамаральныя якасці ў дачыненні ў тым ліку да сваіх прыгонных.

Універсальныя каштоўнасці: праца і яе вынік, сям’я, дом, зямлят уяўляюць сабой “формулу” выжывання чалавека і кладуцца ў аснову ўстойлівага аксіялагічнага комплекса этнічнай культуры, паколькі вынік жыцця кожнага чалавека ўсіх гістарычных эпох у рознатыпных культурах залежыць найперш ад рэалізацыі (здзяйснення) сэнсажыццёвых каштоўнасцей – яны як універсаліі культуры захоўваюць сваю значнасць на ўсім працягу іх гістарычнага вымярэння да нашых дзён. Гэтыя каштоўнасці выступалі ў выглядзе сінтэза светаразумення і практыкі і былі замацаваны ў архетыпічным і сімвалічным узроўнях беларускага ментальна-парадыгмальнага комплекса.

## 2. Узаемасувязь каштоўнасцей, норм, ідэалаў і мэт.

Сярод аб’ектаў духоўнай культуры вызначальнае месца займае ідэал, які выступае адной з дамінуючых форм існавання каштоўнасцей у культуры. Разам з тым ідэал вылучаецца як структурны элемент сацыякультурнай парадыгмы, паколькі менавіта ён вызначае накірунак дзеяння суб’екта, спосаб вырашэння жыццёвазначных задач. Такімі магчымасцямі ідэал валодае па той прычыне, што з’яўляецца не нейкім абагульненым фармуляваннем пэўнай каштоўнасці, а канкрэтным уяўленнем пра пажаданую будучыню, яе вобразам. Па сутнасці праз грамадскі ідэал выражаецца канцэптуальнае бачанне сацыяльнага жыцця.

Суб’екты культуратворчасці асэнсоўваюць жыццё з розных бакоў, спецыялізуючыся на адначасовым вывучэнні шматлікіх праблем. Менавіта таму аб’екты духоўнай культуры, выражаныя праз іх сукупны інтарэс, пераўтвараюцца ў эфектыўныя інструменты самапазнання ўсёй культуры эпохі. Сярод такіх аб’ектаў вызначальнае месца займае ідэал.

Ідэал можна акрэсліць як ідэальны вобраз, які мае нарматыўны характар і вызначае паводзіны і дзейнасць людзей. У межах поліпарадыгмальнасці як культурнай цэласнасці на аснове сінтэзу парадыгмальных накірункаў ідэал выступае пастулатам духоўнага жыцця. Ідэалы – важкія элементы светапогладу, якія поруч з ідэямі, канцэптуальнымі вобразамі ствараюць пэўную карціну свету і чалавека ў свеце. Арыентуючыся на ідэалы, чалавек вызначае мэты і задачы жыцця, практычнага пераўтварэння свету і сябе.

Культурфіласофскае разуменне ідэала, яго ролі ў культуры, у структуры духоўнасці суб’екта становіцца эпіцэнтрам праектавання грамадскіх сістэм і чалавечага быцця. Гэта вядзе да неабходнасці асэнсавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалу як носьбіта найвышэйшай каштоўнасці, які накіроўвае паводзіны чалавека ў маральнай, эстэтычнай, палітычнай, рэлігійнай сферах, а таксама служыць крытэрам ацэнкі рэальнасці ў кожнай з гэтых сфер. Такімі магчымасцямі ідэал валодае па той прычыне, што з'яўляецца не нейкім абагульненым фармуляваннем пэўнай каштоўнасці, а канкрэтным уяўленнем пра пажаданую будучыню, яе вобразам.

Агульная характарыстыка ідэала ў філасофскай літаратуры палягае ў тым, што пад дадзенай катэгорыяй разумеюць духоўнае адлюстраванне пэўнай нормы, узора, які адрозніваецца ад паўсядзённай рэчаіснасці, які валодае пабуджальнай сілай да дзеяння, той узор дасканаласці, арыенцір, на які раўняюцца людзі ў сваёй дзейнасці.

Найперш ідэал выступае прадуктам грамадскай свядомасці. Варта адзначыць, што аксіялагічнае артыкуляванне і інтэрпрэтацыя каштоўнасцей у мастацкай творчасці адбываецца не ў індывідуальнай, у агульнаэтнічнай форме, паколькі каштоўнасці выступаюць у якасці культурных сэнсаў, аб'ектывізаваных досведам этнічнай супольнасці. Слушнасць дадзенага меркавання пацвярджае даследчык ў галіне айчыннай культуралогіі М. І. Крукоўскі, які сцвярджае, што самасвядомасць індывіда першапачаткова праяўляецца не на ўсведамленні сябе як Я, а на аснове прыналежнасці да Мы: спачатку кроўна-сваяцкай абшчыны, пасля этнічнай супольнасці

Паколькі ідэал фарміруецца ў залежнасці ад успрыняцця яго сацыяльнымі групамі, ён становіцца яшчэ і аб'ектыўнай сістэмай сродкаў выразнасці, інтэгруючым фактарам развіцця духоўнай культуры ў цэлым у тую ці іншую эпоху. Ідэалы канкрэтна-гістарычныя і культурна абумоўленыя. Адметнасць інтэрпрэтацыі ідэала заключаецца ў тым, мноства сэнсаў могуць быць незразумелымі, калі нам не вядомыя агульныя ўмовы: грамадскае асяроддзе, гістарычны перыяд, стан праблемы. У кожную гістарычную эпоху існуе і функцыянуе пэўная сістэма ідэалаў, абумоўленая спецыфікай сацыяльна-эканамічных, палітычных і сацыякультурных умоў свайго часу. Падставай такой сістэмы з'яўляецца акрэслены каштоўнасны стандарт, які складаецца з базавых каштоўнасцяў, характэрных для дадзенай эпохі.

У якасці ўсеагульнай формы мэтастваральнай дзейнасці ідэал выступае ва ўсіх сферах жыцця грамадства – сацыяльнай, палітычнай, эстэтычнай. Ідэалы неабходны для асэнсавання існавання чалавека і чалавецтва. Нармальнае існаванне грамадства немагчымае без грамадскіх ідэалаў, паколькі менавіта яны адыгрываюць сацыярэгулятыўную функцыю, тым больш на этапе крызісу папярэдняй цывілізацыі і пачатку фарміравання нацыі і нацыянальнай культуры. Найбольш глыбокае ўсведамленне грамадскага ідэала адбываецца праз мастацтва як сродак яго аб'ектывацыі – дзякуючы мастацкім вобразам ідэал набывае сваю нагляднасць і канкрэтнасць.

Ідэалы фармуюцца думаючай элітай у адказ на канкрэтныя запыты і чаканні грамадства. Паколькі розныя пласты грамадства маюць розныя інтарэсы, у грамадстве аднačасова могуць існаваць непадобныя і нават

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супрацьлеглыя ідэалы, якія прыводзяць да барацьбы ідэй, або сацыяльныя групы знаходзяцца на розных прыступках у магчымасці адкрытага выражэння неабходнасці рэфармавання сацыякультурнай сітуацыі ў адпаведнасці з абраным ідэалам. Звычайна дадзеныя праблемы выходзяць на першы план у складаныя гістарычныя перыяды крызісу. Вось чаму праблема грамадскага ідэалу была гэтак актуальная для беларускай сацыякультурнай сітуацыі XIX ст., што адлюстравалася ў мастацкай творчасці суб’ектаў сацыякультурных парадыгмаў. Неабходна падкрэсліць, што на той час ва ўмовах імперскага кантролю за любымі праявамі філасофскай і грамадскай думкі нацыянальная рэфлексіўная культурфіласофія не магла развівацца ў форме тэарэтычнага мыслення – яна выражалася ў форме літаратурных мастацкіх алюзій. Менавіта праз набыткі мастацкай культуры можна рэканструяваць тагачасную сістэму ідэалаў у межах сінтэзаваных сацыякультурных парадыгмаў (поліпарадыгмальнасці).

Аб’ектывацыя ідэала ў мастацтве можа адбывацца рознымі шляхамі. У асобных выпадках ён можа выступаць як асобны самастойны дастаткова цэласны вобраз дасканалай будучыні, але часцей за ўсё ён атрымлівае канкрэтнае ўвасабленне толькі ў сваіх асобных каштоўнасных момантах. Калі ў межах рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы ў асноўным задача мастацтва заключалася ў далучэнні індывіда да традыцыйных каштоўнасцей, да таго, што асвечана мінулым, то мастацтва рэалізму (як прыватная праява стылю культуры ў межах рэалістычна-дэмакратычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця грамадства) дапамагае чалавеку крытычна асэнсаваць недасканаласць свету і скіроўвае яго на змяненне сацыяльнай рэчаіснасці ў адпаведнасці з ідэалам

Па сутнасці праз грамадскі ідэал выражаецца канцэптуальнае бачанне сацыяльнага жыцця. Калі звярнуцца да аналізу грамадскага ідэалу як самаўпарадкаванай сістэмы аб’ектаў духоўнай культуры, то можна сказаць, што ўсе яго складнікі можна ўмоўна падзяліць на ўтылітарныя (эканамічныя і палітычныя) і духоўныя (светапоглядныя і эстэтычныя), пры гэтым ролю аб’ядноўваючага звяна паміж імі адыгрываюць этычныя (маральныя, антрапалагічныя ідэалы) – ідэалы чалавечай асобы. Яны звязваюць такім чынам уяўленні пра тое, якім павінна быць вытворчасць і кіраванне з уяўленнем пра светапогляд, спагаду і суперажыванне. Спецыфіка заключаецца менавіта ў адзінстве каштоўнасцей, якое гарантуецца пэўным ідэалам, а паняцце культуры неабходна для таго, каб выдзеліць той аспект (ракурс, зрэз сацыяльнага жыцця), які звязаны з пэўным грамадскім ідэалам.

Звяртаючыся да разгляду дыхатаміі “каштоўнасць-ідэал”, мы пагодзімся з даследчыкамі дадзенай праблемы В. Краусам і Л. Уладыкоўскай, якія сцвярджаюць іх узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць: ідэалы – гэта каштоўнасці, убачаныя ў іх дасканаласці, а каштоўнасці – гэта рэалізаваныя ідэалы. Уяўленне аб дасканаласці магчыма толькі тады, калі стаіш на фундаменце каштоўнасцей. Нават калі адно і тое ж паняцце ўжываецца то для абазначэння каштоўнасці, то для абазначэння ідэала, яно ўсё роўна выклівае розныя асацыяцыі. У якасці каштоўнасці яно вызначае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экзістэнцыяльную сітуацыю і можа быць ажыццёўлена ў пэўных межах. У якасці ідэалу яно мысліцца як дасканаласць і застаецца далёкім, як да яго не набліжайся. Асноўнае адрозненне каштоўнасных арыентацыі і ідэалаў заключаецца ў тым, што ідэал прадугледжвае дзеянне па пераўтварэнні рэчаіснасці ў імкненні да жаданага. Падзяляючы ў дачыненні дадзенага меркавання думку канцэпцыю К. М. Клакхана, размеркоўвае каштоўнасці на групы: тое, што перажываецца як каштоўнасць у цяперашнім часе (каштоўнасныя арыентацыі), тое, чаго жадаюць дасягнуць у будучыні (ідэалы).

Узаемаўплыў грамадскіх ідэалаў і ўсіх аспектаў сацыяльнага жыцця відавочны: ідэал фарміруецца пад уплывам сацыяльных абставін, а любога характару змены прыводзяць да нараджэння новага ідэала. Так, гістарычная і сацыякультурная сітуацыя першай паловы XIX ст. абумовіла цікавасць да праблемы перабудовы і ўдасканалення грамадства, да фармулявання і пераасэнсавання грамадскага ідэала. Цікавасць да гэтых праблем набывала ўсё больш шырокі размах, імі займалася адносна вялікая колькасць творчых суб’ектаў розных парадыгмаў сацыякультурнага развіцця грамадства – у прыватнасці гэта выражалася ў літаратурнай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў асяроддзі дробнапамеснай “краёвай” шляхты, студэнтаў і выкладчыкаў – інтэлігенцыі, якая выступае ў якасці асноўнага стваральніка і носьбіта ідэалаў.

Ідэал можа скіроўваць да *негвалтоўнага (пасіўнага) супраціву*, да якога можна аднесці маральнае ўдасканаленне, пераадоленне комплексу непаўнавартасці праз выхаванне пачуцця ўласнай годнасці, самаўсведамленне, асвету і імкненне да набыцця ведаў, добрасумленную, часта пакутлівую працу на карысць гаспадара (агульначалавечая накіраванасць, адсутнасць эгаізму), захавання маральнасці, цярплівасці і боскай пакоры ў пакутах.

Ідэал можа матываваць супольнасць да *актыўнай барацьбы, змагання, абароны* свайго краю ў крызісны перыяд пагрозы поўнай асіміляцыі і знікнення ідэнтычнасці, пераўтварэнне энергіі пакут у энергію актыўнага дзеяння – змаганне за ідэал свабоды і маральна апраўданая барацьба, абарона “свайго” як канцэпту выразна ўсвядомленага, канкрэтна лакалізаванага. Вызначае вектар актыўнасці супольнасці.

Значнасць грамадскіх ідэалаў, а дакладней той дзейнасці, якая накіраваная на іх дасягненне, падкрэслівалася ў межах пэўнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця грамадства.

У працэсе фармулявання новага грамадскага ідэала часта пераасэнсоўваецца таксама суаднясенне яго з ідэаламі ў культуры цяперашняга і будучага з культурай мінулага часу. Менавіта ідэал мінуўшчыны займае вызначальнае месца ў межах рамантычнага парадыгмальнага светапогляду. В. Каратынскі лічыў, што мастак мае права ідэалізаваць гісторыю свайго народа, зыходзячы з высакародных мэт: *“Высакародная мэта з’яўляецца праўдзівай, а ўсё, што праўдзівае, тое прыгожа ў эстэтычным значэнні, тое можа быць прадметам мастацкага*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*твора*. Напрыклад, менавіта ў якасці такой высакароднай мэты выступала імкненне суб’ектаў рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы ўдасканаліць існуючы грамадскі лад. І адным са шляхоў гэтага ўдасканалення ім бачылася арыентацыя на мінулае як узор у арганізацыі жыццядзейнасці на ўзроўні супольнасці. Гэты ідэал адыгрываў функцыю пэўнай сацыяльнай матывіроўкі, якая накіроўвала грамадскую актыўнасць і грамадскую думку ў накірунку вырашэння актульных для таго часу праблем: найперш супраціву акупацыі, захавання культурнай адметнасці. У першай палове XIX ст. пачынаецца працэс усведамлення беларусамі свайго мінулага, што было абумоўлена актывізацыяй этнанацыянальнай думкі.

Інтэрпрэтацыя ідэала мінуўшчыны адбываецца праз асэнсаванне гістарычнага кантэксту адлюстроўваемай падзеі: аўтарскае разуменне праходзіць шлях ад вывучэння падзеі ў мінулым да перакладу яе на сучасную для мастака мову шляхам суаднясення з актуальным кантэкстам (паводле М. Бахціна). Нягледзячы на тое, што тэкст (гістарычная падзея, з’ява) належаць мінуламу, аўтарская інтэрпрэтацыя адаптуе яго да сучаснасці, кіруючыся пэўнай мэтай, паколькі творчае разуменне не павінна адмаўляцца ад сучаснасці, ад актуальных праблем сацыякультурнай сітуацыі эпохі.

Рэтраспектыўныя звароты ў мінулае праз ідэалізацыю адлюстравання падзей і асобаў ў творчасці суб’ектаў айчыннай культуры найперш маюць на мэце падтрымку і апору ў сацыякультурных і дзяржаўных пераўтварэннях тагачаснай рэчаіснасці, бо фактычна выступаюць у якасці павучальных ўзораў для сучаснікаў. Даўніна лічылася своеасаблівай адзнакай якасці, ідэалам, якім варта пераймацца, будуючы актуальную рэчаіснасць. У такой ідэалізацыі мінулага можна ўгледзець архетып “залатога стагоддзя” як найбольш утапічна набліжаны час існавання гарманічнага грамадства. Ідэал залатога стагоддзя ў большасці прадстаўнікоў беларускага рамантызму ўзыходзіць не да першапачатковага ў часавым вымярэнні і міфічнага па змесце перыяду гісторыі чалавецтва, так званага міфічнага варыянта ідэала, а ўяўленне пра былую дасканаласць звязваецца імі з дакладнымі гістарычнымі перыядамі найвышэйшага шчасця, росквіту і дабрачыннасці ў адносна недалёкім мінулым роднага краю, прычым часта гістарычна даставерным адносна падзей і герояў-удзельнікаў.

У свой час Ё. Хейзінга ў сваім артыкуле “Пра гістарычныя жыццёвыя ідэалы” падкрэсліў значнасць памяці пра сапраўднае мінулае, паколькі менавіта пры даставернай інтэрпрэтацыі гістарычны змест ідэала ўзрастае і ён становіцца больш вызначаным і акрэсленым.

Такім чынам, ідэал мінуўшчыны, прадстаўлены ў розных варыянтах, выступае своеасаблівым жыццёвым арыенцірам, дасканалым узорам існавання, паколькі, нягледзячы на сваю сканструяванасць з дасягненняў мінулага, якія пазнаюцца і каштоўнасна асэнсоўваюцца творцамі, усё такі валодае пэўнай перспектывай, бо падказвае, як чалавеку і грамадскай супольнасці трэба жыць і на што арыентавацца ў сучасным.

Разуменне творчасці суб’екта культуры немагчыма без пранікнення ва ўнутраны яго свет, што ажыццяўлялася пры дапамозе фенаменалагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэдукцыі інтэнцыянальнага аналізу свядомасці, якая распрацавана Э. Гусэрлем. У сваіх працах ён сцвярждаў, што для творцы паўстае не свет у цэлым або асобныя яго часткі, а сэнс свету. І гэты свет канстатаваны ў адпаведнасці з пэўным модусам перажывання, тыпам яго інтэнцыі, ці накіраванасці на свой прадмет. Істотна зазначыць, што свабода ёсць маральная катэгорыя. Яе адлюстраванне ў канкрэтных каштоўнасцях залежыць ад маралі і ўзроўню культуры грамадства. < … > У філасофскім сэнсе, свабода – гэта магчымасць вечнага развіцця да ідэалу.

Свабода выступае ў ролі грамадскага ідэала, паколькі з'яўляецца натуральнай мэтай імкненняў кожнага народа, якая вызначае этычныя прынцыпы паводзін асобы і акрэслівае рамкі публічнай дзейнасці пэўных грамадстваў. Гэта таксама паказчык узроўню цывілізаванасці народаў, крытэрый месца сярод культур, на якім у гістарычным працэсе знаходзіцца народ.

Так, ідэал свабоды ў грамадскім сэнсе В. Каратынскі ўсведамляў як магчымасць мець Радзіму, свой кут, які, у сувязі з апошнімі палітычнымі падзеямі, быў страчаны і да якога можна вяртацца толькі ўспамінамі: *Я ж зямліцу меў радную, / Быў свабодзен сам.* Без свабоды, падкрэслівалі філаматы, не можа існаваць ніякіх грамадскіх даброт. Варта адзначыць, што увасабленне катэгорыі свабоды ў межах мастацкай спадчыны А. Міцкевіча насіла не індывідуальны, а грамадскі характар:імкненне да свабоды як да прыцягальнага ідэалу было спробай спраектваць ідэальную будучыню для цэлага народа, які прымусова страціў сваю дзяржаўнасць, а разам з ёй і незалежнасць як аспект свабоды.

Інтэнцыйнае канструяванне, якое складае аснову ідэалатворчасці ў межах культуры, найперш праектуе дадзены ідэал на ўзроўні падсвядомасці і карэлюе яго з рэальнасцю сацыяльнага быцця.

Адмаўленне ад асабістага на карысць грамадскага даволі часта выступае ў якасці дамінуючай рэфлексіі ў творчасці суб'ектаў культуры.

У сучаснай культуралагічнай думцы Беларусі існуе меркаванне наконт таго, што рэалізацыя грамадскіх ідэалаў магчымая праз ідэалы духоўныя, ідэалы маральныя. Відавочна, што чым большая вера ў ідэал, тым на большыя ахвяры чалавек гатовы пайсці дзеля яго рэалізацыі – так што ахвяра выступае своеасаблівай мерай веры ў ідэал.

Інтэнцыйнае канструяванне, якое складае аснову ідэалатворчасці ў межах дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы, найперш праектуе ідэал свабоды на ўзроўні падсвядомасці і карэлюе яго з рэальнасцю сацыяльнага быцця. Так, у змаганні за ідэал свабоды К. Каліноўскі відавочна апазіцыйна настроены ў адносінах да дэспатыі, і да яе канкрэтна-гістарычнай формы – расейскага самадзяржаўя, стаіць на пазіцыі таго меркавання, што грамадская супольнасць мусіць згуртавацца і дзейнічаць у адпаведнасці з адзінай праграмай, якая б вызначала паводзіны кожнага ў справе дасягнення агульнай мэты: *Бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сакеры, нажы і косы, так бы маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня і мы на век вякаў ужэ былі бы вольны* [71, с. 23 – 24]. Грамадскі ідэал адносна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўнага будаўніцтва – фарміравання гарманічнай дзяржавы К. Каліноўскі тлумачыў так: *“…добры ўрад глядзець павінен шчасця людзей, слухаць народ і рабіць так, як народу лепей. І не дзіва, бо не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа*” [71, с. ].

Ілэал сацыяльнай кансалідацыі, народнага яднання дзеля дасягнення галоўнай мэты – свабоды у рэфлексіўна-публіцыстычнай творчасці К. Каліноўскага выступае як вектар, задаючы накіраванасць неабходных сацыяльных зменаў: *Но не доўга яны нас будуць абдзіраці, бо мы пазналі, гдзе сіла і праўда, і будзем ведаць, як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду. Вазьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам!* [71, с. 22] *За мужыцкую крыўду стойце смела, усе разам Падумайце добра, да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашую вольнасць!* [71, с. 32] Так К. Каліноўскі шляхам супастаўлення несправядлівасці тагачасных сацыяльных адносін выявіў значную інтэнцыю неабходнасці змагання з несправядлівасцю і актыўнага сацыяльнага дзеяння.

У беларускай сацыякультурнай сітуацыі. адным з актуальных у межах рэалістычнай парадыгмы быў матыў праўдашукальніцтва. Свет чалавечы здаўна быў недасканалы, таму людзі заўсёды шукалі праўду, ісціну, справядлівасць. У аснове дадзенага матыву палягае катэгорыя праўды. Праўда народнай справядлівасці (“мужыцкая праўда”) выступае ў якасці ідэацыйнага канцэпта і дамінуючага ідэала ў творчасці шэрагу творцаў. Сапраўды, у беларускай літаратуры заўсёды знаходзіліся тыя, хто меў мужнасць гаварыць і адстойваць праўду, імкнуўся знайсці выйсце з цяжкага становішча ці быў упэўнены ў сваёй праваце, не пагаджаўся з хлуснёй, кідаў выклік часу, заклікаў пазбавіцца пачуцця рабскай пакоры і страху. Адзін з такіх па-грамадзянску мужных людзей і праўдалюбаў быў пісьменнік Ф. Багушэвіч. Праўду вызнае аўтар за першаступенны ідэал, які здольны абудзіць грамадства і выратаваць ад несправядлівасці: *Каб яго, то слова, ды праўдай назвалі, Каб і разышлося то слова па свеце<…> / Каб жа тое слова ды людцаў з’яднала, / Каб на тое слова варагоў не стала; / Каб людцы прызналі братоў ды братамі –/ Дзяліліся б доляй і хлеба шматамі, А без таго слова я - нямы калека!*

Такім чынам, у якасці дамінуючых грамадскіх ідэалаў грамадства выступаюць праўда, свабода, воля да жыцця і народ, як самастойны суб’ект культуры. Сродкамі рэалізацыі ідэалаў і дасягнення гарманічнага існавання беларускага народа ў свеце, выяўленымі ў мастацкай спадчыны суб’ектаў поліпарадыгмальнасці, выступае: негвалтоўны пасіўны супраціў, які праяўляецца ў добрасумленнай працы на карысць іншых, захавання маральнасці, цярплівасці і боскай пакоры ў пакутах, а таксама пераўтварэнне энергіі пакут у энергію актыўнага дзеяння – змаганне за ідэал свабоды і маральна апраўданая барацьба, абарона “свайго” як канцэпту выразна ўсвядомленага канкрэтна лакалізаванага – гэтымі ідэаламі прасякнута культура беларускай мастацкай рэфлексіі XIX ст. як крыніцы духоўнай сілы нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

Бадера, Н. И. Общественный идеал как социальный регулятор и его художественно-эстетические аспекты: Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. филос. наук/ Н. Бадера. – Харьков, 1983. - 16 с.

Барковский, П. В. Феномен понимания: контуры современной герменевтической философии / П. Барковский. – Минск: Экономпресс, 2008. – 175 с.

Бахановіч, Н. Маральна-этычны ідэал у паэтычнай спадчыне Францішка Багушэвіча / Н. Бахановіч // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры. Выпуск пяты – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 2004. – С. 110 – 114.

Бахтин, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. Москва:Искусство, 1979. – 423 с.

Бердяев, Н. А. Философия свободного духа / Н. А. Бердяев. – Москва: Республика, 1994. – 480 с.

Каган, М. С. Философская теория ценності / М. С. Каган. – Санкт-Петербург: Петрополис, 1997. – 225 с.

Кажухоўская Л.С. Базісныя сімвалы нацыянальнай мастацкай карціны свету беларусаў / Л. С. Кажухоўская. – Мінск: БДУ, 2002 – с.

Конан, У. М. Ідэалы дасканалага грамадства ў беларускай літаратуры XIX – XX стст. / У. М. Конан. – рэжым доступу: http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/mab/albaruthenica/13/02.htm - электронны рэсурс]. – дата доступу: 12 чэрвеня 2018.

Крукоўскі М. І. Бляск і трагедыя ідэалу: філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і суверэнітэт / М. І. Крукоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2010. – 292 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма. Тыпалагічны аналіз культуры (2 гадзіны)

*План лекцыі:*

1. Паняцці тыпу, тыпалогіі і тыпалагізацыі культур.
2. Прынцыпы тыпалагізацыі культур.

*Мэта лекцыі:* разгледзіць асновы, крытэрыі і прынцыпы тыпалагічнай класіфікацыі культуры.

### 1. Паняцці тыпу, тыпалогіі і тыпалагізацыі культур.

У працэсе вывучэння абазначанай тэмы неабходна асэнсаваць вытокі праблемы тыпалагічнай класіфікацыі культуры, у выніку чаго яна ўзнікае і фарміруецца і якое месца займае ў культуралагічным праблемным полі. Знаёмства з відамі, формамі культуры паказвае, што сацыякультурны свет прадстае перад намі не як нешта аднароднае, а як багатая разнастайнасць, мноства, шматвары-янтнасць самабытных унікальных культурных адзінак. Яны часам існуюць не сутыкаючыся,маюцьсваюпрасторуісвойчас.Так,нямецкідаследчыкО.Шпен-глер

лічыў, што кожная культура жыве прыкладна адну тысячу гадоў, а яго англійскі калега А.Тойнбі сцвярджаў, што існаванне культур не мае выразных часовых межаў.

Перад сучаснымі культуролагамі паўстала пытанне: асобныя сацыякультурныя з'явы існуюць як абсалютна незалежныя адна ад адной, абсалютна непаўторныя, унікальныя ці паміж імі існуе нейкае падабенства, нейкая агульнасць? Адказ на пастаўленае пытанне мае два варыянты. Шэраг культуролагаў (М.Да-нілеўскі, А.Тойнбі, Э.Трольч) лічаць, што няма адзінай культурнай гісторыі чалавецтва; гісторыя, па іх меркаванні, уяўляе змену культур, кожная з іх жыве сваім уласным самадастатковым і адасобленым ад іншых культур жыццём. Яны перакананы, што аднalінейнасці працэсу культурнага і гістарычнага жыцця няма, лініі развіцця культуры разыходзяцца.

Вальтэр, Ш. Л.Мантэскё, Г.Э.Лесінг, І.Кант, І.Гердэр, У.Салаўёў, К.Ясперс зыходзяць з ідэі аб універсальнасці сусветнай гісторыі. Па іх меркаванні, у разнастайнасці сацыякультурнага свету можна прасачыць адзіную лінію развіцця чалавецтва, якая вядзе да стварэння агульначалавечай культуры. Асноўным аргументам гэтай пазіцыі з'яўляецца прызнанне таго, што культура ёсць змест чалавечага жыцця і чалавек усюды і заўсёды думае аб адным, як уладкаваць сваё жыццё і жыццё іншых людзей найлепшым чынам.

Разыходжанні па пытанні аб адзінстве сусветнай культуры, аб агульначалавечай культуры звязаны з розным разуменнем агульнага ў сусветнай культуры і розным тлумачэннем адзінства.

Разабрацца ў адзінстве разнастайнасці культур магчыма з дапамогай *тыпалагізацыі.* Справа ў тым, што ў межах аднаго мноства можна вылучыць некато-рую агульнасць усіх непаўторных элементаў, асобных культурных адзінак і абазначыць гэту агульнасць як адметную асаблівасць мноства культур у адроз-ненне ад іншага мноства. З гэтым і звязана шшяцце/ньшу *культур.*

*Тыпалогія культуры - гэта колькасна-змястоўная характарыстыка канкрэтна-гістарычных формаў бытавання культуры* (этнанацыянывльных, рэліг-ійных, рэлігійна-тэрытарыяльных і інш.). Праблема тыпалогіі культуры з'яў-ляецца адной з актуальных і дыскусійных праблем у сучаснай тэорыі культуры.

Асэнсаванне тыпу культуры, вызначэнне яго статуса, сэнсавага напаўнен-ня дэтэрмінаваныя асноватворным прынцыпам, у адпаведнасці з якім аналізу-ецца культурны кантэкст і выяўляюцца найболын агульныя якасныя рысы. *Тыпалагічны прынцып* задае даследчыку каляіну тэарэтычнага руху, вызначае яго ракурс і вектар у адборы і пабудове канкрэтнага матэрыялу. У гісторыі развіцця тэарэтычнай думкі аб культуры вядомыя розныя тыпалогіі. Іх аўтарамі былі філосафы, этнографы, сацыёлагі, гісторыкі, дзеячы мастацтва. Вядомыя тыпалогіі О.Шпенглера, Ф.НІцшэ, М. Данілеўскага, М.Бярдзяева. У наш час можна назваць больш дзесяці прынцыпаў тыпалагізацыі культуры, якія сустракаюцца ў тэарэтычнай літаратуры. Да іх адносяцца фармацыйны, цывілізацыйны, канцэптуальны, культурна-гістарычны, рэгіянальна-тэрытарыяльны, каланізацыйны, этнанацыянальны, дэмаграфічны, тыпалагізацыі па тыпу духоўна-каштоўнасных арыентацый чалавека, па тыпу рэлігіі, у адносінах да прыро-дны і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2. Прынцыпы тыпалагізацыі культур.**

У гуманітарнай навуцы найбольш вядомы наступныя прынцыпы. У ліку іх *фармацыйны,* які ўстанаўлівае залежнасць тыпу культуры ад пануючага споса-бу вытворчасці (першабытна-абшчынны, рабаўладальніцкі, феадальны, капі-талстычны).

*Цывілізацыйны* прынцып сустракаецца ў многіх аўтараў, але трактуецца ў залежнасці ад разумення цывілізацыі. Аналізуючы культуру з улікам дасягнен-няў і недахопаў цывілізацыі, многія даследчыкі прыйшлі да змястоўна блізкіх вынікаў аб адмоўным уздзеянні цывілізацыйных працэсаў на культуру, таму што яны параджаюць непрымальныя ёй з’явы і бяздушны інтэлект, духоўную бясплоднасць (Шпенглер), масавасць, перавагу утылітарна-прагматычныхус-тановак, дыктат тэхнікі (Бярдзяеў).

*Канцэптуальны* прынцып дае магчымасць асэнсаваць культуру з улікам пануючагаўграмадствесветапогляду.Канцэптуальна-светапоглядны яўяўленні аб свеце, месцы і ролі ў ім чалавека, аб значнасці яго дзеянняў, аб узаемаадно-сінах з іншымі даюць шырокі матэрыял для пабудовы пэўнай культурнай ма-дэлі свету.

*Рэлігійны* прынцып дазваляе класіфікаваць культуру ў залежнасці ад тыпу рэлігійнага светапогляду. Гэты прынцып дае магчымасць падзяліць культуру на язычніцкую (старажытную) і культуру, у якой пануе адна з формаў так назы-ваемых сусветных рэлігій: хрысціянская, мусульманская, будыйская і інш.

*Этнацыянальны* прынцып вызначае тыпалагічны аналіз культуры з улі-кам агульнасці этнанацыянальных характарыстык. Нацыянальныя культуры існуюць, як правіла, на вызначанай тэрыторыі лакальнага рассялення этнасу.

*Дэмаграфічны* прынцып тыпалагізацыі культуры арыентуецца на выяўлен-не асаблівасцей і супольнасцей узроставых і палавых прымет, дэтэрмінуючых якасць культурных арыентацый. У сувязі з гэтым істотнае значэнне набываюць шчыльнасць насельніцтва, яго колькасць, склад, сацыяльная занятасць.

*Культурна-гістарычны* прынцып з’яўляецца найбольш распаўсюджаным і ўстойлівым для выкарыстання пры вызначэнні культурнага кантэкста сацы-яльнагаразвіцц.Ёнакцэнтуедухоўныядамінантыгістарышныхперыядаўіэпох, у рамках якіх узніклі і функцыянуюць канкрэтна-гістарычныя тыпы культуры.

*Канкрэтна-гістарычны тып культуры - гэта форма бытавання шйбольш істотных, агульных, канцэптуальных духоўных каштоўнасцей.* У сучаснай культуралогіі вылучаюць наступныя гістарычныя тыпы еўрапейскай культу-ры: прыродна-сімвалічны (старажытныя формы культуры), антропакасмагані-чны (антычнасць), хрысціянска-рэлігійны (сярэднявечча), пратэстанцка-рэ-фармісцкі (Рэфармацыя), рацыянальна-нарматыўны (абсалютызм), крытыка-асветніцкі (Асветніцтва), рамантычна-утапічны (рамантызм), індывідуальна-прагматычны (другая паловаXVIII ст.), таталітарна-бюракратычныі дэмакра-тычна-тэхнатронны, а таксама гуманістычны (XX ст.).

*Да прыродна-сімвалічнга* тыпу культуры адносяццараннія формы культу-ры, якія характарызуюцца прадметнасцю культурных каштоўнасцей у прырод-ныхз’явах.

*Антрапа-касмаганічнаму* тыпу культуры належаць антычныя формы куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры, якія выяўляюць адзінства прыроднакасмічных і чалавечых пачаткаў.

Культура ранняга і позняга сярэднявечча, заснаваная на хрысціянскай дактрыне, *уяўляе хрысціянска-рэлігійны* тып культуры.

Калі мы гаварым *пра універсальна-гарманічны* тып культуры, то маем на ўвазе культуру эпохі Адраджэння, якая сцвярджала ідэалы гуманізму і тытанізмучалавечагадуху.

*Пратэстанцка-рэфармісцкі* тып культуры звязаны з культурай, якая адлюстравала ідэі пратэстантызіу, апазіцыйнага рэлігійна-рэфармісцкага руху супрацькансерватыўна-дэспатычнай ідэалогіі каталіцызму. Пратэстантызм дэмакратызаваў царкоўныя традыцыі, Рэфармацыя заклала асновы вольнадумства і прававойдзяржавы.

*Рацыянальна-нарматыўны* тып культуры ўласцівы культуры, якая строга падпарадкавалася і рэгламентавалася пануючай ідэалогіяй абсалютызму. Гэ-тая культура пераважна рацыянальная і нарматыўная.

*Рамантычна-утапічны* тып культуры характарызуе сістэма светаўспрыман-ня, якая ўзнікла ў выніку расчаравання вынікамі буржуазных рэвалюцый у Еў-ропе, якія не апраўдалі асветніцкіх ідэй дасканаласці чалавека і грамадства.

*Індывідуальна-прагматычны* тып культуры звязаны з сістэмай каштоўнасцей, якая склалася ў эпоху буржуазных адносін, калі дамінуючымі становяцца інстытут прыватнай уласнасці, прагматычныя інтарэсы чалавека, асабістая ініцыятыва, прадпрымальнасць і мэтанакіраванасць у прымнажэнні матэрыяльныхдаброт.

*Дэмакратычна-тэхнатронны* тып культуры ўключае сучасную культуру высокаразвітых цывілізацый, якая характарызуецца двухадзіным уплывам тэхнікі: пазітыўна-дэмакратычным і негатыўным. Навукова-тэхнічны прагрэс садзей-нічае пашырэнню сацыякультурнага поля. Разам з тым развіццё гэтага працэсу ўзмацняецца дыктатам тэхнікі над духоўным.

Да *таталітарна-бюракратычнага* тыпу культуры належыць пераважна афіцыйная культура, якая падпарадкоўваецца строгім установкам пануючай ідэа-логіі.

Такім чынам, тыпавая характарыстыка аб'ядноўвае элементы па агульным для іх прынцыпе ў адну групу, але ў той жа час менавіта тыпавая характарыс-тыка адрознівае гэтае мноства ад іншых груп. Значыць, *тып культуры - гэта падабенства, агульнасць, тое, што аб'ядноўвае культурныя адзінкі ў адно мноства культур і адрознівае гэта мноства культур ад іншых.* А метад навуковага пазнання, з дапамогай якога ўся разнастайнасць культур ўпарадкоўваецца, класіфікуецца, групуецца ў розныя тыпы (мноствы, групы) культур, называецца *тыпалагізацыяй.* Як навуковы метад, што выкарыстоўваецца ў культуралогіі, *тыпалагізацыя ёсць расчляненне сацыякультурных аб'ектаў і іх групоўка па некаторых агульных прыметах, стварэнне некаторай ідэалізаванай тыпалагічнай мадэлі культуры ці тыпу.* Вынікам тыпалагізацыі з'яўляецца тыпалогія культуры, пад якой неабходна разумець *сістэму вылучаных тыпаў культуры.* На падставе сказанага культуролагі разводзяць тыпалагізацыю культур як метад культурнагістарычнага аналізу і тыпалогію як сістэму вылучаных тыпавых мадэляў культуры.

Тыпалогія культур ажыццяўляецца з дапамогай дзвюх важнейшых зыход-ных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логіка-пазнавальных працэдур.

Па-першае, як і любая класіфікацыя, тыпалагізацыя культур, упарадкаван-не па групах абапіраецца на выбар *падстаў, крытэрыяў* класіфікацыі. Пры-чым у кожным канкрэтным вышадку пабудовы тышалогіі можа вылучацца адна падстава, адна важнейшая прымета, па якой устанаўліваецца агульнасць куль-тур, аб'яднаных у адзін тыш культуры, або адразу некалькі. Але важна, каб гэта

*Этнаграфічны* крытэрый прадугледжвае, што ў якасці падстаў могуць вы-ступаць быт, гаспадарчы ўклад, мова і інш.

*Прасторава-геаграфічны* крытэрый бярэцца за аснову пры класіфікацыі культур па рэгіянальных прыметах (заходнееўрапейская, лаціна-амерыканская, афрыканская і інш.).

*Храналагічна-часовы* крытэрый абумоўлівае вылучэнне такіх тыпаў куль-тур, якія існавалі ў сацыяльным узаемадзеянні (кансерватыўны, традыцыйны, інавацыйны тыпы культуры).

*Фармацыйны* крытэрый вынікае з тэорыі грамадска-эканамічных фарма-цый, якія адрозніваюцца адна ад другой спосабамі вытворчасці і сістэмамі гра-мадскіхадносін (рабаўладальніцкі, феадальны, буржуазны, пралетарскі тыпы культур).

*Каштоўнасныя арыентацыі* як крытэрый выступаюць у тым выпадку, калі за аснову бярэцца прыярытэтнасць пэўных каштоўнасцей. Менавіта такая пры-мета ўзята за аснову сучаснымі культуролагамі. У гэтым выпадку робіцца най-больш абагульненая тыпалагізацыя культур (Усход–Захад).

Безумоўна, намі пералічаны далёка не ўсе крытэрыі, па якіх ажыццяўляецца тыпалагізацыя культур. Але і названыя крытэрыі сведчаць, што падстаў для тыпалагізацыі культур існуе шмат і кожная тыпалогія робіцца з пэўнай мэтай, вырашае пэўныя пазнаваўча-даследчыя задачы. Таму другой логіка-пазнаваў-чай працэдурай, якая вызначае тыпалагізацыю культур, з'яўляецца выяўленне пазнаваўчых мэт (задач) такой класіфікацыйнай пабудовы. Так, даследчыцкія і пазнаваўча-вучэбныя мэты прадугледжваюць набор некалькіх прымет і крытэ-рыяў. Шэраг культуролагаў групуюць культуры па крытэрын функцыянальнай ролі і механізмаў ажыццяўлення асноўных формаш мыслення (А.Е.Гелен, Э. А. Арлова). На базе гэтага крытэрыя вылучаюцца тыпы культур, у якіх пера-важаюць або абстрактная, або асацыятыўна форма мыслення.

Можна вылучыць *інфармацыйна-камунікатыўную* тыпалогію культур. Ас-ноўным крытэрыем у дадзеным выпадку з'яўляецца ступень залежнасці кож-най культуры ад сацыякультурнага кантэксту і формы абмену інфармацыяй. На падставе гэтага Дж. Хофстэд вылучае культуры з высокай ступенню залежнасці ад сацыякультурнага кантэксту і з нізкай ступенню.

Можна назваць цэлы шэраг іншых крытэрыяў і прымет, па якіх адбываецца тыпалагізацыя культур. Але з вышэйсказанага вынікае, што ў сучаснай гуман-ітарыстыцы існуе неадназначнасць крытэрыяў і пазнаваўчых задач, на базе якіх ажыццяўляецца тыпалагізацыя культур.

Такім чынам, разнастайнасць сацыякультурнага свету не дазваляе нам па-будаваць адзіную тыпалогію культуры. Менавіта гэтым можна патлумачыць існаванне стракатай тыпалагічнай мазаічнасці і шматварыянтнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

Библер, В. С. От наукоучения - к логике культуры: два филос. введения в двадцать первый век/ В.С.Библер.-М.: Политиздат, 1990.- 413 с.

Дубянецкі, Э.С. Культуралогія: Энцык. давед. / Э.С.Дубянецкі; маст. А.А.Глекаў.-Мінск.:БелЭн, 2003. – 383 с.

Ерасов, Б.С. Социальная культурология: Пособие для студентов высших учебных заведений, -- 2-е изд., испр. и доп. – М.: Аспект Пресс, 1997. – 591 с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Мартынов, В.Ф. Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В.Ф.Мартынов. – Минск: АСАР, 2008. – 848 с.

Смолік, А.І. Культурологія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Швейцер, А. Упадок и возрождение культуры: Избранное /А.Швейцер-М.: Прометей, 1993. – 512 с.

**Тэма. Структурная дынаміка культуры (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Сацыяльныя формы культуры і іх сутнасць.
2. Субкультура і контркультура ў кантэксце асваення аксіялагічнай прасторы.
3. Глабалізацыя як фактар сацыядынамікі культуры.

*Мэта лекцыі:* выявіць прычыны сацыякультурнай дынамікі, паказаць дынаміку культуры як змену каштоўнасцей, металітэту і культурна-гістарычных працэсаў.

## 1. Сацыяльныя формы культуры і іх сутнасць.

Своеасаблівымі адзінкамі, элементамі усёй агульнай культуры з'яўляюцца яе розныя формы, гэта значыць спосаб перадачы сацыяльнай інфармацыі, захавання пэўнага каштоўнаснага зместу. Культурная форма ўяўляе сабой своеасаблівую мадэль, на аснове якой ствараюцца разнастайныя артэфакты, узнікаюць пэўныя з'явы і працэсы культуры. Форма характырызуецца семантычным (змястоўным) патэнцыялам, сукупнасцю каштоўнасцей і сэнсаў, якія яна транслірue ў культурную прастору. Культурнай форме таксама ўласцівы і сацыяльны патэнцыял, здольнасць уздзейнічаць на развіццё грамадства. Форма стварае вакол сябе ментальнае поле, якое структурыруецца катэгорыямі культуры.

Культуролагі раздзяляюць культурныя формы на *семантычныя і*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*дзейнасныя.* Да семантычных форм адносяцца нормы, каштоўнасці, ідэалы, якія перадаюць асноўныя каштоўнасныя аспекты культур.

Адзначым перш за ўсё разнастайнасць формаў культуры, паколькі любы від ці спосаб чалавечай жыццядзейнасці дазваляе нам гаварыць аб новай форме культуры і яе новым суб’екце-носьбіту. Шматлікія формы культуры могуць нараджацца як па гарызанталі, так і па вертыкалі чалавечага быцця.

Разнастайнасць культуры грунтуецца на мностве спосабаў арганізацыі творча-стваральнай дзейнасці людзей, на прынцыпе дзейнасці як уласна чалавечай крыніцы паходжання мыслення, формаў сацыяльнага жыцця і прадуктаў культуры. Агульнасць катэгорыі дзейнасці дазваляе ўключыць у яе ўсякую спецыфічна чалавечую форму актыўных адносін да навакольнага асяроддзя, змест якой складаюць яго мэтанакіраванае змяненне і пераўтварэнне. У сферы дзейнасных адносін людзей да прыроды, грамадства, іншых людзей фарміруюцца зыходныія стымулы развіцця ўсіх формаў чалавечай культуры.

Кожная форма культуры ўзнікае па сутнасці як адказ на пэўныя праблемы і задачы, звязаныя з узнаўленнем чалавечага існавання. Формы прынята лічыць складаным элементам структуры культуры. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што яны не з’яўляюцца культурнымі універсаліямі, а толькі элементамі складанай культуры, маючай развітую структуру. Таму станаўленне асобных формаў культуры, іх вылучэнне з сінкрэтычнай культуры з’яўляецца важнейшым прадметам любога культуралагічнага разгляду.

Культура як прадукт чалавечай дзейнасці мае на сабе адбітак свайго творцы, унутранай сваёй структурай адлюстроўвае яго структуру. Вядома, што чалавек мае два структурныя ўзроўні: біялагічны і сацыяльны. Гэта азначае, што ў сваім узаемадзеянні з прыродай чалавек карыстаецца і пачуццём, і розумам. Задавальненне матэрыяльных і духоўных патрэб чалавека адбываецца часткова за кошт натуральных прадуктаў прыроды, часткова за кошт новых, створаных ім прадуктаў у працэсе дзейнасці. Гэтыя артэфакты і складаюць культуру. У адпаведнасці з вышэйазначанай структурай чалавека прадукты яго жыццядзейнасці маюць два асноўныя структурныя ўзроўні: знешні (прадметны); унутраны (асобасны). На падставе гэтага ўсю культуру прынята падзяляць на духоўную і матэрыяльную.

Такі падзел культуры адносны. З аднаго боку, культура ў цэлым духоўная, таму што яна ўяўляе сабою свет сэнсаў, г. зн. духоўных сутнасцей. А з другога боку, яна ўся матэрыяльная, таму што прадстаўлена ў пачуццёва ўспрымальных кодах, знаках і тэкстах.

Аб *духоўнай культуры* як асобнай галіне культурнай прасторы магчыма гаварыць толькі ў тым выпадку, калі гэта галіна вылучаецца не па прымеце яе нематэрыяльнасці, а па яе становішчы адносна кагнітыўнай, каштоўнаснай і рэгулятыўнай восей.

Такім чынам, галіна духоўнай культуры набывае выразныя контуры, калі да яе адносяцца ў асноўным такія культурныя формы, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зарыентаваны, галоўным чынам, на выпрацоўку ведаў, каштоўнасцей і ідэалаў. З гэтага вынікае, што духоўная культура ўключае прадметы, з'явы і працэсы, якія выконваюць выключна інфармацыйную, знакава-сімвалічную, эстэтычную і ментальную функцыі. Іншымі словамі, тэрмін "духоўная культура" ўжываецца ў культуралоги для абазначэння сферы чалавечай дзейнасці, якая ахоплівае розныя бакі духоўнага жыцця чалавека і грамадства.

Спалучэнне апазіцыіі "прырода — культура" з'яўляецца зыходнай і гістарычна, і лагічна ў асэнсаванні культуры як спецыфічнай формы быцця. Практычнае суаднясенне культуры і прыроды, апасродкаванне працоўнай дзейнасцю чалавека вядзе да ўсё больш шырокага пераўтварэння прыроды ў культуру. Яно пачалося ў глыбокай старажытнасці, у працэсе вырабу прыілад працы, адзення, посуду, збудавання жытла, і прадаўжаецца на працягу ўсёй гісторыі, паслядоўна пашыраючы экалагічную нішу, якую чалавецтва заняло і імкнецца найлепшым чынам абсталяваць. Звычайна вынікі і спосабы такой дзейнасці прынята называць *матэрыяльнай культурай*. Са сказанага вынікае, што матэрыіяльная культура — гэта сукупнасць матэрыіяльныіх каштоўнасцей, створаныіх чалавецтвам у працэсе гістарыічнай грамадска карыіснай дзейнасці, прыіладыі працыі, жыіллё, адзенне, ежа, транспартныія сродкі, культавыія і быітавыія рэчыі, прадметыі мастацтва і інш. Яна адлюстроўвае ўзровень вытворчых сіл і экалагічнага асваення прыроды чалавекам.

Матэрыяльная культура вызначае ўзровень жыцця грамадства, характар яго матэрыяльных патрэб і магчымасці іх задавальнення. Яна стварае аснову духоўнай культуры. Істотныія змены ў відах апошняй выклікаюцца фундаментальнымі структурнымі пераўтварэннямі ў відах матэрыяльнай культуры, трансфармацыяй цывілізацыі.

Разнастайнасць чалавечай дзейнасці ўскладняе працэс вывучэння матэрыяльнай культуры, вызначэнне яе фораў і катэгорый. У.Огбарна, напрыклад, да матэрыяльнай культуры адносіць усе матэрыяльныя прадметы, а таксама вынаходніцтвы і змены ў развіцці тэхналогіі. Шэраг культуролагаў лічаць, што ў матэрыіяльную культуру ўваходзяць: а) культура працы і матэрыіяльнай вытворчасці; б) культура быпу; в) культура топасу; г) культура адносін да ўласнага цела.

Розныя азначэнні матэрыяльнай культуры, яе формаў можна патлумачыць тым, што яе вывучэннем займаюцца археалогія, этналогія, гісторыя і іншыя навукі гуманітарнага профілю.

Звычайна за аснову вызначэння формаў матэрыяльнай культуры бяруць наступныя прыметы: 1) здольнасць да самастойнага перамяшчэння; 2) здольнасць захоўвацца; 3) нерухомасць; 4) прыродны жывы субстрат фактаў культуры; 5) тэхнагенны субстрат фактаў культуры; 6) неабходнасць у сацыяльных шстытутах для стварэння і існавання дадзенага віду культуры.

У залежнасці ад таго, які суб'ект стварае артэфакты культуры і які іх ўзровень класіфіцыруюцца формы культуры. У папярэдніх лекцыях мы ўжо разгледзілі некаторыя формы культуры. Цяпер звернемся да *сацыяльных*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*форм культуры.*

**Элітарная культура**. Актывізацыя інтарэса і звароту да духоўнай культуры элітарнай часткі супольнасці мінулых стагоддзяў дэманструе якасна новы ўзровень нацыянальнай самасвядомасці сучаснай моладзі. На дадзеным этапе культурагэнэза адбываецца трансмісія ўзораў культуры арыстакратыі і вяртанне яе ў сучасную сацякультурную прастору. Гэта, на наш погляд, вельмі важна, так як ва ўмовах сацыяльных рэвалюцый і сацыялістычных пераўтварэнняў была страчана пераемнасць традыцый элітарнасці. У свядомасць савецкіх людзей насаджалася перакананне, што рухаючай сілай грамадства з'яўляюцца масы, а не асоба. У той жа час заснавальнікі тэорыі эліт В.Парета, Г.Моска, и Р.Міхельс і інш. пераканаўча паказалі, што эліта ажыццяўляе выпрацоўку ідэй, стратэгіі развіцця грамадства, адыгрвае вызначальную ролю ў палітыцы, эканоміцы і культуры.

Ідэя *элітарнасці культуры* зарадзілася ў заходняй філасофіі ў выніку засваення духоўнай спадчыны эпохі Асветніцтва. У рамках параўнальнай сацыялогіі і філасофіі культуры быў праведзены глыбокі аналіз арыстакратычнай і дэмакратычнай культуры. Ф.Ніцше адзначаў, што ў арыстакратычным грамадстве пануючая эліта стварае дыстанцыю паміж сабой і групамі, якія стаяць на больш нізкіх прыступках сацыяльнай лесвіцы.

*Эліта — гэта вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства, які ажыццяўляе функцыі кіравання, развіцця навукі і культуры.* Яна ўяўляе сабой адносна невялікую частку насельніцтва, што стварае і спажывае *элітарную культуру***,** валодае больш высокім, чым у сярэднім па грамадству, культурным капіталам, яе найчасцей атаясамліваюць з інтэлектуаламі, зрэдку — з інтэлігенцыяй у цэлым. Прадстаўнікі элітарных колаў вельмі адмоўна адносяцца да імпульсіўных, спантанных паводзін, лічаць іх вульгарнымі. Звычайна арыстакратычная эліта імкнецца стварыць уласную элітарную культуру. Яна клапоціцца аб тым, каб пэўныя істотныя рысы яе групавой культуры, і перш за ўсё такія, як формы зносін, забавы, асаблівасці мовы, розныя метады і сістэмы ведаў, заставаліся недасягальнымі для мас.

Элітарная культура ствараецца звычайна элітай або па яе заказе высокапрафесіянальнымі творцамі (мастакамі, пісьменнікамі, музыкантамі), што валодаюць творчай адоранасцю і выключнай мастацкай успрымальнасцю. Яна складаецца з выяўленчага мастацтва, класічнай музыкі, літаратуры і іншых відаў мастацтва, якія прадстаўлены найбольш самабытнымі, яркімі, таленавітымі мастакамі, пісьменнікамі, рэжысёрамі, вучонымі, што з'яўляюцца культурнымі лідэрамі ў сваіх краінах, задаюць сістэму высокіх патрабаванняў, ствараюць высокамастацкія, эталонныя, узорныя творы (карціны, раманы, паэмы, спектаклі, тэорыіі, канцэпцыіі). Гэтыя творы атрымліваюць шырокае прызнанне, уваходзяць у нацыянальную і агульначалавечую культурную спадчыну.

Характэрнымі рысамі элітарнай культуры з'яўляюцца духоўны арыстакратызм, эстэтычная свабода, глыбіня зместу і арыгінальнасць, вытанчанасць формы, наватарства, цяга да эксперыментатарства, прынцыповая замкнёнасць, ярка выяўлены індывідуальны пачатак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камерцыйная незалежнасць і інш. Яна звыйайна паслядоўна супрацьстаіць культуры большасці — масавай культуры.

Вытокі элітарнай культуры трэба шукаць ў першабытным грамадстве, калі жрацы, шаманы, племянныя кіраўнікі станавіліся прывілеяванымі ўладальнікамі асаблівых ведаў, навыкаў, якія не прызначаліся для ўсеагульнага, масавага карыстання. У наступныя гістарычныя эпохі (антычнасць, сярэдневякоўе, новы і навейшы час) адбываліся станаўленне і развіццё элітарнай культуры, што выявілася ў дзейнасці знакамітых творцаў у галіне філасафіі, літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва, тэатра.

Элітарныя тэндэнцыі атрымалі надзвычайнае пашырэнне ў XX ст. і былі ўласцівы пераважна авангардысцкаму, мадэрнісцкаму і постмадэрнісцкаму мастацтву.

Па сваім узроўні мастацкія творы, створаныя культурнай элітай, нярэдка бываюць надзвычай складанымі або зусім незразумелымі для сярэднеі нізкаадукаваных людзей. У той жа час нельга не адзначыць, што надзвычай арыгінальныія, наватарскія творы элітарнай культуры могуць значна апярэджваць свой час, а таму яны нярэдка атрымліваюць належнае прызнанне з боку грамадства толькі праз многія гады і нават дзесяцігоддзі.

У жыцці адныя і тыя ж віды мастацтва могуць належаць высокай і масавай культурам (напрыклад, класічная музыка — элітарнай, а папулярная — адпаведна масавай). Бываюць выпадкі іх узаемаўплываў, узаемапераходаў і спалучэння асобных элементаў розных культур у адным творы, у дзейнасці аднаго творцы.

**Народная культура.** Гістарычнай асновай элітарнай культуры з'яўляецца непрафесійная, ананімная, калектыўная культура, якая адлюстроўвае творчую дзейнасць народа, яго жыццё, уяўленні і ідэалы. У навуцы яе прынята называць народнай культурай. Яна адносіцца да найважнейшай часткі гісторыка-культурнай спадчыны і адыгрывае выключную ролю ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу, адлюстроўваючы яго гістарычныя вытокі і першародную сутнасць. Народ заўсёды выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультурных традыцый, якія ён беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы яе сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам. Складваючыся з цягам часу ў зладжаную і гарманічную сістэму жыццёвых правіл, маральных нормаў, прыярытэтаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, міфалагічных і мастацкіх вобразаў, працоўных навыкаў, народныя традыіцыіі служыілі магутнай маральна-ахоўнай сілай, інтэлектуальным рэсурсам, што вызначаў пасіянарнасць, жыццяздольнасць народа і яго самабытнай культуры. Менавіта народная культура з уласцівымі ёй непасрэднасцю, першароднай чысцінёй, глыбокай маральнасцю, рэгіянальна-варыятыўнай разнастайнасцю служыць асновай для розных відаў прафесійнага мастацтва, надае ім непаўторны нацыянальны каларыт і супрацьстаіць агрэсіі масавай культуры. Народная культура ўзнікла ў старажытнасці, яна цесна звязана з традыцыямі якога-небудзь віду мастацкай дзейнасці і з'яўляецца гістарычнай асновай сусветнай мастацкай культуры. Звычайна яна ствараецца ананімнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творцамі, якія найчасцей не маюць прафесійнай падрыхтоўкі. Па сваім выкананні элементы народнай культуры могуць быць індывідуальнымі (напрыклад, расказванне легенды), групавымі (выкананне песні, танца), масавымі (карнавальныя шэсці). Што б ні ствараў чалавек — храмы, жыллё, выязныя экіпажы, бытавыя рэчы, адзенне і інш. — гэта заўсёды працоўны і асветлены духоўна творчы працэс. Разнастайныя рукатворныя рэчы — ад помнікаў архітэктуры да бытавых дробязей — увасабляюць пэўныя этнакультурныя традыцыі, што даюць каштоўную, а часам унікальную інфармацыю пра гістарычную мінуўшчыну: пра тое, як жыў чалавек, чым жыў, пра яго духоўныя інтарэсы, эстэтычныя густы, міфалагічныя светаўяўленні, веды, навыкі майстэрства і інш. Тыя ці іншыя рэчы выконваюць разнастайныя функцыі — утылітарна-практычныя, эстэтычныя, сацыяльна-псіхалагічныя, абрадавыя, выхаваўчыя. Яны набываюць асаблівы сімвалічны сэнс, выпраменьваючы ўнутранае святло, сакральную аўру, зачароўваюць, настройваюць на роздум, будзяць успаміны. Як рэліквіі і гісторыка-культурныя помнікі, яны з’яўляюцца святынямі, што фарміруюць нацыянальна-дзяржаўны імідж, выхоўваюць многія пакаленні ў адпаведнасці з лепшымі нацыянальнымі традыцыямі, нормамі маралі і духоўнага жыцця.

Гістарычны вопыт паказвае, што традыцыйная народная і прафесійная культуры, нягледзячы на урбанізацыю і навукова-тэхнічны прагрэс, суіснуюць разам у творчых стасунках і ўзаемадачыненнях. Ідэйны разрыў ці антаганізм дзвюх формаў культуры тоіць у сабе вялізную разбуральную сілу, вядзе да бездухоўнасці, адчужэння народа і інтэлігенцыі, да крызісу нацыянальнай культуры. Г этыя калізіі яскрава выяўляліся на пераломных этапах гісторыі — крушэнні антычнай цывілізацыі, сацыяльных рэвалюцыях. Па-свойму гэты крызіс перажываюць краіны, якія губляюць сваю незалежнасць і суверэнітэт. Наша краіна на працягу некалькіх стагоддзяў была пазбаўлена права на нацыянальную адукацыю і развіццё прафесійнай культуры. У такіх умовах беларуская культура доўгі час развівалася галоўным чынам у форме народнай, традыцыйна-бытавой культуры. Асноўным яе носьбітам з’яўляліся сялянства, рамеснікі і дробная шляхта. Адносная ізаляцыя ад культуры пануючых вярхоў вызначала яе своеасаблівы архетып, устойлівую кансерватыўнасць, садзейнічала захаванасці ў ёй старажытных язычніцкіх культаў, багатай міфалогіі, самабытных славянскіх, часткова балцкіх элементаў.

Народная культура ўключае створаную народнымі творцамі паэзію (паданні, песні, казкі, эпас), музыку (песні, інструментальныя найгрышы і п’есы), тэатр (драмы, сатырычныя п’есы, тэатр лялек), танец, выяўленчае і дэкаратыўнае мастацтва.

**Масавая культура.** Паміж дзвюма сусветнымі войнамі ў Еўропе, ЗША, Японіі пачало складвацца новае грамадства, у якім навукова-тэхнічная рэвалюцыя, урбанізацыя, разбурэнне лакальных супольнасцей і размыванне тэрытарыяльных і сацыяльных межаў спарадзілі масавую культуру. Паняцце “масавая культура” з’явілася ў 1940-я г. у ЗША. Пад ёй разумеецца вытворчасць культурных каштоўнасцей, разлічаная на масавы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падпарадкаваны масам ужытак. Масавая культура і з'яўляецца прадуктам трансфармацыі сучаснага грамадства, яго пераходу ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) тыпу тэхналагічнага развіцця і звязана з развіццём сродкаў масавай камунікацыі, павышэннем узроўню адукаванасці мас і дэмакратызацыяй культуры, павелічэннем вольнага часу.

Шматлікія даследчыкі гэтага феномена адзначаюць, што масавая культура арыентавана на масавае распаўсюджанне сваіх духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей на ўзроўні "ўсярэдненага" масавага спажыўца, функцыяніруе як прамыслова-камерцыйная вытворчасць. Яна з'яўляецца своеасаблівым "мастацтвам" для ўсіх і для кожнага. Дадзеная форма культуры атрымала найбольшае распаўсюджванне ў другой палове XX ст. у сувязі з хуткім развіццём сродкаў масавай інфармацыі – радыё і тэлебачання, аўдыё- і відэтэхнікі, камп'ютэраў, Інтэрнэту. Так, Г.Андэрсам, Р.Баўэрам, К.Мертанам сродкі масавай інфармацыі разглядаюцца як каналы грамадства, што распаўсюджваюць ілюзіі, эталоны пачуццяў і ўчынкаў. Яны падкрэсліваюць, што масавая культура адцягвае людзей ад рэальнага жыцця, запаўняе яго выдуманымі сюжэтамі, пагружае грамадства ў летаргічны сон. Масавая культура заснавана на розных ілюзіях, фантазіях, стэрэатыпах масавай свядомасці, моцна залежыць ад сучаснай моды, разлічана на на прадстаўнікоў розных нацый, полаўзроставых супольнасцей і да т. п. Сэнсавы дыяпазон масавай культуры шырокі — ад прымітыўнага кіча да складаных і змястоўна насычаных формаў.

Асноўныя жанры ў розных відах культуры наступныя: у літаратуры — дэтэктыў, прыгоды, фантастыка, так званая "бульварная літаратура"; у кіно — ба-
явік, трылер, меладрама, "мыльная опера"; у выяўленчым мастацтве — карыкатура, комікс; у музыцы — рокі поп-музыка, а таксама разнастайныя шоу.

Тыповымі героямі і сімваламі масавай культуры з'яў-
ляюцца, напрыклад, суперагент Джэймс Бонд, Тэрмінатар, усякія супермены, разнастайныя секс-сімвалы і інш.

Разглядаемая форма культуры адпавядае патрэбам масавай аўдыторыі ў эмацыянальнай кампенсацыі і разрадцы, адпачынку, гульнях; адначасова садзейнічае ўкараненню ў свядомасць людзей стандартызаваных нормаў асабістай культуры, ідэалагічна арыентаванага светаўяўлення, нівеліроўцы поглядаў і густаў. Характэрныя асаблівасці масавай культуры — прымітывізацыя чалавечых адносін, культ моцнай асобы, грошай, поспеху, асабістага абагачэння, прапаганда канфармізму ў грамадскай свядомасці, жорсткасці, насілля, сексу, выкарыстанне разнастайных паўзабароненых і ўзбуджальных тэм, вобразаў і мастацкіх сродкаў, штучная забаўляльнасць, натуралізм і інш. Г алоўным вытворцам масавай культуры з'яўляюцца Злучаныя Штаты Амерыкі, а асноўнымі спажыўцамі — прадстаўнікі пераважна заходняй цывілізацыі. Праяўленне масавай культуры характэрна для ўсіх краін незалежна ад формаў дзяржаўнага ладу.

Большасць сучасных культуролагаў сцвярджаюць, што масавая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культура наогул прывяла да дэструкцыі асобы, пазбавіўшы чалавека сапраўдных пачуццяў і перажыванняў. Але ў асэнсаванні яе вызначаецца і другая тэндэнцыя. Шэраг даследчыкаў лічаць, што нельга разглядаць функцыі масавай культуры толькі з пазіцый высокай эстэтыкі і, абапіраючыся на іх, прымаць меры па абмежаванні гэтай культуры. Пры гэтым неабходна ўлічваць культурны механізм яе некаторых жанраў у зняцці велізарных напружанняў, якія узнікаюць у паўсядзённым існаванні, настрою стомленасці і абыякавасці, жорсткасці і агрэсіўнасці, адчаю і разгубленасці, крыўды і страху.

Істотнай асаблівасцю сучаснай масавай культуры стала шырокае распаўсюджванне ў ёй не толькі ўласна забаўляльнай мастацкай прадукцыі, але і папулярнай навукі. Вялікая колькасць навукова-папулярных часопісаў дапаўняецца пастаяннымі радыёі тэлеперадачамі адукацыйнага характару, што садзейнічае далучэнню шырокіх мас насельніцтва да навуковых ведаў.

### 2. Субкультура і контркультура ў кантэксце асваення аксіялагічнай прасторы.

Дэфініцыя "субкультура" ў навуковы абарот увайшло параўнальна нядаўна. Акрамя таго, у першых працах даследчыкі, якія вывучалі дадзенае паняцце, ставіліся да з'явы, якую яна абазначае, адмоўна: меркавалася, што субкультура — гэта не толькі параджэнне капіталістычнага грамадства, але і прыкмета яго загнівання. Напрыклад, расійскі сацыёлаг Ю.Н.Давыдаў у кнізе "Эстэтыка нігілізму" пісаў, што маладзёжную субкультуру «ў пэўным сэнсе можна назваць штучным прадуктам, фабрыкатам капіталістычнай "індустрыі культуры."»

У даведачных выданнях паняцце "субкультура" з'явілася толькі ў другой палове 80-х гг. XX ст. З гэтага часу паняццю "субкультура" больш не надавалася, па-першае, адмоўнае значэнне "загнаення капіталістычнага грамадства", па-другое, яго пачалі выкарыстоўваць для характарыстыкі не толькі капіталістычнага грамадства, але і сацыялістычнага, якім быў СССР; аднак пры гэтым, па-трэцяе, захавалася негатыўнае адценне ў яго трактоўцы, якое, калі гаворыцца аб субкультурах злачыннага міру або мафіі, магчыма, і будзе апраўдана, але ў выпадках з маладзёжнай і прафесійнай субкультурамі прыводзіць да пэўных складанасцей у тлумачэнні. Яно трактуецца наступным чынам: 1) *культура якой небудзь сацыяльнай або дэмаграфічнай групы; 2) у чымсьці абмежаваная культура сацыяльнай супольнасці, абумоўленая абмежаванасцю яе сацыяльных сувязей, непаўнатой або цяжкасцю доступу для яе культурнай спадчыны.*

У шэрагу выпадкаў групы, якія былі пастаўлены ў нераўнапраўнае становішча ў грамадстве ці часова пазбаўленыя свабоднага доступу да культурнай спадчыны і магчымасцей для самаразвіцця, развіваюць спрошчаныя формы культуры, якія змяняюць яе нармальныя, сутнасныя формы ў той ці іншай ступені, і супрацьстаяць культуры як цэламу. Такімі, напрыклад, з'яўляюцца субкультуры злачынных груп і арганізацый тыпу мафіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Больш складанымі ўяўляюцца адносіны з дэмаграфічнымі і прафесійнымі групамі, культура якіх (напрыклад, моладзі, вучоных, маракоў далёкага плавання), хоць і не супрацьстаіць цэласнай нацыянальнай культуры, мае ўсё ж такі значныя асаблівасці. Моладзь развівае сваю субкультуру, у прыватнасці, стварае жаргонную мову, сваю моду, музыку, маральны клімат. Яе асаблівасці тлумачацца, з аднаго боку, жыццёвай энергіяй, багаццем уяўлення моладзі, а з другога — адсутнасцю ў яе эканамічнай і сацыяльнай самастойнасці.

Субкультурныя нормы, каштоўнасці, уяўленні і стэрэатыпы адрозніваюцца ад аналагічных, прынятых у межах традыцыйнай культуры, таму што аказваюцца скарэкціраванымі для канкрэтных таварыстваў у межах пэўнай сацыякультурнай сістэмы. Прадстаўнікі той ці іншай субкультуры падзяляюць нормы, каштоўнасці, а таксама ўяўленні, прынятыя ў межах іх субкультуры.

Для любой субкультуры існуе абавязковы набор характэрных рыс, адсутнасць якой-небудзь з іх ставіць пад пытанне магчымасць аднясення таго або іншага сацыякультурнага ўтварэння да субкультуры. Гэта наступныя рысы:

спецыфічны стыль жыцця і паводзін;

уласцівыя дадзенай сацыяльнай групе своеасаблівыя нормы, каштоўнасці, светаадчуванне;

наяўнасць больш або менш яўнага ініцыятыўнага цэнтра, які генерыруе ідэі;

своеасаблівы “стыль”, які з дапамогай пэўнага адзення, прычоскі і інш. дазваляе стварыць і падтрымліваць пэўны вобраз, імідж;

жаргон, спецыфічная форма вядзення размовы, адмысловая міміка, жэстыкуляцыя і інш.

Адзінай дэфініцыі субкультуры сучасная культуралогія яшчэ не выпрацавала, таму найбольш распаўсюджанае ўяўленне пра субкультуру як культуру з сістэмай нормаў і каштоўнасцей, якія адрозніваюць групу ад большасці грамадства. Гэта можа быць культура групы або класа, яна адрозніваецца ад пануючай культуры або з’яўляецца ёй варожай (контркультура). Субкультура можа ўяўляць сукупнасць некаторых негатыўна інтэрпрэтаваных нормаў і каштоўнасцей традыцыйнай культуры, якія функцыянуюць у якасці сацыякультурных арыентацый злачыннага пласта грамадства. Разам з тым гэта можа быць асобая форма арганізацыі людзей (часцей за ўсё моладзі) як аўтаномнае цэласнае ўтварэнне ўнутры пануючай культуры, што вызначае стыль жыцця і мыслення яе носьбітаў, а таксама адрозніваецца сваімі звычаямі, нормамі, комплексамі каштоўнасцей і нават інстытутамі. Субкультурай лічаць і трансфармаваную прафесійным мысленнем сістэму каштоўнасцей традыцыйнай культуры, якую характарызуе своеасаблівы светапогляд, сацыякультурная афарбоўка ва ўяўленнях і жыццёвых пазіцыях пэўнай сацыяльнай групы грамадства.

Такім чынам, субкультура — гэта культура груп, аб’яднанняў у межах больш буйнага культурнага ўтварэння; трансфармаваная прафесійным мысленнем сістэма каштоўнасцей традыцыйнай культуры, якая атрымала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

своеасаблівую афарбоўку светапогляду. Субкультура ўзнікае як пазітыўная або негатыўная рэакцыя на пануючую ў грамадстве культуру і сацыяльную структуру сярод розных сацыяльных пластоў і ўзроставых груп, з'яўляецца дыферэнцыяцыяй светапогляду ўнутры маладзёжнага руху. У агульным сучасныя субкультуры ўяўляюць сабой спецыфічны спосаб дыферэнцыяцыі развітых нацыянальных і рэгіянальных культур, дзе побач з асноўнай, класічнай тэндэнцыяй, існуе шэраг своеасаблівых культурных утварэнняў як па форме, так і па змесце, якія адрозніваюцца ад вядучай культурнай традыцыі, але ў той жа час з'яўляюцца прамым параджэннем апошняй. Субкультура можа мець месца ва ўсіх сферах жыццядзейнасці людзей: гаспадарчай, палітычнай, эстэтычнай, сацыяльнай.

Кожная грамадская сістэма ўяўляе сабой мазаіку з пэўнага набору субкультур, і ён аднолькавы для тых грамадстваў, якія знаходзяцца на агульным этапе развіцця. Аднак адны і тыя ж субкультуры ў межах розных сацыякультурных базавых сістэм (напрыклад, субкультура злачыннага свету або маладзёжная субкультура) будуць адрознівацца, паколькі з'яўляюцца носьбітамі ўсіх асаблівасцей і характэрных рыс сваёй базавай культуры.

Сучаснае індустрыяльна развітое грамадства, а таксама грамадства, якое пераходзіць да постіндустрыялізму, уяўляюць сабой таксама сістэму мноства розных субкультур, кожную з якой любы чалавек можа выбраць сабе. Больш таго, сучасны чалавек не толькі можа, але і вымушаны рабіць выбар сярод субкультур, колькасць якіх няўхільна ўзрастае разам з паскарэннем тэмпу жыцця і сацыякультурнай дынамікі. Чаму?

Справа ў тым, што традыцыйная, афіцыйная, або базавая, культура грамадства не з'яўляецца для канкрэтнага чалавека пытаннем выбару. Ён нарадзіўся ў межах дадзенай культуры і ўвабраў яе, як кажуць, з малаком маці. Чалавек расце, жыве і дзейнічае ў дадзенай культурнай прасторы. А вось у адносінах пэўных субкультур ён можа вырашаць, прымаць іх або не.

Аднак права выбару распаўсюджваецца далёка не на ўсе субкультуры. Калі чалавек ад нараджэння гарадскі жыхар, то, як правіла, ён так і застаецца чалавекам гарадской субкультуры. Праўда, у чалавека застаецца яшчэ права выбару, а таксама змены базавай культуры пры эміграцыі. Пры выбары субкультуры ў чалавека, як правіла, маецца больш магчымасцей здзейсніць свядомы выбар, чым пры выбары базавай культуры (хоць і не заўсёды). Яшчэ трэба дадаць, што кожны чалавек належыць адначасова да некалькіх субкультур — тэрытарыяльных, прафесійных, арганізацыйных і іншых.

Кожная субкультура захоўвае эзатэрычную (патаемную, схаваную, прызначаную выключна для дасведчаных) чысціню, паколькі падрабязнасці таго або іншага субкультурнага існавання не паддаюцца абагульненню. Пры гэтым кожная субкультура, у адрозненне ад базавай культуры, у якую першая ўключана, і з'яўляецца яе састаўной часткай, схільная да вельмі хуткіх змен і выступае інавацыйнай сферай для базавай культуры.

**Контркультура і яе месца ў гістарычнай дынаміцы** Исследование современной социокультурной ситуации в Республике Беларусь показывает, что в условиях социально – культурной деструкции получили развитие

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

криминальная субкультура и контркультурные тенденции. Их присутствие и нарастание следует связывать с властной необходимостью обновления, с развитием соответствующих антистатических, неравномерных состояний и процессов. В данном вопросе наши соображения во многом совпадают с мыслями З.Фрейда, высказанными им в его известной работе «Неудобство культуры». «Трудно не просто отличить, — пишет З.Фрейд, — инновации, имеющие целью замену одних конкретных исторических форм другими, более адекватными и оптимальными, — от порывов к отказу от культуры вообще, к отрицанию самих ее устоев» [217, с.299]. Наличие и распространение контркультуры — сущностный признак деструкции культуры, неудовлетворенности человека предлагаемыми знаниями, ценностями, нормами, образцами.

В современной культурологии нет единого подхода к содержанию, функциям и сущности контркультуры как целостного культурно-исторического феномена.

Одна из попыток рассмотреть контркультуру в качестве целостного культурно-исторического феномена была предпринята Дж. Мильтоном Йингером в его докладе Американской социологической ассоциации в 1977 г. В самом общем виде Йингер определяет контркультуру как комплекс, набор или конфигурацию «норм и ценностей группы», резко противоречащих нормам и ценностям, господствующим в обществе, «частью которого» эта группа является [266, с.833].

Свое понимание контркультуры высказал в это же время и Ф.Девис. Он определяет контркультуру не через негативное отношение к культуре вообще, а только через «резкое противоречие» с культурой, господствующей в данном обществе, с его «нормами и ценностями» [256].

Несколько иной подход к трактовке этого понятия у российских обществоведов Ю. Н. Давыдова и И. Б. Роднянской [42, с.175]. Контркультуру они рассматривают как форму борьбы определенных (достаточно ограниченных, партикулярных) групп за признание обществом их права жить, отвергая или обходя его нормативы и требования, отрицая фундирующую их культуру.

В. П. Крутоус под контркультурой понимает все дионисические, дисгармонически-обновительные явления в культуре [86, с.46].

В современной отечественной теоретической литературе вопрос о выделении и анализе контркультурных тенденций приобретает особую актуальность. Так, Г. М. Грибов, С. В. Лапина, В. Г. Ракицкая считают, что контркультура проявляет себя в виде механизма культурных новаций, рождающих новые культурные эпохи. Данное понятие служит для обозначения социально-культурных установок, противостоящих фундаментальным принципам официальной культуры [135].

Признавая правомерность приведенных выше дефиниций, следует все же отметить, что контркультурные тенденции, с нашей точки зрения, — явление весьма неоднозначное, амбивалентное. Они парадоксальным образом сочетают в себе позитив и негатив, конструктивные по целям и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

деструктивные тенденции. Видимо, современное белорусское общество находится в процессе контркультурного размежевания. Рождаются новые социокультурные группы, имеющие специфический менталитет, образ жизни, ценностные установки. Исследование динамики культуры показывает, что противостояние господствующей культуре, рождение новых ценностных и практических установок — процесс, постоянно воспроизводящий себя в мировой культуре. Всякая новая культура, культура конкретной эпохи возникает в процессе осознания кризиса предшествующей социокультурной парадигмы. В контркультурных феноменах, возникающих в реформируемом белорусском обществе, следует усматривать не только разрушительные механизмы, но и мощные катализаторы культурно-исторического развития.

### 3. Глабалізацыя як фактар сацыядынамікі культуры.

У канцы ХХ ст. працэс культурнай інтэграцыі набірае сілу. Ідзе развіццё рознабаковых міжнародных культурных кантактаў, ствараюцца новыя міжнародныя культурныя, навуковыя, спартыўныя і іншыя арганізацыі, усталёўваюцца агульнапрынятыя для ўсіх краін нормы міжнароднага права, палітычнага жыцця, маралі. Усё гэта дазваляе нам гаварыць аб працэсе глабалізацыі сучаснай культуры.

Тэрмін "глабалізацыя" ў грамадскіх навуках ужываецца для абазначэння паскоранага працэсу інтэграцыі нацый у сусветную сістэму ў сувязі з развіццём сучасных транспартных сродкаў і эканамічных сувязей, а таксама ўзмацнення сродкаў масавай інфармацыі. Агульнапрынятая пазітыўная ацэнка глабалізацыі як працэсу пэўнага аб'яднання чалавецтва ў адзіную гаспадарчую сістэму толькі на базе сучаснай матэрыяльнай культуры, тэхнікі мае традыцыйны характар і абапіраецца на традыцыйна пазітыўную ацэнку амаль класічных ужо мадэляў агульнаграмадскага індустрыяльнага развіцця.

Пытанне аб уздзеянні на гісторыка-культурны працэс, аб глабальным мадэляванні і планаванні мае ўжо не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Зразумела, каб ажыццявіць ідэальна-плануючую функцыю, неабходна мець прагнастычную мадэль развіцця свету. Праблемы будучага культурна-гістарычнага развіцця ўвасобіліся ў выглядзе шэрага культуралагічных канцэпцый. Так, А.Маслоў ускладвае свае надзеі на стварэнне будучага грамадства, у якім рашаючую ролю будуць адыгрываць самаактуалізуючыеся і схільныя да вышэйшых перажыванняў індывіды. С.Хантынгтон у сваёй комплекснай праграме глабальнага мадэлявання праводзіць ідэю, што культурныя асаблівасці больш значныя, чым палітычныя і сацыяльныя разыходжанні, і фундаментальнай праблемай сучаснай эпохі з'яўляецца супрацьстаянне сучаснага і традыцыйнага. Самасвядомасць, ідэнтычнасць будзе мець у бліжэйшай будучыні ўсё больш вызначальнае значэнне менавіта на ўзроўні вылучаных культурцывілізацый, ці метакультур. Гэта таксама звязана з усведамленнем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канфліктнасці свету і будучымі сутыкненнямі цывілізацый па “лініях культурных разломаў”, г.зн. прасторавых меж метакультурных супольнасцей. Напрыклад, С.Хантынгтон выказвае меркаванне аб тым, што адрозненні паміж цывілізацыямі-культурамі велізарныя і яшчэ доўга будуць заставацца такімі. Сапраўды, цывілізацыі непадобны па сваёй гісторыі, культурных традыцыях, рэлігіях. У людзей розных культурцывілізацый адрозніваюцца ўяўленні аб свеце ў цэлым, аб свабодзе, мадэлях развіцця, аб адносінах паміж індывідам і супольнасцю, аб Богу.

Асаблівую ролю ў вызначэнні абрысаў будучага культурнага свету адыгрывае фундаменталізм (строгае выкананне архаічных нормаў, вяртанне да былых парадкаў), перш за ўсё ў выглядзе рэлігійных рухаў. Вяртанне да традыцыйных культурных каштоўнасцей, на наш погляд, ёсць рэакцыя на экспансію глабальнай культуры ў развіваючыеся краіны. Дадзеная з’ява ахапіла ў першую чаргу краіны ісламскай метакультуры, якая адыгрывае істотную ролю ў сучасным свеце. Асноўны “культурны разлом” навукоўцы бачаць у супрацьстаянні Захаду астатняму свету. Выйсце з такога становішча бачыцца ў змене супрацьстаяння палітычных сістэм супрацьстаяннем розных культур, фарміраванні шматполюснага полікультурнага ўзаемадзеяння. Сёння паступова адбываецца пераарыентацыя сучаснай індустрыяльнай культуры на больш інтравертную, звернутую да ўнутранага свету чалавека. Гэта выяўляецца ў вялікай цікавасці да асобаснага самаўдасканалення, да рэлігійных сістэм, у непрыняцці маладым пакаленнем рацыянальна-рэчавага падыходу да жыцця, ва ўзнікненні субкультур і контркультуры, пошуку сэнсу існавання ў заходняй культуры. Як адзінка знешняга геапалітычнага ўзаемадзеяння заходняя культура іманентна імкнецца да мадэрнізацыі, абнаўлення.

Такім чынам, дынаміка культуры ў кантэксце глабалізацыі будзе залежаць ад узаемадзеяння культур і цывілізацый, ад вырашэння канфлікту паміж сучаснасцю і традыцыйнасцю, ад выкарыстання асаблівасцей культурна-гістарычнага шляху розных народаў.

Абазначаная кола праблем сацыякультурнага развіцця сусветнай супольнасці, у тым ліку і беларускага грамадства знайшла сваё адлюстраванне ў разнастайных артэфактах сусветнай духоўнай і матэрыяльнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

Акопян, К. З. Массовая культура : учеб. пособие / К. З. Акопян и др. – М. : Альфа; Инфра-М, 2004. – 304 с.

Арнольдов А.И. Введение в культурологию: учеб. пособие /А.И.Арнольдов. - М.: Нар. акад. Культуры и общечелов. Ценностей , 1993. – 350 с.

Давыдов, Ю.Н. Социология контркультуры. Критический анализ / Ю.Н.Давыдов, И.Б.Роднянская. – М.: Наука, 1980. – 255 с.

Крутоус, В.П. «Дионисизм» в культуре и контркультурные тенденции / В.П.Крутоус // Маргинальное искусство. – М.: Изд-во Московского ун-та, 1999. – 159.

Лазука, Б.А. Помнікі мастацкай культуры Беларусі / Б.А.Лазука, Л.Я. Агеева, Д.Я. Баброўскі і інш. –Мінск: Рэспуб. унітар. прад-ва “Выдавецтва “Беларусь”, 2012. – 414 с.

Левикова, С.И. Молодежная субкультура / С.И.Левикова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2004. – 608 с.

Масленченко, С.В. Субкультура и коммуникация: монография / С.В. Масленченко. – Минск: Ин-т радиологии, 2003. – 90 с.

Матвеева, С.Я. Субкультуры в динамике культуры / С.Я.Матвеева // субкультурные объединения молодежи: критический анализ: препринты докл. всесоюз. науч. конф. «Культура и ее роль в активизации человеческого фактора», 1987 г. / Ан СССР, Ин-т философии; отв. ред. И.К. Кумачева. – М.,1987. – С. 16-23.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Фрейд, З. Неудобства культуры / З.Фрейд // Фрейд, З. Художник и фантазирование : Пер. с нем. / Под ред. Р.Ф. Додельцева, К.М.Долгова. – М.: Республика, 1995. – С. 299-336.

**Тэма. Дынаміка культурна-гістарычнага працэсу (2 гадзіны)**

*План лекцыі:*

1. Культура першабытнага грамадства і яе адметнасці.
2. Старажытныя цывілізацыі і іх культуры.

*Мэта лекцыі:* прасачыць этнагенез і прасэс станаўлення і развіцця сусветнай духоўнай і матэрыяльнай культуры.

## 1. Культура першабытнага грамадства і яе адметнасці.

Першапачатковымі часавымі межамі культурагенез звязаны з рубяжом сярэдняга і позняга палеаліту. Верхні палеаліт – гэта тая эпоха, калі чалавецтва, у дадатак да біялагічна-відавой разнастайнасці, набывае той узровень інтэгруючых сувязей, які называецца культурай. Рашаючае значэнне ў культурагенезе мелі тры фактары, характэрныя для позняга палеаліту. Па-першае, на мяжы сярэдняга і верхняга палеаліту заканчваецца эвалюцыя (антрапагенез) выкапняў гамінід і з’яўляецца сапраўдны чалавек – Homo sapiens. Па-другое, павялічваецца разнастайнасць каменных і іншых прылад працы. Па-трэцяе, замацоўваецца экзагамія – выключэнне са шлюбных зносін бліжэйшых сваякоў.

Культура нараджаецца ў канцы старажытнага каменнага веку як усталяваная сістэма, тады як у зыходным пункце антропа- і сацыягенезу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можна гаварыць толькі аб асобных зонах культурных паводзін. Але іх не трэба прымяншаць, як і амаладжваць самую культуру, а культурагенез тым больш. Першыя прылады працы з’явіліся, паводле навейшых даных, больш за 2 млн. гадоў назад.

Мова як сродак зносін паміж людзьмі ўсталявалася на стадыі архантропаў. На стадыі палеантропаў сталі ўтварацца прасцейшыя ідэалагічныя ўяўленні, якія працягваюць развівацца ў людзей больш позніх відаў, а таксама выявіліся культурныя адрозненні (асаблівасці) – аснова сучасных этнічных асаблівасцей.

Такім чынам, у шматтысячагадовай гісторыі культуры можна вылучыць вялікі перыяд, які пачаўся прыблізна 40 тыс. гадоў таму назад і закончыўся ў IV тыс. да н.э. Гэта быў перыяд распаўсюджання першабытнай культуры, падчас якога чалавек навучыўся размаўляць (але яшчэ не ўмеў пісаць), пачаў выконваць рэлігійныя рытуалы і культы, будаваць першае жыллё, ствараць першыя творы мастацтва – малюнкі, скульптурныя работы. Даследчыкі адзначаюць, што матэрыяльная культура сярэдняга палеаліту паўстае перад намі ў вялікай разнастайнасці формаў і стварае прыклады асобных разнастайных помнікаў, якія не знаходзяць блізкіх аналогій адзін з адным. Культурная разнастайнасць чалавецтва ў ходзе актыўнага засялення айкумены стала яшчэ больш значнай, чым яго біялагічная своеасаблівасць. Хоць жыццё старажытных плямён у розных геаграфічных рэгіёнах мела свае асаблівасці, існуюць агульныя рысы, характэрныя для культуры першабытнага тыпу.

Вывучэнне артэфактаў першабытнай культуры, знойдзеных на тэрыторыях Паўднёвай Амерыкі, Акіяніі, Аўстраліі, Афрыкі, а таксама Еўропы, дазваляе гаварыць аб наяўнасці ў ёй агульных рыс.

Важнейшай вызначальнай рысай першабытнай культуры з’яўляецца *сінкрэтызм* (ад грэч. syncrētismos – аб’яднанне) – нерасчляняльнасць, недыферэнцыраванасць яе формаў, уласцівыя іх неразвітому стану. Для ранніх этапаў культуры першабытнага грамадства характэрна першапачатковая спалучанасць нерасчляняльных формаў духоўнай дзейнасці. У разглядаемай культуры функцыі асобных формаў грамадскай свядомасці не спецыялізаваны і самі функцыі вылучаюцца вельмі ўмоўна. Вераванні і мастацтва суб’ектаў першабытнай культуры былі цесна пераплецены і не падзяляліся на асобныя сферы духоўнага жыцця. Не было падзелу на выканаўцаў і спажыўцоў, мастакоў і гледачоў. Сінкрэтызм таксама азначае, што ўсе віды і элементы існуюць у цесным узаемадзеянні, сінтэзе, у шчыльным узаемаперапляценні. Таму толькі даволі ўмоўна можна гаварыць асобна пра выяўленчае мастацтва, музыку, танцы, спевы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, тэатралізаваныя дзеянні і інш.

Мастацтва эпохі першабытнаабшчыннага ладу зарадзілася і развівалася як рэальная патрэба эстэтычнага асэнсавання жыцця, абумоўленая грамадска-працоўнай дзейнасцю старажытнага чалавека. Зародкавыя элементы яго ўзніклі ў сярэднепалеалітычную эпоху. Аднак толькі калі ў Еўропе распаўсюдзіліся людзі сучаснага тыпу (40–30 тыс. гадоў назад), зарадзіліся і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачалі развівацца розныя формы мастацтва, найперш выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное. Аб’ектамі мастацкай творчасці былі пераважна буйныя жывёлы і чалавек, адлюстроўваліся культы плоднасці і паляўнічая магія.

З зараджэннем земляробства і жывёлагадоўлі ўзнікла неабходнасць асэнсавання складаных паняццяў урадлівасці зямлі, уплыву агню, нябесных свяціл і прыродных з’яў. Гэта знайшло адлюстраванне найперш у *абстрактных сімвалах*, сярод якіх асаблівае месца займаюць зігзаг, крыж – знак сонца і агню, трохкутнік – знак пладавітасці. У раёнах развітога земляробства вядомыя гліняныя скульптурныя выявы жанчыны – багіні ўрадлівасці. Да нашых часоў дайшлі некаторыя помнікі першабытнага мастацтва. Гэта паліхромныя наскальныя размалёўкі на тэрыторыі Іспаніі і Францыі, гравіроўкі на косці і камені, у тым ліку арнаменты, барэльефныя выявы, скульптуры малых формаў, сярод якіх вылучаюцца “палеалітычныя Венеры”, распаўсюджаныя ад Францыі да Сібіры. У Паўднёва-Заходняй Еўропе вядомы наскальныя малюнкі з дынамічнымі кампазіцыямі паляванняў і бітваў лучнікаў. Асноўным аб’ектам арнаментальнай творчасці першабытнага чалавека з’яўляецца гліняны посуд.

Адной з асаблівасцей першабытнай культуры з’яўляецца яе *гамагеннасць* (аднароднасць). Яна знаходзіцца ў ізаляванасці і ўвесь час узнаўляе сваю першапачатковую сутнасць. У гамагеннай сістэме няма аксіялагічнага плюралізму (культурная гамагеннасць) і сацыяльных груп з рознымі інтарэсамі (сацыяльная гамагеннасць). У першабытным грамадстве недыферэнцыраваныя інтарэсы выключаюць плюралізм каштоўнасцей, а адсутнасць плюралізму блакіруе фарміраванне новых інтарэсаў. Такі працэс кансервуе цэласную сацыякультурную сістэму.

Дынаміка развіцця першабытнй сацыякультурнай сістэмы зводзіцца да ўзнаўлення існуючай сістэмнай структуры. Гэтая сістэма пры адсутнасці ўздзеяння знешніх фактараў не схільная да якасных змяненняў, перыядычна паўтараючы рытуалы абнаўлення, якія дазваляюць ліквідаваць назапашаныя напружанні, і рэгенеруючы свой сацыяльны склад пры дапамозе цырымоній ініцыяцыі. Апісанні і аналіз першабытнай культуры паказваюць, што ў паводзінах чалавека дабыццё ежы, размнажэнне і самаабарона непарыўна звязаны. Жыццё збіральніка і паляўнічага было абавязковай гульнёй па жорсткіх правілах, якая рэгулявалася гэтымі трыма асноўнымі функцыямі чалавечых паводзін.

Увогуле можна сказаць, што першабытная сацыякультурная сістэма характарызуецца (наколькі аб гэтым можна меркаваць на сучасным узроўні ведаў) надзвычайнай аднароднасцю сацыяльных структур, адным і тым жа наборам тыпаў дзейнасці, высокай ступенню аднолькавасці ў сэнсе духоўнай культуры розных чалавечых адносін.

Безумоўна, што культура ад узнікнення і да нашых дзён ніколі не была трафарэтна-аднолькавай, бязлікава манатоннай; яна не падобная на аднолькавыя, канвеерныя серыйныя прадукты. Разам з тым разнастайныя формы культуры, як бы ні былі не падобнымі адна на другую, з’яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

параджэннем аднаго ж і таго кораня, раўназначныя ў сваёй сутнасці як спосабы адзінай чалавечай дзейнасці.

Важнай асаблівасцю гэтай культуры – яе *бяспісьменнасць.* Вынікам гэтага з'яўляецца павольнасць запашвання інфармацыі ў грамадстве, слабыя тэмпы культурнага і сацыяльнага развіцця. Галоўным інфармацыйным каналам культуры была, акрамя прыродна-біялагічнай актыўнасці, працоўная дзейнасць. У ёй зліваліся ў адно прагмастычны і інфармацыйны аспекты. Засваенне і перадача сутнасці працоўных аперацый праходзілі ў невербальнай форме, без слоў. Паказ і перайманне былі асноўнымі сродкамі навучання і зносін. Дзеянні, пасля якіх назіраўся які-небудзь карысны эфект, станавіліся ўзорамі, яны капіраваліся і перадаваліся з пакалення ў пакаленне і пераўтвараліся ў рытуал.

Усё жыццё першабытнага чалавека праходзіла ў выкананні шматлікіх *рытуальных звычаяў і абрадаў*. Значная частка сярод іх на самой справе мела магічны характар. Але для старажытных людзей магічныя рытуалы з'яўляліся такімі ж неабходнымі і эфектыўнымі, як і працоўныя акты.

Рытуальныя аперацыі выступалі сімваламі, якія вызначалі ўзровень авалодання культурай і сацыяльную значнасць асобы. Перайманне рытуальных паводзін патрабавала ад індывіда наследавання ўзорам і выключала творчую самастойнасць. Індывідуальная самасвядомасць у гэтых умовах развівалася слаба і амаль злівалася з калектыўнай. Праблемы парушэння сацыяльных нормаў паводзін, непаслухмянасць, супярэчнасці паміж асобаснымі і грамадскімі інтарэсамі не існавалі. Індывід павінен быў весці сябе "як усе", ён не мог "адыходзіць" ад рытуальных патрабаванняў. Асаблівую ролю тут ігралі забароны – *табу* на ажыццяўленне пэўных дзеянняў (выкарыстанне якіх-небудзь прадметаў, вымаўленне слоў, асабістыя кантакты, учынкі і інш.). З дапамогай табу рэгламентаваліся важнейшыя бакі жыццядзейнасці чалавека – гаспадарчы, сямейны, духоўны, забяспечвалася выкананне шлюбных нормаў. Асаблівасць табу, якая адрознівае яго ад іншых абмежаванняў і забарон, вызначаецца тым, што гэтая забарона нічым не матывуецца і нічым не абгрунтоўваецца. Звычай табуіравання выступаў важнейшым механізмам кантролю і рэгулявання зносін паміж людзьмі ў сферы сацыяльнай культуры. Лічылася, што яго парушэнне немінуча выкліча жорсткае пакаранне (хваробу, смерць) з боку звышнатуральных сіл. Культура, па меркаванні З. Фрэйда, пачынаецца з забарон, якія перасякаюць асацыяльныя праявы жывёльных інстынктаў, але разам з тым стрымліваюць асабістую прадпрымальнасць.

З развіццём мовы і маўлення фарміруецца і набывае важнасць новы інфармацыйны канал – *вусныя вербальныя зносіны*. Гэта суправаджаецца развіццём мыслення і індывідуальнай самасвядомасці. Індывід перастае атаясамліваць сябе з калектывам, у яго з'яўляецца магчымасць выказваць, прапаноўваць і абмяркоўваць розныя меркаванні і здагадкі аб прычыне падзей, дзеянняў, іх вынікаў, планаў і інш., хоць самастойнасць мыслення доўгі час застаецца яшчэ вельмі абмежаванай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першабытную эпоху зараджаецца самая ранняя і прымітыўная форма пісьменнасці – піктаграфія (лац. pictus – намаляваны, грэч. graphō – пішу). Яна ўяўляе сабой умоўнае і вельмі простае рысуначнае пісьмо на скуры, кары, дрэве, косці, камяні. Асабліва шырока піктаграфія была распаўсюджана ў індзейцаў Паўночнай Амерыкі. З гэтага віду пісьма ў далейшым развівалася іерагліфічнае пісьмо. Існавалі піктаграфічныя хронікі. Напрыклад, славутая “Валам олум” (“Чырвоны запіс”) індзейцаў-справавараў, якія стварылі 184 малюнкамі на драўлянай кары свае гістарычныя паданні – з пачатку стварэння да ўзнікнення ў краіне еўрапейскіх каланізатараў.

Духоўнай асновай першабытнай культуры становіцца *міфалагічная свядомасць*. Сутнасць міфалагічнага светапогляду заснавана на прыпадабненні навакольнай рэальнасці чалавеку, перанясенні ўнутраных якасцей індывіда на знешні свет. Міфалогія звязана з вераваннямі ў адухатварэнне ўсёй прыроды. Аб’екты прыроды ўяўляюцца яму адушаўлёнымі істотамі, якія таксама, як і ён, маюць волю, жаданні, думкі, пачуцці. У міфах спалучаюцца рэальнасць і выдумка. Затое яны тлумачаць усё: у іх усё робіцца зразумелым, нягледзячы на дробязь рэальных ведаў. Славесная сімволіка міфаў уліваецца ў рытуалы і надае ім сэнс (у тым ліку і тайны сэнс магічных рытуалаў, даступны толькі чараўнікам і магам). Міфы ахутваюць усе формы жыццядзейнасці людзей і выступаюць як асноўныя “тэксты” першабытнай культуры. Іх вусная трансляцыя забяспечвае ўсталяванне адзінства поглядаў усіх членаў племя на навакольны свет. Вера ў “свае” міфы замацоўвае племя і разам з тым аддзяляе яго членаў ад “чужакоў”, што вераць у іншыя міфы.

У міфах замацоўваліся і асвятляліся практычныя звесткі і навыкі гаспадарчай дзейнасці. Дзякуючы іх перадачы з пакалення ў пакаленне, сабраны на працягу многіх гадоў вялікі вопыт захоўваецца ў сацыяльнай памяці і ствараe першасны ўзровень ведаў і спосабаў мыслення, ад якіх пачынаецца шлях, які вядзе да развіцця філасофіі і навукі.

Такім чынам, першабытная міфалогія ўключае ў сябе зачаткі асноўных сфер духоўнай культуры, якія выдзяляюцца ў ёй на далейшых ступенях развіцця чалавечага грамадства, – рэлігіі, мастацтва, філасофіі, навукі.

Першабытная культура была заснавана на *магічных дзеяннях і магічным мысленні.* Магія (грэч. mageia – чараўніцтва, вядзьмарства) – сукупнасць абрадаў і рытуальных дзеянняў, звязаных з верай у звышнатуральную здольнасць чалавека ўздзейнічаць на людзей і з’явы прыроды. Яна ўзнікла ў першабытным грамадстве і існавала адначасова з анімізмам, татэмізмам, фетышызмам. Магічныя формы думкі, варажба, знакі, абрады з’яўляліся не толькі культурным кампанентам, яны прадвызначалі стыль жыцця таго часу. Магі з даўніх часоў валодалі складаным комплексам разнастайных магічных сродкаў і дзеянняў для прадухілення жыццёвых няшчасцяў, стыхійных бедстваў, што выяўлялася ў даволі шырокай распаўсюджанасці варажбы, знахарства і чарадзейства. Многія магічныя дзеянні былі прымеркаваны да старажытных народных свят і абрадаў. Магі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нярэдка валодалі дарам яснабачання, лекарства, праводзілі містычныя абрады і рытуалы, займаліся астралогіяй, тлумачэннем сноў.

Вядомы англійскі рэлігіязнаўца і этнограф Джэймс Фрэзер у працы “Золотая ветвь” адзначае, што магічнае мысленне заснавана на двух прынцыпах сімпатычнай магіі (закон сімпатыі). Першы ён называе гамеапатычнай магіяй, або законам падабенства, другі – кантагіёзнай магіяй (законам кантакту); у яго ён уключае вядзьмарскія прыёмы, заснаваныя на законе сутыкнення.

Разнавіднасцю магіі з’яўляецца *фетышызм* (франц. fétiche ад партуг. feitiço – амулет, чарадзейства) – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці прыродных або вырабленых самім чалавекам неадушаўлёных прадметаў (фетышаў) і пакланенне ім. Ён выяўляўся ў тым, што фетышы надзяляліся цудадзейнай здольнасцю наўмысна ўплываць на жыццё людзей. Паняцце “фетышызм” увёў у навуковую літаратуру ў XVIII ст. французскі вучоны Ш. дэ Брос.

У гісторыі многіх старажытных народаў важную ролю адыгрывала пакланенне жывёлам і дрэвам. Калі першабытны чалавек называў сябе імем жывёлы, іменаваў яе сваім “братам” і ўстрымліваўся ад яе ўмярцвення, такая жывёла называлася татэмнай. Уся сістэма адносін паміж племенем і прабацькамі-жывёламі атрымала назву *татэмізму* – комплексу вераванняў і абрадаў у абшчынна-родавым грамадстве, звязаным з уяўленнем пра роднасць паміж групай людзей (родам, фратрыяй) і татэмам (пэўным відам жывёл, раслін, радзей з’явай прыроды і неадушаўлёнымі прадметамі).

Татэмаў паважалі, часам абагаўлялі, не прычынялі ім шкоды, імкнуліся іх аберагаць, спрыялі павелічэнню іх колькасці. Кожная татэмная група насіла імя свайго татэма, а яе члены мелі спецыяльныя татэмічныя эмблемы (камень, драўляная дошчачка); існавала забарона на заключэнне шлюбаў унутры татэмных груп. Дзеля задобрання татэма-жывёлы людзі выконвалі спецыяльныя магічныя абрады, выконвалі песні-заклінанні, татэмічныя танцы, у якіх звычайна імітаваліся паводзіны татэмаў.

Адной з формаў першабытных вераванняў з’яўляецца *анімізм.* Гэта вера ў існаванне душы і розных духаў; сістэма ўяўленняў і вераванняў аб духах і душы як вызначальных пачатках свету і чалавечага жыцця. Тэрмін “анімізм” уведзены англійскім антраполагам, этнографам Э. Б. Тайларам. Лічылася, што духі аказваюць пазітыўны або адмоўны ўплыў на жыццё чалавека, жывёл і раслін, а таксама на прадметы і з’явы навакольнага свету. Душа ва ўяўленнях старажытных людзей – гэта тонкі, нематэрыяльны вобраз, нешта падобнае на пару, паветра або цені. Яна адухаўляе цела, у якім жыве, але можа пакінуць яго і хутка перанесціся ў любое месца. Яна здольная з’яўляцца людзям, усяляцца ў іншых людзей, у прадметы і жывёл.

*Утылітарнасць* першабытнай культуры выяўлялася ў тым, што яна найчасцей была арыентавана на дасягненні практычнай карысці, індывідуальнай і калектыўнай выгоды людзей. Станоўчыя практычныя веды першабытнага чалавека ўзнікалі і фарміраваліся пад уздзеяннем паступовага назапашвання гаспадарчага вопыту, развіцця мовы і мыслення. Дзякуючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мове, карысная інфармацыя акумуліравалася і перадавалася новым пакаленням.

Такім чынам, крыніцай ведаў чалавека ў першабытную эпоху ў многім была яго працоўная дзейнасць, з якой яна фактычна і пачынаецца, напрыклад. Земляробская праца прывучала чалавека да кругавароту з'яў у прыродзе, што ў выніку прывяло да стварэння прымітыўнага календара, у якім месяцы (звычайна лунныя) былі яшчэ далёка не роўныя паміж сабой . Значнае развіццё атрымалі і практычныя галіны ведаў.

## 2. Старажытныя цывілізацыі і іх культуры.

**Месапатамская цывілізацыя**. Першым асяродкам высокаразвітой агульначалавечай культуры з'яўляецца Старажытны свет. Ён складаўся з культурна-гістарычных арэалаў Месапатаміі ці Двурэчча. Еўра-афра-азіяцкая культурна-гістарычная зона пачала фарміравацца яшчэ ў IV тыс. да н.э. у нізінах рэк Тыгра і Еўфрат. У гэты час на землях Месапатаміі жылі аседлыя шумеры, акадцы, вавіланяне і асірыйцы. Як бачна, цывілізацыя Месапатаміі не была этнічна аднародная. Яна складалася з самабытных культур розных этнічных супольнасцей, народаў. Шумераў большасць сучасных усходазнаўцаў называюць родапачынальнікамі культуры Месапатаміі. Менавіта яны стварылі высокую аграрную культуру і развітую сістэму меліярацыі. Шумеры раней за іншыя народы пачалі выкарыстоўваць кола, ганчары круг, плуг, сеялку, парусную лодку, выраб прылад працы з бронзы і медзі. Шумерскія гарады (Лагаш, Ніппур, Кіш, Ур, Урук і інш.) з'яўляліся аднымі з першых культурных цэнтраў у гісторыі чалавецтва.

Прыкладна ў сярэдзіне III тыс. да н. э. тэрыторыя шумераў была занята акадцамі. Пазней у Міжрэччы ўзніклі Асірыя і Вавілон, якія стварылі ўласную высокаразвітую культуру, абапіраючыся на дасягненні шумерскай цывілізацыі. На мяжы III–II тыс. да н.э. гісторыя Месапатаміі становіцца ў асноўным гісторыяй семіцкіх народаў.

**Культура індаарыяў**. Індыйская цывілізацыя пачала складвацца ў сярэдзіне III тыс. да н.э. Яна адносіцца да ліку найбольш старажытных у свеце. У развіцці старажытнаіндыйскай культуры можна вызначыць шэраг стадый. У перыяд з сярэдзіны III да першай паловы II тыс. да н.э. сфарміравалася *харапская, ці індыйская*, культура, для якой характэрна развітая гарадская цывілізацыя ў даліне ракі Інд. Насельнікамі Індыі былі створаны высокамастацкія творы дробнай пластыкі, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

З першай паловы II і да сярэдзіны I тыс. да н.э. развіваецца *індаарыйская* культура, на якую значны ўплыў аказалі качавыя плямёны арыяў. Дарэчы, да XIX ст. індыйскую тэрыторыю называлі краінай арыяў. Гэты тып культуры адзначаны росквітам індаарыйскай міфалогіі, наяўнасцю разнастайных культаў, ахвярапрынашэнняў, стварэннем манументальных эпічных сказанняў.

У Y - II стст. да н. э. узнікае культура *дынастыі Маур'яў*, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіваецца ва ўмовах існавання цэнтралізаванай дзяржавы. У гэты перыяд зараджаюцца новыя рэлігійна-філасофскія вучэнні, развіваюцца літаратура, навука і мастацтва.

Нарэшце, у I ст. да н.э.- УІ ст. н. э. паўсюдна пануе кушана-гупцкая культура. У дадзеную гістарычную эпоху адбываюцца культурны ўздым, узвядзенне манументальных пабудоў, стварэнне выдатных скульптурных, жывапісных, літаратурных твораў.

**Культура старажытнай егіпецкай цывілізацыі.** Старажытны. Егіпет – гэта дзяржава ў даліне і дэльце Ніла ў Паўночна-Усходняй Афрыцы. Егіпецкая цывілізацыя праіснавала з канца IV тыс. да н.э. да 332 г. н э., калі Егіпет быў заваяваны войскамі Аляксандра Македонскага. Культура гэтай краіны прайшла шэраг паслядоўных стадый развіцця. Яе гісторыя ўмоўна падзяляецца на наступныя эпохі: Ранняга царства (XXX–XVIII стст. да н.э.), Старажытнага царства (XXVIII–XXIII стст. да н.э.), Сярэдняга царства (XXI–XVIII стст. да н.э.) і Новага царства (XVI–XI стст. да н.э.).

У эпоху Ранняга царства адбылося аб'яднанне тэрытарыяльных абшчын, што прывяло да ўзнікнення першых дзяржаўных утварэнняў, якія называліся "номы".

У эпоху Старажытнага царства Паўднёвы і Паўночны Егіпет аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву, на чале якой стаў цар Паўднёвага Егіпта Менес – заснавальнік першай дынастыі фараонаў. Тады ўзмацнілася цэнтралізацыя ўлады, устанавілася неабмежаваная ўлада фараонаў.

Эпоха Сярэдняга царства вызначалася новым аб'яднаннем Егіпта, паўсюдным распаўсюджаннем бронзы, удасканаленнем земляробчых прылад працы. У канцы эпохі Сярэдняга царства Егіпет быў захоплены ўсходнімі плямёнамі гіксосаў.

Для эпохі Новага царства характэрны вызваленне з-пад улады гіксосаў і новае аб'яднанне Егіпта, далучэнне да Егіпта часткі тэрыторый паўночна-ўсходняга Міжземнамор'я. Гэты перыяд завяршыўся заваяваннем войскамі Аляксандра Македонскага тэрыторыі Егіпта.

Вярхоўная ўлада ў Егіпце належала фараону, які лічыўся нашчадкам багоў. Ён адначасова быў і зямным богам і вярхоўным жрацом, меў неабмежаваную ўладу і незлічоныя багацці ў краіне, бо ўсе прыродныя, зямельныя, матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы лічыліся яго асабістай уласнасцю. Надзвычай важнае значэнне ў жыцці егіпцян меў культ абагатворанага цара – фараона. Вялікай падзеяй у жыцці кожнага чалавека лічылася магчымасць пацалаваць сандалі фараона; усе людзі павінны былі падаць ніц перад фараонам.

Своеасаблівасць культуры старажытнаегіпецкай цывілізацыі ў многім тлумачыцца прыроднымі ўмовамі і геаграфічным становішчам краіны. Егіпет працяглы час знаходзіўся ў ізаляцыі ад іншых рэгіёнаў свету, што ўскладняла культурныя запазычанні ад іншых цывілізацый. У выніку гэтага на тэрыторыі Старажытнага Егіпта сфарміравалася своеасаблівая культура са сваімі адметнасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Культура старажытнакітайскай цывілізацыі**. Кітай, або Сярэдняе царства, – краіна, якая раскінулася на прасторах Усходняй і Цэнтральнай Азіі ў басейнах рэк Хуанхэ і Янцзы. Тут каля шасці тысяч гадоў назад зарадзілася адна са старажытнейшых цывілізацый, якая аказала ўплыў на развіццё ўсіх народаў, насяляўшых краіны Далёкага Усходу.

Старажытныя плямёны, якія насялялі ўрадлівыя даліны рэк, апрацоўвалі палі, разводзілі хатніх жывёл, ведалі многія рамёствы. У агульную культуру Кітая ўнеслі свой уклад шматлікія народы, якія пражывалі на яго тэрыторыі. Сінтэз іх самабытных культур – той унікальны феномен, які называюць кітайскай цывілізацыяй. Толькі з канца III тыс. да н.э. вызначаецца ў гэтым сінтэзе вядучая роля ханьскай народнасці, ад якой утварылася назва кітайскага народа. Назва "хайнцы", ці "ханьжэнь", паходзіць ад назвы велізарнай дэспатычнай імперыі эпохі позняй старажытнасці – Хань (202 г. да н.э.).

Гісторыю і культуру Старажытнага Кітая прынята дзяліць на шэраг перыядаў.

Эпоха Шань-Інь была адносна не доўгай (XVI–XII стст. да н.э.). Сваю назву гэты перыяд атрымаў ад імя племені, якое насялала даліну ракі Хуанхэ. Менавіта тады ўтварылася першая кітайская дзяржава, на чале якой стаяў правіцель – *ван*, які быў адначасова і вярхоўным жрацом. У той час ва ўсіх сферах жыцця жыхароў Кітая адбываліся значныя змены: былі вынайдзены шаўкапрадства, бронзаліцейная справа, іерагліфічнае пісьмо, зарадзіліся асновы горадабудаўніцтва.

Наступны перыяд гісторыі Старажытнага Кітая Чжоў займае XI–VIII стст. да н.э. У гэты час адбываецца сакралізацыя ўлады, *ван* быў абвешчаны сынам неба і яго адзіным зямным увасабленнем. У эпоху Чжоў кітайцы знайшлі месцазнаходжанне жалеза, што дазволіла ім перайсці да жалезных прылад працы і палепшыць тэхніку земляробства. Значна пашырыўся круг рамёстваў, якія ўвайшлі ў абіход.

У перыяд Лега ("шматцарстваванне") VII–VI стст. да н.э. з'яўляецца пісанае дзяржаўнае заканадаўства ўзамен вуснага звычаёвага права. У дадзеную эпоху адбываюцца значныя змены ў сацыяльна-палітычным, эканамічным і духоўным развіцці старажытнакітайскага грамадства.

Паступова ўлада *вана* аслабла, і ў V ст. да н.э. дзяржава распадаецца на сем дробных дзяржаў, якія на працягу наступных 250 гадоў вялі пастаянныя войны паміж сабой. Таму V–III стст. увайшлі ў гісторыю як эпоха "ваюючых царстваў". Тым не менш у гэты перыяд працягваюць развівацца больш складаныя рамёствы: ткацкае, лакавае, ювелірнае, керамічнае і інш. Кітайцы наладзілі вытворчасць шоўку, фарфору і нефрыту. Важнае значэнне стаў набываць міжнародны гандаль, росквіт якога звязаны з адкрыццём Вялікага шаўковага шляху ад ханьскай сталіцы Чанані праз Азію на рымскі Усход.

Перыяды Цынь і Хань займаюць адрэзак часу з III ст. да н.э. да II ст. н.э. Гэтая эпоха адметная шматлікімі рэформамі, галоўнай мэтай якіх было пераадоленне дэцэнтралізацыі і раздробленасці. Найбольш паспяхова такія рэформы прыватнаўласніцкіх і рабаўладальніцкіх адносін былі праведзены ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

царстве Цынь міністрам Шан Янамю.

Першы кітайскі імператар Шы-хуандзі распаўсюдзіў на ўсю імперыю парадкі, устаноўленыя Шан Янамю, што дазволіла аб'яднаць краіну, стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця грамадства ва ўсіх сферах.

Менавіта ў гэтую эпоху ўзнікла магутная цэнтралізаваная дзяржава, было ўстаноўлена адзінае заканадаўства, пачалося будаўніцтва так званай Вялікай кітайскай сцяны для абароны ад нападаў качэўнікаў-варвараў. Яе працягласць складала 4 тыс. кіламетраў. Кітайская імперыя стала адной з найбольш магутных у свеце: колькасць яе насельніцтва дасягала 60 млн., што складала прыблізна пятую частку насельніцтва ўсёй планеты. У пачатку III ст. н.э. кітайская імперыя распалася на некалькі асобных царстваў. Пачынаецца шосты перыяд у гісторыі і культуры Старажытнага Кітая, які доўжыцца да VI ст. н.э. Ён атрымаў назву "трохцарстравання".

Такім чынам, за тысячагоддзі на тэрыторыі сучаснага Кітая склалася цывілізацыя, якая захавала пераемнасць асноўных традыцый, асобных адметных рыс матэрыяльнай і духоўнай культуры і працягвае існаваць у сучасны перыяд. У той жа час іншыя старажытныя цывілізацыі па розных прычынах і ў розны час зніклі.

Цывілізацыя і культура кітайскага народа, нягледзячы на катаклізмы, захавала цэласнасць і своеасаблівасць. Яна мела больш рацыянальны, прагматычны характар, у значнай ступені звернуты да каштоўнасцей рэальнага зямнога жыцця. Духоўная культура вызначалася надзвычайнай устойлівасцю, стабільнасцю, кансерватызмам; у яе фарміраванні і развіцці вельмі важную ролю адыгрывалі шматлікія традыцыі, звычаі, абрады, рытуалы і цырымоніі. Па глыбіні эстэтычнага і паэтычнага пранікнення ў быццё прыроды яна бадай не ведае сабе роўных у свеце. Сярод шматлікіх культаў найбольш важнымі і распаўсюджанымі на ўсёй тэрыторыі Кітая былі культ неба і культ продкаў.

**Грэка-рымская антычная культура.** Паняцце "антычнасць" узнікла ў эпоху Адраджэння, калі італьянскія гуманісты пачалі выкарыстоўваць тэрмін "антычны" (ад лац. antiquus – старажытны) для вызначэння найбольш старажытнай культуры свету – грэка-рымскай. Дадзены тэрмін ужываецца ў адносінах да старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай цывілізацый.

Старажытнагрэчаская цывілізацыя была першай з усіх вядомых высокаразвітых цывілізацый на еўрапейскім кантыненце. Храналагічна і гістарычна названыя цывілізацыі суадносяцца з IX ст. да н.э. і V ст. н.э. Гэтаму параўнальна невялікаму адрэзку гістарычнага часу і адпавядае антычная культура.

*Антычная культура – гэта цэласнае ўтварэнне, якое ахоплівае ўсе яе гістарычныя формы быцця – палітыку і права, міфалогію і рэлігію, філасофію і мастацтва Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.*

У антычным грамадстве ўпершыню сфарміраваліся адносіны да чалавека як да "меры ўсяго існага", вышэйшай сапраўднай каштоўнасці. Галоўнымі ідэаламі і каштоўнасцямі антычнай цывілізацыі і культуры былі патрыятызм, вернасць грамадзянскаму абавязку, ушанаванне багоў, павага да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

продкаў. У антычнай культуры знайшлі падрабязную распрацоўку такія актуальныя і вядомыя сёння паняцці і тэрміны, як грамадзянская свабода і раўнапраўе, грамадзянскі доўг, гарманічнае развіццё асобы.

Практычна да сённяшніх дзён у асноўных рысах дайшла старажытнагрэчаская сістэма адукацыі і выхавання. У антычную эпоху былі створаны практычна ўсе асноўныя жанры літаратуры Сярэдневякоўя, Новага і Навейшага часу: ідылія, трагедыя, камедыя, ода, элегія, сатыра, эпіграма, байка і інш. Антычная міфалогія і літаратура на працягу многіх стагоддзяў з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай натхнення паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў. Філасофія аказала надзвычай моцны ўплыў на далейшае развіццё сусветнай філасофскай думкі.

На працягу многіх стагоддзяў антычнае мастацтва было ўзорам для пераймання.

“Грэка-рымская культура, – адзначаў А.Тойнбі, – разлілася ў свой час па Старому Свету нічуць не менш шырока, чым наша заходняя ў цяперашні час. Уздзеянне грэчаскай культуры на свет у перыяд з IV ст. да н.э. і пазней было такім жа рэзкім, як і ўздзеянне сучаснай заходняй культуры з XV ст. да нашых дзён.”

Літаратура

*История* Древнего мира: Древний Восток. Индия. Китай. Страны Юго-Восточной Азии / А.Н.Бадак, И.Е.Войнич, Н.М.Волчек [и др.] – Минск.: Харвест, 1998. – 884 с.

*Казакова, И. В.* История и теория мировой культуры: учеб.-метод. пособие / И. В. Казакова (авт. сосст.). – Минск: Зорны Верасок, 2010. – 664 с.

*Кнотт, К.* Индуизм / Ким Кнотт; пер. с англ. – М.: Весь мир, 2001. – 187 с.

*Крамер, С.* Шумеры: первая цивилизация на Земле / Самюэль Крамер; пер. с англ. – М.: Центрполиграф, 2002. – 381 с.

*Петров, М.К.* Античная культура / М.К.Петров. – М.: РОССПЭН, 1997. – 352 с.

*Смолік, А.* І. Культурологія: гісторыя культуры : вучэбна-метадычны комплекс / А. І. Смолік, В. М. Сакалова, Л. К. Кухто ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. –352 с. : іл.

*Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура / предисл. и примеч. А.П.Першина; пер с англ. – М.: Политиздат, 1989. – 572 с.

## 2.2 Слоўнік паняццяў і катэгорый культуры

**Аб'ект культуры** — гэта элемент, фрагмент яе быцця, які ўяўляе сабой прадукт рэалізацыі актыўнасці суб'екта культуры.

**Адаптацыя** (ад лац. adaptare — прыладжваць) — працэс прыстасавання індывіда або групы людзей да знешніх абставін іх жыццядзейнасці. У працэсе фізічнай адаптацыі чалавек паступова прыстасоўваецца да пэўнага клімату, а ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ходзе сацыякультурнай адаптацыі — адпаведна да патрабаванняў канкрэтнай культуры, усяго грамадства.

**Аксіялогія** (ад грэч. axia — каштоўнасць + logos) — вучэнне аб каштоўнасцях; філасофская тэорыя агульназначных прынцыпаў, якія вызначаюць матывацыю і накіраванасць дзеянняў чалавека. Як навуковая дысцыпліна сфарміравалася ў другой палове XIXст., хоць пытанні прыроды каштоўнасцей (сэнс жыцця, сутнасць дабра і зла, справядлівасці і несправядлівасці) ставіліся на працягу ўсёй гісторыі філасофіі, пачынаючы са старажытнасці. На тэрыторыі Беларусі філасофскі прынцып духоўнай самакаштоўнасці чалавека, маральныя ідэалы дабра і справядлівасці знайшлі адлюстраванне ў дзейнасці і творчасці Клімента Смаляціча, Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. Іх паслядоўнікі і пераемнікі Ф. Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, В.Цяпінскі, А.Волан, Мялецій Сматрыцкі, Л.Карповіч, Сімяон Полацкі і іншыя мысліцелі-гуманісты вылучалі як каштоўныя якасці чалавечай асобы высокую духоўнасць, талерантнасць, нацыянальную свядомасць, павагу да людзей. Дыялектычную ўзаемасувязь асобасных, нацыянальна своеасаблівых і агульначалавечых каштоўнасцей і інтарэсаў адзначылі ў сваёй творчасці К.Каліноўскі, Ф.Багушэвіч, М.Багдановіч, Я.Купала, А.Луцкевіч, Я.Лёсік, В.Ластоўскі, І.Канчэўскі, У.Самойла, Ф.Шантар і іншыя дзеячы культуры. Прадстаўнікі сучаснай беларускай гуманістыкі разглядаюць каштоўнасці як неад ’емны кампанент чалавечага быцця і існавання, даследуюць іх у арганічнай узаемасувязі з праблемамі ўмацавання суверэнітэту краіны, усведамлення кожным чалавекам сваёй нацыянальнай годнасці, прыналежнасці да цывілізаванай сям ’і еўрапейскіх народаў і агульначалавечай супольнасці.

**Акультурацыя** — працэс і вынік узаемаўплыву розных культур, пры якім ўсе ці частка прадстаўнікоў адной культуры (рэцыпіенты) пераймаюць нормы, каштоўнасці і традыцыі другой культуры (донара).

**Антрапалогія** (ад грэч. anthropos — чалавек) — галіна навукі, якая вывучае паходжанне, эвалюцыю і заканамернасці біялагічных асаблівасцей чалавека і яго рас. Цесна звязана з прыродазнаўчагістарычнымі навукамі. Мае тры асноўныя раздзелы: расазнаўства (вывучае ўмовы і прычыны ўтварэння, заканамернасці фарміравання і ўзаемадзеяння рас; часткай раздзела з’яўляецца і этнічная антрапалогія, якая даследуе праблемы этнагенезу), антрапагенез і марфалогія (вывучае заканамернасці зменлівасці будовы цела і органаў чалавека ў залежнасці ад спадчыннасці, умоў жыцця і працы). Як навука антрапалогія сфарміравалася ў XIXст., калі пачалі збірацца і сістэматызавацца звесткі пра розным тыпы старажытнага і сучаснага складу беларусаў.

**Артэфакт** (ад лац. arte — штучна + factum — зроблены) — штучна створаны чалавекам матэрыяльны прадмет, фізічны аб’ект (прылады працы, рэчы, адзенне, упрыгожванні, мастацкае і хатняе начынне, жыллё, дарогі, масты і інш.). Культурнымі артэфактамі, напрыклад, з ’яўляюцца напісаныя тсъменнікамі кнігі прозы, зборнікі вершаў, намаляваныя мастакамі карціны, гравюры, напісаныя музыкантамі сімфоніі, песні і іншае, пастаўленыя рэжысёрамі тэатральныя спектаклі, ктафтъмы, апублікаваныя вучонымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

манаграфіі, навуковыя артыкулы і інш. Артэфактамі культуры з ’яўляюцца таксама разнастайныя тэорыі, канцэпцыі, гіпотэзы, ідэі, мастацкія вобразы, а таксама спосабы паводзін індывідаў ці пэўных супольнасцей і інш.

**Архетып** (ад грэч. arhe — пачатак і typos — вобраз) — першасны вобраз, правобраз, які захоўваецца ў душы чалавека. Архетып культурны з ’яўляецца базісным элементам культуры, які фарміруе канстантныя мадэлі духоўнага жыцця. Змест архетыпу складае найболъш тыповае ў культуры. Яго фарміраванне адбываецца на ўзроўні культуры ўсяго чалавецтва або культур буйных гістарычных суполънасцей у працэсе сістэматызацыі культурнага вопыту. Архетыпы выступаюць у якасці ўстойлівых структур апрацоўкі, захавання ірэпрэзентацыі калектыўнага вопыту. 1снуюць універсалъныя і этнічныя архетыпы. Яны застаюцца практычна нязменнымі па сваёй сутнасці, аднак у прасторава-часавай перспектыве праяўляюцца ў самых разнастайных формах: міфалагічных сюжэтах і вобразах, рэлігійных вучэннях ірытуалах, нацыяналъных ідэалах і інш. У культуралогіі праявы архетыпаў вывучаюцца таксама праз аналіз сноў, фантазій, фобій, літаратурных, філасофскіх твораў і інш.

**Асіміляцыя** (адлац. assimilatio — прыпадабненне) — від аб’яд^ўчых этнічных працэсаў, якія суправаджаюцца засваеннем адным народам ці этнічнай групай мовы, культуры і іншых этнічных прымет другога народа (які сацыялъна болъшразвіты ці дэмаграфічна пераважае) да поўнага зліцця з ім.

**Біхевіярызм** (ад англ. behaviour — паводзіны) — адзін з пашыраных кірункаў у сучаснай заходняй псіхалогіі. Заснавана ў 1913 г. амерыканскім псіхолагам Дж. Уотсанам. Эксперыментальнай асновай біхевіярызму паслужылі даследаванні амерыканскім псіхолагам Э. Торндайкам паводзін жывёл. Працягваючы механістычны кірунак у псіхалогіі, біхевіярызм атаясамліваў свядомасць і паводзіны, зводзіў псіхічныя з ’явы дарэакцый арганізма, а ўсё пазнанне — ад утварэння ў арганізмах (уключаючы і чалавека) умоўныхрэакцый. Ідэі біхевіярызму паўплывалі на лінгвістыку, антрапалогію, сацыялогію, семіётыку і сталі адным з вытокаў кібернетыкі.

**Веды** — вынік пазнання прадметаў і з ’яўрэчаіснасці, правільнае яе адлюстраванне ў свядомасці чалавека. Як ідэальнае выяўленне ў знакавай форме аб’ектыўных уласцівасцей і сувязей свету, прыроды і грамадства, веды з’яўляюцца перадумовай і непасрэднай мэтай працэсу пазнання, авалодання вопытам іразуменнем, неабходнымі для спасціжэння аб’ектыўнай ісціны і стваральна-творчай дзейнасці людзей. Аб’ектыўную неабходнасць і выключную ролю ведаў у духоўным узвышэнні асобы, удасканаленні сацыяльнапалітычнай і нацыянальна-культурнай формаў жыцця грамадства сцвярджалі беларускія філосафы і мысліцелі Ф. Скарына, С.Будны, А.Волан, А.Доўгірд, М.Пачобут-Адляніцкі, К.Семяновіч, А.Скарульскі, К.Нарбут, М.Сматрыцкі, В.Цяпінскі, С.Шадурскі і інш.

**Грамадства** — гэта адносна ўстойлівая сістэма сацыяльных сувязей і адносін як вялікіх, так і малых груп людзей, якая склалася ў працэсе гістарычнага развіцця чалавецтва і падтрымліваецца сілай звычак, традыцыі, закона, сацыяльных інстытутаў і г. д., што грунтуюцца на пэўным спосабе

вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання матэрыяльных і культурных даброт.

**Гульня** — форма свабоднага самавыяўлення чалавека, якая прадугледжвае рэальную адкрытасць свету магчымага і разгортваецца ў выглядзе спаборніцтваў або у форме паказу (выканання, рэпрэзентацыі) якіх-небудзь сітуацый, сэнсаў, станаў.

**Дзейнасць** — мэтанакіраваная, структураваная, рацыянальна асэнсаваная актыўнасць суб’екта, у працэсе якой адбываецца развіццё чалавека, грамадства і культуры.

**Дзяржава** — тэрытарыяльны, суверэнны саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Яе дзейнасць рэгламентуецца прававымі нормамі і правіламі маральных паводзін, выкананне якіх забяспечваецца сістэмай кіравання і выхавання. Асноўныя прыметы дзяржавы — наяўнасць формаў уласнасці, права, пэўнай тэрыторыі, у межах якой дзяржава ажыццяўляе сваю ўладу і суверэнітэт.

**Закон** — нарматыўна-прававы акт, прыняты вышэйшым прадстаўнічым органам дзяржаўнай улады або шляхам усенароднага галасавання. Ён рэгулюе найбольш важныя грамадскія адносіны, валодае вышэйшай юрыдычнай сілай у адносінах да нарматыўных актаў усіх іншых органаў дзяржавы.

**Ідэал** (фр. ideal ад грэч. idea — паняцце, уяўленне) — дасканаласць; дасканалы ўзор якога-небудзь аб’екта, падзеі з пункту гледжання канкрэтнага чалавека ці групы людзей. Тэорыя ідэала была сфармулявана ў нямецкай класічнай філасофіі (І.Кант, Г.Гегель, І. Фіхтэ). Кожная эпоха стварае свой уласны ідэал (бſжаства, святога, манарха, героя), выпрацоўвае ўяўленні, абсалютную гармонію, справядлівас^ і прыгажосцъ, найвышэйшую мэту імкненняў і дзейнасці. Так, у сярэдневяковай хрысціянскай культуры Беларусі яскрава выявіліся ідэі боскай мудрасці і грамадскай згоды. У эпоху А драджэння сфарміраваліся гуманістычныя ідэалы асветніка, будаўніка хрысціянскага свету. У ХІХ-ХХ стст. узнік і атрымаў пашырэнне ідэал камуністычнага грамадства, які звязваўся з ліквідацыяй прыватнай уласнасці, пабудовай бяскласавага грамадства, усталяваннем прынцыпаў справядлівасці іроўнасціўсіхлюдзей. Аднак у канцы ХХ ст. адбылося крушэнне гэтых утапічных ідэй, таму ў сучасны перъшд паўстала праблема пошуку новых, адэкватных сённяшнім рэаліям грамадскіх ідэалаў.

**Ідэнтыіфікацыія(ад позналац.** identificare — атаясамліваць) — апазнанне, устанаўленне тоеснасці аб’ектаў. Важны механізм сацыгялізацыі асобы, пры дапамозе якога засвойваюцца сацыялъныя ролі, устаноўкі, нормы, ідэалы.

**Імітацыя** (лац. imitatio — перайманне) — перайманне, прыпадабненне камунебудзъ, чаму-небудзъ, дакладнае ўзнаўленне.

**Індывід** — (ад лац. individuum — непадзелънае, асобнае) — індывідуум, адзіночнае як процілеглае сукупнасці, масе. У

філасофіі асобны прадстаўнік сацыялънай суполънасці (народа,грамадства, сацыялънай групы і інш.), сацыялъная істота, якая

самастойна вызначае ўласныя паводзіны і псіхічныя працэсы.

**Інкультурацыія** — працэс і вынік засваення людзьмі традыцый, звычаяў і каштоўнасцей, вераванняўроднай культуры; вывучэнне і перадача культуры папярэднім пакаленнем наступнаму.

**Інтэграцыя** (ад лац. integratio — аднаўленне, папаўненне) — адзін з бакоў працэсу развіцця, калі асобныя часткі ці элементы аб'ядноўваюцца пад дзеяннем пэўнага фактару ў адно цэлае.

**Інтэграцыя культурная** — працэс паглыблення культурных ўзаемадзеянняў і ўзаемаўплываў паміж дзяржавамі, нацыянальна-культурнымі групамі і гісторыка-культурнымі сферамі. Ахоплівае ўзаемадзеянне паміж установамі культуры, творцамі і спажыўцамі культуры, працэс узгаднення розных нацыянальных формаў культуры, традыцый і наватый, устанаўленне адзінай агульначалавечай сістэмы каштоўнасцей. У выніку інтэграцыі культурнай розныя элементы, часткі культуры з-за іх падабенства паступова аб'ядноўваюцца ў адзіную культурную сістэму.

**Інтэрыярызацыя** — пераход звонку ўнутр. У псіхалогіі фарміраванне ўнутраных структур псіхікі ў выніку засваення знешняй сацыяльнай дзейнасці. Паняцце ўведзена французскімі псіхолагамі П.Жанэ, Ж.Піяжэ, А.Валогам. У псіхааналізе выкарыстоўваецца пры тлумачэнні працэсу фарміравання структур несвядомага.

**Інфармацыйнае грамадства** — адно з азначэнняў сучаснага стану грамадства ў індустрыяльнаразвітых краінах, якое звязана з якасна новым узроўнем вытворчасці, перапрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі. Тэорыя інфармацыйнага грамадства ўзнікла ў 1970-я иг., калі новыя тэхналогіі, усеагульная камп'ютэрызацыя і інфарматызацыя грамадства прывялі да глабальных змен у навуковай, тэхнічнай, сацыяльнай, духоўнай і іншых сферах яго жыццядзейнасці, паглыбленне творчага, інтэлектуальнага пачатку ў матывацыі працоўнай дзейнасці, вытворчасці матэрыяльных і культурных каштоўнасцей. Такое грамадства ў розных тэарэтычных канцэпцыях разглядаецца як адна з разнавіднасей постіндустрыяльнага грамадства або якякасна новая ступень у развіцці грамадскага працэсу, якая прыходзіць на змену постіндустрыялізму.

**Інфармацыя** (ад лац. informare — стварыць вобраз, складаць паняцце аб чым-небудзь) — звесткі, якія перадаюцца людзьмі вусна, пісьмова або іншым спосабам, а таксама сам працэс перадачы ці атрымання такіх звестак; агульнанавуковае паняцце, якое ўключае абмен звесткамі паміж людзьмі, чалавекам і аўтаматам, аўтаматам і аўтаматам, абмен сігналамі ў жывёльным і раслінным свеце, перадачу адзнак ад клеткі да клеткі, ад арганізма да арганізма.

**Кампенсацыя** (ад лац. compensare — ураўнаважваць) — аднаўленне парушанай раўнавагі псіхічных і псіхафізіялагічных працэсаў праз стварэнне процілегла накіраванай рэакцыі ці імпульсу. Паняцце кампенсацыя ” развівалася пераважна ў межах глыбіннай псіхалогіі.

**Камунікацыя** (ад лац. communicatio) – працэс перадачы і абмену інфармацыяй; сродкі сувязі паміж любымі аб'ектамі матэрыяльнага і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўнага свету.

**Каштоунасць** — філасофскі, сацыялагічны і культуралагічны тэрмін, які фіксуе чалавечае, сацыяльнае і культурнае значэнне пэўных з ’яўрэчаіснасці, якія ацэньваюцца ў плане дабра і зла, праўды і хлусні, прыгажосці і агіднасці, дапушчальнага і забароненага, справядлівага і несправядлівага і інш. Каштоўнасцямі называюцца таксама спосабы і крытэрыі, на аснове якіх ацэньваюцца адпаведныяз’явы (устаноўкі, забароны, мэты ці праекты). Каштоўнасці азначаюць не самі па сабе прадметы матэрыяльнай культуры, з ’явы духоўнай культуры або працэсы ў сферы чалавечых адносін, а іх сацыяльную якасць і значэнне ў жыццядзейнасці грамадства. Кожная культура фарміруе свой набор і іерархію каштоўнасцей, сістэма якіх выступае ў якасці найбольш высокага ўзроўню сацыяльнай рэгуляцыі.

**Культура** (ад лац. cultura — апрацоўка, вырошчванне) — сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей (звычаяў, вераванняў, традыцый, ідэй, сімвалаў, твораў мастацтва, пабудоў, машын і г.д.), якія ствараюцца людзьмі ў працэсе фізічнай і разумовай працы для задавальнення іх разнастайных патрэбнасцей і перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Існуе мноства азначэнняў культуры і падыходаў да вытлумачэння яе сутнасці. Развіваецца ў розных формах, выконвае разнастайныя сацыялъна значныя функцыі. Суб’ектам культуры выступае чалавек, паколът ён творыцъ, захоўвае іраспаўсюджвае створаныя ім культурныя артэфакты.

**Мараль** (фр. morah — маралънасцъ) асаблівая форма грамадскай свядомасці і від грамадскіх адносін (маральныя адносіны); адзін з асноўных спосабаў нарматыўнай рэгуляцыі дзеянняў чалавека ў грамадстве.

**Маргінальнасць** (лац. margo — край, мяжа) — тэрмін, які выкарыстоўваецца ў сацыялогіі, культурнай антрапалогіі для абазначэння індывідаў, якія па сваім становішчы знаходзяцца па-за межамі пэўнага сацыялънага слоя, на мяжы двух асяродкаў, што ў выніку пръгводзщъ да наяўнасці падвойнай (часам — множнай) сацыякультурнай самаідэнтыфікацыі. Прычынамі ўзнікнення і пышырэння феномена маргтальнасщ многія даследчыкі лічацъ узмоцненую міграцыю народаў і розных этнічных, сацыялъных груп, развіццё гандлю, рынку, хуткірост буйных гарадоў (мегаполісаў). Для маргіналаў уласцівыя такія адметныя рысы, як маральная раздвоенасцъ, адчуванне пазбаўленасці ранейшай культурнай самаідэнтыфікацыі і немагчымасцъ дасягнуцъ іншай, канфлжтнасцъ з традыцыйнымі нормамі і ідэаламі і інш.

**Масавая культура** — паняцце, якое характарызуе найболъш тыповыя спосабы бытавання культуры ў сучасныгм грамадстве. Уяўляе сабой новы тып, разнавіднасць культуры індустрыялънага грамадства. Іншыя яе назвы — камерцыйная, спажывецкая, папулярная, агулънадаступная культура.

**Народнасць** — гэта супольнасцъ людзей этнічнага паходжання, заснаваная на агулънасщ тэрыторыі, мовы, эканамічнага і культурнага жыцця, якая фарміруецца з узнікненнем прыватнаўласніцкіх адносін. Характэрна для рабаўладальніцкай і феадалънай фармацый, папярэднічае стварэнню нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Нацыія** (лац. natio — народ) — устойлівая этнасацыялъная суполънасцъ людзей, якія пражываюцъ на адной тэрыторыі. Звязаны агулъным эканамічныім і сацъялъна-палітъIчнъIм жыццём, маюцъ адзіную културу, мову і самасвядомасцъ.

**Нормы** — прадпісанні, агулънакулътурныя правілы, прынцыпы, узоры паводзін або дзеянняў індывідаў ці груп у грамадстве. Адлюстроўваюцъ пазітыўныя (прадпісанні) і негатыўныя (забарона) характарыстыкі дзеянняў. На аснове нормаў забяспечваюцца ўпарадкаванасць, рэгулятыўнасцъ сацыялъных узаемадзеянняў індывідаў і груп. Маралъ і права — найболъш важныя сферы нарматыўнай рэгуляцыі паводзін і дзеянняў суб’ектаў грамадскіх адносін.

**Палітыка** (грэч. politike — майстэрства кіравання дзяржавай) — арганізацыйная і рэгулятыўна-кантрольная сфера дзейнасці, звязаная зразмеркаваннем і ажыццяўленнем улады, рэгуляваннем грамадскіх адносін. Як спецыфічны від дзейнасці ўзнікла разам з дзяржавай.

**Права** — сістэма агульнаабавязковых сацыяльных нормаў, якія ўстаноўлены або санкцыяніраваны дзяржавай ірэгулююць дзеянні, паводзіны і адносіны людзей, іх груповак, дзяржаўных і грамадскіх органаў, арганізацый і ўстаноў.

**Прырода** — у шырокім сэнсе ўсё, што існуе (матэрыяльны сусвет) і стаіць у адным шэрагу з паняццямі быццё, матэрыя; у больш вузкім сэнсе — аб’ект вывучэння прыродазнаўчымі навукамі. Разглядаецца таксама як сукупнасць прыродных умоў існавання чалавека з пункту гледжання месца і ролі прыроды ў сістэме адносін да яе чалавека і грамадства. Існуе незалежна ад чалавека, бясконцая ў прасторы і часе, невычарпальнаяў сваіх формах і іх уласцівасцях. Мае структуру і сістэмнасць, знаходзіцца ў стане вечнай змены іразвіцця. Чалавек з’яўляецца арганічнай часткай прыроды, па-за якой ён не можа існаваць фізічна і духоўна. Рэальная аснова адносін чалавека да прыроды — яго практычная дзейнасць, акультурванне натуральнай прыроды.

**Сацыялізацыя** (лац. socialis — грамадскі) — працэс засваення чалавекам пэўнай сістэмы ведаў, нормаў і каштоўнасцей, якія дазваляюць яму функцыянаваць у якасці паўнапраўнага члена грамадства, уваходжання чалавека ў грамадскае жыццё. Уключае як сацыяльна кантраляваныя працэсы мэтанакіраванага ўздзеяння на асобу (выхаванне), так і стыхійныя, спантанныя працэсы, якія ўплываюць на яе фарміраванне.

**Семіётыка** (грэч. semeiotike ад semeion — прымета) — семіялогія, навука, што вывучае ўласцівасці знакавых сістэм ці знакаў, кожнаму з якіх пэўным чынам надаецца пэўнае значэнне. Даследуе асноўныя характарыстыкі любых знакаў і іх спалучэнняў і сістэм знакаў. Яна ўзнікла як лагічная навука і паўплывала на развіццё не толькі мовазнаўства, але стала агульным метадам для шэрагу даследаванняў у мастацтве, літаратуразнаўстве і агульнай тэорыі культуры. Універсальнасць semiятычнага падыходу заснавана на тым, што па сутнасці ўся інфармацыя, якую набывае чалавек на працягу жыцця і якая складае асноўны змест яго разумення, уяўляе сабой адлюстравальна-знакавую сістэму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Суб’ект культуры** (лац. subjectum) — паняцце ў культуралогіі, якое ўжываецца для абазначэннярозных носьбітаўу сферы стварэння, спажывання, захавання і трансляцыі культурных дасягненняў, нормаў, адносін. Суб’ектамі культуры выступаюць асобныя індывіды або якія-небудзь супольнасці (сацыяльныя, нацыянальныя, рэлігійныя, полаўзроставыя і інш.).

**Трансмісія культурная** — працэс, дзякуючы якому культура перадаецца ад папярэдніх пакаленняў да наступных найперш праз навучанне. На яе аснове фарміруецца пераемнасць культуры, неперапыннасць яе гістарычнага развіцця ў часе і прасторы.

**Тыпалогія** (грэч. typos — форма, узор + logos — веды, вучэнне) — навуковы метад, у аснове якога ляжыць сістэматызацыя працэсу або з’явы па найбольш агульных прыметах, якасцях.

**Формы культуры** — культуралагічнае паняцце; састаўны элемент структуры культуры. Яны не з ’яўляюцца культурнымі універсаліямі, формы — элемент складанай культуры, якая мае развітую структуру. У залежнасці ад таго, хто стварае культуру і які яе ўзровень, вылучаюць розныя яе формы — элітарную, народную, масавую, этнічную, маральную, палітычную, прававую і інш.

**Функцыя культуры** (лац. functio — дзейнасць) — прызначэнне або значэнне, роля, якую пэўная культура выконвае ў жыццядзейнасці ўсяго грамадства і яго асобных індывідаў.

**Чалавек** — вышэйшая ступень эвалюцыі жывых арганізмаў на Зямлі, прадстаўнік біялагічнага віду, сацыяльная істота і суб’ект культуры. З жывёльнага свету чалавека вылучаюць свядомасць, здольнасць рабіць прылады працы і выкарыстоўваць іх для ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Генетычна звязаны з іншымі жывымі арганізмамі, чалавек адрозніваецца ад іх наяўнасцю свядомасці, абстрактнага мыслення і мовы, здольнасцю пранікаць ў сутнасць навакольных прадметаў і самога сябе. Ён з ’яўляецца суб’ектам грамадска-гістарычнага працэсу, творцам каштоўнасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры, носьбітам традыцый, якія змяшчаюць у сабе дасягненні цывілізацыі.

**Эліта** (фр. elite — лепшы, выбраны) – лепшыя прадстаўнікі грамадства ці якой-небудзь яго часткі. Эліта — вышэйшы слой (ці слаі) сацыяльнай структуры грамадства, які ажыццяўляе функцыі кіравання, развівае навуку і культуру.

**Элітарная культура** — спецыфічная форма культуры, якая ствараецца прывілеяванай часткай грамадства або па яе заказу высокапрафесійнымі творцамі, што валодаюць творчай адоранасцю і выключнай мастацкай успрымальнасцю. Уключае выяўленчае мастацтва, класічную музыку і літаратуру.

**Этнас** (грэч. ethnos — народ) — этнічная супольнасць людзей (племя, народнасць, нацыя). Сярод асноўных прымет этнасу — саманазва (этнонім), агульнасць і цэласнасць тэрыторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, мовы. Тэрмін блізкі да паняцця “народ”.

**Этнічная культура** — сукупнасць створаных каштоўнасцей пэўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнічнай супольнасцю.

**Этыка** (грэч. ethike ад грэч. ethos — характар) — філасофская навука, аб’ект вывучэння якой — мараль цалкам, маральнасць як адзін з бакоў жыццядзейнасці чалавека, спецыфічная з’ява грамадскага жыцця і форма грамадскай свядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

### Семінар як лабараторыя крэатыўнага мыслення

Семінар – лацінскае слова Seminarium – рассаднік ведаў. Практыка выкладання культуралагічных дысцыплін дае нам падставы сцвярджаць, што, з аднаго боку, дадзены від заняткаў найбольш складаны, а з другога – з’яўляецца найбольш эфектыўнай формай, якая дазваляе замацаваць важнейшыя тэарэтычныя палажэнні, сфарміраваць навыкі і ўменні, неабходныя будучаму культуролагу-даследчыку і выкладчыку, садзейнічае развіццю мыслення, лагічанаму ізлажэнню сваіх думак і поглядаў на пэўныя з’явы і працэсы культуры. У працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і падчас выступлення на іх студэнты засвойваюць навыкі складання плана і працы з тэкстам, падрыхтоўкі даклада, тэзісаў выступлення, прэзентацыі, методыку данясення да аўдыторыі сваіх меркаванняў. Семінар прывучае студэнта самастойна выбіраць тэму выступлення, знаходзіць неабходную літаратуру, дадатковыя крыніцы, фармуліраваць высновы.

Можна лічыць семінар своеасаблівай лабараторыяй творчага мыслення будучага спецыяліста сацыякультурнай сферы. Менавіта семінарскія заняткі ствараюць атмасферу творчасці і крэатыўнасці, асобаснага падыхода да выяўлення асаблівасцей сацыякультурнага развіцця грамадства з улікам спецыфічных дэтэрмінантаў. Тут выпрацоўваюцца ўменні выкарыстоўваць культуралагічныя веды для вырашэння канкрэтных праблем у сферы культуры. Семінар прадстаўляе студэнту магчымасць непасрэдна мець зносіны з выкладчыкам, знаходзіцца ў стане супрацоўніцтва падчас пошуку ісціны. Супрацоўнітва прадугледжвае таксама сумесную вучэбную дзейнасць усіх студэнтаў акадэмічнай групы.

Асноўнай *мэтай* семінараў па культуралогіі, на нашу думку, з’яўляецца выпрацоўка на аснове аналіза лекцыйнага матэрыла і дадатковай літаратуры па тэорыі культуры ўласнага погляду на пастаўленую праблему і шляхоў яе вырашэння. Безумоўна, рэалізацыя гэтай мэты патрабуе ад выкладчыка і студэнтаў скрупулёзнай падрыхтоўкі да семінара, выкарыстання разнастайных формаў, метадаў і адукацыйных тэхналогій. Пры гэтым важна дабіцца, каб кожны студэнт пастаянна добрасумленна рыхтаваўся да семінара, каб на занятках ніхто не застаўся абыякавым да абмяркоўваемай праблемы.

Выкладчыкамі кафедры культуралогіі выкарыстоўваюцца разнастайныя *формы* правядзення семінарскіх заняткаў. Найбольш прыемлімымі, на наш погляд, з’яўляюцца: разгорнутая гутарка па пытаннях тэмы; круглыя сталы як падагульняючыя заняткі па пэўнаму раздзелу праграмы; дыскусія па абмяркаўваемых рэфератах, дакладах і паведамленнях; семінар-канферэнцыя; семінар-кантрольная работа з абмеркаваннем яе вынікаў; дзелавыя гульні; семінар-аратар. Безумоўна, у кожнай з пералічаных формаў маюцца свае пазітыўныя бакі, таму тая альбо іншая з іх выкарыстоўваецца ў залежнасці ад характара вывучаемай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемы і складу студэнтаў акадэмічнай групы. Пры правядзенні асобных семінараў адначасова могуць выкарыстоўвацца элементы розных формаў. Для таго каб студэнты на семінары змаглі глыбей разабрацца ў сутнасці асноўным тэорыі культуры, авлодаць навыкамі самастойнага аналіза феноменаў культуры, неабходна старанна падрыхтавацца да яго па праверанаму ў ходзе акадэмічнай практыкі алгарытму. Пры падрыхтоўцы да семінара неабходна:

1. Уважліва азнаёміцца з планам семінара, зразумець тэму, мэту і пытанні, якія пастаўлены ў плане.

2. Вызначыць неабходную літаратуру, своечасова падабраць неабходныя матэрыялы, спланаваць парадак работы.

3. Прааналізаваць канспект лекцыі па тэме, якая вынесена на семінарскія заняткі, дапрацаваць яе з улікам дадатковай літаратуры і падручніка.

4. Заканспекціраваць першакрыніцы, фрагменты тэкстаў навуковых прац вядомых беларускіх і замежных культуролагаў, у якіх разглядаюцца пытанні вывучаемай праблемы.

5. Дапоўніць сабраны матэрыял па тэме семінарскіх заняткаў матэрыяламі спецыяльных навукова-тэарэтычных часопісаў, газет, Інтэрнэта.

6. Пры неабходнасці падрыхтаваць прэзентацыю, якая ілюструе разглядаемыя на семінары пытанні. Магчыма таксама мець і рэферат па аднаму з пытанняў, якія вынесены на абмеркаванне на семінары.

Падрыхтоўка да семінара з’яўляецца вельмі працаемкай дзейнасцю. У сувязі з гэтым падрыхтоўку да яго пажадана весці на працягу 4-7 дзён. Напярэдадні заняткаў карысна ўважліва прачытаць падрыхтаваны канспект па тэме семінара, прадумаць сваё вуснае выступленне на семінары.

Тэма 1. Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства.
Тэма 2. Духоўная культура і яе сутнасць.
Тэма 3. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест.
Тэма 4. Функцыі культуры.
Тэма 5. Культура сацыяльных супольнасцей.
Тэма 6. Спецыфіка масавай культуры.
Тэма 7. Тыпалогія культуры. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры.
Тэма 8. Дынаміка культуры.
Тэма 9. Прырода і культура.
Тэма 10. Асоба ў прасторы культуры.
Тэма 11. Культура і цывілізацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.2 Рэкамендуемыя тэмы магістарскіх работ

### Магістарская дысертацыя і яе месца ў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці магістрантаў

На завяршальным этапе падрыхтоўкі культуролагаў-даследчыкаў магістранты пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў выконваюць магістарскую працу па адной з актуальных праблем тэорыі культуры.

Работа, як форма выніковай атэстацыі магістрантаў, з’яўляецца відам іх самастойнай працы, якая прадстаўляе сабой рашэнне вучэбнай задачы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне. Дадзены від самастойнай работы прадугледжвае паглыбленае вывучэнне тэарэтычных пытанняў фундаментальнай культуралогіі, сістэматызацыю назапашаных у працэсе лекцыйных і семінарскіх заняткаў культуралагічных ведаў, набыццё уменняў і навыкаў, неабходных для навукова-даследчай дзейнасці і вырашэння прафесійных задач.

У працэсе падрыхтоўкі тэкста дысертацыі і даклада падчас яе абароны магістранты на практыцы выкарыстоўваюць тэарэтычныя веды, якія атрыманы на занятках па вучэбнай дысцыпліне “Метадалогія і метады культуралагічных даследаванняў”. Пры даследаванні пэўнай праблемы ў межах дысертацыйнай работы магістрант вучыцца выкарыстоўваць шэраг аналітычных прыёмаў, аперацый і працэдур, якімі карыстаюцца даследчыкі феноменаў культуры. Справа ў тым, што культуралогія ў сваіх даследаваннях працэсаў і з’яў культуры абапіраецца як агульнанавуковыя, так і ўласныя метады пазнання. Магістранту, які выконвае даследаванне па канкрэтнай праблеме фундаментальнай культуралогіі, ставіцца задача навукова прааналізаваць пэўны артэфакт культуры, выявіць факталогію яго існавання, параўнаць розныя тэарэтычныя аспекты яго вывучэння, праясніць спецыфіку спосаба быцця артэфакта ў сучаснай культуры, сэнс і змест яго функцыянавання ў сацыяльнай практыцы. Для таго каб паспяхова вырашыць дадзеную задачу аўтару дысертацыі пад кіраўніцтвам педагога неабходна:

а) сабраць і апрацаваць фактычны матэрыял па абранай праблеме;

б) сістэматызаваць яго ў адпаведнасці са структурай работы;

в) азнаёміцца з рознай манаграфічнай літаратурай па тэме працы, выбраць з яе патрэбныя фрагменты тэкстаў, якія ілюструюць пэўныя палажэнні працы;

г) скласці спіс выкарыстанай літаратуры і аформіць яе ў адпаведнасці з патрабаваннямі бібліяграфічнага апісання;

д) стылістычна правільна і лагічна ў пісьмовай форме выказаць свае думкі па даследуемай праблеме;

е) аформіцьдысертацыйную работу як стандартызаваны тэкст;

ё) напісаць тэкст даклада, з якім неабходна выступіць падчас публічнай абароны дысертацыі.

Азначаны алгарытм падрыхтоўкі дысертацыйнай працы дазволіць паспяхова справіцца з пастаўленай мэтай і задачамі. Як правіла, аб’ём

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўнага тэксту курсавой работы па тэорыі культуры (без бібліяграфічнага спісу і дадаткаў) займае не менш 50 старонак камп'ютэнага набору. Практыка паказвае, што ў дадзеным памеры магчыма грунтоўна і аргументавана раскрыць сутнасць і змест абранай да даследавання праблемы.

Магістрантам пажадана рэкамендаваць прыкладную структуру працы. Яна можа складацца з уводзін, асноўнай часткі тэкста (2-3 раздзелы, якія разбіваюцца на асобныя параграфы), заключэння, бібліяграфічнага спісу, дадаткаў, якія размяшчаюцца ў самым канцы працы. Для ілюстрацыі асобных палажэнняў і высноў аўтар працы можа падрыхтаваць прэзентацыю і выкарыстаць яе пры абароне.

Тэмы магістарскіх работ распрацоўваюцца на кафедры і зацвярджаюцца загадчыкам кафедры да пачатку семестра, у якім прадугледжана іх выкананне ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі па напрамку спецыяльнасці (спецыялізацыі). Колькасць зацверджаных тэм павінна быць дастатковай для выдачы ў вучэбнай групе кожнаму магітранту індывідуальнага задання. Магістрант мае права выбраць тэму работы з ліку зацверджаных на кафедры або самастойна прапанаваць тэму даследавання з абгрунтаваннем яе мэтазгоднасці.

Высокі тэарэтычны ўзровень дысертацыйнай работы, практычная значнасць яе вынікаў можа быць ў далейшым абрана для кандыдацкай дысертацыі. Таму вельмі важна дапамагчы магістрантам абраць яе тэму. Пажадана, каб яна насіла праблемны характар, была актуальнай для сацыякультурнай практыкі, безумоўна, адпавядала інтарэсам даследчыка .

Прыкладныя тэмы дысертацыйных работ вызначаюцца прафесарска-выкладчыцкім складам кафедры, да кожнай тэмы прапануецца пэўная колькасць літаратуры, у якой абазначаны аспекты вывучэння абранай праблемы, магчымыя метады вырашэння пастаўленых задач.

*Тэма. Культура ў гісторыі гуманітарных ведаў*

Літаратура


Аксиологические аспекты теории культуры // Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – С. 48-55.

Запесоцкий, А.С. Теория культуры академика В.С.Степина: лекции прочитанные студентам СПбГУП в мае-сентябре 2010 года / А.С.Запесоцкий. – СПб.: С.-Петерб. ун-т, 2010. – 87 с.

Орлова, Э.А. Введение в социальную и культурную антропологию / Э.А.Орлова. – М.: Изд-во МГИК, 1994. – 214 с.

Розин, В. М. К вопросу о культурологии, ее предмете и методе В.М. Розин // Социально-политический журнал. – 1993. – № 3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма. Культурныя аб’екты*

Літаратура

Ерасов, Б.С. Содержательные элементы духовной жизни общества: обычаи, нормы, ценности, смыслы и знания / Б.С.Ерасов // Ерасов, Б.С. Социальная культурология: Пособие для студентов высщих учебных заведений. – 2-е изд. испр. и доп. – М.: Аспект Пресс, 1997. – С. 98-155.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Морфология культуры: структура и динамика [под ред. Э.А.Орловой] . – М.: ,1994. – с.

Уайт, Л. Понятие культуры // Антология исследования культуры. — СПб.: Университетская книга, 1997. – Т.1. Интерпретация культуры. – С. 141-156.

Флиер, А.Я. Культурные объекты / А.Я.Флиер // // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 137-143.

Шендрик, А.И. Теория культуры: учеб. пособие для вузов / А.И.Шендрик. – М.:ЮНИТИДАНА; Единство, 2002. – 519 с.

*Тэма. Артэфакты нацыянальнай беларускай культуры*

Літаратура

Введение в культурологию под ред. Е.В.Попова. – М.: , 1995. – с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Рождественский, Ю.В. Введение в культуроведение / Ю.В.Рождественский. – М.: , 1996. – с.

Флиер, А.Я. Арефакты в культуре / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 147-149.

*Тэма. Культурныя формы*

Літаратура

Арнольдов, А.И. Человек и мир культуры: Введение в культурологию / А.И.Арнольдов. – М.: Изд-во МГИК, 1992. – 240 с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Смолік, А.І. Віды і формы культуры / А.І.Смолік // Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 43-156.

Флиер, А.Я. Культурные формы / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 144-147.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма. Дыфузія культуры (на прыкладзе беларускай культурнай прасторы)*

Літаратура

Аванесова, Г.А. Динамика культуры / Г.А.Аванесова // Культурология . XX век: словарь. – СПб.: Университетская книга, 1997. – С. 99-102.

Кармин, А.С. Динамика культуры / А.С.Кармин // Культуралогия. – 2-е изд., перараб. и доп. – СПб.: Изд-во "Лань", 2003. – С. 730-915.

Моль, А. Социодинамика культуры: Пер. с фр. /А.Моль-М.: Прогресс , 1973.— 406 с.

Смолік, А.І. Дынаміка культуры / А.І.Смолік // Культурологія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 230-244.

Сорокин, П.А. Социокультурная динамика и эволюционизм / П.А. Сорокин // Американская социологическая мысль: Тексты / Р.Мертан, Дж. Мид, Т.Парсанс, А.Шюц. – М.: Политиздат, 1994. – С. 372-392.

Флиер, А.Я. Дифузия культуры / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 275-276.

*Тэма. Сацыякультурная камунікацыя ў дыхатаміі Беларусь-Заходняя Еўропа*

Літаратура

Грушевицкая, Т.Г., Попков, В.Л., Садохин, А.П. Основы межкультурной коммуникации: Учебник для вузов / ред. А.П.Садохин / Т.Г.Грушевицкая, В.Л.Попков, А.П.Садохин. – М.: ЮНИТ-ДАНА, 2002. – 352 с.

Гудков, Д. Теория и практика межкультурнай коммуникации / Д.Гудков. – М.: Политиздат, 2003. – 187 с.

Диалог и коммуникации: философские проблемы (материалы круглого стола) // Вопросы философии. – 1989. – № 7. – С. 3-27.

Каган, М.С. Мир общения: проблема межсубъектных отношений / М.С.Каган. – М.: Политиздат, 1988. – 319 с.

Почепцов, Г.Г. Теория коммуникаций / Г.Г.Почепцов. – М.: Рельеф-бук, 2001. – 656 с.

Садохин, А.П. Межкультурная коммуникация / А.П.Садохин. – М.: Альфа-М, 2006. – 287 с.

*Тэма. Парадоксы дыялога ў навуковай думцы XX-XXI стст.*

Літаратура

Бахтин, М.М. Проблема текста в лингвистике, филологии и других гуманитарных науках. Опыт философского анализа / М.М.Бахтин // Бахтин, М.М. Литературно-критические статьи. – М.: Художественная литература, 1986.— С. 281- 307.

Библер, В.С. Культура. Диалог культур (Опыт определения) / В.С.Библер // Вопросы философии. – 1989.— № 6. – С. 31-42.

Бубер, М. Я и Ты: пер. с нем. / М.Бубер. – М.: Высшая школа, 1993. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

176 с.
Диалог и коммуникации: философские проблемы (материалы круглого стола) // Вопросы философии. – 1989. – № 7. – С. 3-27.
Драгунский, Д. Культура как диалог / Д.Драгунский // Диалог в культуре. – М.: Наука, 1989. – Вып. 5. – С. 6-8.
Каган, М.С. Мир общения: проблема межсубъектных отношений / М.С.Каган. – М.: Политиздат, 1988. – 319 с.

*Тэма. Канфесіянальны тып культуры (на матэрыялах беларускай культуры)*

Літаратура

Вебер, М. Социология религии М. Вебер // Вебер, М. Избранное. Образ общества / М. Вебер. – М.: Юристъ,1994. –704 с.
Мень, А. В. История религии: В поисках Пути, Истины и Жизни: В семи томах. Т. 1. Истоки религии / А.В. Мень. – М.: СП «Слово», 1991. – 228 с.
Розанов, В. В. Религия. Философия. Культура / В.Розанов. – М.: Республика, 1992. –400 с.
Фрейд З. Психоанализ, религия, культура. М.: , 1992. – с.
Флиер, А.Я. Конфессиональный тип культуры / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 157-158.
Тиллих, П. Избранное. Теология культуры / П.Тиллих. – М.: Юрист, 1995. – 479 с.
Тэнасе, А. Культура и религия / Э.Тэнасе. – М.: Изд-во политической литературы, 1975. – 128 с.

*Тэма. Мода як феномен сучаснай беларускай культуры*

Літаратура

Барт, Р. Система моды. Статьи по семиотике культуры / пер. с фр., вступ. ст. и сост. С.И.Зенкина / Р.Барт. – М.: , 2003.— с.
Гофман, А.Б. Мода и люди. Новая теория модного поведения / А.Б.Гофман. – СПб.: , 2004. – с.
Зиммель, Г. Мода / Г.Зиммель // Избранное: в 2 т. – Т. 2: Созерцание жизни. – М.: , 1996. – с.
Кавамура, Ю. Теория и практика создания моды / Ю.Кавамура. – Минск: , 2009. – с.
Линч, А., Штраусс М.Д. Изменения в моде: причины и следствие / А.Линч, М.Д. – Минск: , 2009. – с.
Свендсен, Л. Филасофия моды: пер. с норв. / Л.Свендсен. – М.: ,2007. – с.

*Тэма. Транслакальныя культурныя сістэмы*

Літаратура

Бродель, Ф. Грамматика цивилизаций / Ф.Бродедь. – М.: Весь мир, 2008. – 545 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ерасов, Б.С. Цивилизация: Универсалии и самобытность / М.: Наука, 2002. – 522 с.

Локотко, А.И. Историко-культурные регионы Беларуси / А.И.Локотко. – Минск: Бел. навука, 2002. – 223 с.

Цітоў, В. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. – 2-е выд. / В.Цітоў. – Мінск:Беларусь, 2001. – 331 с.

Флиер, А.Я. Транслокальные культурные образования / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 167-168.

Чебоксаров, Н.Н. Народы. Расы. Культуры / Н.Н.Чебоксаров. – М.: Наука, 1985. – 323 с.

*Тэма. Семіятычная прастора беларускай культуры*

Літаратура

Ветров, А.А. Семиотика и ее основные проблемы. Над чем работают и спорят философы / А.А.Ветров. – М.: ИПЛ, 1968. – 263 с.

Семиотическое пространство культуры // Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – С. 108-117.

Лотман, Ю.М. Семиосфера. Культура и взрыв. Внутри мыслящих миров. Статьи. Исследования. Заметки / Ю.М.Лотман. – СПб.: Искусство-СПб., 2010.— 703 с.

Почепцов, Г.Г. Русская семиотика. Идеи и методы, персоналии, история / Г.Г.Почепцов. – М.: Рефл-бук: Ваклер, 2001. – 768 с.

Семиотическое пространство культуры // Худенко, А.В. Повседневность в лабиринте рациональности // Социологические исследования. – 1993. – № 4.

Эко, У. Отсутствующая структура. Введение в семиологию / У.Эко. – СПб.: Петрополис, 1998. – 432 с.

Юнг, К.-Г. Человек и его символы / К.-Г.Юнг, М.Л.Франц, Д.Л.Хендерсон, И.Якоби, А.Яффе. – СПб.:Б.С.К., 1996. – 454 с.

*Тэма. Семіётыка беларускага мастацтва (від на выбар)*

Літаратура

Барт, Р. Мифология / Р.Барт. – М.: Академический проект, 2008. – 351 с.

Бердяев, Н.А. Кризис искусства (Репринтное издание) / Н.А.Бердяев. – М.: СП Интерпринт, 1991. – 48 с.

Лосев, А.Ф. Проблемы символа в реалистическом искусстве / А.Ф.Лосев. – М.: Искусство, 1995. – 320 с.

Мейлах Б. С. Философия искусства и художественная картина мира // Вопросы философии. 1983. № 7.

Осокин, Ю. В. Искусство как феномен культуры / Ю. В. Осокин // Системные исследования культуры. 2008. - Санкт-Петербург, 2009. - С.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

233-262.
Таланцева, О.Ф. Костюм как художественный символ в изобразительном искусстве / О.Ф.Таланцева //Мастацкая адукацыя і культура. – 2004. – № 4. – С. 26-33.

*Тэма. Рэгіянальныя культуры Беларусі (рэгіён на выбар)*

Літаратура

Беларусы: Вытокі і этнічнае развіццё / В.К.Бандарчык, В.М.Белявіна, Г.І.Каспяровіч і інш.; НАНБ. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 433 с.

Локотко, А.И. Историко-культурные регионы Беларуси / А.И.Локотко. – Минск: Бел. навука, 2002. – 223 с.

Парашкоў, С. Гісторы культуры Беларусі / С.Парашкоў. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 442 с.

Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М.Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. – 287 с.

Цітоў, В. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. – 2-е выд. / В.Цітоў. – Мінск:Беларусь, 2001. – 331 с.

Флиер, А.Я. Транслокальные культурные образования / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 167-168.

Чебоксаров, Н.Н. Народы. Расы. Культуры / Н.Н.Чебоксаров. – М.: Наука, 1985. – 323 с.

*Тэма. Архетыпічныя структуры ў беларускай міфалогіі*

Літаратура

Голан, А. Миф и символ / А.Голан. – М.: Руслит, 1993. – 375 с.: ил.

Конан, У. Архетыпы нашай культуры / У.Конан //Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 1-11. С. 16-21; 30-34; 23-29; 34-39; 16-22; 26-32; 48-52; 21-25; 20-25.

Мелетинский, Е.М. Поэтика мифа / Е.М.Мелетинский; Рос. акад. наук, Ин-т мировой лит. – 4-е изд. репр. – М.: Вост. лит., 2006. – 407 с.

Морозов, И.В. Основы культурологи. Архетыпы культуры. / И.В.Морозов. – Минск: ТетраСистемс, 2001. – 608 с.

Пискун, Н.Д. Архетипы и прототипы персонажей интермедий школьного и народного белорусского театра ХУ1-начала XX века / Н.Д.Пискун. – Минск: Энциклопедикс, 2009. – 292 с.

Свечнікова, А.У. / А.У.Свечнікова // Весн. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2 Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2009.— № 4. – С. 97- 102.

Юнг, К.-Г. Архетип и символ: Пер. с англ. и нем. / К.-Г.Юнг. – М.: , 1996. – с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма. Навука як планетная з’ява*

Літаратура

Вебер, М. Исследования по методологии науки / М.Вебер. – М.: ИНИОН, 1980. – 148 с.

Вернадский, В.И. Научная мысль как планетное явление / В.И.Вернадский. – М.: Наука, 1991. – 270 с.

Поппер, К. Логика научного исследования / К.Поппер // Логика и рост научного знания. М.: Прогресс, 1983. – С. 33-235.

Пуанкаре, А. Ценность науки / А.Пуанкаре // Пуанкаре, А. О науке. М.: Наука, 1983. – С. 153-282.

Степин, В.С. Научные революции как «точки» бифуркации в развитии знаний / В.С.Степин // Научные революции в динамике культуры. – Минск: Университетское , 1987. – 384 с.

Порус, В.Н. Наука – культура – цивилизация / В.Н.Порус // Культура: теория и проблемы. – М.: Наука, 1995.

*Тэма. Слова і культура*

Літаратура

Гусев, С. Смысл возможного. Коннотационная семантика / С.Гусев. – СПб.: Алетейя, 2002. – 192 с.

Мандельштам, О.Э. Слово и культура: Статьи. – М.: Советский писатель, 1987. – 320 с.

Мелетинский, Е.М. Возникновение и ранние формы словесного искусства / Е.М.Мелетинский // История всемирной литературы. – Т. 1. – М.: Наука, 1987. – С. 23-52.

Моррис, Ч.У. Основания теории знака / Ч.У.Моррис // Семиотика / под ред. Ю.С.Степанова. – М.: Радуга, 1988. – С. 31-39.

Сепир, С. Избранные работы по языкознанию и культурологи / Э.Сепир. –М.: Аудиториум, 1994. – 412 с.

Сосюр, Ф. Труды по языкознанию / Ф.Сосюр. – М.: Прогресс, 1997. – 695 с. – (Языковеды мира).

*Тэма. Структура і маштаб ідэнтычнасці*

Літаратура

Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду / І.Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

Гудков, Л. «Негативная идентичность». Статьи 1997-2002 годов / Л.Гудков. – М.: Новое литературное обозрение, 2004. – 807 с.

Данилова, Е.Н., Ядов, В.А. Нестабильная социальная идентичность как норма современных обществ / Е.Н. Данилова, В.А. Ядов // ОЦИС. – 2004. – № 10.— С. 27-30.

Извеков, А.И. Проблема идентичности в кризисной культуре / А.И.Извеков // Проблемы культурной идентичности. – Казань: АЛМА, 1998. – С. 44-49.

Искусство в контексте цивилизационной идентичности: в 2 т. / отв. ред.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н.А.Хренов. – М.: , 2006. – с.
Кон, И.С. В поисках себя: Личность и ее самосознание / И.С.Кон. – М.: Знание, 1984. – 387 с.
Культурная идентичность и идентификация культуры // Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013. – С. 323-336.
Культурная идентичность – одна из важнейших человеческих потребностей // П.С.Гуревич. Культурология: элементарный курс: Учеб. пособие. – М.: Гардарики, 2002. – С. 276-290.
Эриксон, Э. Идентичность: юность и кризис / Э.Эриксон. – М.: Прогресс, 1996. – 344 с.

*Тэма. Беларуская нацыянальная культура ва ўмовах глабалізацыі*

Літаратура

Бек, У. Что такое глобализация? Ошибки глобализма – ответы на глобализацию / У.Бек. – 301 с.
Гидденс, Э. Ускользающий мир. Как глобализация меняет нашу жизнь / Э.Гидденс. – М.: , 2004. – с.
Кастельс, М. Информационная эпоха: экономика, общество и культура / Э.Кастельс. – М.: 2001 , -- с.
Саликов, А.Э. Белорусская национальная культура перед вызовом глобализации / А.Э.Саликов // Чалавек.Грамадства. Свет. – 2001. – С. 16-19.
Удовик, С.Л. Глобализация: Семиотические прдходы / С.Л.Удовик. – М.: Рефл-бук, 2002. – 461 с.
Уткин, А.И. Мировой порядок XX1 века / А.И.Уткин. – М.: Алгоритм-книга, 2001. – 472 с.

*Тэма. Хрысціянскія канцэпцыі культуры*

Літаратура

Донин, А. У истоков христианства / А.Донин. – М.: , 1990. – с.
Лившиц, Г.М. Происхождение христианства в свете рукописей Мертвого моря / Г.М.Лившиц. – Минск: , 1967. – с.
Мартысевич, А.С. Методологические основания изучения христианских концепций культуры XX - начала XX1 в. / А.С.Мартысевич // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры и мастацтваў. – 2010. – № 1(13). – С. 14-20.
Мень, А. В. История религии: В поисках Пути, Истины и Жизни: В семи томах. Т. 1. Истоки религии / А.В. Мень. – М.: СП «Слово», 1991. – 228 с.
Розанов, В. В. Религия. Философия. Культура / В.Розанов. – М.: Республика, 1992. –400 с.
Тиллих, П. Избранное. Теология культуры / П.Тиллих. – М.: Юрист, 1995. – 479 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трацяк, І.І. Беларускае духавенства (пачатак XX ст. – 1930-я гады) / І.І.Трацяк // Беларус. гіст. часопіс. – 1999. – С. 41-48.

Тэнасе, А. Культура и религия / Э.Тэнасе. – М.: Изд-во политической литературы, 1975. – 128 с.

*Тэма. Інфарматызацыя і яе глабальныя сацыякультурныя наступствы*

Літаратура

Гиренок Ф. И., Светличная Т. Н. Культура как виртуальность / Ф.И. Гиренок // Человек в современных философских концепциях. – Волгоград: , 1998 – С. 112 – 115.

Кризис современной цивилизации: Выбор пути. Сб. обзоров / под ред. Ф.ИЖиренко, Л.И.Василенко. – М.: ИНИОН РАН, 1992. – 124 с.

Маньковская, И.Б. Виртуальная реальность // Культурология XX век. Словарь. СПб: Университетская книга, 1997. - С. 73-77.

Савицкая, Т. Е. Виртуальная реальность: опыт прояснения культурного статуса / Т. Е. Савицкая // Обсерватория культуры. - 2009. - № 1. - С. 34-41б.

Сорокин, П.А. Человек. Цивилизация. Общество: Пер. с англ. / П.А.Сорокин-М.: Политиздат, 1992. – 543 с.

Семенюк, Э.П. Кризисные проявления цивилизации и информатика / Э.П.Семенюк // Научно-техническая информация. Серия 1. Организация и методика информационной работы. – 2010. – № 1. – С. 1-11.

Тойнби, А.Дж. Цивилизация перед судом истории. Сб. / А.Дж.Тойнби. -- М.: Айрис-Пресс, 2003. – 592 с.

Печенкин, В.В. Информационные технологии в социальной структуре общества / В.В.Печенкин. – Саратов: Изд-во Саратов. ун-та, 2001. – 185 с.

Шу, Т. Интернет в культуре и культура в Интернете : социально-антропологический анализ / Т. Шу // Вопросы культурологии. - 2010. - № 7. - С. 51-55.

*Тэма. Мараль як феномен культуры*

Літаратура

Бергсон, А. Два источника морали и религии / А.Бергсон. – М.: , 1994. – с.

Бубер, М. Проблемы человека / М.Бубер. – М.: , 1992. – с.

Гусейнов, А.А. Великие моралисты / А.А.Гусейнов. – М.: Республика, 1995. – 351 с.

Назаретян, А.П. Агрессия, мораль и кризисы в развитии мировой культуры / А.П.Назаретян. – М.: , 1995. – с.

Ремизов, В.А. Культура личности (ценностно-мировоззренческий анализ) / В.А.Ремизов. – М.: , 2004. – с.

Смолік, А.І. Маральная культура / А.І.Смолік // Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 157-160.

Флиер, А.Я. Личность и культура /А.Я.Флиер // Культурология для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 127-131.

*Тэма. Духоўны ідэал як фактар сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства*

Літаратура

Крукоўскі, М.І. Бляск і трагедыі ідэалу / М.І.Крукоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 352 с.

Мудрагей, Г.С. Идеал – проблема выбора / Г.С.Мудрагей // Идеал, утопмя и критическая рефлексия; отв. ред. В.А.Лекторский. – М.:РОССПЭН, 1996. – 302 с.

Осипов, А.И. Духовность. Традиции. Патриотизм / А.И.Осипов. – Минск: ОО "Молодежное научное общество, 2001. – 99 с.

Новгородцев, П.И. Об общественном идеале / П.И.Новгородцев. – М.: , 1991. – с.

Новиков, А.А. О пародоксах идеала / А.А.Новиков // Идеал, утопмя и критическая рефлексия; отв. ред. В.А.Лекторский. – М.:РОССПЭН, 1996. – 302 с.

Соловьев, В.С. Духовные основы жизни / В.С.Соловьев // Собр. соч.: в 3 т. – Брюссель, 1966. – Т.3. – 430 с.

Уладыкоўская, Л.М. Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізацыі / Л.М.Уладыкоўская. – Мінск: БДУ, 2009. – 199 с.

Франк, С.Л. Духовные основы общества / С.Л.Франк. – М.: Республика, 1992. – 511 с.

*Тэма. Сацыякультурная дэструкцыя: сутнасць і дэтэрмінанты*

Літаратура

Анатомия кризисов / А.Д.Арманд [и др.]. – М.: Наука, 1999. – 392 с.

Бэрон, Р. Агрессия / Р.Бэрон, Д.Ричардсон. – СПб.: Питер, 2001. – 352 с.

Камю, А. Бунтующий человек. Философия. Политика, Искусство / А.Камю; пер. с фр. – М.: Политиздат, 1990. – 415 с.

Ласло, Э. Век бифуркации. Постижение меняющегося мира / Э.Ласло // Путь. – 1995. – № 7. – С. 27-41.

Розанов, В. Апокалипсис нашего времени / В.Розанов // Собр.соч., [Т. 2]. – М.: Республика, 1994. – 541 с.

Смолик, Д.А. Деструктивные механизмы культуры психоаналитический аспект / Д.А.Смолик // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. гуманітар. навук. – 2004. – № 2. – С. 60-63.

Сорокин, П.А. Кризис нашего времени // Человек. Цивилизация. Общество. П.А.Сорокин: [сб. ст.]. – М.: Аспект-Пресс, 1992. – С. 427-504.

Флиер, А.Я. Социокультурная деструкция /А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 277-279.

Швейцер, А. Упадок и возрождение культуры: избранное / А.Швейцер. – М.: Прометей, 1993. – 512 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма. Прыярытэты нацыянальна-культурнага і духоўнага развіцця Беларусі ва ўмовах глабалізацыі*

Літаратура

Глушаков, В.Е. Вызов времени: Беларусь на пороге тысячелетий / В.Е. Глушаков. – Минск: Белбизнеспресс, 1999. – 224 с.

Евменов, Л.Ф. Глобализация и диалог цивилизаций: проблемы Беларуси / Л.Ф.Евменов // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2007. – № 2. – С. 25-37.

Конан, У.М. Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі / У.М.Конан // Беларусь – XXI ст.: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 10-12 снежня 2003 г.; рэдкал. Л.Уладыкоўская-Канаплянік [і інш.]. –Мінск: ІНАЦ імя Ф.Скарыны, 2004. – С. 90-96.

Саверчанка, І. Нацыянальная ідэнтычнасць: сутнасць, функцыі, шляхі ўмацавання / І.Саверчанка // Беларусь – XXI ст.: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 10-12 снежня 2003 г.; рэдкал. Л.Уладыкоўская-Канаплянік [і інш.]. –Мінск: ІНАЦ імя Ф.Скарыны, 2004. – С. 97-100.

Смолик, А.И. Социокультурные основания деструктивности в трансформирующемся белорусском обществе / А.И.Смолик // Беларусь – XXI ст.: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 10-12 снежня 2003 г.; рэдкал. Л.Уладыкоўская-Канаплянік [і інш.]. –Мінск: ІНАЦ імя Ф.Скарыны, 2004. – С. 111-115.

Уладыкоўская, Л.М. Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізму / Л.М.Уладыкоўская. – Мінск: БДУ, 2009. – 199 с.

Чаквін, І.У. Фарміраванне беларускай нацыі / І.У.Чаквін, І.А.Юхо // Этнаграфія Беларусі. – Мінск, 1989. – 67 с.

*Тэма. Эгалітарызм і плюралізм культуры*

Літаратура

Артановский, С.Н. Историческое единство человечества и взаимное влияние культур / С.Н.Артановский. Философско-методологический анализ современных зарубежных концепций. Л.: Просвещение, 1967. – 268 с.

Гурвич, П.С. Что такое множественность культуры / П.С.Гурвич // Гурвич, П.С. Культуралогия: элементарный учебник: Учеб. пособие. – М.: Гардарики, 2001. – С. 226-243.

Данилевский, Н.Я. Россия и Европа / Н.Я.Данилевский.-М.: Ин-т русской цивилизации, Благословение, 1991. – 816 с.

Рерих, Н.К. Восток – Запад / Н.К.Рерих. М.: Международный центр Рерихов, 1994. – 104 с.

Сорокин, П.А. Человек. Цивнлизация. Общество: Пер. с англ. / П.А.Сорокин-М.: Политиздат, 1992. – 543 с.

Спирина. Е.А. Мультикультурализм как стратегия взаимодействия этнокультурных групп / Е.А.Спирина. – Минск: РИВШ, 2012. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Флиер, А.Я. Транслокальные культурные образования / А.Я.Флиер // Культурология для культурологов. – М.: Академ. Проспект, 2000. – С. 167-168.

Чебоксаров, Н.Н. Народы. Расы. Культуры / Н.Н.Чебоксаров. – М.: Наука, 1985. – 323 с.

Шпенглер, О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой культуры / Пер. с нем. под ред. А.А. Франковского / О.Ш-пенглер-М.: Искусство, 1993. – 304 с.

*Тэма. Сэнс крызіса культуры*

Літаратура

Белл, Д. Грядущее постиндустриальное общество. Опыт социального прогнозирования / Д.Белл. – М.:Academia, 1999. – 783 с.

Бродель, Ф. Грамматика цивилизаций / Ф.Бродель. – М.: Весь мир. – 545 с.

Данилевский, Н.Я. Россия и Европа / Н.Я.Данилевский.-М.: Ин-т русской цивилизацыи, Благославение, 1991. – 816 с.

Кризис современной цивилизации: Выбор пути. Сб. обзоров / под ред. Ф.И. Жиренко, Л.И.Василенко. – М.: ИНИОН РАН, 1992. – 124 с.

Тоффлер, Э. Война и антивойна. Что такое война и как с ней бороться, как выжить на рассвете ХХ1 века / Э.Тоффлер. – М.: АСТ, Транзиткнига, 2005. – 412 с.

Уткин, А.И. Мировой порядок ХХ1 века / А.И.Уткин. – М.: Алгоритм-книга, 2001. – 472 с.

Хантингтон, С. Столкновение цивилизаций / С.Хантингтон. – М.: АСТ, 2003. – 603 с.

Ясперс, К. Смысл и назначение истории / К.Ясперс. – М.: Республика, 1994. – 527 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіх заняткаў

***Тэма 1. Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства*** (2 гадзіны)

План

1. Метадалагічныя ўяўленні аб культуры. Тэрмін "культура" як этымалагічная загадка.
2. Міфалагічнае трактоўка культурнага досведу ў антычнымі мысліцелямі.
3. Заходнееўрапейскі вопыт філасофскага спасціжэння культуры.
4. Імпліцытныя веды аб культуры ў разнажанравай беларускай літаратуры Сярэдніх вякоў і эпохі Адраджэння.
5. Асэнсаванне новаеўрапейскага тыпу культуры асветнікамі Беларусі.
6. Станаўленне і развіццё эксплiцытных культуралагічных ведаў у XIX –XX стст.
7. Асаблівасці фарміравання культуралагічнай думкі ў Беларусі.

Літаратура

Бердяев, Н.А. Смысл истории / Н.А.Бердяев. – М.: Республика,1990. – 383 с.

Иконникова, С.Н. История культурологии. Идеи и судьбы / С.Н. Иконникова. – СПб.: Снкт-Петербур. академия культуры и искусств ,1996. – 264 с.

Маркарян, Э.С. Теория культуры и современная наука/ Э.С.Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.

Смолік, А.І. Беларуская культуралогія: гісторы і сучаснасць / А.І.Смолік; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 276 с.

Флиер, А.Я. Культурология для культурологов / А.Я.Флиер. – М.: Политиздат, 2000. – 496 с.

***Тэма 2. Духоўная культура і яе сутнасць*** (2 гадзіны)

План

1. Пр адметнае быццё культуры: формы духоўнай прадметнасці
2. Веды як вынік пазнаваўчай дзейнасці суб'ектаў культуры (практычныя, міфалагічныя, гульнявыя, ідэалагічныя, тэарэтычныя веды).
3. Каштоўнасці і іх класіфікацыя.
4. Нормы і іх функцыі.
5. Значэнні як спецыфічна культурны сродак сувязі чалавека з навакольным светам.

Літаратура

Бердяев, Н.А. Философия творчества, культуры и искусства /

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н.А.Бердяев. – М.: Знание, 1994. – 482 с

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования / К.Г.Антонов, Т.В.Артемьев, В.А.Белоус и др. ; под ред. Л.М.Мосоловой. – М.: Издательский центр «Академия», 2013.— 352 с.

Розин, В.М. Введение в культурологию: учеб. для выш. шк. /В.М. Розин.— М.: Форум: Инфа-М, 1997. – 219 с.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

***Тэма 3. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест*** (2гадзіны)

План

1. Прадметнае быццё культуры: формы матэрыяльнай прадметнасці.

2. Каналы культурнага развіцця цела чалавека (гульня, абрад, праца). Тыпы цялеснасці ў культуры розных народаў.

3. Рэч як культурны аб'ект. Значэнні рэчы ў культуры. Вобраз рэчы ў мастацтве.

4. Сацыяльная арганізацыя і яе функцыянаванне ў культуры. Спосабы арганізацыі сацыяльнага жыцця.

Літаратура

Бодрийар, Ж. Система вещей / Ж.Бодрийар. – М.: , 1995. – с.

Быховская, И.М. Человеческая телесность в социокультурном измерении / И.М.Быховская. – М.: , 1993. – с.

Давыдов, Ю.Н. Гомо экономикус / Ю.Н.Давыдов // Диалог. – 1990. – № 14.

Дюркгейм, Э.О. О разделении общественного труда / Э.О.Дюркгейм. – М.: , 1991. – с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Липс, Ю. Происхождение вещей: Из истории культуры человечества / Ю.Липс. – М.: , 1954. – с.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Сорокин, П.А. Социологические теории современности / П.А.Соркин. – М.: , 1992. – с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 4. Функцыі культуры** (2 гадзіны)

План

1. Вызначэнне зместу паняцця “функцыя”. Поліфункцыянальнасць культуры. Дыялектыка функцыянальнасці і дысфункцыянальнасці.
2. Класіфікацыя функцый культуры ў адпаведнасці са структурай духоўнай вытворчасці.
3. Функцыя вытворчасці культурных нормаў, каштоўнасцей, значэнняў і ведаў.
4. Функцыя назапашвання, захавання і трансляцыі культуры.
5. Сацыялізіруючая функцыя культуры.
6. Камунікатыўная функцыя. Тыпы камунікацый.

Літаратура

Ерасов, Б.С. Социальная культурология. / Б.С.Ерасов.-М.:АспектПресс, 1997. – 589 с.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Соколов, Э.В. Понятия,сушность и основные функции культуры: Учеб. пособие Э.В.-Соколов.- /. – Л.: Ленинград. гос. ун-т культуры, 1989. – 83 с.

Флиер, А.Я. Культурология для культурологов: учеб. пособпе. / А.Я.Флиер.- М.: Академический проект, 2000.— 496 с.

Хейзинга, Й. Homo ludens. В тени завтрашнего дня / Пер. с нидерланд. М.В.Вульфа. – М.: Прогресс; Прогресс-Академия, 1992. – 464 с.

Языкович, В.Р. Культурология: учеб.-метод. пособие / В.Р.Языкович. – Минск: РИВШ, 2010.— 364 с.

**Тэма 5. Культура сацыяльных супольнасцей** (2 гадзіны)

План

1. Сацыяльная стратыфікацыя грамадства.
2. Эліта як вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства. Элітарная культура і яе рысы.
3. Народная культура і яе роля ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу.
4. Віды і формы народнай культуры беларусаў.

Літаратура

Бердяев, Н.А. Философия свободы; Смысл творчества / Н.А. Бердяев.- М.: Правда, 1989.— 607 с.

Гончаренко, Н. Гений в искусстве и науке/ Н. Гончаренко. – М.: Искусство, 1991. – 432 с.

Бромлей, Ю.В. Очерки теории этноса / Ю.В.Бромлей. – М.: Наука, 1983. – 412 с.

Культурология. XX век: словарь-справочник.- СПб.: Университетская кннга, 1998. – 640 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культурология: хрестоматия /сост. проф. П.С.Гуревнч.-М.: Гардарики, 2000.- 592 с.

Лосев, А.Ф. Дерзание духа / Сост. Ю.А. Ростовцев.-М.: Политиздат, 1988.— 366 с.

Ортега-и-Гассет, X. Восстание масс / Х.Ортега-н-Гассет// Вопросы философии. – 1989. – № 3.— С. 119-154; № 4. – С. 114-155.

Лазука, Б.А. Помнікі мастацкай культуры Беларусі / Б.А.Лазука, Л.Я. Агеева, Д.Я. Баброўскі і інш. –Мінск: Рэспуб. унітар. прад-ва "Выдавецтва "Беларусь", 2012. – 414 с.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

**Тэма 6. Спецыфіка масавай культуры** (2 гадзіны)

План

1. Масавая культура як прадукт індустрыяльнага тыпу тэхналагічнага развіцця.

2. Ірацыянальнасць масавых рухаў і масавай свядомасці.

3. Сэнсавы дыяпазон масавай культуры. Натуралізм як рыса масавай культуры.

4. Асноўныя жанры масавай культуры.

Літаратура

Жаринов, Е.В. Историко-литературные корни массовой беллетристики / Е.В.Жаринов. – М.: ГИТР, 2003. – 388 с.

Костина, А.В. Массовая культура как феномен постиндустриального общества / А.В.Костина. – М.: Едиториал УРСС, 2003. – 350 с.

Лебон, Г. Психология толпы / Г.Лебон. – М.: Ин-т психологии РАН: КСП+, 1998. – 416 с.

Массовая культура: учеб. пособие / К.З.Акопян, А.В.Захаров, С.Я.Каргалицкая [и др.]. –М.: Альфа –М: Инфра-М, 2004. – 3004 с.

Ортега-и-Гассет, X. Восстание масс / Х.Ортега-н-Гассет// Вопросы философии. – 1989. – № 3.— С. 119-154; № 4. – С. 114-155.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Смольская, Е.П. Массовая культура. Развлечение или политика? / Е.П.Смольская. – М.: Мысль, 1986. – 144 с.

Соколов, Е.Г. Аналитика масскульта / Е.Г.Соколов. – СПб.: Санкт-Петерб. филос. об-во, 2001. – 340 с.

Хевеши, М.А. Толпа, массы, политика: историко-философский очерк / М.А.Хевеши. – М.: ИНФРАН, 2001. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 7. Тыпалогія культуры. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры** (2 гадзіны)

План

1. Праблема тыпалогіі ў фундаментальнай культуралогіі.
2. Крытэрыі і прынцыпы тапалагізацыі культур.
3. Канкрэтна-гістарычныя тыпы культуры паводле О.Шпенглера і М.Я.Данілеўскага.
4. Культурна-гістарычная канцэпцыя А.Дж.Тойнбі і К.Ясперса.
5. Тыпалагічныя мадэлі М.Мід і П.А.Сарокіна.

Літаратура


Данилевский, Н.Я. Россия и Европа / Н.Я.Данилевский.-М.: Ин-т русской цивилизации, Благословение, 1991. – 816 с.

Сорокин, П.А. Человек. Цивнлизация. Общество: Пер. с англ. / П.А.Сорокин-М.: Политиздат, 1992. – 543 с.

Тойнби, А. Постижение истории : Сб.: Пер. с англ. / Сост. Огурцов А.П. ; Вступ. ст. Уколовой В.И.; Закл. ст. Рашковского Е.Б. / А.Тойнбн—М.: Прогресс, 1991. – 736 с.

Шпенглер, О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой культуры / Пер. с нем. под ред. А.А. Франковского / О.Ш-пенглер-М.: Искусство, 1993. – 304 с.

Ясперс, К. Смысл и назначение истории / К.Ясперс - М. Политиздат, 1991. – 527 с.


**Тэма 8. Дынаміка культуры** (2 гадзіны)

План

1. Дэтэрмінанты культурнай дынамікі. Мадыфікацыя рыс культуры ў прасторы і часе.
2. Асноўныя канцэпцыі культурнай дынамікі (лінейна-паступальная, хвалепадобная, цыклічная, інверсійная і інш.).
3. Традыцыя як крыніца культурнай дынамікі.
4. Культурныя інавацыі і этапы іх укаранення.
5. Псіхасацыяльныя фактары прыняцця і адмаўлення культурных запазычанняў.
6. Механізмы культурных дыфузій.

Літаратура


Аванесова, Г.А. Динамика культуры / Г.А.Аванесова // Культурология . XX век: словарь. – СПб.: Университетская книга, 1997. – С. 99-102.

Кармин, А.С. Динамика культуры / А.С.Кармин // Культуралогия. – 2-е изд., перараб. и доп. – СПб.: Изд-во “Лань”, 2003. – С. 730-915.

Моль, А. Социодинамика культуры: Пер. с фр. /А.Моль-М.: Прогресс , 1973.— 406 с.

Смолік, А.І. Дынаміка культуры / А.І.Смолік // Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. -Мінскн.: Беларус. ун-т культуры і мастацтваў, 2008 . – С.207-243.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сорокин, П.А. Социокультурная динамика и эволюционизм / П.А. Сорокин // Американская социологическая мысль: Тексты / Р.Мертан, Дж. Мид, Т.Парсанс, А.Шюц. – М.: Политиздат, 1994. – С. 372-392.

Фрейд, З. Основные психологические теории в психоанализе / Пер. М.В. Вульфа / З.Фрэйд -М.: Пг.: Госиздат, 1923. – 207 с.

Хоруженко, К.М. Культурология: энцпклопедический словарь / К.М. Хоруженко.-Ростов н/Д.: Феникс, 1997 – 640 с.

**Тэма 9. Прырода і культура** (2 гадзіны)

План

1. Інтэрпрэтацыя прыроднага і культурнага ў культурфіласофскай думцы. Погляды беларускіх фізіякратаў (Л.Залускі, Г.Млоцкі, М.Страйноўскі, І.Храптовіч і інш.) на суадносіны прыроды і культуры.
2. Роля прыроды ў станаўленні і развіцці культуры. Прыродныя сімвалы ў культуры.
3. Тэорыя каэвалюцыі чалавека, грамадства і культуры.
4. Экалагічныя праблемы тэорыі культуры.

Літаратура

Гибсон, Дж. Экологический подход к зрительному восприятию / Дж. Гибсон. – М.: Прогресс,1998. – 464 с.

Гуревич, П. С. Культурология: учебник для студентов высш. учеб. заведеннй / П.С. Гуревич; ред. А.Г. Гридчина.- 3-е изд., перераб. и доп.- М.: Гардарики, 2003.-280 с.

Залусский, Л. Общая философия /Л.Залусский // Памятники философской мысли Белоруссии ХУ11- первой половины ХУ111 в. / В.В.Дубровский [и др.]; [сост. и подгот. текстов С.А.Подокшин]. – Минск: Навука і тэхника, 1991. – С. 93-107.

Игнатовская, Н.Е. Природа как ценность культуры / Н.Е.Игнатовская. – М.: Знание, 1997. – 152 с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Фурсов, В.И. Человек и Природа: век ХХ: монография / В.И.Фурсов. – Алма-Ата:Кайнар, 1983. – 224.

Цивилизация против природы. Что происходит с погодой и климатом? / Р.К.Баландин. М.: Вече, 2004. – 379 с.

**Тэма 10. Асоба ў прасторы культуры** (2 гадзіны)

План

1. Сутнасць і структура асобы. Узроўні асобаснай інтэграцыі. Асоба ў разуменні культурфілосафаў эпох мадэрну і постмадэрну.
2. Творчасць як асноўны тып асобаснай дзейнасці.
3. Спосабы і формы засваення культуры асобай.
4. Фарміраванне асобы ў працэсе сацыялізацыі і інкультурацыі.
5. Акультурацыя як працэс засваення іншай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

Арнольдов, А.И. Человек и мир культуры: Введение в культурологию / А.И.Арнольдов. – М.: Изд-во МГИК, 1992. – 240 с.

Каган, С.М. Философия культуры / М.С.Каган. – СПб.: ТОО ТК «Петрополис», 1996. – 416 с.

Левяш, И.Я. Культурология: курс лекций / И.Я.Левяш. Минск: ТетраСистемс, 1998. – 544 с.

Михайлова, Л.И. Социология культуры: Учебное пособие / Л.М.Михайлова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 1999. – 232 с.

Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

Тейяр де Шарден, П. Феномен человека / П. Тейяр де Шарден. – М.: Наука, 1997. – 419 с.

Фрейд, З. Психоаналитические этюды / З.Фрейд. – М.: АСТ, 2004. – 220 с.

Фромм, Э. Человек для себя. Иметь или быть? / Э.Фромм. – Минск: Коллегиум, 1997. – 253 с.

**Тэма 11. Культура і цывілізацыя** (2 гадзіны)

План

1. Шматполюснасць сусветных цывілізацый і іх узаемадносіны з культурай. Крытэрыі тыпалагізацыі цывілізацый.
2. Цывілізацыі Усходу: япона-сінтаісцкі, кітайска-канфуцыянскі, індыйскі тыпы цывілізацый.
3. Цывілізацыі Захаду: сутнасць і этапы фарміравання.
4. Сучасная сусветная цывілізацыя: каштоўнасныя і сутнасныя характарыстыкі.

Літаратура

Артановский, С.Н. На перекрестке идей и цивилизаций: исторические формы общения народов. Мировые культурные контакты. Многонациональное государство / С.Н.Артановский. – СПб.: Санкт-Петербургская гос. академия культуры, 1994. – 432 с.

Данилевский, Н.Я. Россия и Европа / Н.Я.Данилевский.-М.: Ин-т русской цивилизацыи, Благославение, 1991. – 816 с.

Де Фреде, Э. Культура, цивилизация и идентичность / Э.Де Фреде // Политические исследования. – 2012. – № 5. – С. 17-23.

Ионов, И.Н. Теория цивилизаций от античности до конца X1X века: научное издание / И.Н.Ионов, В.М.Хачатурян. – Санкт-Петербург: Алетейя, 2002. – 382 с.

Завадский, С.А., Новикова, Л.И. Искусство и цивилизация / С.А.Завадский, Л.И.Новикова. – М.: Искусство, 1986. – 272 с.

Кризис современной цивилизации: Выбор пути. Сб. обзоров / под ред. Ф.ИЖиренко, Л.И.Василенко. – М.: ИНИОН РАН, 1992. – 124 с.

Моисеева, Л.А. История цивилизаций / Л.А.Моисеева. – Ростов-на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дону, 2000. – 300 с.

Сорокин, П.А. Человек. Цивнлизация. Общество: Пер. с англ. / П.А.Сорокин-М.: Политиздат, 1992. – 543 с.

Тойнби, А.Дж. Цивилизация перед судом истории. Сб. / А.Дж.Тойнби. – М.: – М.: Айрис-Пресс, 2003. – 592 с.

Цивилизации и культуры. Вып. 1. Россия и Восток: цивилизациоееые отношения. – М.: Инст. Востоковедения РАН, 1994. – 292 с.

Хантингтон, С. Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М.: АСТ, 2003. – 603 с.

Шпенглер, О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой культуры / Пер. с нем. под ред. А.А. Франковского / О.Ш-пенглер-М.: Искусство, 1993. – 304 с.

Яковец, Ю.В. История цивилизаций / Ю.В.Яковец. – М.: Владар, 1995. – 461 с.

**4.2 Пытанні да экзамену**

1. Дысцыплінарны статус культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны. Культуралогія як навука: асноўная праблематыка дыскусіі (па матэрыялах “круглого стола” ў часопісе “Вопросы философии” “Культурология как наука: за и против ”. ВФ – 2008. – № 12).
2. Сфера культуры як аб’ект вывучэння і даследавання. Фундаментальная і прыкладная культуралогія. Смолік А.І., Грыгаровіч Я.Д. “Прыкладная культуралогія”.
3. Метады культуралагічных даследаванняў: паняцце метада і яго структура; класіфікацыя навуковых метадаў. Метадалагічны плюралізм сучасных культуралагічных ведаў.
4. Метады аналізу і сінтэзу ў культуралагічных даследаваннях.
5. Метад мадэлявання ў вывучэнні культуры.
6. Кампаратыўны падыход у культуралагічных даследаваннях. Аналогія і сапастаўленне; параўнальны метад.
7. Метады тэарэтычнага даследавання. Гіпатэтыка-дэдуктыўны метад у вывучэнні культуры.
8. Метад адзінства культурна-гістарычнага і лагічнага ў культуралагічных даследаваннях.
9. Метады індукцыі і дэдукцыі ў культуралагічных даследаваннях. Індуктыўна-дэдуктыўны метад Сакрата (бяседы Сакрата з мастакамі).
10. Культура як камунікатыўная сістэма: традыцыйныя формы трансляцыі культурнага вопыту. Трансляцыя і трансмутацыя культурнага вопыту ў сінхраніі і дыяхраніі культуры.
11. Міф у культуры: тыпалогія і значэнне.
12. Паглыбленне разумення культуры ў антычнасці. Ідэя пайдэі Лосеў А.Ф. “Дванаццаць тэзісаў аб антычнай культуры”.
13. Сярэдневечча як культурная эпоха (перыядызацыя, асноўныя рысы). Крэяцыянізм і сімвалізм. Аўгусцін. “Пісьмо ды Небрыдыя”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Культура Адраджэння (перыядызацыя, асноўныя рысы). Пытанні аб культуры ў працах Піка дела Мірандролы, Э. Ратэрдамскага, Т. Кампанэлы і інш. гуманістаў.

15. Культуралагічныя веды ў эпоху Асветы. Культура як культ чалавечага розуму. Апазіцыя культуры і прыроды ў філасофіі Ж.-Ж. Русо ("Ці садзйнічала развіццё навук і мастацтваў паляпшэнню нораваў").

16. Культуралагічныя ідэі І.Г. Гердэра: роля культуры ў развіцці чалавека; мова як форма нацыянальнай культуры. Праца І.Г. Гердэра "Ідэі да філасофіі гісторыі чалавецтва".

17. Культуралагічныя ідэі ў працах Г.В.Ф. Гегеля. Культура як іншабыццё абсалютнай ідэі.

18. Рацыяналістычны падыход да культурнага працэсу (К. Маркс). Базіс і надбудова. Вучэнне аб дзвюх формах культуры.

19. Культуралагічныя ідэі А. Шапенгауэра, Ф. Ніцшэ, С. К'еркегора.

20. Даследванні праблем культуры ў працах рускіх філосафаў XIX – пач. XX ст. (Ф.В. Адоеўскі, П.Я. Чаадаеў, П.С. Хамякоў). М.Я. Данілеўскі аб культурна-гістарычных тыпах.

21. Культура і цывілізацыя. Тэорыі лакальных цывілізацый (О. Шпенглер, А.Дж. Тойнбі).

22. Гульнёвая мадэль культуратворчасці (Й. Хейзінга, Я. Фінк). Праца Й. Хейзінга "Homo ludens. Чалавек гуляючы" (фрагмент).

23. Псіхааналітычныя інтэрпрэтацыі культуры. Праца З. Фрэйда "Нездавальненне культурай".

24. Псіхааналітычныя інтэрпрэтацыі культуры. К.-Г. Юнг. "Паняцце калектыўнага неўсвядомленага", "Псіхалагічныя аспекты архетыпа маці", "Трансцэндэнтная функцыя" (фрагменты).

25. Франкфуртская школа культуратворчасці (М. Хоркхаймер, Т. Адорна, Г. Маркузе, Э. Фром, Ю. Хабермас). Чалавек і культура ў творчасці Э. Фрома (па працах "Бегства ад свабоды", "Мець ці быць").

26. Постмадэрністская трактоўка культуралагічных праблем. Ж. Бадрыйяр аб нарастанні сімулякравасці ў сучаснай культуры.

27. Культура як надбіялагічная праграма (канцэпцыя В.С. Сцёпіна).

28. Паняцце і структура культуры: асноўныя стратэгіі вызначэння.

29. Рэнесанс ў беларускай культуры.

30. Спецыфіка мастацкай дзйнасці; паняцце мастацкай культуры (па працы: Каган М.С. "Чалавечая дзейнасць").

31. Асноўная праблематыка працы А.С. Запясоцкага і А.П. Маркава "Современная культурология как научная парадигма" (Вопросы философии. – 2010. – № 8).

32. Навуковы апарат культуралагічнага даследавання: падыходы, катэгорыі, метады ў вывучэнні аб'екта культуры.

33. Л. М. Баткін. "Два спосабы вывучаць гісторыю культуры" (Вопросы философии. – 1986. – № 12. – С. 104–115).

34. Гісторыка-культурныя перадумовы станаўлення культуралагічнай парадыгмы і спецыфіка "культуралагічнага метаду" (па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы: А.С. Запясоцкі, А.П. Маркаў. Современная культурология как научная парадигма. (Вопросы философии. – 2010. – № 8).

35. Архетыпічны змест культуры і яго ўвасабленне ў духоўных формах культуратвочасці (міф, рэлігія, мастацтва, мараль).

36. Семіятычны падыход да культуры (асноўныя катэгорыі). Ю.М. Лотман аб семіясферы культуры. Р. Барт аб семіялагічным універсуме культуры.

37. Каштоўнасная сістэма культуры. Дынаміка гістарычных тыпаў каштоўнасцей.

38. Развіццё культуралагічнай праблематыкі ў творчасці І. Канта.

39. Структурная дынаміка сучаснай культуры: элітарная і масавая культуры. Праца К. Ясперса "Духоўная сітуацыя нашага часу" (асноўная праблематыка).

40. Структурная дынаміка сучаснай культуры: сацыякультурны цыкл А. Моля.

41. Тыпалагічны аналіз культуры: праблема тыпаўтваральных прыкмет (асноўныя падыходы). Канцэпцыя М.К. Пятрова, яе тэарэтыка-метадалагічныя магчымасці.

42. Парадыгматычныя і сінтагматычныя тыпы культур: канцэпцыя Ю.М. Лотмана.

43. Канцэпцыя культурна-гістарычных тыпаў, яе теарэтыка-метадалагічныя магчымасці.

44. Кампаратыўны аналіз заходняй і ўсходняй культур: характар дынамічных змен. Мадэрнізацыя.

45. Структурная дынаміка сучаснай культуры: контркультура і субкультуры.

46. Еўрапейская культура Новага часу: рамантызм.

47. Еўрапейская культура Новага часу: мадэрнізм як іннавацыйна-крэатыўны тып культуратворчасці. А. Брэтон. "Маніфест сюррэалізму" (скарочана).

48. ХХ стагоддзе як самастойны перыяд у еўрапейскай культуры: адметныя рысы. Індустрыяльнае грамадства і яго культура.

49. Беларуская культура ў сучаснай сацыякультурнай дынаміцы.

50. Фенамен мульцікультурнасці: падыходы да даследавання. Узаемадзеянне культур: асноўныя віды.

51. Л. Вала. Аб асалодзе (Гл. XXI "Аб прыгажосці мужчын". Гл. XXII "Аб прагажосці жанчын").

52. Экзістэнцыяльная культурфіласофія (Ж.-П. Сартр, А. Камю).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### 5.1 Вучэбная праграма

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

**ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭОРЫІ
І ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ**

*Вучэбная праграма
ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі
1-21 80 13 Культуралогія*

2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту ОСВО 1-21 80 13-2012 Культуралогія і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-21 80 13 Культуралогія, рэг. № Д 21-2-02/вуч. ад 29.08.2012 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;

*В. М. Сакалова,* старшы выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. Г. Балодзіс,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;

*А. А. Любая,* загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 27.02.2018);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 19.04.2018)

Адказны за рэдакцыю: В. М. Сакалова

Адказны за выпуск: А. І. Смолік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Культура сучаснай цывілізацыі ўяўляе сабой складанае, шматузроўневае супярэчлівае ўтварэнне, якое ўплывае на ўладкаванне грамадства ў велізарнай геакультурнай прасторы. Культура з'яўляецца духоўным кампанентам, які ахоплівае розныя сферы жыццядзейнасці грамадства, садзейнічае інтэрыярызацыі, агульнай адукаванасці будучых спецыялістаў. У культуры знаходзяць праяўленне прынцыпы дыферэнцаванасці і сістэмнасці грамадскага жыцця, якія падтрымліваюць адзінства, пераемнасць і развіццё грамадства. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне магістрантамі вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры» – адной з базавых дысцыплін другой ступені вышэйшай культуралагічнай адукацыі. Ва ўмовах глабалізацыі вывучэнне сусветнай культуры – пры веданні сваёй, нацыянальнай – набывае асаблівае значэнне. Засваенне тэорыі і гісторыі культуры дазваляе асэнсаваць шматграннасць чалавечага існавання, далучыцца да духоўнага вопыту старэйшых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасці для ўсебаковага развіцця асобы і фарміравання агульнакультурных каштоўнасцей і ідэалаў. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалізаваць толькі шляхам сістэматызаванага, лагічна пабудаванага вывучэння ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Самастойна авалодаць скарбамі сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, немагчыма. Сёння ні адна з'ява, што мае дачыненне да гуманітарнай сферы, не можа быць разгледжана па-за культуралагічным кантэкстам, без якога любы дыскурс будзе няпоўным.

Праграма прызначана для асваення магістрантамі, якія абучаюцца па спецыяльнасці «культуралогія», і ўлічвае атрыманыя імі веды па гуманітарных дысцыплінах (Гісторыі Беларусі, Эканамічнай тэорыі, Філасофіі, Паліталогіі, Педагогіцы, Асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы і інш.), веданне ў цэлым асаблівасцей культурных эпох, пэўных звестак па розных відах мастацтва. Прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах.

Курс арыентаваны на пошук узаемадзеяння і ўзаемаўплыву паміж гуманітарнымі і ўласна культуралагічнымі праблемамі і ўяўляе інтэграваны вынік адукацыі.

*Мэты вучэбнай дысцыпліны:*

– сістэматызацыя ведаў па фундаментальных праблемах тэорыі і гісторыі культуры, авалоданне метадалогіяй сучасных сацыяльна-гуманітарных даследаванняў;

– развіццё здольнасцей да творчага, крытычнага ўспрымання тэндэнцый, плыняў, феноменаў, сімвалаў, універсалій і канцэптаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– авалоданне тэарэтычнымі, педагагічнымі і прыкладнымі палажэннямі культуралогіі, засваенне мабільнай дыдактычнай мадэлі выкладання культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэалізацыя названых мэт патрабуе вырашэння наступных *задач:*

– вызначэнне агульных прынцыпаў і метадаў для аналізу культуралагічных праблем;

– асэнсаванне асноўных кірункаў культуралагічнай думкі, якія адлюстроўваюць сутнасныя аспекты ўзнікнення і развіцця культуры;

– выяўленне ўсеагульных заканамернасцей функцыянавання культуры, асаблівасцей асноўных культурных тыпаў і ўласцівых ім базісных структур, духоўных дамінант;

– вывучэнне культуралагічных тэкстаў, прыярытэтных крыніц, што адлюстроўваюць галоўныя тэндэнцыі развіцця культуры;

– фарміраванне ведаў пра культурна-гістарычныя стылі, напрамкі, спецыфіку мастацкай сферы культуры.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны магістрант *павінен ведаць:*

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як цэласнай інтэгратыўнай сістэмы ў непарыўным адзінстве ўніверсальнага і ўнікальнага;

– марфалогію культуры;

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– прынцыпы тыпалогіі і формы ўзаемадзеяння культур;

– праблемы крос-культурных камунікацый у кантэксце глабалізацыйных працэсаў;

– прагностыку культуры, педагагічныя, сацыяльныя, лінгвістычныя, арганізацыйныя і іншыя прыкладныя магчымасці культуралогіі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен *умець:*

– крытычна ўспрымаць разнастайныя з’явы культуры ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі;

– асэнсоўваць значэнне культуры як індыкатара стану грамадства;

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– назапашваць тэарэтычны і эмпірычны матэрыял для выяўлення сутнасці і зместу культурных працэсаў;

– выкарыстоўваць метады культуралагічных даследаванняў;

– прымяняць параўнальны аналіз для выяўлення менталітэту народа ў розныя гістарычныя эпохі; тэндэнцый, базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць навуковую дзейнасць у галіне культуры;

– фармуляваць навуковую гіпотэзу як галоўны метадалагічны інструмент;

– вылучаць культурныя артэфакты і вывучаць іх з семіятычнага, аксіялагічнага і цывілізацыйнага пунктаў гледжання;

– апрацоўваць, аналізаваць і абагульняць навуковую інфармацыю.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВО

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1-21 80 13-2012 па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) 1-21 80 13 Культуралогія пасля заканчэння вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры» магістр павінен валодаць наступнымі кампетэнцыямі.

**Акадэмічныя:**

АК-4. Быць падрыхтаваным да стварэння культурнага, сацыяльнага і педагагічнага праектавання сацыякультурнай дзейнасці.

АК-5. Валодаць навыкамі і ўменнямі пабудовы найбольш эфектыўных мадэлей вучэбна-выхаваўчага працэсу з мэтай самаактуалізацыі і самарэалізацыі суб'ектаў культуры.

**Сацыяльна-асобасныя:**

САК-3. Быць здольным да супрацоўніцтва і работы ў камандзе.

САК-4. Валодаць камунікатыўнымі здольнасцямі для работы ў міждысцыплінарным і міжнародным асяроддзі.

САК-8. Успрымаць і пераасэнсоўваць каштоўнасці, нормы, артэфакты культуры.

**Прафесійныя:**

ПК-2. Складаць планы і праграмы даследаванняў па асноўных праблемах сацыядынамікі культуры.

ПК-3. Збіраць, аналізаваць і сістэматызаваць тэарэтычны і эксперыментальны матэрыял.

ПК-4. Распрацоўваць методыку сацыялагічных даследаванняў, апрацоўваць матэрыялы і на іх аснове рабіць навукова абгрунтаваныя высновы.

ПК-5. Рыхтаваць навуковыя артыкулы ў рэцэнзуемыя часопісы, даклады на навуковыя канферэнцыі.

ПК-15. Рацыянальна выкарыстоўваць сучасныя прынцыпы, метады, формы, сродкі і механізмы кіравання сферай культуры.

ПК-17. Прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць устаноў культуры і мастацтва.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры» прадугледжана 76 гадзін аўдыторных заняткаў, з якіх 46 – лекцыйныя, 30 – практычныя заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Значэнне вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры» ў працэсе падрыхтоўкі выкладчыкаў і даследчыкаў культуралагічных праблем. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай вучэбнай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

Сучасная сацыякультурная сітуацыя. Фундаментальныя змены гістарычнай рэчаіснасці. Абвастрэнне праблем планетарнага маштабу. Узрастанне антрапалагічнага націску на біясферу. Феномен манкуртызму як адрыў чалавека ад культурнага космасу. Задача пераасэнсавання каштоўнасных арыенціраў з мэтай гуманізацыі тэхнагеннага грамадства. Праблема развіцця якасна іншай культуры асобы як глабальны імператыў сучаснай цывілізацыі.

### *Тэма 1. Дысцыплінарны статус культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны*

Культуралогія як экспліцытная форма ведаў аб феноменах культуры. Актуальнасць вывучэння культуралагічных праблем. Месца культуралогіі ў структуры гуманітарных ведаў. Культуралогія як сістэма ведаў аб культуры. Гісторыя ўзнікнення і прычыны фарміравання культуралогіі. Неабходнасць універсальнага падыходу да культуры: адзінства асобаснага, сацыяльнага і глабальнага аспектаў.

Мэты і задачы культуралогіі. Асноўныя функцыі культуралогіі: светапоглядная, гнасеалагічная, аксіялагічная, праксіалагічная, метадалагічная і інш.

Дыверсіфікацыя навук аб культуры. Фундаментальная і прыкладная культуралогія. Значэнне культуралогіі ва ўмовах міжнародных камунікацый, інфармацыйнага грамадства, глабалізацыі.

### *Тэма 2. Сфера культуры як аб’ект вывучэння і даследавання*

Культура як аб’ект вывучэння розных дысцыплін (археалогіі, этнаграфіі, гісторыі, антрапалогіі, сацыялогіі, філасофіі, паліталогіі, рэлігіязнаўства, аксіялогіі і інш.). Анталагічны і гнасеалагічны сэнс культуры. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання. Заканамернасці і механізмы функцыянавання і развіцця культуры як атрыбута сацыяльнай сістэмы. Раскрыццё ўнутраных сэнсаў артэфактаў культуры, вобразаў, форм і сэнсаў, якія ўтрымліваюцца ў іх, задача навукі аб культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Метады культуралагічных даследаванняў*

Метад як сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення з’яў і працэсаў культуры.

Рэгламентацыя зместу і паслядоўнасці пазнавальных дзеянняў, аперацый і працэдур даследавання з дапамогай метаду.

Класіфікацыя навуковых метадаў: непасрэдныя і апасродкаваныя; якасныя і колькасныя; апісальныя і тлумачальныя; змястоўныя і фармальныя.

Агульналагічныя метады: аналіз, сінтэз, абстрагаванне, індукцыя, дэдукцыя, аналогія, мадэляванне.

Метады эмпірычнага даследавання: назіранне, апісанне, вымярэнне, параўнанне, аналіз дакументаў, апытанне, эксперымент.

Метады тэарэтычнага даследавання: мысленны эксперымент, ідэалізацыя, фармалізацыя, аксіяматычны метад, гіпатэтыка-дэдуктыўны метад, пераход ад абстрактнага да канкрэтнага, метад адзінства культурна-гістарычнага і лагічнага. Метадалагічны плюралізм сучасных культуралагічных ведаў.

### *Тэма 4. Кірункі навуковых даследаванняў у галіне культуры*

Сістэматызацыя культурных з’яў па сутнасных прыметах. Фенаменалагічнае апісанне культурных аб’ектаў і іх класіфікацыя па знешніх атрыбутыўных прыметах. Эмпірыка-сістэматызатарскія даследаванні культурных феноменаў мінулага.

Даследаванне культуры ментальнасцей, культуры штодзённасці, гістарычнай дынамікі культуры і яе форм.

Праблема дзейнасці і адаптыўна-тэхналагічныя функцыі культуры.

Сацыякультурная мадэрнізацыя і гістарычная дынаміка беларускай культуры.

Культурная палітыка і дзейнасць культурных інстытутаў у Беларусі. Сацыякультурнае прагназаванне, праектаванне і рэгуляванне. Сацыялізацыя і інкультурацыя асобы. Ахова культурнай спадчыны беларусаў.

Аналіз зместу, структуры, дынамікі і тэхналогій функцыянавання сацыякультурнага вопыту ў ракурсе яго генезісу, селекцыі і акумуляцыі, сістэмнай упарадкаванасці, рэгулятыўнай практыкі, зменлівасці, семантычнай выражанасці і практыкі засваення.

### *Тэма 5. Трансфармацыя культуралагічных ведаў у Антычнасці*

Міфалагічныя ўяўленні аб культуры. Дыферэнцыяцыя прыроднага і культурнага ў міфалогіі. Культурныя героі. Прыроднае і звышпрыроднае, хаос і парадак. Міфы аб Праметэі, залатым веку і інш.

Паглыбленне разумення культуры ў Антычнасці. Этымалогія канцэпту «культура». Праблема духоўнага ўдасканалення асобы ў Піфагора. Сутнасць адукацыі ў грамадстве. Культурныя ўстаноўкі сафістаў. Ідэя пайдэі. Культура як культ душы, ведаў аб чалавеку (Сакрат). Выкрыванне ролі пісьмовай куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры ў Платона. Крытыка цывілізацыйных дасягненняў (Дыяген). Цыцэрон аб ролі культурнага развіцця асобы. Культура як культ маральнага выхавання чалавека (Сенека). Даследаванне пытанняў культуры ў Тацыта. Гуманістычнае значэнне антычнай інтэрпрэтацыі культуры.

### *Тэма 6. Уяўленні аб сутнасці культуры ў Сярэдневякоўі і ў эпоху Адраджэння*

Монатэістычная канцэпцыя культуры. Разуменне культуры як культу. Роля экзагетыкі ў фарміраванні культурнай прасторы. Значнасць містычнага вопыту. Разуменне пытанняў культуры ў працах Тэртуліяна, Аўгусціна, Фамы Аквінскага. Крэацыянізм, сімвалізм. Тэалогія культуры.

Уяўленні аб культуры ў эпоху Адраджэння. Крытыка схаластычнай традыцыі (Пятрарка). Паглыбленне поглядаў на культуру ў працах Піка дэла Міра́ндалы, Мантэня, Эразма Ратэрдамскага і іншых гуманістаў. Феномен акультурвання быцця ў працах Мікалая Кузанскага. Культура як функцыя адраджэння святла. Пытанні аб культуры ў працах Тамаза Кампанелы, Ларэнца Валы.

### *Тэма 7. Культуралагічныя веды ў Новы час*

Культуралагічныя веды ў эпоху Асветы. Сутнасць асноўных ідэй прадстаўнікоў протаасветы. Культура як культ чалавечага розуму. Праблема суадносін традыцый і нацыянальнага мыслення (Р. Дэкарт, Дж. Лок). Ф. Бэкан аб атрыманні дакладных ведаў. Культуралагічныя ідэі Дж. Віко, М. дэ Кандарсэ, А. Цюрго. Роля рэлігіі і навукі ў працах Б. Паскаля. Апазіцыя культуры і прыроды ў філасофіі Ж.-Ж. Русо. Асаблівасці культуралагічных ідэй у тэорыі Вальтэра, Т. Гобса і інш.

Развіццё культуралагічных уяўленняў у індустрыяльным грамадстве. Германія – галоўны цэнтр фарміравання новых культуралагічных ідэй. І. Г. Гердэр аб ролі культуры ў развіцці чалавека. Гуманізм як мэта культуры. Прычына культуратворчасці. «Культура вучоных» і «культура народа». Мова як форма нацыянальнай культуры. В. Гумбальт аб ролі культуры.

Развіццё культуралагічнай праблематыкі ў І. Канта. Культура як найвышэйшая ступень праяўлення свабоды. «Культура ўмення» і «культура выхавання». Сэнс культуры. Культура і цывілізацыя. Інтэрпрэтацыя ролі асноўных форм культуры ў Ф. Шэлінга.

Культуралагічныя ідэі ў працах Г. В. Ф. Гегеля. Галоўная мэта творчасці. Культура як іншабыццё абсалютнай ідэі. Культура і свабода. Рысы ўсеагульнасці ў культуры. Высокая і нізкая, тэарэтычная і практычная культура.

Крытыка культуры індустрыяльнага грамадства ў Ф. Шылера. Праблема гарманічнага развіцця чалавека. Феномен «частковага» чалавека. Ідэя гульні.

Рацыяналістычны падыход да культурнага працэсу (К. Маркс). Базіс і надбудова. Крытыка рэлігіі. Галоўная крыніца развіцця грамадства. Вучэнне аб дзвюх формах культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развянчанне рацыяналістычнага аптымізму (А. Шапенгаўэр). Сусветная воля як крыніца культуратворчасці. Роля мастацтва і маралі ў гарманізацыі асобы. Сутнасць культуры.

Культуралагічныя ідэі Ф. Ніцшэ. Апаланічны і дыянісійскі пачаткі ў культуры. Праблема крызісу культуры. Крытыка Сакрата.

Феномен духоўнага фарміравання чалавека ў працах С. К’еркегора. Тры ступені развіцця асобы: эстэтычная, этычная і рэлігійная. Сэнс веры.

Даследаванне праблем культуры ў работах рускіх філосафаў XIX – пачатку XX ст. Культуралагічныя ідэі В. Ф. Адоеўскага, П. А. Чаадаева, А. С. Хамякова. М. Я. Данілеўскі аб культурна-гістарычных тыпах. Праблема спецыфікацыі сусветных культур. Тыпы цывілізацый і іх крытэрыі.

### *Тэма 8. Трактоўка культуралагічных праблем у XX ст.*

Разуменне асаблівасцей чалавечага быцця У. Салаўёвым. Сэнс гісторыі. Усход – Захад – Расія ў кантэксце сусветнага развіцця.

Інтэрпрэтацыя сутнасці культуры ў М. Бярдзяева. Культура і цывілізацыя.

Культуралагічныя ідэі П. Сарокіна. Паняцце «энергія культуры».

Культуралагічныя ўяўленні П. Фларэнскага, М. Фёдарава, С. Булгакава, В. Розанава, А. Белага: параўнальны аналіз.

Інтэрпрэтацыя феномена культуры ў тэхнагеннай цывілізацыі. Неаэвалюцыяністкая канцэпцыя культуры (Л. Уайт, Р. Карнэйра, М. Харыс і інш.).

Тэорыя лакальных цывілізацый (О. Шпенглер, А. Дж. Тойнбі і інш.).

Аксіялагічны падыход да культуры (Г. Рыкерт, В. В. Віндэльбанд, М. Вебер).

Сімвалічная канцэпцыя культуры (Э. Касірэр, Л. Уайт і інш.).

Гульнявая мадэль культуратворчасці (Ё. Хёйзінга, Х. Артэга-і-Гасет, Э. Фінк).

Дыялагічная сутнасць культуры (М. Бубер, М. М. Бахцін).

Псіхааналітычная інтэрпрэтацыя культуры. Лібіда як універсальная культуратворчая сіла (З. Фрэйд). Узаемадзеянне ЯНО, Я і ЗВЫШ-Я. Феномен эдыпавага комплексу. К. Г. Юнг аб ролі архетыпаў. Міф як базавы элемент культуры. Сутнасць культуры. Роля сімвалаў у кантэксце культуратворчасці.

Экзістэнцыяльная культурфіласофія. Культуралагічныя ідэі Ж. П. Сартра, А. Камю, М. Хайдэгера: параўнальны аналіз. Роля тэхнікі і навукі ў кантэксце культуры. Культура як вынік трансцэндавання.

Франкфурцкая школа ў культуралогіі (М. Хоркхаймер, Т. Адорна, Г. Маркузе, Э. Фром, Ю. Хабермас). Крытыка прагрэсісцкай лініі развіцця культуры, «аднамернага грамадства». Праграма гуманізацыі тэхнікі.

Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем. «Філасофія хаосу». Дэканструктывізм Ж. Дэрыда. Дрэвападобная культура і культура рызомы (Ж. Дэлёз, Ф. Гватары). Ж. Бадрыяр аб нарастанні сімулякравасці ў сучаснай культуры.

Структуралісцкая версія культуры. Культуралагічныя ідэі К. Ляві-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Строса, М. Фуко, Р. Барта, Ж. Лакана. Роля структур у культуры. Дыялектыка рэальнага, уяўнага і сімвалічнага.

### *Тэма 9. Актуальныя праблемы тэорыі культуры*

Функцыянальнае вызначэнне паняцця культуры і яе асноўныя характарыстыкі. Чалавек як творца культуры. Амбівалентнасць чалавека як галоўная прычына культуратворчасці. Дыялектыка фізічнага і духоўнага, прыроднага і культурнага, бессвядомага і свядомага. Шматграннасць феномена культуратворчасці. Культура як адаптацыя чалавека да прыроды, грамадства і як матэрыялізацыя бязмежных магчымасцей духу. Культура як культ духоўнасці. Сутнасць духоўнасці.

Прырода, культура і цывілізацыя. Эвалюцыя паняцця «прырода». Гістарычныя мадэлі ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Культура як другая прырода. Цывілізацыя і прырода. Этымалогія і сэнс паняцця «цывілізацыя». Экалагічныя праблемы: сучасны стан. Біясфера і наасфера. Культура і прырода. Прынцып глыбокай павагі да прыроды. Духоўна-сімвалічны характар культуры і прагматычны характар цывілізацыі. Фактары цывілізацыі: развіццё гарадоў, знешні гандаль, палітычныя сувязі, сродкі камунікацыі і інш.

### *Тэма 10. Архетыпічная накіраванасць культуры і праблема фарміравання духоўнай прасторы*

Культура як сістэма базавых феноменаў. Міф як першая форма гарманізацыі чалавека. Тыпалогія міфа. А. Ф. Лосеў аб сутнасці міфа. Міфалагічнае мысленне: пралагічнае (Л. Ляві-Бруль) ці лагічнае (К. Ляві-Строс). Прастора міфа: сакральная і прафанная (М. Эліядэ). Міф і сучаснасць (Э. Касірэр, Р. Барт, М. Эліядэ і інш.).

Паглыбленне светапогляду і працэс дыферэнцыяцыі грамадскай свядомасці. Нараджэнне сусветных рэлігій. Культуратворчая функцыя рэлігіі. Рэлігійны вобраз свету. Міф і рэлігія. Рэлігія як фактар аб'яднання (Э. Дзюркгейм), сацыяльнай дзейнасці (М. Вебер), псіхалагічнай абароны (З. Фрэйд), каштоўнасных арыентацый асобы (Э. Фром). Рэлігія і мараль. Рэлігія і навука. Рэлігія і эканоміка. «Пратэстанцкая этыка і дух капіталізму» М. Вебера як узор культуралагічнага даследавання рэлігіі. Рэлігія ў кантэксце сучаснага грамадства.

Мастацтва як сфера культуры. Тэорыі паходжання мастацтва (імітацыйная, міметычная, гульнявая, культурна-гістарычная і інш.). Функцыі мастацтва ў культуры. Мастацтва як культ унікальнага, непаўторнага, самабытнага. Гуманістычная прырода мастацтва. Мастацкі тэкст як артэфакт. Мастацтва – асаблівы тып пазнання, стварэння асобы і духоўнай рэчаіснасці. Роля аўтара ў мастацтве. Трансфармацыя ролі аўтара ў культуры постмадэрнізму. Гісторыя культуры як змена стыляў. Спецыфіка сучаснага мастацтва.

Распрацоўка рацыянальнага шляху пазнання свету. Нараджэнне філасофіі. Філасофія як культ рэфлексіі, як сістэма катэгорый. Анталагічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сэнс філасофіі. Сафія як аб’ектыўная якасць разумна ўпарадкаванага свету. Філасофія ў кантэксце пошукаў чалавекам абсалютнай гармоніі. Пазнанне як узвышэнне над неабходнасцю. Навука і тэхніка як феномены культуры. Спецыфіка навуковых ведаў, іх мэта і сэнс. Навука і мастацтва, рэлігія і навука: узаемадзеянне і ўзаемаўплыў. Этас навукі: сацыякультурныя фактары яе развіцця. Т. Кун, П. Феерабенд аб сучасных праблемах развіцця навукі. «Тэхнэ» (М. Хайдэгер) і тэхніка. Сучаснае разуменне тэхнікі. Сэнс тэхнікі – вызваленне ад улады прыроды. Інфармацыйная тэхніка і яе развіццё ў сучасным свеце.

Маральна-этычныя аспекты культуры. Паняцце маралі. Нормы маралі і права. Этас культуры і маральнасць грамадства. Маральныя ўяўленні ў структуры каштоўнасцей асобы. «Залатое правіла маральнасці» як усеагульная каштоўнасць у гісторыі культуры. Універсальныя этычныя катэгорыі ў розных культурах. Мараль ва ўмовах дэмакратыі і таталітарызму. Імкненне да самаактуалізацыі, камунікацыі, творчасці як аснова сучаснай маралі.

Мова як сістэмны носьбіт культуры. Вербальныя і невербальныя мовы. Функцыі мовы ў культуры. Тэорыі паходжання мовы. Мова і менталітэт. Роля мовы ў інтэграцыі і дыферэнцыяцыі соцыуму. Асноўныя формы культуры як знакавыя сістэмы. Культура як вытворчасць значэнняў і сімвалаў. Прырода сімвала і яго функцыі.

### *Тэма 11. Семіятычны аналіз культуры: асноўныя напрамкі даследавання*

Прадмет і аб’ект семіётыкі культуры; праблемнае поле і падыходы. Семіётыка як навука і як метад. Роля семіятычнага метаду ў сучаснай культуралагічнай адукацыі. Семіятычнае разуменне культуры і мэты семіётыкі культуры. Знак як культурны аб’ект у камунікатыўнай прасторы. Дэфініцыя знака. Знак і значэнне. Дзвюхчасткавая мадэль знака (Ф. дэ Сасюр). «Выражэнне» і «змест» як структурныя характарыстыкі знака (Л. Ельмслеў). Трохчасткавая мадэль знака: рэферэнт, рэпрэзентант і інтэрпрэтант (Ч. С. Пірс). Уласцівасці знака. Тыпы знакаў (па Ч. С. Пірсу): іконы, індэксы, сімвалы. Паняцці ўзроўняў сігніфікацыі – «дэнатата» і «канатацыі». Міф як трэці ўзровень азначвання (Р. Барт).

### *Тэма 12. Каштоўнасная сістэма культуры: тэарэтычнае і гістарычнае вымярэнні*

Характарыстыка асноўных катэгорый аксіялогіі культуры як навукі аб каштоўнасцях. Культура як сукупнасць матэрыяльных, духоўных і сацыяльных каштоўнасцей. Паняцце каштоўнасці. Метады аксіялагічных даследаванняў. Каштоўнасці і іх сутнасць. Функцыі, тыпы і віды каштоўнасцей. Аксіялагічныя асновы свету культуры.

Узаемасувязь каштоўнасцей, норм, ідэалаў і мэт. Залежнасць каштоўнасцей ад патрэбнасцей і інстынктаў. Каштоўнасць – мэта і каштоўнасць – сродак. Каштоўнасць і контркаштоўнасць. Іерархія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей. Рэальныя, дэкларуемыя і сімвалічныя (уяўляемыя) каштоўнасці. Асобасныя і сацыяльныя, кардынальныя і субкардынальныя каштоўнасці. Агульначалавечыя каштоўнасці. Абсалютная каштоўнасць – выжыванне грамадства.

Функцыі каштоўнасцей. Мадэляванне каштоўнасцей. Дынаміка каштоўнасцей. Прынцыповае адрозненне каштоўнасцей даіндустрыяльных культур ад індустрыяльных і постіндустрыяльных. Каштоўнасці і культурная дынаміка.

Вытокі каштоўнаснай свядомасці суб’екта культуры і яго культуратворчай дзейнасці. Разуменне каштоўнасці як дабра ў эпоху Антычнасці. Каштоўнасць як значнасць (В. Віндэльбанд, Г. Рыкерт, Г. Коген). Апрыёрная, трансцэндэнтальная прырода каштоўнасцей. Праблема залежнасці каштоўнасцей ад пачуццяў (В. Вунт, Ф. Брэнтана). Ідэалістычнае разуменне каштоўнасцей (М. Бярдзяеў, М. Лоскі). Сацыяльная і канвенцыяльная прырода каштоўнасцей (М. Вебер, Э. Дзюркгейм).

### *Тэма 13. Культура як камунікатыўная сістэма*

Камунікатыўны аспект культуры. Канцэпт «Іншы» і дынаміка адносін да Іншага ў культурна-гістарычным працэсе. Функцыі Іншага ў жыцці чалавека і культуры. Паняцці «Я–Ты», «Я–Яно» ў М. Бубера. Канцэпцыя асіметрычнага дыялогу Э. Левінаса. «Я» і «Мы»: асоба ў сістэме сацыякультурных інтэракцый.

Сутнасныя культурныя адрозненні паміж людзьмі. Змест паведамленняў і іх уплыў на ўзаемаадносіны. Двухсэнсоўнасць і невыразнасць камунікацый і шляхі іх пераадолення. Сістэмы камунікацый у розных культурах і шляхі іх засваення.

Аспекты міжкультурнай кампетэнцыі. Элементы міжкультурнай камунікацыі: афектыўныя (эмпатыя і талерантнасць), кагнітыўныя (культурна-спецыфічныя веды, неабходныя для адэкватнага разумення камунікатыўных паводзін прадстаўнікоў іншай культуры), працэсуальныя (стратэгіі, якія ўжываюцца ў сітуацыях міжкультурных кантактаў і накіраваны на паспяховае праходжанне камунікатыўнага ўзаемадзеяння).

Мэты авалодання міжкультурнай кампетэнцыяй: кіраванне працэсам узаемадзеяння, яго адэкватная інтэрпрэтацыя, набыццё новых культурных ведаў з кантэксту пэўнага міжкультурнага ўзаемадзеяння. Стратэгіі дасягнення міжкультурнай камунікацыі. Асноўныя віды міжкультурнай камунікацыі.

### *Тэма 14. Структурная дынаміка культуры*

Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сутнасць і формы народнай культуры. Нараджэнне прафесійнай культуры. Элітарнасць як фундаментальная рыса сусветнага духоўнага руху. Элітарная і масавая культура. Асноўныя рысы масавай культуры. Праблема стандартызацыі рыначных каштоўнасцей. Рэлігійная і свецкая культура. Маргінальная культура. Гуманістычная, аўтарытарная і таталітарныя дамінанты ў культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культура, субкультура і контркультура ў кантэксце асваення аксіялагічнай прасторы. Асаблівасці субкультуры: байкеры, панкі, хіпі, рэперы, металісты, готы, хакеры, гопнікі, графіці, зіпі, міцькі і інш.

Сусветная структурная дынаміка культуры як працэс паглыблення дыферэнцыяцыі культурных форм, суб'ектывізацыі, плюралізму.

Сацыякультурная дынаміка як змена менталітэту эпох, культурных тыпаў. Прычыны сацыякультурнай дынамікі. Каштоўнасці і дынаміка культуры. Ю. М. Лотман аб характары дынамічных працэсаў у культуры: культура і выбух. Роля інавацый у культуры і іх узаемадзеянне з традыцыямі. Псіхакультурныя фактары прымання ці адмаўлення ад інавацый. Паняцце сацыякультурнага прагрэсу.

Глабалізацыя як феномен культуры. Асноўныя формы глабалізацыі ў гісторыі культуры. Перспектывы сацыякультурнай эвалюцыі.

### *Тэма 15. Тыпалагічны аналіз культуры*

Асновы тыпалагічнай класіфікацыі культуры: геаграфічныя, этнаграфічныя, гістарычныя, аксіялагічныя і інш. Міфалагічная тыпалагізацыя культуры. Дж. Віко аб перыядах культурна-гістарычнага працэсу. Фармацыйная класіфікацыя культуры (К. Маркс). Мужчынскі і жаночы тыпы культур (М. Бярдзяеў, Г. Зімель). «Арганічныя» тыпы культуры: апаланічная і дыянісійская (Ф. Ніцшэ), гарачыя і халодныя (К. Ляві-Строс). Канцэпцыя цыклічнага развіцця культуры (П. Сарокін). Semiятычная тыпалогія культур: дапісьмовая, пісьмовая, друкаваная і электронная (М. Маклюэн). Спецыфіка культур (М. Мід). Традыцыяналісцкі і тэхнагенны тыпы культур (В. С. Сцёпін).

Кампаратыўны аналіз заходняй і ўсходняй культур. Характар дынамічных змен у культуры Усходу і Захаду. Інтэграцыя дасягненняў навукі і тэхнікі Захаду з духоўнымі каштоўнасцямі Усходу.

Беларуская культура: сутнасць і праблема тыпалогіі. Асноўныя этапы фарміравання беларускай культуры. Феномены маргінальнасці, транзітыўнасці, эклектычнасці ў працэсе развіцця духоўнасці беларусаў. Асаблівасці нацыянальнага духоўнага вопыту. Кірунак развіцця беларускай культуры. Імкненне да Усходу. Імкненне да Захаду. Беларускі і рускі тыпы духоўнасці. Усходнеславянскі свет у ХХ ст.: трагедыйнасць культуры. Беларуская культура ў сучасным цывілізацыйным працэсе.

### *Тэма 16. Дынаміка культурна-гістарычнага працэсу*

Культура першабытнага грамадства і яе адметныя рысы (гармонія з прыродай, пантэізм, сінкрэтызм, дыфузнасць, беспісьмовы характар, безасабовасць і інш.).

Культура старажытных цывілізацый, яе агульныя рысы (традыцыйнасць, сінкрэтызм, цыклічнасць, абагаўленне правіцеля, сістэма дэспатыі, статычнасць і інш.) і адрозненні.

Культура Старажытнага Егіпта: перыядызацыя, своеасаблівыя рысы Старажытнага, Сярэдняга і Новага царстваў. Месапатамія. Культура

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шумераў, Асірыі, Вавілона.

Сінтэтычнасць індыйскай культуры: сінтэз жанраў (архітэктура, жывапіс, скульптура), сінтэз духоўнага і пачуццёвага. Індуізм як адлюстраванне сінтэтычнага характару культуры. Будызм як рэлігійная, філасофская і этычная сістэма. Сучасны індуізм.

Дзве асновы кітайскай культуры мінулага і сучаснасці: канфуцыянства і даасізм. Паняцце даа ў канфуцыянстве і даасізме. Прынцыпы канфуцыянства: іх рэгулятыўная функцыя. Інь і ян як асновы гармоніі. Прырода як эталон кітайскай культуры.

Антычнасць як тып культуры, яго асноўныя рысы, храналагічныя рамкі, этапы развіцця. Цэласнасць грэка-рымскіх кампанентаў у антычным тыпе культуры і іх адрозненні («культура аўтараў» і «культура аўтарытэтаў»).

Асноўныя рысы культуры Старажытнай Грэцыі (касмалагізм, полісны менталітэт, сацыяцэнтрызм, цялесны характар, вобразнасць і інш.). Перыядызацыя старажытнагрэчаскай культуры.

Перыядызацыя культуры Старажытнага Рыма. Роля этрускай культуры. Уздзеянне грэкаў на культуру Рыма. Нараджэнне хрысціянскага светапогляду.

## Тэма 17. Генезіс і эвалюцыя еўрапейскай культуры

Хрысціянства як каштоўнасна-сімвалічная аснова культуры Сярэдневякоўя, яго роля ў адзінстве Еўропы. Праблема перыядызацыі сярэдневяковай культуры. Катэгорыі сярэдневяковай культуры. Узаемасувязь рэлігійнай, свецкай і народнай культуры. Горад як цэнтр культуры. Узнікненне школ і ўніверсітэтаў, новых форм трансляцыі ведаў.

Уздым і росквіт рыцарскай культуры. Народная карнавальная культура як «парадыйны дублет» рэлігійнай культуры (М. Бахцін).

Позняе Сярэдневякоўе. Павышэнне каштоўнасці свецкага жыцця. Індывідуалізацыя веры. Разрыў царквы і дзяржавы. Ідэалы позняга Сярэдневякоўя і перадумовы Рэнесансу.

Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі, іх уклад у культуру ўсходнеславянскага Сярэдневякоўя. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага: асобныя рысы беларускай культуры. Роля старажытнабеларускай мовы ў культуры ВКЛ.

Культура Адраджэння і Рэфармацыі. Месца Рэнесансу ў гісторыі еўрапейскай культуры. Рэнесансныя адносіны да Антычнасці і Сярэдневякоўя. Новае ўспрыманне традыцыйных хрысціянскіх догматаў. Пераадольванне дуалізму сярэдневяковага вобраза свету. Новы погляд на чалавека і яго месца ў свеце. Антрапацэнтрызм, гуманізм, індывідуалізм і інш. Ідэалы і каштоўнасці рэнесансных гуманістаў, іх адлюстраванне ў жывапісе, літаратуры, архітэктуры.

Асаблівасці Рэнесансу ў славянскіх краінах. Мікола Гусоўскі: уваход беларускай культуры ў рэнесансную еўрапейскую культуру, пашырэнне ведаў аб беларускай прыродзе і ментальнасці ў Еўропе. Творчасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Францыска Скарыны ў кантэксце сінтэзу Усходу і Захаду.

Перадумовы стварэння ідэалогіі Рэфармацыі. Статус каталіцкай царквы. Асноўныя ідэі пратэстантызму. М. Вебер аб сувязі пратэстантызму і капіталізму. Праблема існавання «бесцаркоўнага хрысціянства». Усталяванне асобы новага тыпу. Рысы пратэстанцкай культуры: пурытанства, народны характар, спрашчэнне культу, адказнасць асобы і інш. Сацыякультурнае значэнне Рэфармацыі.

Беларускае Адраджэнне. Самабытная культура Беларусі ў ВКЛ. Свецкая і царкоўная культура. Статуты ВКЛ як помнік прававой і палітычнай культуры. Вольнасці шляхты. Рэнесансныя ідэі ў Беларусі: умовы і фактары ўзнікнення. Каштоўнасці Рэнесансу ў беларускай культуры (Ф. Скарына, М. Гусоўскі). Рэфармацыя ў Беларусі (С. Будны, В. Цяпінскі, М. Радзівіл-Чорны і інш.). Нацыянальная мова і культура ў творчасці беларускіх гуманістаў.

### Тэма 18. Еўрапейская культура Новага часу

Перадумовы і крыніцы фарміравання культуры Новага часу. Навуковая рэвалюцыя: новы лад культуры і змена вобраза свету. Культ навукі і тэхнікі. Адметныя рысы еўрапейскай культуры: рацыяналізм, сцыентызм, прыярытэт эмпірыкі, прагматызм і ўтылітарызм, спалучэнне сацыяцэнтрызму і індывідуалізму і інш. Секулярызацыя культуры і быту. Асвета як ідэалогія буржуазіі ў час яе ўзнікнення і развіцця. Дзейнасць французскіх асветнікаў (Д. Дзідро, Вальтэр і інш.). Ідэі Ж.-Ж. Русо як адказ еўропацэнтрызму. Палітычныя інавацыі ў культуры.

Беларуская культура XVII – першай паловы XVIII ст. Развіццё адукацыі і асветы. Сацыякультурныя, палітычныя, канфесіянальныя прычыны такой сітуацыі. Мастацкая культура на беларускіх землях.

Культура XIX ст.: вытокі, своеасаблівасці. Набыццё Еўропай і еўрапейскай культурай цэласнага статусу. Фарміраванне аўтаномнага еўрапейскага індывіда: пазітыўныя і негатыўныя вынікі.

Рамантызм як пратэст супраць механізаванага характару культуры: увага да асабістага ўнутранага свету чалавека. Мастацтва як спроба ўнясення эстэтычнага светапогляду ў прагматычны буржуазны свет. Беларускі рамантызм: зварот да народных крыніц і нацыянальнай гісторыі. Ідэалы рэалізму.

Мадэрнізм – інавацыйна-крэатыўны тып культурнага светабачання. Ідэя зруйнавання дагматычных форм мастацтва дзеля будовы «новага». Авангардныя напрамкі ў культуры (фавізм, дадаізм, футурызм, кубізм, сюррэалізм, экспрэсіянізм і інш.) як адлюстраванне супярэчнасцей быцця Еўропы.

Сацыяльна-дэмакратычная хваля ў культуры Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Культурна-філасофская думка І. Абдзіраловіча. Культуралагічная інтэнцыя ў літаратурнай творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 19. Культура ХХ – пачатку ХХІ ст.: асноўныя тэндэнцыі і праблемы*

ХХ ст. як самастойны перыяд у еўрапейскай культуры: адметныя рысы. Індустрыяльнае грамадства і яго культура: прагматызм, утылітарызм, масавізацыя. Паняцце таталітарнай культуры. Распад адзінства еўрапейскай культуры: з’яўленне апазіцый «элітарнасць – масавасць», «калектывізм – індывідуалізм», «манастылізм – полістылізм» і інш.

Беларуская культура савецкага перыяду: ад беларусізацыі да ўніфікацыі. Сучасны стан беларускай культуры. Дзяржаўная палітыка ў галіне беларускай мовы і культуры.

Сучасны этап развіцця еўрапейскай культуры: пераход да постіндустрыяльнага грамадства. Феномен постмадэрнізму і яго адметныя ўласцівасці: адмаўленне ад рацыяналізму, веры ў розум, традыцыйных каштоўнасцей, інтэрпрэтатыўнасць, полівалентнасць, энтрапія сэнсаў, дэканструктыўнасць і інш. Пераадольванне супярэчнасцей элітарнай і масавай культуры ў постмадэрнізме.

Станаўленне планетарнай культуры. Прынцып дыялогу культур – шлях да ўніверсальных каштоўнасцей чалавецтва. Роля сродкаў масавай камунікацыі ў гэтым працэсе. Узаемадзеянне культур Усходу і Захаду і пошукі ўзаемаразумення. Спалучэнне агульначалавечага і нацыянальнага ў сусветнай культуры.

Футуралогія аб глабальным мадэляванні розных аспектаў сусветнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| **Уводзіны** | 1 | | | |
| ***Тэма 1.*** Дысцыплінарны статус культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны | 1 | | 2 | ВА |
| ***Тэма 2.*** Сфера культуры як аб'ект вывучэння і даследавання | 2 | 1 | 1 | тэст |
| ***Тэма 3.*** Метады культуралагічных даследаванняў | 2 | 1 | 3 | тэст |
| ***Тэма 4.*** Кірункі навуковых даследаванняў у галіне культуры | 2 | 1 | 3 | ПА |
| ***Тэма 5.*** Трансфармацыя культуралагічных ведаў у Антычнасці | 2 | 1 | 1 | ПА |
| ***Тэма 6.*** Уяўленне аб сутнасці культуры ў Сярэдневякоўі і ў эпоху Адраджэння | 2 | | | |
| ***Тэма 7.*** Культуралагічныя веды ў Новы час | 2 | 1 | | |
| ***Тэма 8.*** Трактоўка культуралагічных праблем у XX ст. | 2 | 1 | 2 | дыскус. |
| ***Тэма 9.*** Актуальныя праблемы тэорыі культуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 10.*** Архетыпічная накіраванасць культуры і праблема фарміравання духоўнай прасторы | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 11.*** Семіятычны аналіз культуры: асноўныя напрамкі даследавання | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 12.*** Каштоўнасная сістэма культуры: тэарэтычнае і гістарычнае вымярэнні | 2 | | | |
| ***Тэма 13.*** Культура як камунікатыўная сістэма | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 14.*** Структурная дынаміка культуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 15.*** Тыпалагічны аналіз культуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 16.*** Дынаміка культурна-гістарычнага працэсу | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 17.*** Генезіс і эвалюцыя еўрапейскай культуры | 1 | 1 | 2 | тэст |
| ***Тэма 18.*** Еўрапейская культура Новага часу | 1 | 1 | 2 | ВА |
| ***Тэма 19.*** Культура XX – пачатку XXI ст.: асноўныя тэндэнцыі і праблемы | 2 | 2 | | |
| **Разам…** | 36 | 24 | 16 | |

## Формы кантролю ведаў магістрантаў

ВА – вуснае апытанне па тэме лекцыі;
тэст – тэставыя заданні па тэме;
ПА – пісьмовае апытанне;
дыскус. – дыскусія па дакладах і паведамленнях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 42, [4] с. – (Згукі мінуўшчыны).

2. *Акопян, К. З.* Массовая культура : учеб. пособие / К. З. Акопян [и др.]. – М. : Альфа-М : Инфра-М, 2004. – 304 с.

3. Антология культурологической мысли / сост.: С. П. Мамонтов, А. С. Мамонтов. – М. : Изд-во РОУ, 1996. – 352 с.

4. *Арутюнов, С. А.* Народы и культуры: развитие и взаимодействие / С. А. Арутюнов. – М. : Наука, 1989. – 247 с.

5. *Барт, Р.* Миф сегодня / Р. Барт // Избранные работы: Семиотика. Поэтика : пер. с фр. / Р. Барт. – М., 1989. – С. 72–130.

6. *Баткин, Л. М.* Итальянское Возрождение: проблемы и люди / Л. М. Баткин. – М. : Рос. гос. гуманит. ун-т, 1995. – 448 с. : ил.

7. *Бахтин, М. М.* Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М. : Искусство, 1979. – 424 с.

8. *Бенедикт, Р.* Психологические типы в культурах Юго-Запада США / Р. Бенедикт // Антология исследований культуры. Интерпретации культуры. – М. ; СПб., 2008. – С. 271–284.

9. *Библер, В. С.* Культура. Диалог культур (Опыт определения) / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 31–42.

10. *Бонгард-Левин, Г. М.* Древнеиндийская цивилизация / Г. М. Бонгард-Левин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука : Восточная литература, 1993. – 320 с.

11. *Боннар, А.* Греческая цивилизация : в 2 т. : пер. с фр. / А. Боннар. – Ростов н/Д : Феникс, 1994. – Т. 1 : От Илиады до Парфенона. От Антигоны до Сократа. – 448 с.

12. *Буркхардт, Я.* Культура Возрождения в Италии: опыт исследования / Я. Буркхардт. – М. : Юристъ, 1996. – 591 с.

13. *Вебер, М.* Протестантская этика и дух капитализма / М. Вебер // Избранные произведения ; пер. с нем. и общ. ред. Ю. Н. Давыдова. – М., 1990. – С. 44–271.

14. *Гуревич, А. Я.* Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А. Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1990. – 395 с.

15. *Дорошевич, Э. К.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э. К. Дорошевич, В. М. Конон. – М. : Искусство, 1972. – 320 с.

16. *Зиммель, Г.* Конфликт современной культуры : пер. с нем. / Г. Зиммель // Избранные работы. – Киев, 2006. – С. 61–79.

17. *Иконникова, С. Н.* История культурологических теорий / С. Н. Иконникова. – 2-е изд., перераб. и доп. – СПб. : Питер, 2005. – 474 с.

18. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб. :


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Петрополис, 1997. – 205 с.
*19. Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2001. – 350 с.
*20. Леви-Брюль, Л.* Первобытное мышление : пер. с фр. / Л. Леви-Брюль. – М. : Акад. проект, 2015. – 430 с.
*21. Лотман, Ю. М.* Беседы о русской культуре: Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX века) / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПБ, 1994. – 414 с.
*22. Лотман, Ю. М.* Семиосфера. Культура и взрыв. Внутри мыслящих миров : статьи, исследования, заметки / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПБ, 2010. – 703 с.
*23. Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Восень пасярод вясны / А. Мальдзіс. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 408 с.
*24. Малявин, В. В.* Китайская цивилизация / В. В. Малявин. – М. : АСТ : Астрель : Дизайн. Информация. Картография, 2001. – 632 с.
*25. Маркарян, Э. С.* Теория культуры и современная наука / Э. С. Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.
*26. Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс : пер. с исп. / Х. Ортега-и-Гассет // Избранные труды. – 2-е изд. – М., 2000. – С. 43–163.
*27. Садохин, А. П.* Межкультурная коммуникация : учеб. пособие / А. П. Садохин. – М. : Альфа-М, 2004. – 287 с.
*28. Сорокин, П. А.* Человек. Цивилизация. Общество / П. А. Сорокин / общ. ред., сост. и предисл. А. Ю. Согомонова ; пер. с англ. С. А. Сидоренко. – М. : Политиздат, 1992. – 543 с.
*29. Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры : вучэб.-метад. комплекс / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, С. Л. Шпарло ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 343 с.
*30. Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура : пер. с англ. / Э. Б. Тайлор. – М. : Политиздат, 1989. – 576 с.
*31. Тойнби, А. Дж.* Постижение истории : пер. с англ. / А. Дж. Тойнби. – М. : Прогресс, 1991. – 736 с.
*32. Тоффлер, Э.* Третья волна : пер. с англ. / Э. Тоффлер ; науч. ред., предисл. П. С. Гуревича . – М. : АСТ, 2002. – 776 с.
*33. Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М. : РОССПЭН, 2004. – 960 с. – (Сер. «Культурология. XX век»).
*34. Фейблман, Дж.* Типы культуры / Дж. Фейблман // Антология исследований культуры. Т. 1 : Интерпретации культуры. – 2-е изд. – СПб., 2006. – С. 203–224.
*35. Флиер, А.* Культурология для культурологов : учеб. пособие для магистрантов и аспирантов, докторантов и соискателей, а также преподавателей культурологии / А. Флиер. – М. : Акад. проект, 2000. – 496 с.
*36. Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М. : Попурри, 2015. – 736 с.
*37. Фуко, М.* Слова и вещи: археология гуманитарных наук / М. Фуко. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. : A-cad, 1994. – 408 с.

*38. Хайдеггер, М.* Бытие и время / М. Хайдеггер ; пер. с нем. В. В. Бибихина. – Харьков : Фолио, 2003. – 503, [9] с. – (Philosophy).

*39. Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон ; пер. с англ. Т. Велимеева, Ю. Новикова. – М. : АСТ, 2003. – 603, [5] с. – (Philosophy).

*40. Хёйзинга, Й.* Homo Ludens / Й. Хёйзинга. – М. : АСТ, 2004. – 544 с.

*41. Чернявская, Ю. В.* Введение в культурно-философскую антропологию : пособие для студентов Междунар. гуманит. ин-та БГУ специальности D 21 04 01 Культурология / Ю. В. Чернявская. – Минск : Белорус. гос. ун-т, 2003. – 282 с.

*42. Юнг, К. Г.* Психология бессознательного : пер. с англ. / К. Г. Юнг. – Изд. 2-е. – М. : Когито-центр, 2010. – 352 с.

*43. Ясперс, К.* Смысл и назначение истории : пер. с нем. / К. Ясперс. – М. : Политиздат, 1991. – 527 с. – (Мыслители XX века).

*Дадатковая*

*1. Белл, Д.* Грядущее постиндустриальное общество. Опыт социального прогнозирования : пер. с англ. / Д. Белл. – Изд. 2-е, испр. и доп. – М. : Academia, 2004. – CLXX, 788 с.

*2. Бицилли, П. М.* Элементы средневековой культуры / П. М. Бицилли. – СПб. : Мифрил, 1995. – 244 с.

*3. Макгован, Д.* Жизнь и нравы старого Китая / Д. Макгован, И. Коростовец. – Смоленск : Русич, 2003. – 496 с.

*4. Ионин, Л. Г.* Социология культуры : учеб. пособие для вузов / Л. Г. Ионин ; Гос. ун-т «Высшая школа экономики». – 4-е изд., перераб. и доп. – М. : Изд. дом ГУ ВШЭ, 2004. – 427, [5] с. – (Учебники Высшей школы экономики).

*5. Камю, А.* Бунтующий человек / А. Камю. – М. : Политиздат, 1990. – 415 с. – (Мыслители XX века).

*6. Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М. : Мысль, 1982. – 623 с.

*7. Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры : учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск : АСАР, 2008. – 848 с.

*8. Ницше, Ф.* Рождение трагедии, или Эллинство и пессимизм / Ф. Ницше. – М. : Акад. проект, 2007. – 176 с.

*9. Сартр, Ж. П.* Экзистенциализм – это гуманизм / Ж. П. Сартр // Сумерки богов / Ж. П. Сартр. – М., 1989. – С. 319–344.

*10. Фромм, Э.* Человек для себя / Э. Фромм ; пер. с англ. А. Александровой. – М : АСТ, 2016. – 320 с. – (Философия – Neoclassic).

*11. Элиаде, М.* Аспекты мифа : пер. с фр. / М. Элиаде. – М. : Инвест ППП, 1994. – 240 с.

*12. Шелер, М.* Положение человека в космосе / М. Шелер // Проблема человека в западной философии / сост. и послесл. П. С. Гуревича ; общ. ред. Ю. Н. Попова. – М., 1988. – С. 31–95.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады і тэхналогіі навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню магістрантаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыцця вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці магістрантаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для вызначэння вучэбных дасягненняў магістранта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў магістранта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны ўжываюцца наступныя формы самастойнай работы:

– работа магістрантаў з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, з першакрыніцамі, самастойнае вывучэнне асобных пытанняў вучэбнай дысцыпліны, падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў і экзамену;
– кантралюемая самастойная работа ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў, у тым ліку пісьмовых апытанняў з кансультацыямі выкладчыка;
– падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах і прадстаўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакладаў з прэзентацыямі на семінарскіх занятках.

Выкананая работа павінна адлюстроўваць ступень засваення магістрантам тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна мысліць, лагічна разважаць, ставіць пытанні, абагульняць, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

**Пералік прыкладных форм выканання кантралюемай самастойнай работы магістрантаў**

– напісанне рэферата;
– распрацоўка тэставых заданняў па вывучаемых тэмах;
– падрыхтоўка прэзентацыі;
– практычная работа з выкарыстаннем кейс-метаду (метаду сітуацыйнага аналізу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ